## Святаслаў АСІНОЎСКІ

# ШТО РАНЬШ БЫЛО...



Святаслаў АСІНОЎСКІ

# ШТО РАНЬШ БЫЛО...

Мінск «Беларусь» 2008

УДК 94 (476)
ББК 63.3(4 Беи)
А90

**Асіноўскі, С.М.**

А90 Што раньш было... /Святаслаў Асіноўскі. — Мінск : Беларусь, 2008. — 207 с. : іл.

ISBN 978-985-01-0741-1.

У гісторыка-краязнаўчых нарысах, што складаюць кнігу, прыводзяцца малавядомыя факты: роль беларускіх харугваў у разгроме крыжакоў пад Грунвальдам, няпростыя адносіны беларусаў з татарамі і ўкраінскімі казакамі. А таксама: што стаяла за трагедыяй Барбары Радзівіл — няшчаснае каханне ці халодны разлік тых, хто прагнуў улады; ці апраўдана называлі сучаснікі здраднікам апошняга вялікага князя Вялікага княства Літоўскага і караля Польшчы Станіслава Панятоўскага? На гэтыя і іншыя пытанні аўтар спрабуе даць адказ.

Разлічана на аматараў беларускай мінуўшчыны.

**УДК 94 (476)**
**ББК 63.3(4 Беи)**

**ISBN 978-985-01-0741-1**

© Асіноўскі С.М., 2008
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2008

## Ад аўтара

Якую назву даць кнізе? Такое пытанне, натуральна, паўстае перад кожным аўтарам, калі праца над рукапісам новага твора завершана. Безумоўна, кожны імкнецца, каб назва кнігі не толькі адпавядала яе зместу, але і прыцягнула ўвагу патэнцыяльнага чытача, калі ён спыніцца перад паліцай у кнігарні.

Не пазбег роздуму над назвай і аўтар гэтай кнігі. Больш таго, пошукі прымальнага варыянта крыху зацягнуліся. Але знайшоўся, на шчасце, добры чалавек (дарэчы, дасведчаны ў беларускай гісторыі), які, прачытаўшы рукапіс, пазваніў мне і нечакана прапанаваў даць кнізе назву — «ШТО РАНЬШ БЫЛО...».

Паабяцаўшы падумаць над прапановай, я дастаў з кніжнай паліцы томік Максіма Багдановіча і знайшоў старонку з эпілогам да яго вершаванага апавядання «Вераніка».

> Я ў сад пайшоў... Ўсё глуха, дзіка,
> Усё травою зарасло.
> Няма таго, што раньш было...

І адразу зразумеў: мой дарадца мае рацыю. Аб чым апавядае аўтар у сваёй кнізе? Аб постацях, падзеях і таямніцах беларускай гісторыі, гэта значыць, аб тым, «што раньш было» на нашай зямлі — сто, трыста, пяцьсот, тысячу гадоў таму. Зразумела, што багдановічавы радкі — гэта лірычныя ўспаміны, але, з улікам тэматыкі кнігі і задачы, якую ставіў перад сабой, працуючы над рукапісам, аўтар, яны выклікаюць пэўныя асацыяцыі. Можа, «сад» — гэта наша гістарычная памяць, якая пацíху «зарастае» травой забыцця? Пройдзе яшчэ колькі часу, і —

«няма таго, што раньш было»? Вось чаму людзям, асабліва моладзі, якая лічыць за лепшае глядзець наперад, а не азірацца назад, у мінулае, асабліва — у досыць аддаленае па часе, трэба іншы раз нагадваць аб тым, што адбывалася на абшарах паміж Дняпром і Нёманам, Заходняй Дзвіной і Прыпяццю задоўга да таго, як тут з'явіліся аўтамабіль, тэлебачанне, мабільная сувязь і мы з вамі.

Як і любы творца, аўтар марыць аб тым, каб яго кнігу прачытала як мага больш людзей. Прачытаўшы ж, каб прыйшлі яны да высновы, што мы, беларусы, можам ганарыцца сваёй гісторыяй; што яна стагоддзямі «рабілася» менавіта тут — у Полацку і Оршы, Брэсце і Гродне, Нясвіжы і Пінску; што беларуская гісторыя — гэта багатая палітра літаратурных жанраў: тут і гераічны эпас, і трагедыя, і меладрама, і дэтэктыў, і прыгодніцкая аповесць, і шмат чаго іншага. Спадзяюся, што, прачытаўшы кнігу, чытачы асабіста ўпэўняцца ў тым, што так яно і ёсць на самай справе.

Няма таго, што раньш было?.. Вельмі не хочацца пагаджацца з паэтам у гэтым, асабліва ў кантэксце захавання слаўнай беларускай мінуўшчыны. Пакуль жыве наша гістарычная памяць, разам з намі застаецца і тое, «што раньш было»...

# ЦЕНІ ПАГАНСКІХ КАПІШЧАЎ

Калі глянуць на Мінск з вышыні птушынага палёту, можа ўзнікнуць дзіўная асацыяцыя. Паміж вуліцамі Першамайскай, Пуліхава і Кастрычніцкай рака Свіслач нечакана робіць вялікую дугу, нечым падобную на старадаўнюю зброю — лук. «Цецівой» у ім з'яўляецца згаданая ўжо вуліца Першамайская, а вось вуліца Чырвонаармейская вельмі нагадвае стралу, скіраваную на паўднёвы захад.

Даследчыкі сцвярджаюць, што яшчэ не так даўно, крыху больш за сто гадоў таму, на гэтым месцы знаходзіўся глухі, да таго ж моцна забалочаны лес. Мясцовы люд называў яго Свіслоччам. На першы погляд, лес быў самы звычайны. На больш высокіх месцах раслі стромкія бярозы, дзе-нідзе сустракаліся каржакаватыя дубы. Там, дзе вільготней, буяла альшына, трапяталі лісцем асіны, стаялі змрочныя яліны. Адметнасцю ж Свіслочча з'яўлялася схаванае ў лясных нетрах, падступаўшых да самай ракі, паганскае капішча.

Цэнтрам капішча быў валун (праз гэта месца цяпер праходзіць вуліца Лодачная, а камень перавезены ў музей валуноў, што ў мінскім мікрараёне Уручча), які ляжаў на прасторнай, каля трохсот квадратных метраў, пляцоўцы, абнесенай амаль двухметровай вышыні тынам. Тут жа, пасярод пляцоўкі, узвышаўся дуб у чатыры абхваты. Яго лічылі святым і называлі волатам. Непадалёку ад дрэва, у паглыбленні, увесь час гарэў агонь. Камень, пра які ішла гаворка вышэй, зяўляўся галоўнай святыняй капішча. Людзі называлі яго Дзед, ці Стары. З-пад каменя выбівалася крынічка, вада якой лічылася святой і лекавай.

На капішчы меўся і свой святар, якога называлі чараўнікам, ці ведзьмаком. Дубу, агню і каменю мясцовыя



Валун Дзед (або Стары) на беразе Свіслачы

жыхары неслі свае ахвяраванні — мёд, малако, віно, палатно. Геолаг і краязнавец Эрнст Ляўкоў у кнізе «Маўклівыя сведкі мінуўшчыны» адзначаў, што апошнімі святарамі мінскага капішча былі Севасцей Высокі, які памёр у канцы XIX стагоддзя амаль стогадовым старцам, і яго сын, якога, дарэчы, раскулачылі ў 1930-ыя гады.

Аўтар кнігі лічыць, што паганскае капішча над Свіслаччу праіснавала да пачатку XX стагоддзя. Знішчылі яго толькі недзе перад руска-японскай вайной.

Пра што сведчыць расказанае вядомым краязнаўцам? Ды пра тое, што на Беларусі, з яе тысячагадовай хрысціянскай гісторыяй, вельмі моцныя карані мела язычніцтва, або паганства. Беларусы пакланяліся Ісусу Хрысту і адначасова не забывалі старых, паганскіх звычак. І, відаць, адно не вельмі перашкаджала другому.

Прычына гэтага бачыцца ў тым, што хоць хрысціянства і ўзнікла ў I в. н.э., але карані паганства куды больш глыбокія. Яго гісторыя сягае ў такую сівую мінуўшчыну, што наўрад ці можна дакладна сказаць, калі нашы продкі сталі пакланяцца ідалам.

Мы ведаем, што старажытныя грэкі, егіпцяне, рымляне шанавалі Зеўса, Юпітэра, Венеру, Афрадзіту, Апалона, Геру, Гермеса, Гефеста, Ізіду, Азірыса і яшчэ многіх багоў, кожны з якіх адказваў за свой «дэпартамент». Продкі беларусаў у гэтым плане нічым не саступалі тым жа грэкам. У іх быў свой даволі шматлікі пантэон багоў. Лаўрэнцьеўскі летапіс пералічвае іх у наступным парадку: Пярун, Хорс, Дажбог, Стрыбог, Сымаргл, Мокаш. Густынскі летапіс дадаваў да іх яшчэ Ладу, Купалу, Каляду, Пераплута.

Вось як падае паганскую сістэму багоў пісьменнік Кастусь Тарасаў: «...Найвышэйшыя: Дзіў, Род, Сварог, Стрыбог, Святавіт. Гэты шэраг імёнаў азначае развіццё вобраза Бога ад агульнага ўсім індаеўрапейскім народам вытоку да розніцы славянскіх племянных уяўленняў пра яго. Далей ідуць народжаныя старэйшым бажаством Дажбог, Каляда, Ярыла, Сура, Вялес — гэта ўсё сонца пад рознымі назвамі; Пярун — бог грому і маланкі; Купала — бог дастатку і ўраджаю; Вярба — багіня вясны, абуджэння прыроды; Тур — бажаство дзікіх звяроў (па назве самага дужага з іх); Лада — багіня кахання; Цёця (у беларусаў) — багіня асенняга ўраджаю; Парадзіха — жаночы пачатак жыцця; Жыжаль — бог агню; Пераплут — бог весялосці; магчыма, што існаваў бог вайны і магіі зброі Кава (адсюль — каваць, каваль). Яшчэ адным богам вайны, богам бязлітаснага знішчэння ворагаў, мог быць Кара (адсюль — карнікі). У глыбокай старажытнасці існавалі атрады найбольш лютых ваяроў, якія называліся «кара». Сваім татэмам яны лічылі ваўка.

Бліжэй да рэальнага жыцця чалавека дзейнічалі яшчэ духі дабра і зла: Жыцень — жытні дух; Аўсень — дух авечак (лічаць, што так называлі і каляднага казла), а таксама дамавікі, лесавікі, вадзянікі, русалкі, ваўкалакі... Далей ішлі бажаствы смерці і замагільнага існавання: Баба Яга — багіня смерці; Зніч — у беларусаў бог пахавальнага агню; Вялемос (Вялес) — магчыма, выконваў функцыю бога замагільнага свету. Верагодна, што замагільнае бажаство звалася раней Пекла...»



Бронзавая фігурка Перуна, знойдзеная каля Вільні

Як у старажытных грэкаў — Зеўс, у рымлян — Юпіцер, у скандынаваў — Одзін, у нашых продкаў верхаводзіў усімі багамі Пярун, або Грамабой. Уяўлялі яго у выглядзе ваяра, узброенага сякерай, мячом, булавой, паліцай або лукам са стралой. Ударам маланкі Пярун мог пакараць любога, хто яго раззлаваў. Нездарма імя грознага бога часта сустракаецца ў беларускіх праклёнах, прыслоўях, прымаўках: «Каб цябе Пярун трэснуў!», «Каб яе Пярун, гэтую хваробу!», «Злая, як Пярун», «Пярун б'е па высокім дрэве» і г. д. Дарэчы, ёсць летапісныя сведчанні, што ў даўнія часы Перуну прыносілі чалавечыя ахвяры.

Шанавалі беларусы і Дажбога, якога лічылі богам сонца і цяпла. Менавіта ад яго залежаў багаты ўраджай. Калі Пярун, караючы, пасылаў на зямлю вогненныя маланкі, то Дажбог, мілуючы, адорваў людзей дажджом. Менавіта да яго з просьбамі аб літасці звярталіся нашы продкі ў засуху.

Волас лічыўся богам статка, сялянскім бажаством. Спрадвеку свойская жывёла з'яўлялася для беларусаў сімвалам дастатку і заможнасці. Той, хто шанаваў Вялеса, мог разлічваць на яго дапамогу ў жывёлагадоўлі. Верагодней за ўсё, што менавіта ад яго існуе ў беларусаў культ свойскай жывёлы — каня, каровы, казла, барана, а таксама дзікай жывёлы — мядзведзя, ваўка і г.д.

Асаблівае месца ў пантэоне беларускіх багоў належала Знічу — богу пахавальнага агню. Як вядома, у паганскім мінулым нашы продкі не хавалі нябожчыкаў у зямлю, а спальвалі іх на пахавальных вогнішчах. Спальванне памёршага не толькі насіла ачышчальны характар, але і было свайго роду ахвярай небу. Відаць, адсюль і спальванне вядзьмарак, ерэтыкоў.

Але не толькі неба насялілі нашы продкі ў свой час міфічнымі, казачнымі істотамі. Куды больш іх аказалася на зямлі: у хаце беларуса, у яго гаспадарчых пабудовах, у полі, лесе, балоце, рэчцы, на возеры. Там жылі добрыя і злыя духі, якіх шанавалі і пабойваліся. У балоце хаваліся Аржавень, Багнік, Балотнік. У лесе знайшлі прытулак Лясун, Лазавік, Дабрахочы, Пушчавік. У полі гаспадарылі Палявік і Талака. Хапала «насельнікаў» і на сялянскай сядзібе: Паўночнік, Дамавік — у хаце, Лазнік — у лазні, Гуменнік — пад асеццю, Еўнік — у сушні, Пуннік — у пуні, Рай — у стадоле, Хляўнік — у хляве, Хут — на гарышчы. У кнізе «Міфы Бацькаўшчыны», якую склаў Уладзімір Васілевіч, прыводзяцца звесткі аб сямідзесяці пяці(!) добрых і злых духах, што жылі побач з беларусамі.

Адтуль, з часоў паганства, дайшлі да нас старадаўнія святы: Каляды, Дзяды, Радаўніца, Купалле. Сімвалічна, што ў свой час яны ўстаялі перад жорсткім націскам царквы, захаваліся ў часы ваяўнічага атэізму і ўсё ж такі засталіся з намі.

Адным з яскравейшых успамінаў майго дзяцінства (а гэта пяцідзесятыя гады мінулага стагоддзя) застаецца святкаванне Купальскай ночы. У нашай вёсцы (а жылі мы на Аршаншчыне), з чатырох бакоў аточанай лясамі, Купалле святкавалі і старыя, і малыя. У Купальскую ноч у вёсцы мала хто спаў: на свята выходзілі ўсе — ад стогадовага дзеда Юркі, які, нягледзячы на ўсе дасягненні цывілізацыі, упарта хадзіў у лапцях, да нас, хлапчукоў шасці-сямі гадоў. Як ні стараліся матулі ўтрымаць нас дома, мы праўдамі і няпраўдамі збягалі на Купалле. Зрэшты, асаблівых скандалаў з гэтай нагоды і не было: на Купалле нават самыя строгія маці станавіліся добрымі.

Ох і цудоўнай была гэтая ноч! Вогнішчы, песні, вянкі, казкі дзеда Юркі, вакол якога збіралася цікаўная дзятва. Дзяўчаты напрапалую фліртавалі (у той час гаварылі «жартавалі») з хлопцамі, даруючы ім у чароўную ноч самыя неймаверныя вольнасці, за якія іншым часам можна было папросту атрымаць па карку.

Купальская ноч, як я цяпер разумею, быццам вяртала ўсіх на сотні гадоў назад, у глыб стагоддзяў, калі продкі



Невельскі стод. Двухаблічная выява паганскага бога з Падзвіння

нашы яшчэ былі паганцамі і маліліся не Хрысту, а Перуну, Дажбогу, Вялесу.

Вось што пісаў у 1853 годзе вядомы беларускі этнограф Павел Шпілеўскі: «З увядзеннем хрысціянскай веры ідалы і капішчы знішчаны, але паданні, якія захоўваліся ў народзе, не маглі знішчыцца, вусныя паданні не пераставалі захоўваць у народзе ўспаміны аб вераваннях продкаў...» У 1871 годзе гэту тэму закрануў расійскі фалькларыст Пётр Бяссонаў: «Белая Русь захавала ў абрадзе ўрачыстасць, а ў песнях, якія яго суправаджаюць, водгукі самой сівой мінуўшчыны, як нідзе ў славян».

У 1902 годзе з гэтай нагоды выказаўся беларускі пісьменнік і паэт Карусь Каганец: «У ніводнага народа хрысціянскага не захавалася так многа, так жывых і яс-

ных слядоў паганства. Беларус хоць хрысціянін і набожны, а між тым ён напалавіну паганец, бо спаўняе верна ўсе абрады паганскія...»

К. Каганца ў 1905 годзе дапаўняе не менш вядомы гісторык Мітрафан Доўнар-Запольскі: «На светапоглядзе беларусаў адбіліся сляды аддаленага мінулага. Паўсюль у Расіі яшчэ захоўваюцца у большай ці меншай ступені сляды паганскіх культаў і вераванняў. Аднак беларусу ў гэтых адносінах, бясспрэчна, належыць першынство».

А вось ужо сучаснае сведчанне, якое належыць Уладзіміру Караткевічу: «Рэшткі язычніцкіх вераванняў былі на Беларусі жывучыя, як нідзе».

Святкаванне Купалля — адзін з апошніх паганскіх абрадаў, што захаваўся да нашага часу.

Свята адзначалася ў ноч з 6 на 7 ліпеня (з 23 на 24 чэрвеня па старому стылю). Напярэдадні Купалля вясковая моладзь выбірала свайго роду «тамаду», які кіраваў святочным шэсцем хлопцаў і дзяўчат. Удзельнікі шэсця ўпрыгожвалі сябе зелянінай, дзяўчаты плялі вянкі з палявых кветак, падпярэзваліся паясамі з палыну. Запальваліся доўгія паходні. «Маніфестанты» з песнямі абыходзілі двары, запрашаючы ўсіх на свята.

Цэлую ноч віравала гулянка вакол купальскага вогнішча, моладзь вадзіла карагоды, скакала цераз агонь. Рыхтаваўся сумесны пачастунак. Абавязковым атрыбутам свята былі дзявочыя вянкі, якія пускалі на ваду, — дзяўчаты загадвалі аб будучым замужжы.

Існавала паданне, што купальскі агонь валодае незвычайнай гаючай сілай, таму бацькі спальвалі на вогнішчы кашулькі хворых дзяцей, верачы ў іх абавязковую папраўку. Дзядулі і бабулі, кідаючы ў купальскае вогнішча старыя непатрэбныя рэчы, прасілі багатага ўраджаю.

Лічылася, што ў Купальскую ноч на ўсю моц буяніць усялякая погань: чэрці, ведзьмы, лесавікі. Каб засцерагчыся ад іх, людзі кідалі ў жыта галавешкі, на парогі хлявоў клалі крапіву. Коней на Купалле на начлег не выводзілі.

Існаваў старадаўні звычай: той, хто хацеў набрацца сілы і прыгажосці, павінен быў галышом выкупацца ў ранішняй купальскай расе.

У глыбокай старажытнасці купальскія абрады часта прымалі эратычны характар. У адной з царкоўных кніг яны апісваюцца наступным чынам: «Сыходзіцца народ — мужы і жоны і дзеўкі на начное купанне і бясчынны гоман, на д'ябальскія песні і скокі і на богабрыдкія справы. І бывае отракам апаганенне і дзеўкам разбэшчванне».

Кульмінацыяй Купалля былі пошукі папараць-кветкі, сімвала шчасця. Згодна з паданнямі, кветка з'яўлялася ў дрымучым лесе толькі раз у год, якраз у Купальскую ноч. Цвіла яна ўсяго некалькі імгненняў, а сцерагла яе ад людзей нячыстая сіла. Таго, хто адважваўся наблізіцца да кветкі, яна магла пазбавіць розуму ці напужаць да смерці. Таму, хто выпраўляўся на пошукі цудоўнай кветкі, магло і пашанцаваць, калі ён сустракаў у лесе купальскага дзядка. Той збіраў вогненныя кветкі ў маленькі кошык. Сустрэўшы дзядка, трэба было моўчкі пасцяліць перад ім белае палатно, і ён, таксама моўчкі, клаў на яго адну чароўную кветку. Для таго каб чэрці не адабралі яе, трэба было зрабіць парэз далоні правай рукі і ўставіць туды папараць-кветку.

Людзі верылі, што той, хто знаходзіў папараць-кветку, набываў здольнасць бачыць скрозь зямлю схаваныя скарбы.

Царква, імкнучыся адвучыць людзей ад паганскіх абрадаў, вызначыла на дзень Купалля рэлігійнае свята — Іаана Хрысціцеля (адсюль і другая назва купальскага свята — Іванава ноч, гэта значыць ноч на Івана Купалу).

Дарэчы, чаму паганскае свята атрымала назву «Купалле»? Некаторыя даследчыкі лічаць, што слова бярэ пачатак ад асновы «куп» — купаць. Ёсць і пацвярджэнне такой версіі — абавязковае ранішняе купанне. З другога пункту гледжання, слова «купалле» паходзіць ад «укупе», «купна», гэта значыць — разам. Прыхільнікі апошняй версіі лічаць, што Купалле было сімвалам яднання ў прыродзе — вады і сонца, ночы і дня, вады і людзей, мужчыны і жанчыны.

Напэўна, сёння тыя спрэчкі не такія ўжо і важныя. Галоўнае — у іншым: старажытнае свята (дарэчы, як і тыя нямногія, што яшчэ застаюцца ў нашай памяці) можа адысці ў нябыт. Вельмі шкада, калі цені паганскіх капіш-

чаў назаўсёды знікнуць у яркім святле сучаснай цывілізацыі. Гэта будзе яшчэ адной, няхай і маленькай, але трагедыяй беларусаў і ўсіх славян.

Ці ж можна дапусціць усё гэта?

## Крыніцы


*Арлоў, У.А. Таямніцы полацкай гісторыі /У.А. Арлоў. — Мінск, 1994.*

*Барташэвіч, Г.А. Магічнае слова /Г.А. Барташэвіч. — Мінск, 1990.*

*Белорусы /отв. ред. В.И. Бондарчик, Р.А. Григорьева, М.Ф. Филиппенко. М., 1998.*

*Бессонов, П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с оценками народного обряда, обычая и всего быта /П. Бессонов. — М., 1871.*

*Довнар-Запольский, М.В. Исследования и статьи /М.В. Довнар-Запольский. — Киев, 1905.*

*Дучыц, Л.У. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў /Л.У. Дучыц. — Мінск, 1993.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. — Т. 3. Минск, 1993.*

*Каганец, К. Творы /К. Каганец. — Мінск, 1979.*

*Казакова, І.В. Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры /І.В. Казакова. — Мінск, 1997.*

*Караткевіч, У. Збор твораў. У 8 т. Т. 8. Кн. 1. Зямля пад белымі крыламі. — Мінск, 1990.*

*Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны /Э.А. Ляўкоў. — Мінск, 1992.*

*Носова, Г.А. Язычество в православии /Г.А. Носова. — М., 1975.*

*Полное собрание русских летописей. Т. 35. — Минск, 1975.*

*Рыбаков, Б.А. Язычество древних славян /Б.А. Рыбаков. — М., 1981.*

*Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. — Мінск, 1990.*

*Тавлай, Г.В. Белорусское купалье: Обряд, песня /Г.В. Тавлай. — Минск, 1986.*

*Тарасаў, К. Памяць пра легенды /К. Тарасаў. — Мінск, 1990.*

*Тимощук, Б.А. Языческие святилища древних славян /Б.А. Тимощук. — М., 1993.*

*Цярохін, С.Ф. Перунова цяпельца /С.Ф. Цярохін. — Мінск, 1993.*

*Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю /П.М. Шпилевский. — Минск, 1992.*

## «...І ПАЎСТАЎ ПАМОРАК ВЯЛІКІ»

Лета 1346 года не абяцала генуэзскаму гандлёваму люду, што атабарыўся ў генуэзскіх калоніях золатаардынскага Крыма, нічога добрага. Ужо першыя караваны, што прыйшлі ў Кафу з Сарай-Берке і Харэзма, прынеслі благія весткі. Справы ў хана Джанібека, што ўсяго чатыры гады таму стаў гаспадаром у Сарай-Берке, ідуць не лепшым чынам. Хістаецца золатаардынскі трон пад сынам слаўнага Узбека, які ўмеў трымаць сваіх васалаў жалезнай рукой. А цяпер вось многія царэвічы з роду Узбека пачалі квапіцца на золатаардынскі пасад і нават не хаваюць сваіх хцівых намераў. Джанібеку ўсё цяжэй стрымліваць іх памкненні. Чым заткнуць горла неразумным хціўцам, як адцягнуць іх увагу ад спакусы? Выйсце адно: удалы набег і багатая здабыча, якая ўлагодзіць нават самых няўрымслівых. А дзе ўзяць яе, гэту здабычу, як не ў багатых генуэзскіх калоніях, што яшчэ з часоў легендарнага Батыя бойка гандлююць з усім светам... Так што не сёння-заўтра трэба чакаць пад сценамі Кафы джанібекавых туменаў, а можа, і аглана — галоўнага начальніка аб'яднанага мангольскага войска. Наўрад ці ханскі намеснік у Крымскім юрце будзе супраць таго, каб ваяры Джанібека сапсавалі генуэзцам сёлетні гандлёвы сезон. Так што трэба рыхтавацца да самага горшага — доўгай і цяжкай аблогі...

Разам з весткамі пра немінучы паход манголаў на Кафу гандлёвыя людзі прынеслі яшчэ адну страшную навіну: у далёкім Кітаі лютуе «чорная смерць», якая ўжо выкасіла ці то дзесяць, ці то пятнаццаць мільёнаў чалавек. Кітай, вядома ж, далёка, але чума аб'явілася і за Каспіем, а таксама ў Арменіі, у землях Абазінскай, Яскай і Чаркескай. І

што самае горшае — у самой Ардзе, пры вусці Дона, у Бездзежы, Астрахані і нават у Сараі. А гэта ўжо зусім блізка ад сытай і спакойнай Кафы.

Праз які тыдзень пад сценамі калоніі і на самай справе з'явіліся мангольскія дазорцы. А праз колькі дзён Кафа ўжо была шчыльна абложана манголамі з усіх бакоў.

Аблога абяцала быць доўгай. Кафскія муры былі непрыступныя, правіянту і вады ў калоніі не бракавала, да таго ж генуэзцы не толькі лічыліся добрымі купцамі, але і ўмелі трымаць у руках зброю. Пасля некалькіх няўдалых спроб адолець сцены Кафы залатаардынскія ваяры пачалі наракаць: узяць багатую здабычу імклівым набегам не выпадала. А ў адзін са спякотных дзён абложаны лагер абляцела страшная вестка: у мангольскім войску — «чорная смерць»!

Супраць чумы былі бяссільныя нават жалезныя стэпавыя вершнікі. Яшчэ колькі дзён — і яна пачне бязлітасна касіць ваяроў, і толькі Алах, калі яму стане заўгодна, здольны спыніць жудасную пошасць. Але ці будзе на тое яго воля? А можа, ён, Алах, падкажа, што рабіць, калі багатая здабыча становіцца недасягальнай мрояй?

Хто ведае, можа, і Алах падказаў манголам, як адолець няверных. Але неяк раніцой абаронцы Кафы знайшлі на вуліцах горада некалькі трупаў мангольскіх ваяроў, якіх ужо, відавочна, кранула крыло «чорнай смерці».

Ні самы адчайны штурм, амаль нішто не магло пахіснуць волю генуэзцаў да супраціўлення залатаардынцам. Але пагроза «чорнай смерці» многіх з іх пазбавіла і волі, і розуму. Ужо ноччу ад прычалаў Кафы адплылі першыя галеры, бітком набітыя дрыжачымі ад страху каланістамі, якія захапілі з сабой толькі харч, пітво і золата.

Яны ратаваліся ад «чорнай смерці». Але на палубах і ў трумах галеры ўжо неслі ў Еўропу «чорную смерць».

«Генуэзскія караблі, — занатаваў у «Гісторыі дзяржавы Расійскай» Мікалай Карамзін, — прывезлі яе (чуму. — С.А.) у Італію, дзе, як і ў Францыі, Англіі, Германіі, цэлыя гарады апусцелі. У Лондане на адных з могілак было пахавана 50 000 чалавек. У Парыжы роспачны народ патрабаваў пакарання смерцю ўсіх жыдоў, думаючы, што яны сыплюць атруту ў калодзежы. У 1349 годзе пачалася



Танец смерці. Гравюра М. Вольгемута і В. Плейдэнвурфа з «Сусветнай хронікі» Г. Шэдэля. 1493 г.

пошасць і ў Скандынавіі; адтуль ці з Нямецкай зямлі перайшла яна ў Пскоў і Ноўгарад: у першым праявілася вясною 1352 года і лютавала ад зімы з такою сілаю, ледзь засталася трэць жыхароў. Хвароба выявілася язвамі ў мяккіх ямінах цела, чалавек харкаў крывёю і на другі ці на трэці дзень канаў. Нельга, кажуць летапісцы, уявіць відовішча настолькі жахлівага: юнакі і старыя, мужы і жонкі, дзеці ляжалі ў трунах адзін каля другога; у адзін дзень знікалі сем'і шматлікія...

Хутка «чорная смерць» наведала і Ноўгарад, дзе ад 15 жніўня да Вялікадня памерла мноства людзей. Тое ж было і ў другіх абласцях расійскіх: у Кіеве, Чарнігаве, Смаленску, Суздалі не засталося ніводнага жыхара...»

У 1360 годзе чума зноў выкасіла Пскоў. Яшчэ праз чатыры гады купцы завезлі яе з нізоўяў Дона ў Ніжні

Ноўгарад, Каломну, Пераяслаў, дзе штодзённа канала ад 20 да 100 чалавек. У 1365 годзе пошасцю былі ахоплены Растоў, Цвер, Таржок, Масква. Смаленск яна наведвала тройчы; у выніку ў жывых у горадзе засталося толькі пяць жыхароў, якія, як сведчаць летапісы, «выйшлі і зачынілі горад, напоўнены трупамі».

Сучаснікі так апісвалі сімптомы чумы: «Раптам ударыць як нажом у сэрца, у лапатку ці паміж плячамі; агонь палае ўнутры; кроў цячэ горлам; выступае моцны пот, пачынаецца дрыготка. У другіх робяцца язвы на шыі, сцягне пад скулою, пазухаю ці за лапаткаю. Вынік адзін: смерць непазбежная, хуткая, але пакутлівая...»

«Чорная смерць» лютавала ў Еўропе з 1347 па 1374 год. Гэта эпідэмія чумы была жахлівейшай у еўрапейскай гісторыі і каштавала жыцця кожнаму трэцяму еўрапейцу — 25 мільёнам чалавек.

Натуральна паўстае пытанне: у якой меры пацярпелі ад «чорнай смерці» землі тагачаснага Вялікага княства Літоўскага, дзе за два гады да агульнаеўрапейскага паморку ўладаром стаў знакаміты Альгерд?

Карта распаўсюджання эпідэміі, змешчаная ў «Гісторыі Еўропы» Жака Альдэбера і інш., сведчыць, што межаў Вялікага княства Літоўскага «чорная смерць» дасягнула недзе паміж 1351 і 1353 гадамі. У суседніх з Княствам Пскове, Ноўгарадзе, Цверы, Таржку яна неаднойчы лютавала ў перыяд з 1352 па 1387(!) год. Калі верыць згаданай вышэй карце, страшная пошасць абмінула толькі землі Каралеўства Польскага (абшары ў міжрэччы Лабы, Одры і Віслы). Ускосныя звесткі пра тое, што паморкі былі ў той перыяд і ў Вялікім княстве Літоўскім, ёсць. Прынамсі, аб гэтым сведчаць некаторыя сучасныя даследчыкі. Як вядома, у 1350-ыя гады досыць актыўна сапернічалі паміж сабой Пскоў і Полацк, які на той час ужо ўваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага. Вось што піша Мікола Ермаловіч: «... Паміж Полацкай і Пскоўскай землямі разгарэлася жорсткая барацьба, бо ў 1358 г. пскоўскі князь Астафій з войскам хадзіў да Полацка і парабаваў яго воласці. Мабыць, такія ўзаемныя паходы былі б часцейшымі, каб не паморкі, якія ахаплівалі Пскоў-

скую зямлю ў 1352 і 1360 гг. Не выключана, што ад гэтага пацярпела і Полацкая зямля...»

Цяжка не пагадзіцца з Міколам Ермаловічам, бо кантакты паміж суседзямі (і ваенныя, і гандлёвыя, і простыя чалавечыя), безумоўна, былі вельмі цеснымі. І малаверагодным было б, калі паморкі, што лютавалі ў тым жа Пскове (і другіх памежных з Вялікім княствам Літоўскім гарадах), ніякім чынам не закранулі хаця Полацк.

Так, паморкі — адгалоскі агульнаеўрапейскай эпідэміі — у Вялікім княстве Літоўскім усё ж былі. Гэта пацвярджае і Вітаўт Чаропка, які піша: «Новы, 1360 год прынёс на Літву бяду. У гарадах і сёлах лютаваў мор. Тысячы людзей забірала ў магілу смерць».

Трэба ўлічваць і яшчэ адну акалічнасць. Большасць так званых літоўска-беларускіх летапісаў складалася значна пазней трагічных часоў «чорнай смерці», і ўказаныя ў іх даты некаторых падзей могуць не адпавядаць сапраўднасці. Вось як, напрыклад, апісваюцца падзеі 1320 года ў Хроніцы літоўскай і жамойцкай (складзенай, дарэчы, у XVII стагоддзі, каля 300 гадоў пасля часоў «чорнай смерці»): «Дзве каметы ў дзень Раства Хрыстова за тры месяцы разам паказаліся, і каметы аж да апошняга дня месяца лютага палалі на небе, потым быў вялікі голад у Польшчы, у Русі, у Літве і іншых краінах прылягаючых такі, што людзям зёлак, карэння з зямлі і іншага пракорму не хапала, маткі і бацькі ўбогія дзяцей сваіх елі, другія трупы памёршых і розны гной і плюгаўствы людскія елі, і голад невыносны свой тым наталялі нават: дзе ішоў хто, або муж які сам, або жанчына якая, хлопец або дзеўка вуліцаю, выскоквалі з хат, з двароў другія людзі, хапалі іх, забівалі і елі. Гэты голад два гады цэлых трымаўся».

Не выключана, што падзеі, пазначаныя ў Хроніцы пад 1320 годам, адбываліся значна пазней, магчыма, падчас згаданай ужо эпідэміі чумы, якая, як ужо гаварылася, дасягнула межаў Вялікага княства Літоўскага недзе ў 1350-ыя гады і якой папярэднічаў страшэнны голад — заўсёдны спадарожнік любога тагачаснага паморку.

Дарэчы, падчас работы над гэтым нарысам аўтару давялося сутыкнуцца з яшчэ адным несупадзеннем, на гэты

раз адваротнага плану. Як ужо згадвалася, Каралеўства Польскае, калі верыць карце з «Гісторыі Еўропы» Жака Альдэбера, пазбегла трагічных наступстваў «чорнай смерці» 1347—1374 гадоў. Але ці так было на самай справе?

Вось пра што, напрыклад, сведчыць Летапіс Панцырнага і Аверкі: «Року 1358. Пошасць амаль шэсць месяцаў лютавала і палову палякаў вымерла найлепшай шляхты і мяшчан заможных. У самім Кракаве 20 тысяч людзей вымерла».

Вось вам і не пацярпеўшае ад чумы Каралеўства Польскае!..

Эпідэмія чумы другой паловы XIV стагоддзя была, безумоўна, самай жахлівай у сярэдневяковай Еўропе. Аб гэтым, напрыклад, сведчыць дайшоўшы да нас Жыццяпіс папы рымскага Клімента VI: «У год 1348 ад нараджэння Хрыстова амаль па ўсёй паверхні зямлі назіраецца такая смяротнасць, якой раней не бачылі. Жывых ледзь хапала, каб закапаць мёртвых, бо жывыя адварочваліся ад іх з агідаю. Страшэнны жах авалодаў усімі, што калі ў кагонебудзь з'яўлялася язва або пухліна звычайна ў пахвіне ці падпасе, то гэтаму чалавеку не аказвалі ніякай дапамогі, і родныя адварочваліся ад яго... і многія паміралі ад таго, што ім адмаўлялі ў лячэнні... Многіх яшчэ, якіх лічылі асуджанымі... на смерць... адвозілі да ямаў, дзе іх закопвалі, і многія былі пахаваны зажыва... і чума гэтая працягвалася два гады запар...» (Нагадаем, што Жыццяпіс быў, верагодна, складзены ў Авіньёне, на поўдні Францыі, дзе з 1309 па 1377 год знаходзілася рэзідэнцыя папы рымскага.)

Што ж стала прычынай гэтай пан'еўрапейскай катастрофы, што пасадзейнічала таму, што завезеная з Кафы «чорная смерць» ахапіла ўвесь кантынент? Гэтаму паспрыяла спалучэнне цэлага шэрагу фактараў. Бадай што, галоўны з іх — Стогадовая вайна (1337—1453), у якую былі ўцягнуты Англія, Францыя, Фландрыя, Шатландыя, Германія, Бургундыя. Якраз у яе разгар і ўспыхнула жудасная эпідэмія. Да цяжкіх наступстваў вайны дадаўся нябачаны раней збожжавы крызіс, які ўдарыў па най-

больш абяздоленых слаях насельніцтва. Чума найперш паражала тых, хто недаядаў і, натуральна, быў найбольш уразлівым.

Дарэчы, адным з наступстваў эпідэміі стала ўспыхнуўшае ў Францыі ў 1358 годзе грандыёзнае сялянскае паўстанне, вядомае пад назвай Жакерыя, у якім удзельнічала 100 тысяч чалавек — колькасць па тым часе велізарная.

Жахаючыся з катастрафічных наступстваў эпідэміі 1347—1374 гадоў, трэба мець на ўвазе, што паморкі ад чумы, воспы, халеры, дызентэрыі і нават грыпу наведвалі Еўропу, у тым ліку і абшары паміж Бугам і Дняпром, як раней, так і пазней апісаных вышэй падзей.

У згаданай ужо «Гісторыі дзяржавы Расійскай» ёсць сведчанні, што «ў 1187 годзе лютавала нейкая агульная хвароба ў гарадах і сёлах; летапісцы кажуць, што ніводзін дом не пазбегнуў заразы, і ў многіх некаму было прынесці вады». Ці яшчэ: «У 1318 годзе лютавала ў Цверы нейкая бязлітасная, смертаносная хвароба».

У Летапісе Панцырнага і Аверкі ёсць сведчанне, што «паморак быў у тыя гады цяжкі ў Польшчы року 1205». Там жа ёсць спасылкі на тое, што Польшча цярпела ад пошасцей у 1210, 1211, 1314, 1315, 1318 гадах. Дарэчы, калі верыць летапісу, ад паморку 1318 года акрамя Польшчы пацярпелі таксама Прусы, Літва, Белая Русь і, што адзначана асобна, Віцебск. У таго ж Мікалая Карамзіна ёсць сведчанне, якое тычыцца бацькі знакамітага Давыда Гарадзенскага князя Даўмонта, які ў 1299 годзе «...сканаў ад нейкай заразлівай хваробы, смертаноснай тады для многіх пскавіцян».

Не можа не прыцягнуць нашай увагі і сведчанне, сустрэтае аўтарам у двух летапісах — Валынскім кароткім і Радзівілаўскім. Яно тычыцца падзей 1092 года ў Полацку. Вось што, напрыклад, занатаваў Радзівілаўскі летапіс: «Цуд быў у горадзе Полацку, чуцен быў ноччу тупат, енкі па вуліцах, нібы чалавечыя, гойсалі бесы. І калі хто вылазіў з хаты, жадаючы бачыць, то ўражаны былі нябачна ад бесаў язваю і з таго паміралі, і не смелі выходзіць з хатаў...»



Бесы на вуліцах Полацка ў 1092 г. (магчыма, алегорыя тагачаснага паморку). Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу. Канец XV ст.

Валынскі кароткі летапіс назваў дзіўныя падзеі «карай на палачанаў», у выніку якой «былі ўражаны людзі полацкія і з таго памiралі».

Дык што ж здарылася ў Полацку больш за дзевяцьсот гадоў таму? Некаторыя сучасныя даследчыкі лічаць, што летапісныя расказы пра «полацкія дзівосы» — нішто іншае як своеасаблівае выказванне варожасці Кіева і яго ўладароў да незалежнай палітыкі, якую праводзіў у тыя часы Полацк і яго гаспадар — князь Усяслаў Брачыславіч. Безумоўна, гэта меркаванне мае пад сабой грунт. Але не ўступаючы ў палеміку з прыхільнікамі гэтага меркавання, хацелася б выказаць і такі пункт гледжання: не выключана, што летапісцы занатавалі паморак, які абрынуўся на Полацк у 1092 годзе, бо, як працягваў, апісаўшы полацкія падзеі, той жа Радзівілаўскі летапіс, «у гэтыя ж часы многія людзі памiралі ад розных хваробаў».

Думаецца, што абодва меркаванні якраз не выключаюць адно другое: у 1092 годзе ў Полацку сапраўды лютаваў нейкі паморак (калі мець на ўвазе ўспамін пра «язвы», то, хутчэй за ўсё, гэта была чума), а летапісцы засведчылі, што «полацкія дзівосы» былі Божай карай за «грахі нашы і няпраўды», якія навёў Бог на людзей полацкіх, «наказ-

ваючы ім пакаянне мець і пазбавіцца ад граху, і ад зайздрасці, і ад іншых злых спраў непрыязных».

Занатоўваючы падзеі XV—XVIII стагоддзяў, летапісы досыць часта ўзгадваюць паморкі на абшарах Вялікага княства Літоўскага. Аналіз летапісаў прыводзіць да высновы, што розныя пошасці, якія час ад часу лютавалі тут, па сваіх негатыўных наступствах саступалі, бадай што, толькі ваенным бедствам. Дарэчы, досыць часта няшчасці крочылі поруч.

Каб мець лепшае ўяўленне, так бы мовіць аб эпідэміялагічным становішчы ў тагачасным Вялікім княстве Літоўскім, перагорнем разам з вамі старонкі летапісаў.

Летапіс Панцырнага і Аверкі сведчыць: «Року 1424. Такі цяжкі быў паморак, што Уладзіслаў Ягела з князем Вітаўтам хаваліся ў лясах».

Працягвае жудасны мартыралог Яўрэінаўскі летапіс: «Лета 1434... І многа ліха ў той год учынілася ва ўсёй зямлі Літоўскай... і паморкі былі моцныя».

А вось сведчанне з Хронікі літоўскай і жамойцкай: «Року 1448. Голад быў вельмі вялікі ў Літве, такі, што людзей па сёлах елі сабакі, свінні, ваўкі, мядзведзі, памёршых, што не было каму хаваць, бо пасля голаду паўстаў паморак вялікі і ў самім месце Смаленску трупы людскія сабакі цягалі, і з голаду вялікага людзі людзей елі, таксама маці дзяцей сваіх».

Звяртае на сябе ўвагу запіс з Летапісу Рачынскага: «Лета Божага нараджэння 1506. Кароль Аляксандр расхварэўся, бо яго паморак парушыў». Адсюль не выключана, што ўладар Вялікага княства Літоўскага стаў ахвярай чарговай эпідэміі, што наведала ў той час Літву.

Вельмі верагодна, што паморак каштаваў жыцця яшчэ аднаму знакамітаму чалавеку. Спалучым у адно два летапісныя факты. Хроніка літоўская і жамойцкая сведчыць, што ў 1530 годзе «...у Вільні пошасць маравая... панавала». Яе дапаўняе Яўрэінаўскі летапіс: «Пасад і горад Віленскі гарэў лета Божага нараджэння 1530-га... А князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі памёр лета Божага нараджэння 1530-га, жніўня месяца».

Калі верыць Вітаўту Чаропку, Канстанцін Астрожскі памёр 8 жніўня 1530 года ў Тураве. Але Алег Лойка ў рамане «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае» сцвярджае, што славуты палкаводзец сканаў «у Віленскіх палацах падчас мору».

Занатаваны паморкі і ў Баркулабаўскім летапісе: «Року Божага нараджэння 1588... у збожжы няўрод, голад моцны, дарагоўля моцная, паморкі, пошасці... Таго ж року 88 у месце Віленскім там у тых краях, таксама ў Кіеве і ў многіх краінах вялікі паморак быў».

У Віленскі паморак 1588 года тамтэйшыя езуіты выказалі невымерную самаахвярнасць, змагаючыся з наступствамі эпідэміі. Ратуючы хворых, мужныя манахі самі амаль усе сталі ахвярамі эпідэміі.

Страшнымі паморкамі быў пазначаны ў Вялікім княстве Літоўскім пачатак XVII стагоддзя. Няўрод 1601 года, голад наступнага, 1602-га далі свой жудасны плён, які засведчыў Баркулабаўскі летапіс: «Таго ж року 1603. У месце Віленскім, у Менску, у Радашковічах, на Оршы, у Шклове і па іншых многіх замках быў паморак вялікі ў пост Піліпаў; а ў якіх замках паморку не было, у тых месцах па дарогах, па вуліцах стражу вялікую дзень і ноч мелі аж да Раства Хрыстова...»

Летапіс малюе жахлівыя карціны эпідэміі: «Страшна было бачыць, як па вуліцах, па дарогах, па гумнах, у равах сабакі мёртвых многіх целы елі», «па пяць, па трыццаць у яму хавалі», «страх бачыць гневу божага».

Згаданы вышэй паморак, відаць, так уразіў летапісца, што некалькі наступных гадоў той, быццам не верачы ў адсутнасць якіх бы то ні было катаклізмаў, штогод занатоўваў: «Той рок з ласкі Божай быў здаровы на людзі...» Але ўжо ў 1608 годзе яму давялося запісаць: «Многа дзетак малых з воспы памёрла».

Многія віленчукі ратаваліся ад «чорнай смерці» ў храмах і там паміралі. Пахаванні ахвяр чумы (відаць, эпідэміі 1661 года) да сённяшняга дня захаваліся ў сутарэннях царквы Святадухава манастыра.

Пачатак наступнага, XVIII стагоддзя быў азмрочаны не толькі крывавай віхурай Паўночнай вайны, але і пры-

шэсцем заўсёдных спадарожнікаў ваенных бедстваў — паморкаў. Іх занатаваў ужо згаданы Летапіс Панцырнага і Аверкі. Пошасць 1709 года выкасіла 10 тысяч жыхароў Львова. Праз год ахвярамі паморку сталі 26 тысяч гданьскіх месцічаў і 12 тысяч насельнікаў Вармії. У гэты ж час «чорная смерць» прыйшла і на нашу зямлю. Летапісец засведчыў: «Року 1710. Маравая пошасць лютавала ў Віцебску год цэлы»; «у Вільні хрысціян вымерла 20 тысяч, жыдоў чатыры тысячы».

Паморак вясны 1708 года ў Вільні згадвае Адам Кіркор у «Живописной России»: «Зноў голад, маравая пошасць, пажары! Адных езуітаў загінула 117 чалавек. Налічваюць да 34 000 загінуўшых жыхароў. Людзі елі сабак, кошак, мышэй. У ваколіцах злоўлена 8 чалавек, якія, забіўшы сваіх жонак і дзяцей, з'елі іх трупы, а потым нападалі на праезных, забівалі і пажыралі».

Апісанне ўсіх жудасцей можна было б працягваць бясконца: прыкладаў, на жаль, досыць. Але самае страшнае тое, што няшчасныя людзі былі зусім безабаронныя перад паморкамі. «Чорная смерць» забірала столькі ахвяраў, колькі ёй было патрэбна. Тая ж чума ў бубоннай



Паморак у Вільні ў 1708 г. Малюнак Ф. Пелікана з гравюры ксяндза Кварэнгі. 1798 г.

форме (яе распаўсюджвалі пацукі) забірала 80 працэнтаў захварэўшых, а ў лёгачнай форме (яна перадавалася ад чалавека да чалавека) — усе 100 працэнтаў.

Падчас эпідэмій звар'яцелыя ад жаху людзі ў лепшым выпадку лічылі паморкі Божай карай, а ў горшым — спісвалі іх на яўрэяў, якія быццам бы склалі змову і атручваюць калодзежы, каб знішчыць усіх хрысціян. Вынікам людскога невуцтва і жывёльнага жаху былі жудасныя яўрэйскія пагромы. Напрыклад, падчас паморку ў французскім горадзе Сен-Вельтэн 14 студзеня 1493 года 2000 яўрэяў, «вінаватых» у ім, спалілі жывымі.

Дарэчы, менавіта пасля эпідэміі чумы XIV стагоддзя, а канкрэтна — з 1350 года яўрэям у Заходняй Еўропе дазвалялі жыць толькі ў спецыяльна вызначаных гарадскіх кварталах, якія атрымалі назву «гета». Тагачасны пераслед яўрэяў, дарэчы, выклікаў іх масавыя перасяленні ў Польшчу і Вялікае княства Літоўскае, дзе цемрашалаў, відаць, было менш.

Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што людзі спрабавалі ажыццяўляць нейкія прафілактычныя меры падчас эпідэмій. Каб пазбегнуць заражэння чумой, у сярэдневяковай Еўропе, напрыклад, абкурвалі памяшканні, палячы палын, мяту, дзягілевы корань, ягады ядлоўцу, або выкарыстоўвалі камфару.

Продкі ж беларусаў падчас паморкаў звычайна апелявалі да Бога, а то і да звышнатуральных сіл, якія, на іх думку, толькі і маглі абараніць іх ад страшнай бяды. Калі чалавека апаноўвала якая-небудзь пошасць, напрыклад тая ж чума, мясцовы шаптун тварыў над ім замову: «Чума-чумішча, ведзьма-вядзьмішча, сучка-сучышча, ідзі ты на мох, на балоты, на сухі лес, на чортавую люльку ад раба Божага, ад ягонай жоўтай косткі і чырвонай крыві. Хух, святы дух!»

Існавалі і другія сродкі, так бы мовіць, калектыўнай абароны ад паморкаў. Прадвесцем бяды лічылася так званая маравая панна — маладая жанчына з чорнай хусткай у руцэ, якая быццам бы лятала па небе над асуджаным на паморак населеным пунктам. Найперш бяда па-

гражала той хаце, у вакно ці дзверы якой маравая панна прасуне руку і ўзмахне хусткай. Таму людзі падчас эпідэмій старанна зачынялі дзверы і вокны.

Ратаваліся і па-іншаму. Дзяўчаты, сабраўшыся познім вечарам у адной з хат, павінны былі за ноч саткаць палатно, з якім з узыходам сонца яны хадзілі з тужлівым спевам вакол вёскі. Пасля пад палатном, якое трымалі ў руках, разводзілі касцёр з трэсак, прынесеных з кожнага двара. Праз своеасаблівую вогненную браму павінен быў прайсці кожны жыхар. Напрыканцы на кастры спальвалі і само магічнае палатно.

Яшчэ ў канцы XIX стагоддзя з маравой паннай змагаліся з дапамогай абворвання паселішчаў. У саху запрагалі трох голых цнатлівых дзяўчат, якія ў суправаджэнні старых жанчын, што ўзнімалі неверагодны лямант, каб адагнаць маравую панну, павінны былі праклясці вакол вёскі разору.

Былі і больш «цывілізаваныя» сродкі абароны ад эпідэмій: усталяванне на рагах паселішча так званых збярог-камянёў з выбітымі на іх шасціканцавымі праваслаўнымі крыжамі. Адзін з такіх камянёў захаваўся каля вядомай вёскі Крэва. Лічыцца, што яго ўсталявалі падчас эпідэміі халеры 1871 года.



Збярог-камень з в. Крэва (Смаргонскі раён). Усталяваны падчас эпідэміі халеры 1871 г.

На жаль, усё гэта дапамагала мала. Заразіўшыся чумой або халерай, чалавек быў, за рэдкім выключэннем, асуджаны на смерць.

Больш-менш паспяхова змагацца з паморкамі людзі навучыліся толькі ў другой палове XIX стагоддзя, а пра перамогу над некаторымі страшнымі хваробамі ўрачы загаварылі яшчэ праз некалькі дзесяцігоддзяў. Але ці можна быць упэўненым, што тыя перамогі — канчатковыя?..

Ёсць сведчанні пра эпідэміі, што адбываліся на Беларусі, і не ў такі ўжо далёкі час. Так, напрыклад, у 1893 годзе параходы з Кіева завезлі ў Пінск халеру. Эпідэмія хутка распаўсюдзілася па Мінскай губерні, ахапіўшы Пінскі, Бабруйскі, Рэчыцкі, Мазырскі, Ігуменскі, Барысаўскі і Навагрудскі паветы. Было выяўлена 1311 хворых, 527 з іх (40 працэнтаў) памёрлі.

Эпідэмія халеры, якая распаўсюдзілася па той жа Мінскай губерні ў 1910 годзе, уразіла 1315 чалавек. Ахвярамі паморку сталі 456 чалавек (кожны трэці з захварэўшых).

Лічбы, безумоўна, не такія жахлівыя, як у XIV—XVIII стагоддзях, але досыць красамоўныя. І ў недалёкім XIX стагоддзі паморкі былі страшным бедствам. Але, на шчасце, мясцовыя ўлады і медыкі навучыліся іх лакалізаваць.

Дарэчы, з паморкам звязана і гісторыя ўзвядзення аднаго з адметных архітэктурных помнікаў беларускай сталіцы — касцёла Святога Роха.

Далёка не ўсе ведаюць, што якраз святы Рох вядомы ў католікаў як абаронца людзей і жывёл ад паморкаў. Мінскі краязнавец Васіль Каляда занатаваў наступнае паданне. У сярэдзіне XIX стагоддзя ў Мінску лютавала халера, якая забрала шмат ахвяраў. Многіх з памёршых хавалі на каталіцкіх могілках. Пасля аднаго з адпяванняў ксёндз, зняўшы рызу, паклаў на яе некалькі залатых манет. Тое ж зрабілі і прысутныя парафіяне. Хутка на рызе вырасла цэлая залатая горка з ахвяраваных грошай. На іх і пабудавалі ў 1861—1864 гадах касцёл, асвечаны ў гонар святога Роха...

## Крыніцы


*Арлоў, У.А. Таямніцы полацкай гісторыі /У.А. Арлоў.— Мінск, 1994.*

*Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.*

*Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды /М.І. Ермаловіч. — Мінск, 1990.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. Т. 3. — Минск. 1994.*

*Карамзин, И.М. Предания веков /И.М. Карамзин. — М., 1988.*
*Лойка, А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае /А. Лойка. — Мінск, 1990.*
*Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны /Э.А. Ляўкоў. — Мінск, 1992.*
*Полное собрание русских летописей. Т. 1—2. — М., 1962.*
*Полное собрание русских летописей. Т. 32. — М., 1975.*
*Полное собрание русских летописей. Т. 35. — М., 1980.*
*Полное собрание русских летописей. Т. 38. — М., 1989.*
*Чаропка, В. Імя ў летапісе /В. Чаропка. — Мінск, 1994.*
*Чаропка, В. Уладары Вялікага княства /В. Чаропка. — Мінск, 1996.*

# «АДВЕДАЎ ПАН БОГ ГОРАД АГНЁМ...»

«Тым часам бушуючая стыхія захоплівала ўсё новыя ўчасткі. Не магло быць сумненняў, што нечыя злачынныя рукі падпальваюць горад, таму што новыя ачагі пажару ўспыхвалі ў месцах, размешчаных далёка ад галоўнага яго ачага. З пагоркаў, на якіх размяшчаўся Рым, патокі полымя сцякалі, накшталт хваляў марскіх, у даліны, густа забудаваныя пяці- і шасціпавярховымі дамамі, мноствам хлявоў, крамаў, драўляных перасоўных амфітэатраў... і, нарэшце, складаў з дровамі, аліўкавым алеем, збожжам... Там было багата гаручага матэрыялу, гулкія выбухі ішлі адзін за адным, і пажар з незвычайнай хуткасцю ахопліваў цэлыя вуліцы...

Ніколі яшчэ з часоў нашэсця галаў пад правадырствам Брэна не спасцігала Рым падобнае бедства. Многія з адчаем параўноўвалі той і гэты пажары. Але тады, прынамсі, ацалеў Капітолій. Цяпер жа і Капітолій быў абкружаны злавесным вогненным вянцом. Мармур у агні не гарэў, але па начах, калі вецер на імгненне разганяў языкі полымя, відно было, што  рады калон храма Юпітэра, які стаяў наверсе, раскаліліся і свецяцца чырванаватым святлом, накшталт тлеючага вугалля...

З чатырнаццаці акруг Рыма ацалелі ледзьве чатыры, з улікам Зарэчча. Астатнія знішчыла полымя. Калі кучы вугалля ператварыліся нарэшце ў попел, ад Тыбра да Эсквіліна вачам адкрывалася вялізная, шэрая, панурая, мёртвая пустыня, дзе тырчалі рады пячных трубаў, нагадваючы намагільныя калоны. Пасярод гэтых калон туляліся людзі з тужлівымі тварамі; яны шукалі дарагія сэрцу рэчы або косці родных. Па начах на папялішчах вылі сабакі...»

Гэта радкі з рамана знакамітага польскага пісьменніка Генрыка Сянкевіча «Куды ідзеш» («Камо грядеши» або «Quo vadis»). У таленавітым творы, за які ў 1905 годзе аўтар атрымаў Нобелеўскую прэмію, ён адмысловымі фарбамі намаляваў грандыёзны пажар, які ў ліпені 64 года н.э. амаль поўнасцю знішчыў найвялікшы горад тагачаснага свету — Рым. Велізарны мегаполіс гарэў дзевяць дзён запар, і спробы выратаваць яго сталіся марнымі. Асаблівы трагізм жахлівага бедства, якое ўвайшло ва ўсе падручнікі па гісторыі Старажытнага Рыма, у тым, што сталіца магутнай імперыі была фактычна сцёрта з твару зямлі не ў выніку варожага нападу, а ў мірны час. Больш за тое, хадзілі чуткі, што горад быў падпалены па загаду Нерона — жорсткага, самаўлюбёнага і разбэшчанага рымскага імператара, які такім жудасным спосабам вырашыў увайсці ў гісторыю.

Ператварэнне ў попел заваяваных гарадоў ва ўсе часы было звычайнай практыкай. Асабліва тады, калі мэтай ваеннага паходу з'яўлялася не пашырэнне падуладных зямель, а захоп багатай здабычы і палонных, якіх потым ператваралі ў рабоў. У большасці выпадкаў уварванне заваёўнікаў у горад пачыналася крывавай разнёй і рабаўніцтвам і заканчвалася яго руйнаваннем і спаленнем. Гісторыя таго ж Старажытнага Рыма досыць багатая на падобныя прыклады: рабавалі і палілі рымляне, палілі і рабавалі саміх рымлян.

Пагартайце старадаўнія летапісы і амаль на кожнай старонцы іх знойдзеце дакументальныя пацвярджэнні таго, што і гісторыя ўсходніх славян не з'яўлялася якім-небудзь выключэннем з гэтага жудаснага правіла. Пусціць чырвонага пеўня пад страху суседа было самай звычайнай справай амаль для кожнага ўдзельнага князя. Літвіны палілі маскавітаў, маскавіты палілі літвінаў, крыжакі і татары палілі і тых і другіх.

Але і летапісы, і старыя кнігі данеслі да нас звесткі аб вогненных катаклізмах і іншага кшталту, якія можна паставіць у адзін шэраг са згаданым вышэй рымскім пажарам часоў Нерона. Радзівілаўскі летапіс занатаваў зусім кароценькае паведамленне: «У лета 6525 (1017 г. — С.А.) Ярас-

лаў увайшоў у Кіеў (відаць, летапісец памыліўся, бо Яраслаў сеў на кіеўскі прастол на два гады пазней. — С.А.), і пагарэлі цэрквы». Сціплую нататку дапаўняе Ніканаўскі летапіс. З яго відаць, што той кіеўскі пажар быў проста грандыёзны. Калі мець на ўвазе, што ў агні загінула каля сямісот цэркваў, то можна з вялікай доляй упэўненасці меркаваць, што ў попел ператварыўся бадай што ўвесь горад.

Той жа Радзівілаўскі летапіс ужо больш падрабязна апісвае яшчэ адну вогненную катастрофу: «У лета 6652 (1124 г. — С.А.) пажар быў вялікі ў Кіеве, і выгараў ён амаль увесь, за два дні на Падоле і на Гары цэркваў адных згарэла каля шасцісот. Здарылася гэта месяца ліпеня 23 і 24, на раство Іаана Папярэдніка».

Прыцягнулі ўвагу складальніка Радзівілаўскага летапісу яшчэ два пажары. «У лета 6701 (1193 г. — С.А.), — занатаваў ён, — быў пажар вялікі ў горадзе Уладзіміры чэрвеня 23, напярэдадні Барыса і Глеба, у чацвер, у поўнач загарэўся і гарэў амаль да вечара, цэркваў згарэла 14, а горада палова згарэла, а княжацкі двор Богам захаваны быў ад пажару».

Другое сведчанне... «У тое ж лета (1199 г. — С.А.) быў пажар вялікі ва Уладзіміры месяца ліпеня, 25 дзень, на памяць прачыстай святое Ганны, у дзень суботні, падчас літургіі, загарэўся горад, згарэла цэркваў 16, а горада амаль палова».

Уладзімірскія пажары (відаць, ужо згаданыя вышэй; праўда, пад іншымі гадамі) апісвае ў «Гісторыі дзяржавы Расійскай» Мікалай Карамзін: «Два разы гарэў пры ім (князь Усевалад III Георгіевіч. — С.А.) Уладзімір: у 1185 годзе агонь зруйнаваў там 32 царквы мураваныя і саборную, багата ўпрыгожаную Андрэем (Андрэй Багалюбскі, у 1157—1174 гадах уладзіміра-суздальскі князь. — С.А.); яе сярэбраныя панікадзілы, залаты посуд, уборы службовыя, вышытыя жэмчугам, каштоўныя абразы, парчы, куны або грошы, што захоўваліся ў цераме, і ўсе кнігі былі ахвяраю полымя. Праз пяць гадоў здарылася такое ж няшчасце для цэлай паловы Уладзіміра; ледзьве змаглі адстаяць палац княжацкі».

Год, калі ўладзімірцы з дапамогай Бога баранілі княжацкі замак, быў наогул багаты на катастрафічныя пажары. Вельмі верагодна, што прычынай іх стала небывалая і доўгая засуха. Як бы там ні было, але вогненная стыхія ў той год бушавала на ўсю моц. У Ноўгарадзе за адзін дзень згарэла 4300 дамоў. Былі поўнасцю вынішчаны агнём Старая Руса, Ладага, Растоў Вялікі.

Увайшоў у гісторыю цверскі пажар 1298 года. Разам з горадам загінуў у полымі і княжацкі палац, з якога, па сведчанні Карамзіна, «не паспелі вынесці ні серабра, ні золата, ні зброі; сам князь Міхаіл, ноччу разбуджаны агнём, ледзьве змог выратавацца з маладою жонкаю ад полымя».

Праз год моцна пацярпеў Ноўгарад, у якім агонь літаральна спапяліў многія вуліцы. Знайшліся нелюдзі, якія, карыстаючыся ўсеагульнай панікай, рабавалі маёмасць, што людзі зносілі ў цэрквы, і забівалі вартаўнікоў.

З маскоўскіх пажараў мірнага часу адным з самых жахлівых стала стыхійнае бедства, што спасцігла горад у 1366 годзе, падчас княжання Дзмітрыя Іванавіча. Многія летапісы назвалі яго «вялікім пажарам усясвяцкім», таму што ён пачаўся з царквы Усіх Святых. Усяго за дзве гадзіны агонь, які суправаджаўся страшэннай бурай, знішчыў Крэмль, Палац, Загароддзе і Зарэчча, фактычна — увесь горад, на той час поўнасцю драўляны. Менавіта «вялікі пажар» стаў тым штуршком, які прымусіў князя Дзмітрыя вясной 1367 года залажыць, нарэшце, мураваны Крэмль...

Але надышоў, відаць, час, узгадаўшы знакаміты рымскі пажар і ўспомніўшы самыя жахлівыя кіеўскія, уладзімірскія, наўгародскія, маскоўскія пажары, звярнуцца да гісторыі пажараў беларускіх. На жаль, старажытнарускія летапісы не занатавалі згадак аб «мірных» пажарах, ад якіх пацярпелі беларускія гарады. Праўда, у Іпацьеўскім летапісе ёсць сведчанне, што ў 1183 годзе ударам маланкі былі спалены Гродзенскі замак і мураваныя цэрквы, сярод якіх, верагодна, быў і знакаміты Барысаглебскі храм. Пажар, які ў 1440 годзе знішчыў Полацк, узгадвае ў кнізе «Исторические сведения о примечательнейших местах в

Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся» Міхаіл Без-Карніловіч.

Больш-менш шырокае асвятленне атрымалі пажары XVII—XVIII стагоддзяў, якія прыцягнулі ўвагу складальнікаў Віцебскага летапісу Міхала Панцырнага і Стафана Аверкі і аўтараў Магілёўскай хронікі Трафіма Сурты і Юрыя Трубніцкага. Звесткі аб пажарах у беларускіх гарадах сустракаюцца таксама ва ўжо згаданай кнізе Міхаіла Без-Карніловіча і ў трэцім томе «Живописной России». Невялікае падарожжа па старонках дакументальных крыніц мы з вамі і здзейснім, узгадаўшы найбольш значныя полацкія, віцебскія, магілёўскія пажары і некаторыя стыхійныя бедствы гэтага кшталту ў другіх беларускіх гарадах.

Пачнём з Полацка. Знішчальныя пажары, віноўнікамі якіх станавіліся самі неасцярожныя палачане, былі досыць частай з'явай у самым старажытным беларускім горадзе. Напрыклад, у 1642 годзе моцны пажар, які ўзнік, як адзначае Міхаіл Без-Карніловіч, з-за неасцярожнасці п'яных людзей у Верхнім Замку, літаральна ператварыў яго ў попел. У наступным годзе, як засведчыў Віцебскі летапіс, «горад Полацк выгараў увесь дашчэнту і да аднаго дома». Полацкі пажар 1696 года Магілёўская хроніка растлумачыла «жыдоўскім падпалам», у выніку якога «пагарэлі крамы, ад чаго багатыя купцы прыйшлі да беднасці».

Той жа Міхаіл Без-Карніловіч называе полацкія пажары 1709, 1738, 1750, 1757 і 1770 гадоў, якія, на яго думку, «моцна садзейнічалі да памяншэння ў ім населенасці». «Горад яшчэ больш збяднеў, — дадае Міхаіл Восіпавіч, — пасля пажару (маецца на ўвазе пажар 1796 года. — С.А.), які знішчыў у ім 240 дамоў».

Неасцярожнасць тагачасных палачан у абыходжанні з агнём не ведала межаў. У выніку пажар, які ахапіў горад 15 чэрвеня 1837 года, спапяліў каля трохсот дамоў. У полымі пажару 1848 года пайшлі дымам 72 дамы.

У гэтай сітуацыі не можа не выклікаць павагі пазіцыя «царскага самаўладдзя», якую выкрывалі некалі савецкія гісторыкі. Вось як, па сведчанні Часопіса Міністэрства

Унутраных Спраў (№ 30 за 1838 год), адрэагавалі ўлады на стыхійнае бедства, якое спасцігла Полацк у чэрвені 1837 года: «Для дапамогі жыхарам, якія страцілі ў ім (пажары. — С.А.) усю сваю маёмасць, выдадзена не ў залік дапамога, ад шчодрасцей манаршых 50 000 рублёў асігнацыямі; ды з сумаў Дзяржаўнага казначэйства ўсім пацярпелым ад пажару на пабудову новых дамоў выдадзена ў пазыку на 10 гадоў без працэнтаў 50 000 рублёў асігнацыямі; з выплатай іх па сканчэнні 4 гадоў, у астатнія 6 гадоў. Для пабудовы гандлёвых крамаў гораду выдадзена 50 000 рублёў асігнацыямі тэрмінам на 12 гадоў без працэнтаў (больш за тое, з жыхароў зняты налічаныя на іх нядоімкі 10 930 рублёў асігнацыямі)».

А цяпер наведаем старажытны Віцебск, гісторыю якога занатоўвалі тамтэйшыя мяшчане Міхал Панцырны і Стафан Аверка. Згодна з складзеным імі летапісам, горад выгараў у 1614, 1680, 1698, 1707, 1733, 1752, 1757 гадах. На некаторыя з стыхійных бедстваў варта звярнуць асаблівую ўвагу. Вось што, напрыклад, занатаваў Віцебскі летапіс пад 1733 годам: «Мая 31 па старым календары, на



Панарама Полацка пасля пажару. Сярэдзіна XIX ст.

восьмы дзень Божага цела, ад вялебных айцоў-бернардзінцаў, якія рабілі арган і зайгралі на цэлы свет, выгараў Віцебск, рынкі, крамы і цэрквы».

«У год 1752. Месяца жніўня, другога дня, — сведчыць Віцебскі летапіс, — ад касцёла ксяндзоў дамініканцаў выгараў замак, плябанія, царква Благавешчання, езуіты і многа дамоў».

Не прайшло і пяці гадоў, як у 1757 годзе «мая, 12 дня паводле рускага календара, выгарала Заручаўе (адзін з віцебскіх пасадаў. — *С.А.*) і большая палова замка, тры царквы і два касцёлы».

Здавалася б, будзьце пільнымі і асцярожнымі, віцябчане, — чырвоны певень не дрэмле!.. Ды дзе там! Праз якія тры тыдні, «месяца чэрвеня, 6 [ дня] ад семінарыі пачаўся пажар, дагарэлі рэшткі замка (тое, што ацалела 12 мая. — *С.А.*) і дах у касцёле айцоў езуітаў».

Дарэчы, божыя храмы, калі верыць Панцырнаму і Аверку, гарэлі ў Віцебску ледзь не штогод. Ахвярамі агню станавіліся Саборная царква, царква Звеставання, царква Благавешчання, Заручаўская царква. Калі ў красавіку 1701 года запаленую маланкай царкву Святога Яна Багаслова людзі, што былі на начным набажэнстве, нейкім цудам патушылі, то 11 чэрвеня 1747 года, роўна апоўдні храм усё роўна згарэў дашчэнту.

А цяпер звернемся да сведчанняў Трафіма Сурты і Юрыя Трубніцкага — складальнікаў Магілёўскай хронікі. Яны цікавыя тым, што праз стагоддзі даносяць да нас імёны і прозвішчы няўдачлівых магіляўчан, па віне якіх па гарадскіх вуліцах вольна гуляў чырвоны певень. «У год 1664. Месяца лютага, 24, на першым тыдні Вялікага посту, — сведчыць Магілёўская хроніка, — адведаў пан Бог горад агнём. Пачало гарэць ад дома Савы Ціхенкава, дзе цяпер за важніцаю камяніца. Крамы пагарэлі ўсе, а дамоў мала». У той жа год, 6 красавіка «ізноў адведаў пан Бог горад агнём ад дома, што недалёка ратушы, дзе ў той час [жыў] Гаўрыла Прэкста, а цяпер камяніца Васілеўскіх... Тады згарэлі ратуша, крамы, управа і званіца, а званы нават паплавіліся. Гарэла аж да жаночага манастыра, у якім была цудоўная студня, ад таго часу згінула...»

Відаць, наступствы пажару былі настолькі цяжкімі, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ян Казімір, якому на той час надалося знаходзіцца ў Магілёве, «бачачы, што пры ягонай бытнасці гораду нешчасліваць (два пажары запар. — С.А.), месяца красавіка, восьмага дня, ад'ехаў з горада».

Не абмінуў пан Бог агнём і сталіцу Вялікага княства Літоўскага — Вільню. Найбольш жудасны пажар спасціг яе ў 1610 годзе. Як адзначыў у «Живописной России» Адам Кіркор, той пажар зруйнаваў амаль увесь горад. Ацалелі толькі прадмесці. Згарэлі 10 розных храмаў, езуіцкая акадэмія, часткова Ніжні Замак і, як кажуць сучаснікі, 4700 розных будынкаў. Ранейшая, старая сталіца Літвы знікла амаль зусім».

Пра віленскі пажар 1706 года згадвае Віцебскі летапіс: «Выгарала большая частка горада Вільні, ратуша, крамы, Святы Казімір (касцёл. — С.А.) і што ў склепах было замуравана, усё гэта патлела і пагінула. Чалавек з 50 загінула і згарэла жыўцом».

Адведваў пан Бог агнём і іншыя беларускія гарады. Так, увайшлі ў гісторыю некалькі шклоўскіх пажараў. У 1690 годзе, як сведчыць Магілёўская хроніка, « ... амаль увесь замак з вялікай вежай, фара і крамы пагарэлі». У той год Шклоў гарэў яшчэ раз — 15 жніўня. Гэтым разам па віне панамара Данілы, які «забыўся патушыць у царкве свечкі», згарэў багаты шклоўскі храм «з усімі скарбамі: кнігамі, начыннем, званамі, нічагусенькі не засталося. І так гэты здрайца ўцёк, бо быў бы сам спалены».

Чарговы раз Шклоў гарэў у 1769 годзе. Агонь знішчыў 300 дамоў. Большасць пагарэльцаў з дазволу ўладальніка горада князя Чартарыйскага пабудавалася на новым месцы — на правым беразе Дняпра, утварыўшы паселішча Ніжні Шклоў.

У канцы 1870-ых пажар зноў спустошыў шматпакутны Шклоў.

15 ліпеня 1700 года «дашчэнту, аж да апошняга дома» выгарала Дзісна. У 1751 годзе агонь знішчыў большую частку Навагрудка. Пасля пажару ён, як зазначыў Адам Кіркор, «страціў ранейшае значэнне сталічнага горада».

Гомельскі пажар 1856 года ператварыў у попел 540 дамоў.

21 чэрвеня 1881 года а палове адзінаццатай раніцы пачаўся пажар у самым цэнтры губернскага Мінска. Ужо праз гадзіну ўпартай барацьбы з агнём гарадская пажарная каманда амаль патушыла пажар. Але апоўдні горад запалаў адразу ў некалькіх месцах — на вуліцах Мясніцкай (паміж сучаснымі вуліцамі Ракаўскай і праспектам Пераможцаў), Замкавай (за сучасным магазінам «Алеся») і Завальнай (раён сучаснай плошчы 8 Сакавіка). На бяду, лета ў той год было спякотнае, і высушаныя бязлітасным сонцам хаціны гарадской беднаты ўспыхвалі як порах. Да дзвюх гадзін дня на ўсю моц палалі ўжо некалькі густанаселеных кварталаў Мінска. З усёй жудасцю паўстала страшэнная перспектыва поўнага знішчэння горада. Вечарам барацьбу са стыхіяй асабіста ўзначаліў губернатар, які тэрмінова прыбыў з Бабруйска.

Адчайная барацьба з агнём ішла ў будынку Кантрольнай палаты, на вуліцах Казьмадзям'янаўскай (раён ад царквы па вуліцы Кірылы і Мяфодзія да Нямігі) і Базарнай (цяпер тут пешаходны праход пад аркай з плошчы Неза-



Макет Мінскага пажару 21—22 чэрвеня 1881 г. Знаходзіцца ў Мінскім «Музеі Агню» (Цэнтр навучання пажарнай бяспецы)

лежнасці да вуліцы Ленінградскай), на Саборнай (сучаснай Свабоды) плошчы.

Цэлыя суткі спатрэбіліся на тое, каб затушыць страшны пажар. Калі агонь аціх, цэнтр Мінска ўяўляў з сябе жудасную карціну — вуліцы Койданаўская (Рэвалюцыйная), Кацярынінская (Няміга ад плошчы 8 Сакавіка да Ракаўскай), Багадзельная (Камсамольская) ператварыліся ў суцэльнае папялішча. Агонь знішчыў 252 дамы, 488 флігеляў, 271 краму, 40 складоў, 8 урадавых будынкаў. Больш за 2 тысячы гараджан (а на той час у Мінску жыло каля 70 тысяч чалавек) засталіся без даху над галавой. Згарэла амаль палова драўлянай забудовы горада. Страты ад пажару склалі велізарную па тым часе суму: 6 мільёнаў рублёў серабром.

Паліцыя лічыла, што горад падпалілі зламыснікі, але іх так і не знайшлі.

Гэты пажар быў адным з самых вялікіх, але далёка не адзіным у гісторыі Мінска. Горад руйнаваўся агнём у 1084, 1547, 1698, 1835 гадах. Толькі ў XIX стагоддзі ў Мінску адбылося 16 буйных пажараў. Стыхійнае бедства 1835 года, напрыклад, ператварыла ў попел амаль увесь цэнтр горада.

Аналізуючы гісторыю «мірных» пажараў, пра якія ішла гаворка, можна зрабіць выснову, што іх прычынай была, найперш, людская неасцярожнасць. Успомніце: «п'яныя людзі» ў полацкім Верхнім замку, айцы-бернардзінцы і ксяндзы-дамініканцы ў Віцебску, Сава Ціхенкаў і Гаўрыла Прэкста з Магілёва, шклоўскі панамар Даніла...

Хуткаму распаўсюджванню агню спрыялі і асаблівасці тагачаснай гарадской забудовы, пра што згадваў у «Гісторыі дзяржавы Расійскай» Мікалай Карамзін: «Гэтая сталіца (Масква. — С.А.) штогод узрастала сваёй прасторай і колькасцю жыхароў. Двары больш і больш ушчыльняліся ў Крамлі, у Кітаі; новыя вуліцы прымыкалі да старых у пасадах; дамы будаваліся лепш для вачэй, але не бяспечней ранейшага: тленныя грамады будынкаў, дзе-нідзе раздзеленыя садамі, чакалі толькі іскры агню, каб зрабіцца попелам».



Папялішча ў Гародні. Здымак А. Садоўскага. Канец XIX ст.

Толькі ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў гарадах тагачаснай Расійскай імперыі пачалі ствараццца прафесійныя пажарныя каманды. У Брэсце яны, напрыклад, з'явіліся ў 1851 годзе, у Віцебску і Магілёве — у 1853-ім, у Барысаве, Ігумене (сучасны Чэрвень. — С.А.) і Рэчыцы — у 1860-ым. У Мінску пажарная каманда з шасці чалавек існавала яшчэ ў 1826 годзе. Але ёсць звесткі, што куды раней, яшчэ ў першай чвэрці XVI стагоддзя, маскоўскі князь Васіль Іванавіч «зацвердзіў у Ноўгарадзе пажарную варту».

Тым не менш агонь бязлітасна руйнаваў гарады, пакідаючы за сабой папялішчы, на якіх па начах вылі сабакі. А летапісцы, занатоўваючы для нашчадкаў ваенныя паходы князёў, варожыя набегі і аблогі, гады ўзвядзення замкаў і храмаў, час ад часу сведчылі аб тым, што нават у мірную часіну той ці іншы горад «пан Бог адведаў агнём»...

## Крыніцы

*Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся /М.О. Без-Корнилович. — Минск, 1995.*

*Беларускія летапісы і хронікі.* — Мінск, 1997.

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье* / под общ. ред. П.П. Семенова. Т. 3.— Минск, 1993.

*Карамзин, Н. М.* Предания веков / Н.М. Карамзин. — М., 1988.

*Полное собрание русских летописей.* Т. 32. — М., 1975.

*Полное собрание русских летописей.* Т. 35. — М., 1980.

*Полное собрание русских летописей.* Т. 38. — М., 1989.

*Шыбека, З.В.* Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З.В. Шыбека, С.Ф. Шыбека. — Мінск, 1994.

# «СПРАВА ВЯЛІКАЙ СМЕЛАСЦІ І РОЗУМУ ВЫШЭЙШАГА»

У год 6906 (1399) было пабоішча вялікага князя Вітаўта з царом Цімур-Кутлукам. Князь вялікі Вітаўт сабраў войска незлічонае, і з ім цар Тахтамыш са сваім войскам, і літва, паляне, немцы, ляхі, жамойць, татары, волахі і пяцьдзесят рускіх князёў, і з усімі сіламі ўзброіўшыся, пайшоў Вітаўт на цара Цімір-Кутлука, каб захапіць царства ягонае, і, хвалячыся перад Ардою, сказаў так: «Пойдзем палонім зямлю татарскую, паб'ём цара Цімур-Кутлука, пасадзім замест яго хана Тахтамыша, а ён нас пасадзіць па ўсёй Рускай зямлі»; і, пра тое ўмовіўшыся, пайшлі татараў ваяваць.

Тым часам падышоў цар Цімур-Кутлук са шматлікімі палкамі ратнымі, з усімі сваімі ардынскімі сіламі. І сустрэўся ён з Вітаўтам на полі каля ракі Ворсклы, і адбыўся паміж імі бой вялікі дванаццатага жніўня, у аўторак. Доўга яны біліся — ледзь не ўвесь дзень. І дапамог Бог татарам, і пабілі яны вялікага князя Вітаўта і ўсё яго войска, сам жа вялікі князь уцёк з малою дружынаю.

*Хроніка Быхаўца*

Іначай пачалася бітва на крыле татараў. Татарскія панцыры з гартаванай скуры буйвалаў і іх абцягнутыя такой жа гартаванай скурай шчыты не маглі б вытрымаць удару дзідаў, і татары хана Багардзіна, сутыкаючыся з харугвамі наёмнікаў, якіх вялі Крыштаф фон Герсдорф, Фрыдрых фон Бланкенштэйн, Ганс фон Вальдаў, Ота фон Носціц, пусцілі ў ход нечаканую для немцаў зброю. Калі дваццаць-трыццаць крокаў аддзяляла ўзрадаванае рыцарства

ад татараў, раптам узляцелі ў паветра арканы, і амаль увесь першы шэраг пакрытых бранёй перадхаругвенных быў ганебна звалены, быццам здуты ветрам пад капыты сваіх жа таўстаногіх, магутных коней. Карыстаючыся замяшаннем крыжакоў, татарскія сотні ірвануліся ўперад і ўдарылі ў мячы і шаблі. Лучнікі, якія ішлі следам, выпусцілі насустрач рыцарам завесу стрэлаў і, у імгненне вока скінуўшыся з сёдлаў, перарэзалі аглушаных падзеннем наёмнікаў. Знішчэнне татараў, якое здавалася забавай, абярнулася з першай жа хвіліны стратамі і нялёгкім боем. Моц мячоў, якія разрубалі немудрагелістыя даспехі, ураўнаважвалася змяінымі абдымкамі арканаў, што метка падалі на галаву і здымалі з каня грозных немцаў. Вяроўкай быў крыўдна вырваны з рук харунжага і нібыта сам паляцеў у гушчу татараў сцяг харугвы Герсдорфа — чырвоны крыж на белым полі: рыцары завылі ад ярасці і сораму.

Побач з татарамі стаялі супраць крыжакоў віленскія харугвы Войцеха Манівіда і Мінігала, а плячо ў плячо з імі — троцкая харугва Яўніса і крамянецкая харугва, і харугва Жыгімонта Кейстутавіча, і ратненцы Сангушкі Фёдаравіча, і ваўкавысцы, і віцябчане, і аршанская харугва князёў Друцкіх, і два смаленскія палкі, якія вялі Вяземскі, Бельскі, Дарагабужскі.

*Кастусь Тарасаў. Пагоня на Грунвальд*

Падзеі, пра якія я ўспомніў на пачатку свайго аповяду, пастаўлены мною побач не толькі таму, што яны — бітва на Ворскле і Грунвальдская бітва — блізкія па часе ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага: першую ад другой аддзяляюць усяго адзінаццаць гадоў. Звярнуць увагу хацелася б на іншыя акалічнасці, якія тычацца месца і ролі татараў у айчыннай гісторыі. Дакладней, на тое, наколькі заблытанымі, неадназначнымі былі стасункі адметнага народа з нашай дзяржавай. На Дубровенскім полі харугвы Вітаўта і татарская конніца Джэлал-эд-Дзіна мелі агульнага ворага — немцаў. А незадоўга да гэтага на берагах Ворсклы расклад сіл быў наогул арыгінальным: з аднаго боку былі тумены татарскага хана Цімур-Кутлука, а з

другога — Вітаўтава рацы, падмацаваная атрадам нямецкіх рыцараў і тымі ж татарамі на чале з ханам Тахтамышам.

Па вялікаму рахунку, тут няма нічога дзіўнага: абарона дзяржаўных інтарэсаў часта штурхала ўладароў на самыя нечаканыя альянсы, а гістарычныя абставіны іншы раз складваліся настолькі непрадказальна, што ўчарашні люты вораг раптоўна станавіўся лепшым сябрам, а нядаўні верны саюзнік — праціўнікам.

Стасункі вялікага князя Вітаўта (ды і іншых уладароў Вялікага княства Літоўскага) з татарамі — яскравае сведчанне гэтага. Тут было ўсё: і вераломства, і здрада, і вернасць, і сяброўства...

З татарамі звязана адна з найвялікшых таямніц беларускай, давітаўтавых часоў, гісторыі.

У пачатку XIII стагоддзя вольныя стэпавыя качэўнікі Цэнтральнай Азіі (меркіты, караіты, айраны, найманы, татары, манголы і іншыя) былі згуртаваны жалезнай рукой Чынгісхана ў магутны баявы кулак. На тэрыторыі сучасных Манголіі, Паўночна-Усходняга Кітая і Паўднёвай Сібіры паўстала велізарная дзяржава, якая ледзьве не ўвайшла ў гісторыю як сусветная імперыя. Першы свой удар Чынгісхан скіраваў на Азію. У самы кароткі тэрмін дзікія, але сцэментаваныя жалезнай дысцыплінай орды скарылі народы Сібіры, Паўночнага Кітая, Сярэдняй Азіі, Закаўказзя, Малой Азіі, Блізкага Усходу. У прах рассыпаліся пад капытамі коней бязлітасных заваёўнікаў тысячагадовыя, здавалася, непераможныя азіяцкія дзяржавы, што самі неаднойчы выступалі ў ролі крыважэрных агрэсараў.

Ад легендарнага Чынгісхана заваёўную эстафету прыняў Батый. Качэўнікі крывавай хваляй хлынулі ў Еўропу.

На Русі аб'яднаныя ў магутную армію азіяцкія плямёны (да згаданых вышэй меркітаў, караітаў, айранаў, найманаў, татараў, манголаў далучыліся пакораныя тангуты, чжурджэні, харэзмійцы, туркмены, таджыкі, кіргізы, полаўцы, кіпчакі, волжскія булгары, печанегі, берандзеі, хазары, каўказскія народы) называлі мангола-татарамі, а часцей — проста татарамі. Хаця, як сведчаць даследчыкі, сапраўднымі, этнічнымі, мангола-татарамі ў велізарным

войску качэўнікаў былі толькі военачальнікі і феадальная знаць. Створаная імі магутная дзяржава, якая распасціралася ад Ціхага акіяна да Чорнага мора, была унікальнай з'явай таго часу. Па сутнасці, гэта быў агромністы рухомы ваенны лагер, падзелены на надзвычай мабільныя тумены ў 10 000 вершнікаў кожны. Галоўная мэта велізарнай ваеннай машыны — бясконцыя захопніцкія войны.

У 1237 годзе страшная татарская лавіна наблізілася да межаў старажытнарускіх княстваў, а ўжо на наступны год пераступіла іх...

Усяго чатыры гады спатрэбілася Батыю, каб пакарыць раз'яднаную міжусобіцамі Русь — Разань, Уладзімір, Чарнігаў, Кіеў. Наступнымі ахвярамі заваёўнікаў павінны былі б стаць Полацк, Орша, Вільня, Мінск, Навагрудак, Тураў, Пінск, Брэст. Але на беларускія землі татары не пайшлі. Чаму?

Адназначнага адказу на пытанне пакуль няма. На думку даследчыкаў, татары па меншай меры двойчы маглі зрабіць гэта: першы раз пасля захопу Чарнігава, калі рукой было падаць да неабароненага якімі б то ні было лясамі і балотамі Гомеля, другі — пасля ўзяцця Кіева,



Татарскі набег. Сярэдневяковая гравюра

калі на паўночным захадзе Украіны, у ваколіцах Уладзіміра-Валынскага, Батый сканцэнтраваў адборнае 50-тысячнае войска, якое рыхтавалася да ўварвання на землі Польшчы, Венгрыі і Чэхіі. Да Турава, Пінска, Брэста было ўсяго нічога. Чаму Батый не аддаў загад развярнуць коней на поўнач?

Шэраг даследчыкаў лічыць, што ракавы для Беларусі загад Батый не аддаў таму, што яго войска было моцна аслаблена адчайным супраціўвам рускіх княстваў. Аднак гэта гіпотэза не вытрымлівае ніякай крытыкі, калі ўспомніць, што «аслабленае» войска ў хуткім часе трыумфальна дайшло да Адрыятычнага мора, пакінуўшы за спінай не адну пакораную еўрапейскую дзяржаву.

Сумніўна выглядаюць спасылкі на непраходнасць палескіх балот — па тых часах такіх «перашкод» хапала ў любым усходне-рускім княстве, няхай то ваколіцы Масквы або абшары вакол Бранска.

Не вельмі пераканаўча гучаць разважанні пра тое, што татараў спыніла ўяўная ваенная моц маладой дзяржавы, якую толькі што пачаў ствараць на абшарах Панямоння літоўскі князь Міндоўг. Няма ў летапісных крыніцах і сведчанняў пра быццам бы пераможныя тагачасныя бітвы нашых продкаў з ваяўнічымі качэўнікамі. Першае дакументальна засведчанае ўварванне татараў у Беларускае Панямонне адбылося праз тры гады пасля смерці легендарнага Батыя і амаль праз два дзесяцігоддзі пасля пакарэння ім Русі. Зімой 1258—1259 гадоў, калі Вялікае княства Літоўскае сапраўды пачало станавіцца на ногі і ўяўляць сабой больш-менш сур'ёзную ваенную сілу, татарскі хан Бурундай, узяўшы ў хаўруснікі васальных галіцка-валынскіх князёў, страшэнна спустошыў панямонскія абшары.

Да канца XIII стагоддзя татары здзейснілі яшчэ некалькі набегаў на беларускія землі, але ні адзін з іх не прывёў да падпарадкавання ваяўнічым суседзям.

Калі строга трымацца гістарычнай праўды, то першыя стасункі татараў з нашымі продкамі, не абцяжараныя ваенным супрацьстаяннем, адносяцца да пачатку XIII стагоддзя і звязаны з родзічамі цемніка Нагая. Менавіта яго

ваяры паміж 1280 і 1288 гадамі здзейснілі набегі на Брэст, Навагрудак і Гродна. Але калі падчас міжусобнай барацьбы, якая разгарнулася паміж Нагаем і ханам Такта, цемнік у 1300 годзе загінуў, яго паплечнікі вымушаны былі шукаць прытулку на поўначы. Гісторык Ібрагім Канапацкі спасылаўся на арабскі летапіс Рукнайдына Бэйбарса, у якім занатаваны наступны факт: калі ў 1301 годзе хан Такта падчас мяцяжу забіў свайго брата Сарайбугу і сына Нагая — Турая, унук Нагая — Каракісэк і два яго родзічы — Джэрактэмір і Юлукутлу — вырашылі не выпрабоўваць лёс. Разам з трыма тысячамі падуладных ім вершнікаў яны прыбылі ў краіну Шэшымэн, у мясцовасць, якая называлася Будуль, недалёка ад Кракава. З арабскага летапісу вынікае, што Каракісэк з паплечнікамі сталі наёмнымі ваярамі ўладароў Шэшымэна, вандруючы па розных мясцінах і пракормліваючы сябе з дапамогай мяча.

Ібрагім Канапацкі выказаў слушнае меркаванне, што вандроўнікі маглі прывесці татарскіх наёмнікаў і ў Літву, дзе ў тыя часы ўладарыў вялікі князь Віцень. Часы ўладарання Віценя (1295—1316) прайшлі ў бесперапынных войнах княства з польскімі і жамойцкімі феадаламі, прускімі і лівонскімі крыжакамі. Сведчанняў пра тое, што вялікі князь падчас сваіх паходаў карыстаўся паслугамі татарскіх наёмнікаў, пакуль што не знойдзена, але гэта, безумоўна, не значыць, што ў яго пераважна конным войску не маглі быць татарскія вершнікі. Як сведчыў Ібрагім Канапацкі, у 1319 годзе татары складалі перадавы атрад у войску пераемніка Віценя вялікага князя Гедыміна падчас вайны з тэўтонцамі.

На думку некаторых даследчыкаў, менавіта Гедыміну прыйшла ў галаву думка запрасіць на службу ў свае войска адмысловых конных ваяроў — татараў і кіпчакоў. Ужо ў 1316 годзе ў бітве з крыжакамі пад мястэчкам Жэймы на баку Гедыміна змагаліся татарскія загоны. Факт засведчаны ў Хроніцы літоўскай і жамойцкай. Вялікі князь шырока выкарыстоўваў татараў і для абароны межаў Вялікага княства Літоўскага.

Заслугоўваюць увагі сведчанні прафесара Пецярбургскага універсітэта, ураджэнца Навагрудчыны Антона Мухлінскага, які ў сваёй працы «Даследаванне аб паходжанні і стане літоўскіх татараў» (1857) пісаў: «Вядома таксама, што Гедымін, гэты заснавальнік моцы Літоўскай дзяржавы, умеў здабыць дружбу манголаў: ён ніколі не ваяваў з імі і не плаціў ім дані, наадварот, у шэрагах яго войска служылі татары». І далей: «Па ўсёй верагоднасці, частка татараў, што служылі ў Гедыміна, засталася ў яго дзяржаве і пасля вайны і ва ўзнагароду атрымала ў валоданне землі».

Антон Мухлінскі ўзгадваў сведчанне храніста францысканскага ордэна, якое адносіцца да 1324 года, дзе расказваецца, што ў Літоўскіх землях місіянеры-францысканцы сустрэлі «скіфаў, прышэльцаў з уладанняў нейкага хана» (Узбека. — С.А.), якія «ў сваіх малітвах выкарыстоўваюць азіяцкую мову».

Як меркаваў Антон Мухлінскі, менавіта гэтыя «скіфы» і «склалі першыя паселішчы татараў у Вялікім княстве Літоўскім».

Трэба адзначыць, што і акадэмік Яўхім Карскі таксама лічыў, што татары з'явіліся на Беларусі ў пачатку XIV стагоддзя, прычым добраахвотна, для ўдзелу ў барацьбе з крыжакамі.

У часы саўладарання наступнікаў Гедыміна — Кейстута і Альгерда — прысутнасць татараў на велікакняжацкай ваеннай службе была ўжо звыклай з'явай. Іх даволі часта і паспяхова выкарыстоўвалі ў паходах супраць маскавітаў, палякаў, крыжакоў. Так, у 1350 і 1352 гадах загоны хана Джанібека прымалі ўдзел у паходах Альгерда супраць польскага караля Казіміра Вялікага.

Па сведчанні Антона Мухлінскага, той жа Альгерд у 1362 годзе, «накіроўваючыся для заваёвы Падоліі, дзе пасля Батыя ўсталяваліся татары, прывёў туды і татараў, якія складаліся, па меркаваннях гісторыкаў, з тых, што засталіся ў Літве з часоў Гедыміна». Калі браць пад увагу гэта сведчанне, то вельмі верагодна, што ў знакамітай бітве каля Сініх Водаў супраць аб'яднанага войска ханаў

Хачыбея і Кутлубуга на баку Альгерда змагаліся адзінакроўцы — літоўскія татары.

Вядома, што, вяртаючыся з ваенных паходаў, тыя з татараў, хто пажадаў, атрымлівалі права аседласці ў межах Вялікага княства Літоўскага каля гарадоў і замкаў.

Традыцыю дружалюбных стасункаў з татарамі працягваў і вялікі князь Ягайла. Магчыма, гэта ў пэўнай меры падштурхнула яго да прыняцця рашэння, якое многія даследчыкі лічаць неразумным. Падчас похода цемніка Мамая на Маскву (1380) Ягайла не падтрымаў князя Дзмітрыя, якому абяцаў дапамогу, і, больш таго, меў намер прыняць бок Мамая.

Войска Ягайлы (у якім было некалькі татарскіх палкоў) да Кулікова поля не дайшло, і Дзмітрый разграміў Мамая. А Ягайла ў хуткім часе парадніўся з Кайданам, сынам Мамая. Ужо пры Вітаўце ўнук Мамая — Лекса будзе ў Літве, прыме хрысціянства пад імем Аляксандра, атрымае ў Падняпроўі зямельныя ўладанні і пакладзе пачатак знакамітаму магнацкаму роду Глінскіх.

Незадоўга да Кулікоўскай бітвы, у 1378 годзе, чынгізід (прамы наследнік легендарнага хана) Тахтамыш аб'яднаў Белую і Сінюю Арду і, скарыстаўшыся дапамогай сярэднеазіяцкага ўладара — вялікага Цімура, усталяваўся на пасадзе Залатой Арды.

4 жніўня 1392 года ў Востраве, паблізу Ліды, Ягайла і Вітаўт падпісалі пагадненне, згодна з якім апошні стаў вялікім князем літоўскім і рускім, уладаром Вялікага княства.

Тахтамышу і Вітаўту было наканавана адыграць вызначальную ролю ў лёсе татараў, іх месцы ў гісторыі Беларусі.

Перш чым працягнуць наш аповяд, вернемся на некаторы час назад, у XIII стагоддзе, каб расказаць пра Залатую Арду. Без гэтага, бадай, немагчыма разабрацца ў стасунках Вялікага княства Літоўскага з татарамі.

У 1241 годзе памёр трэці сын Чынгісхана, уладар велізарнай імперыі — Угедэй. Як лічаць многія даследчыкі, менавіта гэта падзея выратавала Еўропу ад канчатковага пакарэння ваяўнічымі качэўнікамі, якія, дасягнуўшы Трыеста, ужо вялі разведку шляхоў на Рым.

Смерць Угедэя вымагала абрання новага ўладара. А паколькі прэтэндэнтаў на тую пасаду не бракавала, выбары абяцалі быць вельмі складанымі, абцяжаранымі інтрыгамі. Адным з прэтэндэнтаў на высокую пасаду мог бы стаць і пляменнік вялікага Угедэя — Батый. Але легендарны палкаводзец вырашыў не выпрабоўваць лёс. Ён не вярнуўся на берагі Керулена, а прывёў сваё стомленае паходамі войска ў нізоўе Іціля (Волгі). З 1224 года тут ужо існавала ўдзельнае княства — Залатая Арда, так званы улус Джучы, сына Чынгісхана, бацькі Батыя. Ён займаў велізарны абшар — Заходнюю Сібір, Паўночны Харэзм, Волжскую Булгарыю, Паўночны Каўказ, прывольныя стэпы ад Дуная да Волгі. Тут, у бацькоўскіх уладаннях (Джучы памёр у 1227 годзе), Батый і вырашыў спыніцца.

Менавіта пры Батыі Залатая Арда стала самастойнай магутнай дзяржавай, незалежнай ад далёкай метраполіі. Падчас уладарання малодшага брата Батыя — хана Берке (1258—1266) Залатая Арда канчаткова адасобілася ад імперыі чынгізідаў. Сам хан прыняў іслам.

Сталіца Залатой Арды — Сарай-Бату — спачатку знаходзілася паблізу сучаснай Астрахані, а ў першай палове XIV стагоддзя, атрымаўшы назву Сарай-Берке, была перанесена ў ваколіцы цяперашняга Валгаграда.

Росквітам Залатой Арды лічыцца перыяд з 1313 па 1357 год, калі дзяржавай адзін за другім правілі хан Узбек і яго сын Джанібек. Як адзначалася вышэй, менавіта падчас іх уладарання і пачаліся дастаткова актыўныя стасункі татараў з Вялікім княствам Літоўскім: у войску Гедыміна, а потым і Альгерда з'явіліся саюзныя татарскія атрады, якія ваявалі на баку Вялікага княства Літоўскага супраць палякаў, маскавітаў і крыжакоў.

Пасля смерці ў 1357 годзе хана Джанібека ў Залатой Ардзе пачаліся бязладдзе і смута. У выніку прыдворных інтрыг і змоў канца 1350-ых гадоў былі забіты многія царэвічы з роду Узбека. З 1357 да 1380 года на залатаардынскім пасадзе перабывала дваццаць ханаў. Унутраныя разборкі паміж ханамі падрывалі Залатую Арду знутры. У 1370-ыя гады яна фактычна распалася на дзве часткі: у Заволжы правіў цемнік Мамай, на ўсходзе — Урусхан.



Хан Тахтамыш. Мініяцюра
з «Ліцэвога летапіснага зводу». XVI ст.

Менавіта ў гэты час золатаардынцам былі нанесены два страшэнныя ўдары (1362 год — Сінія Воды, 1380 год — Кулікова поле), ад якіх яны так і не ачуліся. Якраз пасля гэтых падзей клопатамі Цімура ўладаром Залатой Арды і стаў хан Тахтамыш.

Улада чынгізіда сягала ад Крыма да Аральскага мора. У краіне расквітнеў гандаль, бурна развіваліся рамёствы. Залатая Арда, здавалася, перажывала другое нараджэнне. Упэўнены ў сваіх сілах, Тахтамыш, быццам забыўшыся пра Мамаеў сорам на Куліковым полі, у 1382 годзе паліць Маскву і зноў застаўляе яе плаціць даніну Залатой Ардзе.

Адчуванне ўласнай моцы і значнасці настолькі ўскружыла Тахтамышу галаву, што ён у 1384 годзе зрабіў непрадуманы і ракавы для сябе крок — выступіў супраць самога Цімура.

Адзінаццаць гадоў спатрэбілася легендарнаму эміру для таго, каб паставіць мяцежнага хана на месца. 14 сакавіка 1395 года адбылася апошняя і рашаючая бітва. Арабскі гісторык Шэраф-эд-Дзін Йездзі ў сваёй «Кнізе перамог» так апісаў яе вынікі: «...Тахтамыш кінуў ханства, дом, усё, што меў, і, ратуючы сваё жыццё, з некалькімі людзьмі ўцёк, пайшоў у бок Булара (так арабы называлі Польшчу. — С.А.), у лясную мясцовасць, хаваючыся ад ільвіных кіпцюроў Цімура...»

Новы ўладар Вялікага княства Літоўскага Вітаўт наўрад ці зведваў асабліва цёплыя пачуцці да Залатой Арды наогул і да Тахтамыша ў прыватнасці. Вялікі князь быў жорсткім, прагматычным палітыкам, які ўсе свае рашэнні і ўчынкі сувымяраў з тым, карысць ці шкоду яны прынясуць яго дзяржаве. Вітаўту не была патрэбна моцная і агрэсіўная Залатая Арда, якая б пагражала паўднёвым межам Вялікага княства. Відавочна, што, зыходзячы менавіта з такіх меркаванняў, вялікі князь і здзейсніў два паходы ў Залатую Арду. У 1397 годзе Вітаўтавы харугвы, пераадолеўшы кіпчацкія стэпы, фарсіравалі Дон, выйшлі да Волгі і нанеслі ўдар па асноўных золатаардынскіх улусах. Праз год, узяўшы ў дапамогу крыжакоў, Вітаўт скіраваў удар па крымскіх ордах татараў.

І вось тут настаў час для былога золатаардынскага ўладара Тахтамыша. Як вядома з летапісных крыніц, у 1397 годзе Тахтамыш, які так і не змог прымірыцца са стратай золатаардынскага пасада, вырашыў вярнуць хаця б частку страчаных уладанняў. Сабраўшы войска, ён накіраваўся ў Крым, спрабаваў узяць багатую прычарна-

морскую Кафу (сучасную Феадосію), але быў разбіты стаўленікам Цімура ханам Цімур-Кутлукам — новым ханам былога улуса Джучы.

Пасля разгрому Тахтамыш з рэшткамі свайго войска аб'явіўся ў Кіеве. Тут хан і папрасіў прытулку і дапамогі ў Вітаўта. Вялікі князь не адверг просьбаў уцекача, а пайшоў яму насустрач. У справу ўступіла вялікая палітыка.

Вітаўт добра ведаў, што Тахтамыш — прамы нашчадак Чынгісхана, які мае законнае права на залатаардынскі пасад. Старажытны летапіс данёс да нас тагачасныя планы вялікага князя, якія, як відаць з яго разважанняў, сягалі вельмі далёка: «Пасадзім у Ардзе на царства яго цара Тахтамыша... і тое ўсё будзе наша, і цар наш, і мы не толькі Літоўскай зямлёй і Польшчай валодаць будзем... але і ўсімі вялікімі княжэннямі рускімі».

Нагадаем, што «вялікія княжэнні рускія», пад якімі Вітаўт, відавочна, меў на ўвазе Вялікае Уладзіміра-Суздальскае княства, на той час знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад аслабленай, але ўсё яшчэ дастаткова грознай Залатой Арды.

Зыходзячы з гэтых дастаткова меркантыльных меркаванняў, Вітаўт выдзеліў Тахтамышавым татарам землі ў ваколіцах Чаркасаў і Канева. Сам хан пасяліўся ў Лідзе. Ён жыў у асобным доме, які і пасля яго ад'езду доўгі час называўся Тахтамышавым дваром. Па некаторых звестках, Тахтамыш нейкі час нават быў лідскім старостам.

Узвядзенню хана на залатаардынскі пасад хутчэй за ўсё перашкодзіла трагедыя на Ворскле, дзе 12 жніўня 1399 года Вітаўт (а разам з ім і Тахтамыш) быў ушчэнт разбіты войскам трох залатаардынскіх ханаў. Тахтамышу ўдалося ўратавацца. Лёс закінуў яго ў далёкую Сібір. Пасля яшчэ адной няўдалай спробы самастойна захапіць залатаардынскі пасад ён у 1406 годзе быў забіты.

На абшарах Вялікага княства Літоўскага засталіся жыць уцалелыя ў бітвах ваяры Тахтамыша, для якіх гэта зямля стала другой радзімай.

Праз тры гады пасля гібелі Тахтамыша ва ўладанні Вітаўта прыбыў з невялікім атрадам сын хана Джэлал-



Руіны Лідскага замка. Ліда доўгі час была «сталіцай» беларускіх татар. Мастак Васіль Гразноў. Канец XIX ст.

эд-Дзін, які 15 ліпеня 1410 года прыняў удзел у знакамітай Грунвальдскай бітве. Удзячны Вітаўт дапамог сыну Тахтамыша, і той у 1412 годзе пры яго падтрымцы захапіў Крым, перамогшы ў рашаючай бітве хана Цімур-Кутлука, таго самага, які за пятнаццаць гадоў да таго разбіў пад Кафай яго бацьку.

У тым жа годзе ў выніку змовы эміра Едыгея Джэлал-эд-Дзін быў забіты, і ханам у Крыме стаў яго брат Керым Берды.

Але Вітаўт, як кажуць, упарта гнуў сваю лінію, і ў 1413 годзе ў Вільні ханам Залатой Арды быў вылучаны малодшы сын Тахтамыша — Бетсуб-Улан. Цікава, што ўпершыню за доўгую гісторыю Залатой Арды яе ўладар быў каранаваны ў сталіцы Вялікага княства Літоўскага і атрымаў ханскую шапку з рук вялікага князя.

Вітаўт да самай сваёй смерці ў 1430 годзе прымаў актыўны ўдзел у інтрыгах вакол золатаардынскага пасада.

У 1416 годзе ўладу ў Залатой Ардзе на кароткі час захапіў каранаваны Вітаўтам у Вільні сын Тахтамыша —

Ерымфердэн. У 1422 годзе на золатаардынскі пасад быў узведзены стаўленік Вітаўта — Дэўлет-Берды. За год да смерці вялікага князя пасля доўгай барацьбы ханам Залатой Арды стаў падтрыманы ім унук Джэлал-эд-Дзіна — Улуг Мухамед.

Існуе легенда, згодна з якой народжаны ў Троках Хаджы Гірэй у 1443 годзе пры падтрымцы вялікага князя Казіміра Ягайлавіча захапіў Крым і заснаваў знакамітую дынастыю Гірэяў, якая ўладарыла ў Крымскім ханстве аж да 1783 года.

Пераемнікі Вітаўта — вялікія князі Казімір Ягелончык, Аляксандр Казіміравіч, Жыгімонт I Стары — працягвалі яго мудрую палітыку: пашыралі татарскія паселішчы, умацоўвалі іх. Татарская знаць атрымлівала ў валоданне ўсё новыя землі.

Доўгі час іх «сталіцай» была Ліда. З 1434 па 1443 год яна, напрыклад, была рэзідэнцыяй згаданага вышэй хана Кіпчацкай арды Хаджы-Гірэя, які нават займаў пасаду гарадскога галавы — старосты. Дарэчы, апошні хан Залатой Арды Ахмед жыў у ваколіцах Шчучына, дзе і сёння кампактна селяцца беларускія татары.

У 1501 годзе вялікі князь Жыгімонт выдаў беларускім татарам прывілей на шляхецтва, які пасля пацвярджалі Стэфан Баторый (1576), Жыгімонт III (1608), Уладзіслаў IV (1634). Пры ўжо згаданым Жыгімонце III многія татарскія шляхціцы сталі прымаць беларускія імёны і прозвішчы: так на Беларусі з'явіліся Уланскія, Барунскія, Юшынскія, Найманскія, Кандрацкія, Александровічы, Шабановічы, Кандратовічы, Сагановічы...

Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што ў паслявітаўтавы часы набегі крымскіх татар былі немалым галаўным болем для ўладароў Вялікага княства Літоўскага. Дастаткова ўспомніць паход іх дванаццацітысячнага атрада на Беларусь і разгром крымчакоў Міхайлам Глінскім пад Клецкам 5 жніўня 1506 года. Але пасля таго, як татары ў 1562 годзе зруйнавалі Рагачоў, стасункі паміж татарамі і беларусамі насілі толькі мірны характар.

Закончыць наш аповяд хацелася б яшчэ адным зваротам да працы Антона Мухлінскага, які пісаў: «Калі ўся

Еўропа ўзброілася мячом і нянавісцю супраць мусульманаў, тады разважлівая палітыка ўладароў Літоўскіх, з любоўю і гасцціннасцю, запрашала ў свае ўладанні татараў, якія вымушаны былі ў выніку збегу розных акалічнасцей пакідаць сваю радзіму і добраахвотна перасяляліся ў Літву.

Якраз тут менавіта мудрая прадбачлівасць Літоўскіх уладароў надзяляла татараў землямі, спрыяла іх веры і, з цягам часу, зраўняла іх з тутэйшымі дваранамі, пазбавіўшы ад усіх амаль падаткаў. Для тагачаснай сучаснай эпохі гэта было справай вялікай смеласці і розуму вышэйшага, моцнага...»

## Крыніцы


*Асиновский, С. Потомки хана Токтамыша /С. Асиновский // Эхо веков. — Казань. — 1997. — № 1/2.*

*Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.*

*Гришин, Я. Польско-литовские татары: Наследники Золотой Орды /Я. Гришин. — Казань, 1995.*

*Думін, С.У. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць /С.У. Думін, І.Б. Канапацкі. — Мінск, 1993.*

*Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды /М. Ермаловіч. — Мінск, 1990.*

*Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд / М. Ермаловіч. — Мінск, 1994.*

*Канапацкі, І.Б. Гісторыя і культура беларускіх татар /І.Б. Канапацкі. — Мінск, 2000.*

*Лакотка, А.І. Бераг вандраванняў, ці Адкуль у Беларусі мячэці /А.І. Лакотка. — Мінск, 1994.*

*Мухлинский, А. Исследование о происхождении и состоянии литовских татар /А. Мухлинский. — Минск, 1993.*

*Насевіч, В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы /В. Насевіч. — Мінск, 1993.*

*Тарасов, К. Погоня на Грюнвальд /К. Тарасов. — Минск, 1994.*

*Чаропка, В. Імя ў летапісе /В. Чаропка. — Мінск, 1994.*

*Чаропка, В. Уладары Вялікага княства /В. Чаропка. — Мінск, 1996.*

*Tyszkiewicz, J. Tatarzy na Litwie i w Polsce /I. Tyszkiewocz. — Warszawa, 1989.*

# «СУМЛЕННА ПРЫНЯЛІ СВОЙ ЛЁС»

Ранак гэты напрыканцы лета патанаў у шызых туманах і быў ужо па-асенняму золкім. Сонца хавалася недзе ў шэрані аблокаў, і таму, відаць, туманы спаўзалі ў сырыя нізіны павольна і неахвотна. Не адразу, а паступова туманнае мроіва распаўзалася на кавалкі, і паміж імі, спачатку слаба, а пасля ўсё выразней пачалі праступаць вільготна-чырвоныя чарапічныя дахі раскіданых па агромністым полі хутароў, рэдкія пералескі, ужо злёгку кранутыя барвамі блізкага верасня.

Было да звону ў вушах ціха, так, як бывае толькі на мяжы лета і восені, калі прырода, адбуяўшы, пацíху рыхтуецца да халадоў, што прыйдуць неўзабаве. Наваколле, здавалася, лянíва драмала, і нішто не магло парушыць гэту дрымоту.

І мне здалося неверагодным, нават недарэчным, што менавіта на гэтых мірных, усцішаных пагорках, засланых туманамі, амаль шэсць стагоддзяў таму вырашаўся лёс многіх народаў Еўропы, што тут, на Дубровенскім полі, паміж вёскамі Таненберг і Людвікова, 15 ліпеня 1410 года адбылася адна з буйнейшых бітваў сярэдневякоўя, палітычныя наступствы якой цяжка пераацаніць і сёння.

Потым у невялікім музейным кіназале нам паказалі ўрывак са знакамітага польскага фільма «Крыжакі»...

Да пагорка, на якім у атачэнні світы чакае пачатку бітвы апрануты ў чорнае кароль Уладзіслаў (Ягайла), скачуць на пакрытых гунькамі баявых конях два крыжацкія герольды. У аднаго на шчыце — чорны арол на залатым полі, у другога — чырвоны грыф на полі белым.

— Магістр Ульрых, — кажа першы герольд, — выклікае вас, ваша светласць, і князя Вітаўта на смяротны бой



Пасланне двух мячоў Ягайле.
Мастак Юзаф Пешка. Пачатак XIX ст.

і, каб узняць дух ваш, а храбрасці ў вас, відаць, мала, пасылае вам гэтыя два аголеныя мячы.

Другі герольд дадае:

— Магістр Ульрых загадаў абвясціць вам, гасудар, што, калі мала вам поля для бітвы, ён адыдзе са сваім войскам, каб не трацілі вы ў лесе марна часу.

І кароль адказвае:

— Няма ў нас недахопу ў мячах; але я прымаю і гэтыя, як прадвесце перамогі, якое праз вас пасылае мне сам Бог.

А потым пачынаецца бітва...

Па-майстэрску знятыя кадры ўражвалі, хаця глядзеў іх не ўпершыню; на «Крыжакоў» хадзіў з сябрамі, калі яшчэ вучыўся ў школе. Ужо як быў студэнтам, на адным, як кажуць, уздыху праглынуў знакаміты раман Генрыка Сянкевіча. І фільм, і кніга маляўніча апісвалі Грунвальдскую бітву, дзе доблесныя палякі пад кіраўніцтвам свайго мудрага караля Уладзіслава (літвіна Ягайлы) ушчэнт разграмілі тэўтонскіх рыцараў.

Тады, многа гадоў таму, я не падазраваў, што і ў кінастужцы, і ў кнізе паказана і сказана далёка не ўся праўда. Прызнаюся, што ўсёй праўды не ведаў і тады, калі па волі лёсу патрапіў на легендарнае Дубровенскае поле, дзе і адбылася Грунвальдская бітва. І толькі многа пазней даведаўся, што амаль ці не палова «доблесных палякаў» — гэта беларусы і літоўцы (у сучасным разуменні), якіх вёў у бой вялікі князь Вітаўт.

З самага пачатку нашага тысячагоддзя ці не самай галоўнай мэтай германскай знешняй палітыкі быў захоп тэрыторый, заселеных славянамі, і іх асіміляцыя. Так, да прыкладу, сышлі ў нябыт славянскія плямёны бодрычаў, радараў, борцяў, люцічаў. У 1157 годзе імператар Фрыдрых Барбароса перайшоў на правы бераг Одры. Не прайшло і ста гадоў, як на спрадвечна славянскай зямлі была заснавана сталіца Брандэнбургскага маркграфства — Берлін. Адмыслова ўмацаваны горад стаў фарпостам германскай каланізацыі земляў паміж Одрай і Вартай.

Ахвярай каланізатараў стала, напрыклад, балтыйскае племя прусаў, якое было цалкам знішчана, па горкай іроніі лёсу пакінуўшы заваёўнікам сваё імя.

Тая ж доля чакала і беларусаў з літоўцамі.

Яшчэ ў канцы XII стагоддзя, падчас крыжовых паходаў у Палесціну, быў заснаваны каталіцкі духоўна-рыцарскі Тэўтонскі (Нямецкі) ордэн. Спачатку тэўтонцы дзейнічалі ў Іерусалімскім каралеўстве, а пасля вяртання ў Еўропу з 1211 па 1225 год «дыслацыраваліся» ў Венгрыі, адкуль іх хутка выгналі. У 1226 годзе мазавецкі князь Конрад запрасіў «бяздомны» ордэн на 20 гадоў у Хелмінскую зямлю (Польшча). Мэта ў князя была быццам бы і дабрачынная — уціхамірыць і ахрысціць прусаў, што ўпарта спавядалі паганства.

Не ведаў Конрад, што прыгрэў на грудзях крыжацкую змяю. Набраўшыся моцы, тэўтонцы адваявалі ў мазавецкага князя спачатку Памор'е, а затым Хелмінскую зямлю, прычым у вечнае валоданне.

1202 год стаў годам заснавання яшчэ аднаго крыжацкага ордэна — Мечаносцаў, створанага для германскай экспансіі ва Усходнюю Прыбалтыку. Самастойнасць ор-

дэн захоўваў нядоўга: ужо ў 1236 годзе літоўцы і земгалы разграмілі мечаносцаў. Праз год рэшткі ордэна Мечаносцаў зліліся з Тэўтонскім ордэнам. Такім чынам крыжакі (а тэўтонцы былі самыя агрэсіўныя з іх) амаль на два стагоддзі сталі адной з галоўных пагроз для славян і балтаў. Захапіўшы, як ужо было адзначана, Хелмінскую зямлю і Памор'е, знішчыўшы прусаў, крыжакі свой наступны ўдар нацэлілі на Вялікае княства Літоўскае. У першую чаргу тэўтонцаў цікавіла Жмудзь (этнічная Летува), якая аддзяляла іх ад роднаснага ім Лівонскага ордэна. З захопам Жмудзі ў руках крыжакоў апынулася б усё Балтыйскае ўзбярэжжа.

Каб аблегчыць выкананне сваіх планаў, у 1392 годзе Тэўтонскі ордэн увайшоў у змову з венгерскім каралём Сігізмундам Люксембургскім наконт сумеснага вядзення вайны з Польскім каралеўствам і Вялікім княствам Літоўскім. Як гэта часта бывае паміж драпежнікамі, аматары лёгкай здабычы падзялілі шкуру яшчэ незабітага мядзведзя: Сігізмунд атрымліваў Паўднёвую Польшчу і Валынь з Падоллем (Чырвоную Русь), а ордэн прыбіраў да рук Жмудзь, Белую і Літоўскую Русь, Палессе, Падляшша і Мазавецкае княства, пскоўскія і наўгародскія землі.

Першыя ваенныя сутычкі нашых продкаў з крыжакамі адносяцца ажно да пачатку XIII стагоддзя. Летапісы занатоўваюць паходы полацкіх дружын супраць крыжакоў у 1203, 1206, 1216 гадах. Адна з першых буйных бітваў з нямецкімі рыцарамі адбылася ў 1237 годзе, калі галіцка-валынскі князь Даніла Раманавіч разграміў іх пад Дарагічынам (Надбужскім). Увайшла ў гісторыю і перамога над крыжакамі наўгародскага князя Аляксандра Неўскага 5 красавіка 1242 года на Чудскім возеры. 13 ліпеня 1260 года войска Вялікага княтсва Літоўскага з дапамогай полацкіх дружын разграміла крыжакоў каля возера Дурбе.

З летапісаў вядомы набегі крыжакоў на Гродна ў 1296, 1305, 1311, 1324, 1328, 1362, 1364, 1375, 1377, 1379, 1393 і 1402 гадах. Пад сцены Полацка крыжакі наведваліся ў 1324, 1325, 1334, 1343, 1366, 1374, 1375, 1377, 1382, 1386 гадах.

Адмысловым «спецыялістам» па крыжаках быў гродзенскі кашталян князь Давыд. Ён біў крыжакоў у 1314 годзе пад Навагрудкам, вясной 1319 года вадзіў сваіх ваяроў у прускую правінцыю Вагенштορф, у 1322 годзе і двойчы ў 1323 годзе граміў нямецкіх і дацкіх рыцараў пад Псковам, у 1324 годзе хадзіў на крыжакоў у Мазовію, а ў 1326 годзе вадзіў беларусаў, палякаў і літоўцаў на Брандэнбург і Франкфурт-на-Одэры.

Буйную перамогу атрымала войска Вялікага княства Літоўскага над крыжакамі на рацэ Стрэва 2 лютага 1348 года. З летапісаў вядомыя паспяховыя бітвы нашых продкаў з рыцарамі ў 1345, 1347, 1352, 1370 гадах.

Зведалі крыжацкія напады Мядзел у снежні 1324 года, Камянец у 1373, 1375 і 1379 гадах, Дзісна ў 1374 і 1377 гадах, Ліда ў 1384, 1392 і 1394 гадах. У 1391 годзе беспаспяхова штурмаваў Навагрудак крыжацкі магістр Конрад Валенрод, у 1394 годзе — магістр Конрад фон Юнінгем і маршал Вернер Тэцінгер.

Пералік амаль шасці дзесяткаў бітваў, паходаў, набегаў, узброеных сутычак з крыжакамі, што адбыліся на працягу XIV стагоддзя, прыводзіць да высновы: гэта процістаянне не магло працягвацца бясконца, наспяваў час канчаткова адказаць на пытанне «хто каго?»: быць нашым продкам незалежнымі ці надзець на шыю крыжацкае ярмо?

У такіх варунках у снежні 1408 года (якраз на Каляды) у Навагрудку сустрэліся Ягайла і Вітаўт. І кароль, і вялікі князь прыйшлі да высновы: цярпець крыжацкую экспансію далей не выпадае, з рыцарамі трэба скончыць — раз і назаўсёды. Тут, у Навагрудку, Вітаўт з Ягайлам распрацавалі падрабязны план вайны з крыжакамі.

Праз год, 8—9 снежня 1409 года, у Брэсце здзейснілася яшчэ адна патаемная сустрэча Ягайлы і Вітаўта, дзе кароль і вялікі князь узгаднілі некаторыя дэталі навагрудскага плана і вызначылі тактыку ваенных дзеянняў супраць вялікага магістра Ульрыха фон Юнгінгена.

У сакавіку 1410 года адбыўся апошні і, бадай што, самы трагічны набег крыжакоў на Беларусь. Вёў рыцараў сам вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген. У Вербную ня-

дзелю крыжакі нечакана ўварваліся ў святочны Ваўкавыск і ўчынілі ў горадзе жудасную разню, перабіўшы большую палову насельніцтва.

У чэрвені 1410 года саюзнікі (Польскае каралеўства і Вялікае княства Літоўскае) пачалі збіраць войскі да вызначанага яшчэ ў Брэсце месца. Палякі выступілі з раёнаў канцэнтрацыі каля Кола і Вольбажа. Харугвы Вітаўта ішлі з-пад вытокаў Нарава па правым беразе Буга. 30 чэрвеня войскі сышліся на Вісле, каля Чэрвінска.

14 ліпеня крыжацкія войскі і харугвы Ягайлы і Вітаўта сталі непадалёку ад Таненберга (цяпер гэта Стэмбарк).

На Дубровенскім полі сонечным і ветраным ліпеньскім ранкам сышліся не проста два войскі. Гэта было сутыкненне дзвюх ідэалогій, дзвюх палітык, двух поглядаў на



Грунвальдская бітва. Гравюра з Хронікі ўсяго свету Марціна Бельскага. 1564 г.

жыццё. У жорсткай сечы сутыкнуліся, па-сутнасці, Еўропа крыжацкая, агрэсіўная, і Еўропа славянская, што бараніла сваё годнасць і незалежнасць.

Глыбока памыляецца той, хто лічыць, што Тэўтонскі ордэн — магутная рэлігійна-вайсковая сіла, якая ўпарта экспансіяніравала на славянскі ўсход — быў выключна нямецкім. Гэты ордэн стаў прытулкам для аматараў лёгкай нажывы, рыцараў-рабаўнікоў з усяго Старога Свету. У сталіцу крыжакоў — крэпасць Мальбарк — напярэдадні Грунвальдскай бітвы зехаліся лепшыя ваяры з Аўстрыі і Баварыі, Швабіі і Швейцарыі, Бургундыі і Францыі, Даніі і Фландрыі, Англіі і Іспаніі — карацей кажучы, адборная вайсковая эліта з усёй Заходняй Еўропы.

Не мае рацыі і той, хто сцвярджае, што крыжакам на Дубровенскім полі процістаялі толькі палякі і літоўцы. Войска караля Уладзіслава (Ягайлы) і вялікага князя Вітаўта было куды больш інтэрнацыянальным.

Як сведчаць гісторыкі, з пяцідзесяці польскіх харугваў сем выставілі падпарадкаваныя на той час польскаму каралю ўкраінскія землі. Ян Длугаш у сваёй «Гісторыі Польшчы» (у рускім перакладзе выйшла ў 1962 годзе пад назвай «Грюнвальдская битва») называў наступныя ўкраінскія палкі: Галіцкі, Львоўскі, Перамышленскі, Холмскі і тры Падольскія.

Як вядома, Вялікае княства Літоўскае было прадстаўлена пад Грунвальдам сарака харугвамі. Той жа Ян Длугаш пералічвае палову з іх: Брэсцкую, Ваўкавыскую, Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Драгічынскую, Кіеўскую, Ковенскую, Крамянецкую, Лідскую, Медніцкую, Навагрудскую, Полацкую, Пінскую, Старадубскую, Смаленскую, Трокскую, а таксама харугвы князя Жыгімонта-Карыбута, князя Сямёна-Лінгвена Мсціслаўскага і князя Юрыя. Пісьменнік Кастусь Тарасаў, аўтар гістарычнага рамана «Пагоня на Грунвальд», называе да таго ж харугвы Крэўскую, Мінскую, Магілёўскую, Аршанскую, Слуцкую, Ноўгарад-Северскую, Ратненскую. Ён жа дадае, што выставілі на бітву свяіх ваяроў Нясвіж, Чартарыйск, Кобрын, Лукомль, Ушполле, Вількамір, Заслаўе.

Адным словам, на крыжакоў выйшлі фактычна ўся Польшча, уся Украіна, уся Літва (Жмудзь), уся Беларусь.

Як зноў жа адзначаюць гісторыкі, пад сцягамі Ягайлы і Вітаўта змагаліся чэхі, маравы, сербы, бесарабы, валахі. У бітве прыняла дзейсны ўдзел лёгкая татарская конніца хана Джэлал-эд-Дзіна.

Можна зразумець польскіх гісторыкаў, пачынаючы з таго ж прыдворнага каралеўскага летапісца Яна Длугаша і канчаючы сучасным даследчыкам, аўтарам шырока вядомай працы «Вялікая вайна з ордэнам крыжакоў у 1409—1411 гадах» Стафанам Кучынскім. Кіруючыся пачуццём нацыянальнага патрыятызму, яны, мякка кажучы, прыменшылі ролю літоўскіх і беларускіх харугваў у разгроме Тэўтонскага ордэна. Што ні кажы, а для палякаў з іх складанай і трагічнай мінуўшчынай, трыма грабежніцкімі падзеламі Рэчы Паспалітай, што паклалі горкі вынік тысячагадовай польскай дзяржаўнасці, Грунвальд быў, ёсць і будзе сімвалам магутнай Польшчы, гордасцю нацыі. Магчыма, якраз гэта ў цэлым здаровае пачуццё і спарадзіла неабгрунтаваныя перахлёсты ў ацэнцы тых даўніх падзей. Для пацверджання гэтага меркавання — невялікі ўрывак з ужо згаданага рамана класіка польскай літаратуры Генрыка Сянкевіча «Крыжакі»...

«Прыпаўшы да конскіх холак і наставіўшы дзіды, рыцары рынуліся наперад.

Але Літва не ўстаяла пад страшэнным націскам немцаў... Людзі і коні цяснілі злашчасныя рацці Вітаўта, іх рубілі мячы і сякіры, праціналі і крушылі бердышы, тапталі конскія капыты. Марна князь Вітаўт кідаў на смерць усё новыя і новыя рацці, марнай была ўпартасць, дарэмнай пагарда да смерці, дарэмнымі былі рэкі крыві. Спачатку рассыпаліся татары, бесарабы і валахі, а хутка падалася і сцяна літвінаў, і дзікая разгубленасць ахапіла ўсіх воінаў.

Большая частка літоўскага войска пабегла ў бок возера Любень, а за ёй кінуліся ў пагоню галоўныя нямецкія сілы; тысячамі касілі крыжакі ўцекачоў, так што ўвесь бераг быў завалены трупамі....

Але з палякамі Ліхтэнштэйну не так лёгка было спраўіцца, таму што і браня і коні былі ў іх ненамнога горш,

а рыцарская вывучка аднолькавая. Польскія цяжкія дзіды спынілі немцаў і адкінулі іх назад...»

Даруем Генрыку Сянкевічу яго міжвольны грэх (адзначыўшы, аднак, што, відаць, большасць палякаў прадстаўляюць Грунвальдскую бітву якраз па Сянкевічу). Сучасныя гісторыкі дакладна высветлілі, што панічных уцёкаў войска Вялікага княства Літоўскага з поля бою не было. Гэта на падставе вывучэння шматлікіх гістарычных дакументаў даказвае той жа паляк Стафан Кучынскі. Стойкасць і мужнасць харугваў Вітаўта пацвярджае і нямецкі даследчык М. Пасільге ў «Хроніцы Прускай зямлі». Пра тое ж сведчыць і аўтар Хронікі літоўскай і жамойцкай: «... Потым ударылі ў катлы, у сурмы і адразу літва з татарамі з вялікай пруткасцю накінуліся на немцаў і распачалі з імі бітву, так, што конь аб каня бакамі аціраўся. Вітаўт і сам бегаючы, сваіх успамінае і рады напраўляе, палякі ж з каралём сваім узялі немцаў на палашы... А потым бачаць немцы, што вельмі шмат іх трупаў ляжыць на полі, і пачалі ўцякаць, а палякі і літва з татарамі гналі іх, б'ючы, страляючы, колючы, на некалькі міль, а знатнейшых афіцэраў паланілі і павязалі, самога магістра прускага Ульрыха просты воін ашчэпам забіў. У той вайне не ўсе нашы біліся, другі і шаблі не вымаў, бо было поле цеснае. А Вітаўт татар з літвою пусціў, бурачы прусаў агнём і мячом, невыносную ўчынілі шкоду».

Ды і той жа Ян Длугаш (а на яго «Гісторыю Польшчы», безумоўна, арыентаваўся Генрык Сянкевіч, працуючы над сваім раманам) пазней адзначаў, што войска Вялікага княства Літоўскага змагалася да завяршэння кампаніі і арганізавана пакінула межы Тэўтонскага ордэна 18 верасня 1410 года.

Яўным непаразуменнем з'яўляецца і тое, што войска Вялікага княства Літоўскага, якое ўдзельнічала ў Грунвальдскай бітве, многімі гісторыкамі настойліва называецца або літоўскім, або літоўска-рускім. Як адзначае ў сваёй кнізе «Славутыя адвагай на вайне» Станіслаў Цярохін (спасылаючыся на меркаванне аўтарытэтнага знаўцы гісторыі Вялікага княства Літоўскага Ц. Вострыкава), суадносіны беларусаў і літоўцаў у тагачасным войску кня-

ства былі 23 да 1. Гэта адпавядала этнічнаму складу Вялікага княства Літоўскага, якое было, без усялякіх сумненняў, пераважна беларускім.

Трэба адзначыць, што выключнае значэнне Грунвальдскай бітвы як для беларусаў, так і для другіх народаў (у тым ліку і рускага) доўгія дзесяцігоддзі замоўчвалася савецкімі гісторыкамі (і што асабліва крыўдна — беларускімі). Бітва на Дубровенскім полі была грандыёзнай для свайго часу. Па розных ацэнках, у ёй з абодвух бакоў удзельнічала ад 90 да 250 тысяч ваяроў. Войска Вялікага княства Літоўскага, на думку даследчыкаў, складалася з 30 — 40 тысяч ратнікаў. Вынікам сакрушальнага разгрому крыжакоў сталася тое, што нага ўзброенага немца больш пяці стагоддзяў — да 1914 года — не ступала на землі ўсходніх славян. Тым не менш савецкія школьныя падручнікі гісторыі (ужо згаданы Станіслаў Цярохін, у прыватнасці, спасылаецца на «Хрэстаматыю па гісторыі БССР») пра Грунвальд не абмаўляліся і словам, быццам бы яго і не было. Затое Неўскай бітве ў той жа школьнай «Хрэстаматыі» была адведзена цэлая старонка.

Але ж любому гісторыку добра вядома, што бітва князя Аляксандра Яраславіча са шведамі на Няве 15 ліпеня 1240 года (цікавае супадзенне дат!) была, па сутнасці, «боем мясцовага значэння» ў параўнанні з Грунвальдскай, самай буйной у часы сярэдневякоўя. Тады супраць пяцітысячнага шведскага дэсанта пад началам Ярла Біргера выступілі невялікая наўгародская дружына і атрад палачан.

Лакальны характар насіла і знакамітае Лядовае пабоішча 5 красавіка 1242 года. З абодвух бакоў у ім удзельнічала каля 25 тысяч чалавек. Было забіта 400 нямецкіх рыцараў і 50 узята ў палон. У той жа час пад Грунвальдам палягло 40 тысяч крыжакоў і 15 тысяч трапілі ў палон.

Такім чынам, па сваіх маштабах і палітычнаму значэнню Грунвальдскую бітву з поўным правам можна паставіць у адзін шэраг з Кулікоўскай і Барадзінскай. Але ў «Хрэстаматыі па гісторыі Беларусі» для студэнтаў гістарычных факультэтаў ВНУ рэспублікі пра Грунвальд — ані слова!

Пагартаем першы том «Гісторыі Беларускай ССР», выдадзенай у 1972 годзе Інстытутам гісторыі Акадэміі навук БССР. Акадэмічнае выданне пра Грунвальд усё ж такі згадала, але абмежавалася двума невялічкімі абзацамі, дзе, праўда, было адзначана, што бітва была «адной з буйнейшых у эпоху еўрапейскага сярэдневякоўя» і «мела велізарнае гістарычнае значэнне», таму што «прыпыніла агрэсію нямецкіх феадалаў супраць польскіх, літоўскіх, беларускіх і рускіх зямель». Забягаючы наперад, зазначым, што ў акадэмічным выданні 1994 года «Нарысы гісторыі Беларусі» Грунвальдскай бітве было адведзена ўжо амаль дзве старонкі...

Чаму так адбывалася? Магчыма, адказ на пытанне ў тым, што тагачасны маскоўскі ўладар вялікі князь Васіль I (дарэчы, сын легендарнага Дзмітрыя Данскога) адмовіўся ўдзельнічаць у паходзе супраць агульнага лютага ворага славян — Тэўтонскага ордэна. Адмовіўся, нягледзячы нават на тое, што меў за жонку дачку вялікага князя літоўскага Вітаўта — Соф'ю. Мэта гэтай адмовы даволі празрыстая: у выпадку разгрому войска Вялікага княства Літоўскага і яго непазбежнага паслаблення пашырыць пры выпадку свае ўладанні за кошт заходняга суседа.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што рускія ратнікі прынялі ўдзел у Грунвальдскай бітве. Пад началам князя Сямёна Мсціслаўскага змагалася дружына з Вялікага Ноўгарада. І біліся наўгародцы, трэба аддаць ім належнае, выдатна.

Пазіцыя савецкіх гісторыкаў у адносінах да Грунвальда ў святле гэтых фактаў становіцца зразумелай: раз маскоўскіх войскаў на Дубровенскім полі не было, значыць, пра Грунвальдскую бітву не варта ўспамінаць. Не наша, маўляў, гісторыя, а польская. Беларускія ж калегі, па прыкладу суседзяў, відаць, адмовіліся ад лаўраў пераможцаў на карысць літоўцаў.

Дарэчы, у першай частцы «Гісторыі Беларусі» (выдавецтва «Універсітэцкае», 1998 год) перамозе ў Грунвальдскай бітве прысвечана ўсяго сямнаццаць радкоў, а ацэнка яе куды больш стрыманая, чым нават у часы існавання БССР.

Але час паступова расстаўляе ўсё па сваіх месцах. Сёння ўжо відавочна, што пераломам у ход Грунвальдскай бітвы ўнеслі менавіта беларускія харугвы (дарэчы, войска Вялікага княства Літоўскага ўступіла ў бой з крыжакамі на некалькі гадзін раней за польскія харугвы, якія Ягайла стрымліваў ад сутычкі) — аршанскія, мсціслаўскія, смаленскія, менскія, заслаўскія ваяры на чале з князем Сямёнам Мсціслаўскім. Яго харугвы палеглі амаль цалкам, але ўстаялі пад націскам крыжакоў і тым самым падрыхтавалі спрыяльныя ўмовы для сакрушальнага ўдару ў адказ.

Вось як апісвае гэты эпізод бітвы Кастусь Тарасаў у рамане «Пагоня на Грунвальд»: «На ўсім полі бітвы, ад Таненберга да Людвікова, не было больш свірэпай сечы, чым завязалася тут; нідзе не рубіліся з такой лютасцю, нідзе не гінула столькі літвінаў і немцаў. Палічыўшы гэтую ярасць адпора апошняй успышкай сілы, знакам блізкай перамогі, крыжакі заспявалі свой ордэнскі гімн.

А Сямён Мсціслаўскі, не дачакаўшыся падмогі, аддаў палкам свайго крыла загад — стаяць насмерць. І тысячы ваяроў, што прайшлі тысячавёрстныя шляхі ад родных хат, ад ціхіх рэчак сюды, на прускую зямлю, сумленна прынялі лёс — стаць і выстаяць, не шкадуючы жыцця. Дух паўстаў супраць духа, тэўтонскі супраць славянскага — хто каго перасіліць. Маленькі, у трэць вярсты, узгорысты ўчастак стаў стрыжнем бітвы. Больш шасці тысяч чалавек рубіліся тут, быццам ведалі, што адсюль пачнецца або перамога, або разгром.

Да адзінага чалавека растаяла першая смаленская харугва, ад другой і трэцяй засталося па палове, палеглі мсціслаўцы, менчукі, заслаўцы, але ані на крок не прасунуліся наперад немцы, клін іх змяўся, змірыўся з няўдачай...»

Каля 40 тысяч ваяроў складала войска Вялікага княства Літоўскага. Амаль 20 тысяч з іх (кожны другі) злажылі галовы ў лютай сечы пад Грунвальдам.

Сярэдневяковы паэт-лацініст Ян Вісліцкі ў сваёй паэме «Пруская вайна», напісанай у 1516 годзе, даў беларусам кароткую, але ёмістую, а галоўнае — гістарычна дакладную характарыстыку: «Беларусы славутыя сваёй адва-



Мемарыял у гонар Грунвальдскай бітвы на Дубровенскім полі. Польшча, Альштынскае ваяводства

гай на вайне». Аддаў паэт даніну павагі і тым з герояў бітвы на Дубровенскім полі, хто «з вялікім гонарам і з невымоўным звіцязтвам, і на ўвесь свет знакамітую славу асягнуўшы», вярнуўся на родную зямлю.

Дзякуй табе, Ян Вісліцкі! А што ж мы, нашчадкі вяроў Грунвальда? Што зрабілі мы, каб увекавечыць свет-

лую памяць сваіх мужных продкаў? На жаль, толькі ў Гродне ёсць вуліца (далёка не цэнтральная), якая атрымала назву Грунвальдскай. А дзе помнікі ў гонар землякоў, што загінулі на Дубровенскім полі? Можа, у Навагрудку, дзе Ягайла і Вітаўт рашылі даць крыжакам рашучы бой? Ці, можа, у Брэсце, дзе кароль і вялікі князь абмеркавалі канчатковы план разгрому Тэўтонскага ордэна? А можа, у Мсціслаўлі, вотчыне князя Сямёна, героя Грунвальдскай бітвы? Тут зноў жа вызначыліся толькі гродзенцы, якія, адзіныя ў Беларусі, усталявалі паблізу старажытнай Каложскай царквы памятны знак у гонар 580-годдзя Грунвальдскай бітвы.

Не за гарамі 600-годдзе легендарнай бітвы. Можа, надышоў, нарэшце, час, каб аддаць належнае светлай памяці нашых славутых адвагай на вайне продкаў, якія сумленна прынялі свой лёс на Дубровенскім полі?

## Крыніцы

*Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.*

*Длугош, Ян. Грюнвальдская битва /Ян Длугош. — М.; Л., 1962.*

*Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь. Полацкі і Навагародскі перыяды /М. Ермаловіч. — Мінск, 1990.*

*Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд / М. Ермаловіч. — Мінск, 1994.*

*Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі /У.М. Ігнатоўскі. — Мінск, 1991.*

*Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі /В.Ю. Ластоўскі. — Мінск, 1993.*

*Насевіч, В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы /В. Насевіч. — Мінск, 1993.*

*Сенкевич, Г. Крестоносцы /Г. Сенкевич. — Минск, 1983.*

*Тарасаў, К. Памяць пра легенды /К. Тарасаў. — Мінск, 1990.*

*Тарасов, К. Погоня на Грюнвальд /К. Тарасов. — Минск, 1992.*

*Цярохін, С. Славутыя адвагай на вайне /С. Цярохін.— Мінск, 1991.*

*Чаропка, В. Імя ў летапісе /В. Чаропка. — Мінск, 1994.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 3. — Мінск, 1996.*

*Kuczyński S. Wielka wojna z Zakonem Krzyżackim w łatach 1409—1411. 5 wyd. / S. Kuczyński. — Warszawa, 1987.*

*Samsonovicz H. Krzyżacy /H. Samsomovicz. — Warszawa, 1988.*

# «ГАРАДЫ АДЧЫНЯЛІ ІМ БРАМЫ»

Із-пад Слуцка, із-пад Клецка
Едзе дружба маладзецка,
Ад княжаці із-пад Мінска
Ваяваці места Пінска —
Места Пінска ваяваці,
Ад ляхоў абараняці.
Хоць прыйшлі — не далі рады,
Усе пагінулі ад здрады.
А я пайду ў Пост Вялікі
Да Турова, да Владыкі,
Каб малебен адслужыці,
Ды пакаюсь за грахі,
Дзень і ноч буду маліці,
Дзень і ноч буду прасіці,
Каб загінулі ляхі.

Песню гэту, па сведчанні Вацлава Ластоўскага, яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя спявалі на Беларусі, у першую чаргу — у Прыпяцкім Палессі. Падзеі, пра якія распавядала песня, адбываліся тут восенню 1648 года, а дакладней — у кастрычніку, калі падчас так званай казацкай вайны ўзбунтаваўся і быў жорстка пакараны горад Пінск.

Перш чым расказаць пра драматычныя падзеі, хацелася прывесці пэўныя меркаванні, якія існуюць на іх конт. І не столькі з нагоды канкрэтных пінскіх узрушэнняў восені 1648 года, колькі наконт перыяду беларускай гісторыі, які ў розных крыніцах атрымаў назвы «вызваленчай барацьбы беларускага народа», «народнага паўстання», «казацкага бунта», «казацка-сялянскай вайны» і, нарэшце, «антыфеадальнай вайны 1648—1654 гадоў».

Пры самых розных меркаваннях, якія тычацца сутнасці гэтых падзей, даследчыкі, што давалі ім ацэнку (Міка-

лай Кастамараў, Вацлаў Ластоўскі, Усевалад Ігнатоўскі, Лаўрэнцій Абэцэдарскі, Васіль Мялешка — не сакрэт, гісторыкі даволі адрозных поглядаў), у адным згодныя паміж сабой: «кіруючай і напраўляючай сілай», ужываючы сучасны тэрмін, маторам «бунта—паўстання—барацьбы—вайны» былі ўкраінскія казакі на чале з легендарным Багданам Хмяльніцкім.

Безумоўна, сацыяльна-палітычныя варункі на Беларусі ўжо з канца папярэдняга стагоддзя (асабліва пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 года) таілі ў сабе пэўную небяспеку выбуху. Казакі — ваяўнічыя, адчайныя, бесшабашныя — на канцах сваіх вострых шабляў прынеслі на Беларусь іскры непакоры і волі. Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што ўпалі яны, так бы мовіць, не ў сырое палескае балота, а ў сухі баравы мох...

Казацтва як з'ява з'явілася свайго роду гістарычным феноменам. Спрэчкі вакол паходжання казакоў вядуцца даўно. Большасць даследчыкаў схіляецца да таго, што іх продкі мелі неславянскае паходжанне. Так, Вітаўт Чаропка выказвае меркаванне, што «... заснавальнікамі казацкага руху былі чаркасы або пяцігорцы. Гэта нашчадкі хазараў, якія жылі на Доне і Кубані, каля прадгор'яў Каўказа — у раёне Пяцігорска».

Вядомы руска-ўкраінскі гісторык Мікалай Кастамараў лічыў, што «казацтва — бясспрэчна татарскага паходжання, як і сама назва казак, што абазначае па-татарску бадзягу, вольнага ваяра, вершніка. Пасля заснавання крымскага царства і заняцця ордамі чарнаморскіх краін татарскія вершнікі сталі трывожыць рускіх жыхароў абедзвюх існаваўшых тады дзяржаў — Маскоўскай і Літоўскай. Яны адпраўляліся на ваенныя подзвігі па сваёй волі і без загаду і часта без дазволу сваіх старшых. Такіх называлі казакамі... Рускія, прымушаныя адбіваць татарскія набегі, мімаволі павінны былі засвойваць і тыя спосабы і прыёмы, што ўжывалі іх ворагі, і, такім чынам, у рускіх з'явілася такое ж казацтва, якое было ў татар. Узніклі і рускія казакі».

Недзе з XIV стагоддзя казакамі сталі называць вольных людзей з ліку вызваленых ад падаткаў сялян, якіх

рассялялі ў памежных раёнах. Галоўнай іх задачай было нясенне вартавой службы супраць набегаў ваяўнічых качэўнікаў.

Па сведчанні Вітаўта Чаропкі, у дачыненні да Вялікага княства Літоўскага казакі ўпершыню згадваюцца Хронікай літоўскай і жамойцкай пад 1429 годам, калі войска Вялікага княства Літоўскага хадзіла ў паход на Волгу.

Калі верыць Кастамараву, ужо ў канцы XV стагоддзя ў Вялікім княстве Літоўскім казаком лічылі ваяра, які, аднак, займаўся рамёствамі і гандлем. «Пры Жыгімонце I і Жыгімонце Аўгусту, — адзначаў гісторык, — былі два роды казакоў: адных набіралі старосты з каралеўскіх мястэчак і валасцей; другія збіраліся ў вольныя шайкі і выбіралі самі сабе правадыроў».

Але па-сапраўднаму ўплывовай і дастаткова самастойнай сілай казацтва стала тады, калі ўзнікла легендарная Запарожская Сеч — своеасаблівы правобраз вольнай казацкай дзяржавы. Дакладная дата яе ўзнікнення не вядома. Але засведчаны факт, што ў 1533 годзеканеўскі староста Яўстафій Дашковіч на пётркаўскім сейме прапанаваў размясціць на астравах у ніжнім цячэнні Дняпра пастаянную казацкую варту ў 2000 чалавек. Прыкладна праз 30 гадоў князь Дзмітрый Вішнявецкі пабудаваў на востраве Хорціца ўмацаванне і размясціў там казакоў. Нарэшце, у грамаце Жыгімонта Аўгуста пад 1568 годам паведамляецца, што казакі на ніжнім Дняпры «не толькі ходзяць, як раней бывала, але і перамешківаюць, гэта значыць, жывуць».

Якім чынам фарміравалася казацтва? Вось меркаванні Усевалада Ігнатоўскага: «Ня маючы сілы змагацца з панам, мужык уцякаў ад яго туды, дзе аблогам ляжалі вольныя землі, куды панская дзяржава яшчэ не працягнула сваіх рук, — на поўдзень, у шырокія дняпроўскія стэпы. Там толькі станавіўся ён вольным чалавекам, казаком. З цягам часу ўсё больш і больш народу шукала паратунку ад уціску на поўдні, і к пачатку XVII сталецця паўднёвыя стэпы на сваім абшары сабралі вялікую грамаду казацкага люду».

На думку Вітаўта Чаропкі, які грунтуецца на меркаванні В. Ластоўскага і У. Пічэты, што менавіта беларускія сяляне стварылі Запарожскую Сеч, «добрая частка запарожскіх казакоў паходзіла з літвінскіх земляў — тысячы і тысячы ўцекачоў з Літвы (Беларусі) папаўнялі казацкія шэрагі... Часта казакі-літвіны вярталіся на Літву пlivквітацца са сваімі ворагамі — панамі і шляхтай».

Набліжаючыся да высвятлення прычын казацкіх узрушэнняў канца XVI — першай паловы XVII стагоддзя, варта ўспомніць меркаванне Усевалада Ігнатоўскага, які бачыў значную розніцу паміж казацкімі бунтамі Масковіі і Літвы. На яго думку, прыволжскія і данскія казакі абураліся «проці свайго гаспадарства з прычын палітычна-сацыяльных». У адрозненне ад іх украінскія казакі, сярод якіх, як мы ўжо адзначалі, было многа беглых сялян з Беларусі, бунтавалі не толькі «з прычын палітычна-сацыяльных, але і з прычын рэлігійных і нацыянальных». «Яма паміж заходнім казаком і гаспадарствам, — заўважае Ігнатоўскі, — была куды глыбей, чым яма паміж гаспадарствам і ўсходнім казаком».

Адносіны да казакоў з боку ўлад у Літве і Польшчы былі дастаткова складаныя. З аднаго боку, яны, як ужо



Бой войска Рэчы Паспалітай з казакамі. Барэльеф з Сен-Жэрменскага сабора (Францыя). XVII ст.

адзначалася, неслі вельмі важную для дзяржавы памежную службу. З другога, як сведчыў Вацлаў Ластоўскі, «яны жылі з вайны, калі-нікалі нападаючы на туркаў і татараў і вызываючы гэтым войны паміж Польшчай і Турцыяй. Турцыя, выведзеная з цярпення казацкімі напасьцямі, не раз гатовілася да вялікай вайны з Польшчай, хочучы зваяваць заадно і Польшчу, і яе казакоў...».

І вось яна — прычына казацкага бунта. Ластоўскі бачыў яе ў наступным: «Каб не дапусьціць да вайны, Польшча пастанавіла прыцiснуць казакоў, адбіраючы ім прывілеі караля Баторага і ўсе тыя правы, якія яны дагэтуль мелі. Тады казакі ўзбунтаваліся і напалі на Польшчу».

Казацкія паўстанні канца XVI стагоддзя (кіраўнікі — Севярын Налівайка, Рыгор Лабада, Крыштаф Касінскі) і пачатку XVII стагоддзя (кіраўнікі — Тарас Паўлюк, Астранін), згодна з Ластоўскім, былі адказам на спробу ўлад зрабіць замах на вольнасці і прывілеі казакоў. Як вядома, гэтыя крывавыя падзеі, закрануўшы, дарэчы, і Беларусь, скончыліся для казакоў паражэннем і новым, яшчэ больш жорсткім наступам на іх правы. Вынікам яго стала тое, што ў лютым 1638 года каля ўкраінскага мястэчка Трохцяміраў была склікана вялікая рада, на якой казакі вымушаны былі даць прысягу ў тым, што яны будуць слухаць урад, не стануць хадзіць на мора, не будуць заводзіць чарнячых рад, не асмеляцца прымаць нікога ў сваё саслоўе і будуць гатовыя ўціхамірваць свавольства халопаў, як толькі будзе патрэбна.

Мікалай Кастамараў так апісвае далейшае развіццё падзей, якія ён называе «знявагай казацтва». «Па просьбе казакоў, — сведчыў гісторык, — 9 верасня (1638 г. — *С.А.*) была прызначана рада ў прысутнасці кароннага гетмана. Зразумела, разважанні казакоў не маглі быць вольнымі. На гэтай радзе выбралі чатырох паслоў да караля: Рамана Полаўца, Івана Баярына, Яца Ваўчанка і Багдана Хмяльніцкага. У інструкцыі, дадзенай ім, яны не смелі ўжо, як рабілася раней, прасіць вяртання старадаўніх вольнасцей, малілі толькі пакінуць ім зямлю і маёмасць і абяцалі ва ўсім падпарадкоўвацца волі ўрада...

Праз тры месяцы, 4 снежня, польны гетман сабраў казакоў ва ўрочышчы Маслаў-стаў слухаць рашэнне караля і Рэчы Паспалітай. Казакі пазбаўляліся сваіх ранейшых правоў і не маглі выбіраць сабе начальнікаў. Замест выбранага з іх асяроддзя гетмана, як яны самі яго называлі, або старшага, як тытулавалі яго раней палякі, прызначылі ім камісара шляхціца... Палкоўнікі на шэсць палкоў прызначаны былі таксама з асоб шляхецкага звання... Вайсковымі есауламі былі асобы з казакоў, але з тых, што асабліва вызначыліся вернасцю Рэчы Паспалітай... Ранейшы пісар, Багдан Хмяльніцкі, пазначаны ў ліку сотнікаў чыгірынскага палка; ён, можа быць, быў паніжаны ў годнасці за ўдзел у двух апошніх паўстаннях...»

Абраза, знявага для вольналюбнага казацтва была страшэнная. «Ні гонару ім, ні славы не было, — адзначалася ў адным з украінскіх летапісаў, — бяда іх сталася горш турэцкай няволі; палкоўнікі і ўсе старшыны шляхціцы абыходзіліся з імі як з рабамі і загадвалі тапіць свае печы, даглядаць коней і сабак, чысціць двары свае. Гэта ж рабілі з імі старосты і падстаросты».

Адзін з непасрэдных сведкаў «казацкай знявагі» Багдан Хмяльніцкі (па сведчанні Вітаўта Чаропкі, сын літвінскага шляхціца, забітага ў бітве з туркамі каля Цацоры) да таго ж быў страшэнна абражаны асабіста: чыгірынскі падстароста Чаплінскі напаў на хутар Хмяльніцкага Суботаў, разрабаваў яго, захапіў палюбоўніцу гетмана — польку, чатыры дні пратрымаў у кайданах гаспадара; зяць Чаплінскага — Камароўскі люта высек дзесяцігадовага сына Хмяльніцкага, і на другі дзень хлопчык памёр...

Шматлікія звароты Хмяльніцкага ў суд, нават да караля Уладзіслава IV, вынікаў не далі — нахабнае свавольства Чаплінскага засталося непакараным.

Знявагу казакі цярпелі дзесяць гадоў. Вясной 1648 года яны ўзнялі паўстанне. Узначаліў казацкі рух Багдан Хмяльніцкі.

Чаго хацелі паўстаўшыя ўкраінскія казакі? Афіцыйны пункт гледжання ў свой час выказаў Лаўрэнцій Абэцэдарскі, які, адзначаючы, што «рэлігійная процілегласць



Бой украінскіх казакоў з флатыліяй войска Вялікага княства Літоўскага на Дняпры. Галандскі мастак Абрагам ван Вестэрфельд, які служыў пры двары Януша Радзівіла. 1651 г.

паміж народнымі масамі праваслаўнага веравызнання і іх прыгнятальнікамі, пераважна каталікамі, жорсткі нацыянальна-рэлігійны прыгнёт мас шмат у якіх выпадках надавалі вызваленчай барацьбе рэлігійную афарбоўку», сцвярджаў, быццам барацьба казакоў і падтрымаўшых іх беларусаў «мела класавы характар».

Больш канкрэтным выглядае меркаванне Вацлава Ластоўскага, які лічыў, што Хмяльніцкі «пастанавіў адамсьціць... паном за сябе і за свой народ».

Блізкае да гэтага меркаванне Усевалада Ігнатоўскага: «З вялікай збройнаю сілаю ішоў Хмяльніцкі на помсту ў Польшчу, маючы на мэце выбіць з панскай няволі як казакоў, так і просты народ».

Згодна з Кастамаравым, Хмяльніцкі «вырашыў адпомсціць панам-ляхам вайною не за сваю толькі крыўду, але за зневажанне веры рускай і за ганьбаванне народа рускага».

Цікавыя высновы робіць сучасны даследчык Васіль Мялешка. Ён аспрэчвае ранейшае меркаванне, што і казакі,

і беларускія сяляне змагаліся супраць «польскіх паноў, за ўз'яднанне з Расіяй». На яго думку, барацьба ішла «не за змягчэнне феадальнага прыгнёту, паслабленне тых або іншых павіннасцей, самавольстваў пануючага класа. У названыя гады мэтай іх барацьбы было вынішчэнне шляхты, незалежна ад яе этнічнага паходжання, як галоўнага віноўніка няшчаднага прыгнёту».

Якраз у гэтым відавочнае супадзенне інтарэсаў казацкага і сялянскага рухаў.

Натуральна паўстае і другое пытанне: чаго шукалі ўкраінскія казакі на Беларусі? Пануючым меркаваннем з'яўляецца наступнае: казакі прыйшлі на Беларусь, каб дапамагчы тутэйшым сялянам і гарадской беднаце ў іх класавай барацьбе з польскімі панамі і каталіцкім і уніяцкім духавенствам. Але гэта, здаецца, толькі палова праўды, а можа, і значна меншая яе частка. Безумоўна, Хмяльніцкі шукаў на Беларусі паплечнікаў у сваёй барацьбе. Непакоілі яго і значныя вайсковыя сілы, якія мела тут Вялікае княства Літоўскае, — яны ўяўлялі з сябе пагрозу для казакоў, і іх трэба было нейтралізаваць.

Праўда, ёсць яшчэ адно меркаванне наконт мэтаў «беларускага рэйда» казацкіх загонаў. Безумоўна, яно дастаткова спрэчнае, але, як і любое другое, мае права на жыццё. Гісторыкі, якія ў 1993 годзе падрыхтавалі вучэбны дапаможнік для вайскоўцаў «Гісторыя Беларусі», высоўваюць наступную версію: «Украінскі гетман і казацкая старшына мелі планы стварэння сваёй дзяржавы, у межы якой яны хацелі ўключыць і землі паўднёва-ўсходняй Беларусі. Б. Хмяльніцкі яшчэ ў маі 1648 г. пачаў засылаць у гэтыя раёны сваіх агітатараў, а затым і казацкія загоны для пачатку ваенных дзеянняў. Такім чынам у паветах, якія былі найбольш патрэбны казацкай старшыне, інспіраваўся вызваленчы рух мясцовага насельніцтва».

Як жа разгортваліся падзеі на Беларусі? Звернемся да сведчанняў Мікалая Кастамарава. «Першы, хто прынёс у Белую Русь заклік да вызвалення, — пісаў гісторык, — быў шляхціц Галавацкі, які згуртаваў апалчэнне каля Старадуба... Галавацкі з Старадуба ўступіў у Беларускі край, хутка пайшоў адтуль, але наведванне яго пакінула сляды;

сяляне, распаленыя адозвамі Хмяльніцкага, аддавалі агню і мячу ўладальніцкія сядзібы і рымска-каталіцкую святыню. Паўстанне распаўсюдзілася па Беларусі з хуткасцю. Сяляне аб'ядналіся ў загон пад кіраўніцтвам Нябабы, родам з Карастышэва, і кінуліся вынішчаць неправаслаўных. Разам з ім бушавалі другія загоны Напаліча, Хвясько, Міхенкі, Крывашапкі, Гаркушы. Гарады Гомель, Лоеў, Брахін (Брагін. — С.А.) адчынялі ім брамы. Літоўскі гетман (Януш Кішка. — С.А.) ляжаў пры смерці; памочнік яго (Януш Радзівіл. — С.А.) быў у адлучцы. Паўстанцы доўга не сустракалі ніякага супраціву; толькі аршанская шляхта пад началам Друцкага-Горскага вяла з імі партызанскую вайну; нарэшце польны гетман Януш Радзівіл паслаў супраць іх Мірскага і польнага пісара літоўскага Валовіча ў розныя бакі з дружынамі некаторых паноў. Мірскі быў разбіты ўшчэнт пры вёсцы Горвалі на Бярэзіне. Валовіч пайшоў супраць Нябабы. Мяцежнікі пераправіліся цераз Прыпяць; у гэты ж час ўдарыў нечакана на іх Валовіч і загнаў у горад Пінск...»

Пад сценамі Пінска затрымаемся на нейкі час і кінем позірк на шэрагі супрацьлеглых бакоў. Хто ж і супраць каго ўзняў зброю?

На Беларусі да ўкраінскіх казакоў далучыліся самыя розныя колы мясцовага насельніцтва — сяляне, гарадскія рамеснікі або мяшчане (нават заможная іх частка), дробная праваслаўная шляхта і праваслаўнае духавенства (па сведчанні Ігнатоўскага, у Папрыпяцці «згуртавалася ўзброеная сіла каля 70 тысяч чалавек»). Па другі бок былі магнаты і шляхта каталіцкага веравызнання, каталіцкае і уніяцкае духавенства і, зразумела, войска Вялікага княства Літоўскага (к восені 1648 года яно налічвала каля 14 000 ваяроў), у складзе якога знаходзілася шмат наёмнікаў.

Можна адназначна сцвярджаць, што ні паўстанцы, ні іх супраціўнікі падчас гэтай «антыфеадальнай вайны» не прытрымліваліся аніякіх, нават самых элементарных правілаў цывілізаванага вядзення ўзброенай барацьбы. Як заўважыў Вітаўт Чаропка, і на Украіне, і ў Літве «казакі лютавалі».

Вось што пісаў пра «казацкія забавы» на Украіне Мікалай Кастамараў, аб'ектыўнасць якога наўрад ці можна падвергнуць сумненню: «Яны рэзалі, вешалі, тапілі, распілоўвалі напалам, вырывалі кавалкамі мяса, свідравалі вочы або абкручвалі галаву па пераноссю цецівой лука, варочалі галаву і потым спускалі лук, так што ў ахвяры выскаквалі прэч вочы, здзіралі з жывых скуры, разбівалі аб сцены немаўлят, гвалтавалі жанчын; нярэдка на вачах у мужоў, бацькоў і братоў па некалькі казакоў задавальнялі пажаднасць над няшчаснаю паненкаю і потым забівалі яе. Пасля крывавых сцэн звычайна ішла гулянка: выкачвалі з панскіх склепаў бочкі з вінамі, пілі, танцавалі, пелі песні пасярод папялішчаў і трупаў...

Нянавісць да ўсяго польскага распасціралася да таго, што гінулі праваслаўныя рамеснікі і гандляры толькі за тое, што, трымаючыся тагачаснага звычаю, насілі польскую адзежу або закідвалі ў гаворцы польскія словы.

Рымска-каталіцкая святыня аддавалася ганьбаванню — касцёлы рабавалі і палілі; абразы каталіцкіх святых прастрэльвалі, рубілі, нявечылі; ксяндзы і манахі былі асуджаны на пакуты без міласэрнасці і без выключэння. Іх тапілі, вешалі, здзіралі з іх скуры; нярэдка нападалі на іх пасярод богаслужэння і засякалі да смерці перад алтаром, гвалтавалі манашак у храмах...

Але няўмольней за ўсё абыходзіліся паўстанцы з іудзеямі». Гісторык прыводзіў сведчанне тагачаснага равіна: «Скруткі закона былі выцягнуты з сінагог; казакі танцавалі на іх і пілі гарэлку, а потым клалі на іх іудзеяў і рэзалі без міласэрнасці; тысячы немаўлят былі кінуты ў студні і засыпаны пяском».

Метады вядзення вайны з боку войска Вялікага княства Літоўскага былі адпаведныя — нянавісць, лютасць, бязлітаснасць, гвалт. Вось некаторыя сведчанні. У Брэсце жаўнеры «маёмасць рабуюць і скарбы мяшчанскія і жыдоўскія шукаюць, і ўсюды зямлю капаюць, і застаўшыхся мяшчан і мяшчанскіх дзяцей з-за скарбаў катуюць і агнём паляць».

Жахлівы лёс напаткаў тураўцаў, якія засталіся ў горадзе пасля адыходу паўстанцаў. Усе яны былі перабіты жаў-

нерамі. Тое ж было і ў Чачэрску, дзе жаўнеры, «казакоў выбраўшы паўтараста чалавек, адсеклі правыя рукі да запясця, а 50 чалавек на палі пасадзілі, а астатніх казакоў і іх жонак і дзяцей пасеклі ўсіх», у Лоеве, Давыд-Гарадку.

У Бабруйску жаўнеры адсеклі рукі васьмістам мяшчанам, сто пасадзілі на палі, пяцідзесяці адсеклі галовы.

Адным словам, нянавісць, лютасць, гвалт, рабаванне былі ўзаемныя, але, на жаль, да апошняга часу асвятляліся аднабакова. Маўляў, рэзалі, рабавалі, гвалцілі польскія паны, жаўнеры Януша Радзівіла, наёмнікі. Паўстанцы помсцілі за прыгнёт, здзекі, уціск праваслаўнай веры. А ўкраінскія казакі, што прыйшлі на дапамогу пакрыўджаным беларусам, паказваліся гэтакімі робін гудамі, якія рабавалі багацеяў і раздавалі няправедна нажытае дабро беднякам. Каб жа так...

Але вернемся ў Пінск. Горад стаў першым з тых, хто прыняў на сябе ўдар сабранага к восені 1648 года войска польнага гетмана Януша Радзівіла. Што ж ўяўляў з сябе Пінск XVII стагоддзя?

Недзе ў 1840-ых гадах ксёндз Антон Машынскі знайшоў у архівах пінскага дамініканскага кляштара рукапіс. Высветлілася, што кляштарны летапісец Кляменцій Жаб-



Абарона Пінска ў 1648 г. Мастак М. Бельскі

роўскі ў свой час атрымаў гэты рукапіс без пачатку ад пінскага земскага рэгента Васіля Трухмоўскага. Рукапіс меў назву «Пра бунт горада Пінска і пра ўціхаміранне яго ў 1648 г.». Менавіта гэты дакумент з'яўляецца найбольш поўным сведчаннем пра падзеі, якія адбываліся ў горадзе той восенню. З яго вынікае, што на той час Пінск «... над ракою Пінаю з аднаго боку, якая на ўсход цячэ ад хутара яго міласці, ксяндза ўладыкі Пінскага, на захад да самага Ляшча манастыра Ляшчынскага... густа пабудаваўся ў даўжыню з лішкам на паўмілі і меў ад многіх каралёў вялікія правы і вольнасці; колькасць дамоў у ім прасціралася да пяці або шасці тысяч. Жыхары набылі такую сілу і багацце, што было мноства гараджан, якія мелі ў таргу (у абароце. — С.А.) па сто тысяч».

І вось, як сведчыць рукапіс, «усе без выключэння, знаходзячыся ў добрым стане, пры патуранні начальства, узганарыўшыся і грэбуючы спярша начальствам, яго міласцю каралём, ужо выбраным сенатам і князем, яго міласцю панам канцлерам, сваім старостаю (маецца на ўвазе Альбрэхт Станіслаў Радзівіл. — С.А.), нават правамі і вольнасцямі сваімі, з дзёрзкасці, па-здрадніцку аддалі горад бунтаўшчыкам казакам, увёўшы іх тайна ў горад раней нашага войска, зрабілі самі з казакамі змову бараніць з імі горад да апошняй крайнасці і біць ляхаў».

З «Маніфеста», складзенага францысканскімі ксяндзамі 12 студзеня 1649 года, пасля падаўлення паўстання, нам вядомы імёны яго завадатараў. Гэта бурмістры Багдан Стаяновіч і Якаў Паршуціч Суліч, ратманы Дзям'ян Казарэзавіч, Васіль Іваціэвіч, Фёдар Міхайловіч, Іван Левашчэвіч, Восіп Гомзіч, Ждан Астафевіч, лантвойт Іван Сулкоўскі, лаўнікі Багдан Сінецкі, Фёдар Казаковіч, Лаўрэнцій Лянковіч, Павел Красоўскі, Лаўрэнцій Касцюковіч, цэхмістр кушняроў Багдан Сачыўка, цэхмістр краўцоў Ермалай Велясніцкі, цэхмістр сёдзельнікаў Іван Шаненя, цэхмістр шапавалаў Рыгор Мяшковіч.

Як жа развіваліся падзеі пінскай драмы? Яшчэ 20 жніўня 1648 года пінскі падстароста даносіў падканцлеру Казіміру Льву Сапегу, што паўстанцы — сяляне — «нападаюць на шляхецкія маёнткі, паляць іх, шляхціцаў



Прыём Янушам Радзівілам казацкага палкоўніка Сцяпана Пабадайлы. Мастак Абрагам ван Вестэрфельд. 1651 г.

караюць смерцю, больш багатых купцоў да бедных раўняюць».

Недзе ў канцы верасня паўсталі і рамеснікі. На ўціхамiранне мяцежнага горада Януш Радзівіл паслаў вялікі атрад пад кіраўніцтвам стражніка літоўскага князя Юрыя Мірскага. У пачатку кастрычніка авангард атрада заняў Хомск, што ў дзесяці мілях ад Пінска. Тут Мірскі чакаў падыходу асноўных сіл і артылерыі.

Як трапілі ў Пінск казакі? Як памятаем, Мікалай Кастамараў пісаў, што казацкі загон пад кіраўніцтвам Нябабы нечаканым ударам загнаў за пінскія сцены пісар літоўскі Уладзімір Валовіч. Васіль Мялешка высоўвае другую версію развіцця падзей: на яго думку, Пінск захапілі, разбіўшы войска таго ж Валовіча, казацка-сялянскія атрады Гладкага. Аляксандр Нятылькін у свой час сцвярджаў, што казацкі атрад Антона Нябабы ўступіў у горад ужо пасля таго, як паўстаўшыя гараджане выбілі з горада жаўнераў і шляхту на чале з войтам — палкоўнікам Лукашом Ельскім.

Як бы там ні было, але ў пачатку кастрычніка горад быў у руках паўстаўшых гараджан і казакоў. Пінчукі па-

абяцалі казакам «7000 войска для боя ў полі, самі ж абяцалі заставацца для абароны пры сцяне, у горадзе». Як сведчыць згаданы вышэй рукапіс, «казакі дамовіліся з пінскімі мяшчанамі бараніцца ў Пінску да апошняга; а каб казакі да Раства Хрыстова не адступалі з горада, то гараджане абяцалі ім дзесяць тысяч злотых і пэўнае жалаванне, кожнаму па дзесяць капеек, кажухі, боты і шапкі».

Як бачым, казакі збіраліся абараняць горад не бескарысна...

7 кастрычніка да Пінска падышлі галоўныя сілы Мірскага з артылерыяй і наёмныя нямецкія рэйтары пад кіраўніцтвам палкоўніка Шварца. На наступны дзень дзве сотні казакоў зрабілі смелую, але безвыніковую вылазку ў поле. Агнём артылерыі іх загналі за гарадскія сцены.

Напярэдадні штурма горада Лукаш Ельскі накіраваў абаронцам Пінска пісьмо. Абвінаваціўшы пінчукоў у здрадзе каралю, змове з казакамі, рабаванні касцёлаў і шляхецкіх дамоў, «палкоўнік Пінскага павета і войт горада Пінска» пагражаў пакараць бунтаўшчыкоў і здраднікаў агнём і мячом. Як «чалавек хрысціянін, будучы войтам вашым і не жадаючы, каб дзеці нявінныя і пол жаночы такой строгай, але справядлівай карай абцяжараны былі», Ельскі заклікаў паўстанцаў пакінуць здрадніцкія намеры і схіліць галовы ў пакоры. У адваротным выпадку палкоўнік пагражаў строгай карай справядлівасці Божай.

Але, як сведчыць рукапіс, «гараджане Пінскія, пагрэбаваўшы пісьмом і ўгаворамі яго міласці, пана маршала і палкоўніка Пінскага, засталіся пры казаках і абяцалі пры іх стаяць да крайнасці».

9 кастрычніка войска князя Мірскага пачало штурм Пінска з моцнага артылерыйскага абстрэлу. Пасля гэтага на прыступ пайшлі 120 драгунаў Вінцэнта Гасеўскага, пешцы Пятра Падлеўскага. 2000 ваяроў прыступілі да Северскай брамы. Дзве харугвы пад кіраўніцтвам Лукаша Ельскага кінуліся да Лешчынскай брамы.

Рукапіс сведчыць: «... уварваўшыся, пры дапамозе харугваў яго міласці, пана Гасеўскага, і яго міласці, пана Паўловіча, яго міласці пана Шварца, у горад, уціхамірылі ў запаленым горадзе рыцарскаю рукою, з дапамогай Бо-

жай фанабэрыстую думку казацкую і здраду пінчукоў і пакаралі бунтаўшчыкоў агнём і мячом».

Адбылося гэта пад вечар. Але паўстанцы і казакі адчайна супраціўляліся ўсю ноч і наступны дзень. І толькі калі горад запалаў з усіх бакоў, супраціўленне спынілася. Нявялікі казацкі атрад, які вырваўся з ахопленага агнём Пінска, быў загнаны ў балота і амаль поўнасцю знішчаны.

Вынікі штурма былі жахлівыя. Як гаворыцца ў данясенні маскоўскага пасла Рыгора Кунакова цару Аляксею Міхайлавічу, Мірскі «мяшчан пабіў больш за 3000 чалавек і жонак іх і дзяцей загадаў пабіць без міласці».

Але, калі верыць Адаму Кіркору, трагедыя Пінска была куды больш жудаснай. У «Живописной России» ён пісаў: «Радзівіл аблажыў горад, пачаўся доўгі штурм горада, падчас якога, як сведчаць сучаснікі, загінула чатырнаццаць тысяч жыхароў і згарэла пяць тысяч дамоў».

У рукапісе, знойдзеным ксяндзом Антонам Машынскім, ёсць цікавае сведчанне, якое, хаця і падобна на легенду, тым не менш заслугоўвае таго, каб яго прывесці ў гэтай кнізе.

9 кастрычніка (у рукапісе чамусьці занатавана 9 лістапада) у 11 гадзін вечара над Пінскам быццам бы з'явілася «страшная камета» ў выглядзе мяча, скіраванага вастрыём уніз. «... Гэты крывавы меч, — сведчыць рукапіс, — прабыў час з лішкам, на што гараджане і казакі доўга глядзелі». Пасля ўзяцця горада Мірскім камета з'явілася над Пінскам яшчэ раз. У рукапісе зроблена выснова наконт прычын пінскай трагедыі: «Таму так атрымалася, што меч і мятла нябесныя знішчылі горад Пінск».

Падчас «казацкай вайны» пацярпеў не адзін Пінск. Такому ж вынішчэнню войска князя Друцкага-Горскага падвергла Чэрыкаў, дзе «беларусцаў усіх пасеклі». У руінах застаўся ляжаць Брэст, якому спаўна дасталася ад разлютаваных казакоў, якія, як сведчыць маскоўскі пасол Рыгор Кунакоў, спустошылі горад да падмурка, «палякаў і жыдоў і жонак іх і дзяцей пабілі без рэшты, і харомы і муры каменныя разбурылі і раскідалі, а драўляныя папалілі і ўчынілі з полем роўна».

У сваю чаргу, як сведчаць сучаснікі тых трагічных падзей, «літоўскае войска высекла Мазыр і Тураў». Жорстка пакараў Януш Радзівіл і абаронцаў Бабруйска.

Паўстанне сялян і гарадскіх нізоў на поўдні Беларусі было падаўлена Радзівілам к восені 1651 года. А пачалося ўсё з таго, што 8 жніўня 1649 года Хмяльніцкі і кароль Ян Казімір падпісалі ў Збораве дагавор, які ўсталяваў аўтаномію (уладу ўкраінскага гетмана) Правабярэжнай Украіны ў складзе Рэчы Паспалітай. Казакі атрымалі права на 40-тысячнае запарожскае войска, якому вярталіся ранейшыя і гарантаваліся новыя прывілеі. Дагавор акрэсліў межы, дзе маглі знаходзіцца казакі. Яго другі артыкул падкрэсліваў, што яны не павінны з'яўляцца далей «паказаных месцаў».

Поўдзень цяперашняй Беларусі ў «паказаныя месцы» не ўваходзіў.

У ліпені 1651 года пад Берастэчкам аб'яднанае войска Багдана Хмяльніцкага і крымскага хана Іслам-Гірэя III было разгромлена арміяй Яна Казіміра. Вынікам паражэння казакоў стаў цяжкі для іх Белацаркоўскі трактат, падпісаны 18 верасня літоўскімі і ўкраінскімі камісарамі. Цяпер сваю волю дыктавалі гетман каронны Мікалай Патоцкі і гетман польны Януш Радзівіл. Трактат скарачаў да 20 000 колькасць рэестравых казакоў, значна ўразаў казацкія прывілеі. У дзесятым артыкуле трактата было запісана: «Як войска яго каралеўскай міласці запарожскае, пры складанні свайго рэестра, ніколі не кранался межаў Вялікага княства Літоўскага, так і цяпер не павінна кранацца». Украінскія казакі павінны былі «верна і дбайна выконваць усялякую службу яго каралеўскай міласці і Рэчы Паспалітай».

Хаця ўмовы Белацаркоўскага трактата і быліануляваны пасля таго, як у маі 1652 года Хмяльніцкі ўсё з тым жа Іслам-Гірэем разграміў войска кароннага гетмана Каліноўскага, але для Беларусі гэта ўжо не мела аніякага значэння. Але гэта — на той час...

У маі 1654 года з Масквы выступіла велізарная руская армія. Мэтай паходу былі землі Вялікага княства Літоўскага, у першую чаргу — Беларусь. На яе паўднёвым усходзе з'явілася дваццацітысячнае войска пад кіраўніцтвам паплечніка Хмяльніцкага, наказнога гетмана Івана Залатарэнкі.

Якую ж мэту ставілі казакі на гэты раз? Яе адназначна вызначыў у свой час не хто іншы, як Лаўрэнцій Абэцэдарскі: «... частка старшыны імкнулася, выкарыстаўшы вайну, далучыць да Украіны паўднёва-ўсходнюю Беларусь, устанавіць там сваё палкавое адміністрацыйна-тэрытарыяльнае кіраванне, захапіць зямельныя ўладанні прыгонных сялян».

Такая вось казацкая палітыка...

## Крыніцы


*Абецедарский, Л.С. Белоруссия и Россия. Оценки русско-белорусских связей второй половины XVI—XVIII в. /Л.С. Абецедарский. — Минск, 1978.*

*Абэцэдарскі, Л.С. Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII стагоддзя /Л.С. Абэцэдарскі. — Мінск, 1954.*

*Белоруссия в эпоху феодализма: сборник документов и материалов. В 3 т. — Минск, 1960.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. — Т. 3. — Минск, 1993.*

*Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі /У.М. Ігнатоўскі. — Мінск, 1991.*

*Костомаров, Н.И. Богдан Хмельницкий /Н.И. Костомаров. — СПб., 1904.*

*Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі /В.Ю. Ластоўскі. — Мінск, 1999.*

*Лочмель, И.Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов /И.Ф.Лочмель. — М., 1940.*

*Мелешко, В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII—XVIII вв. /В.И. Мелешко. — Минск, 1988.*

*Нетылькин, А.Т. Пинск: исторический очерк /А.Т. Нетылькин.— Минск, 1961.*

*Похилевич, Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв./Д.Л. Похилевич. — Львов, 1957.*

*Чаропка, В. Уладары Вялікага княства /В. Чаропка. — Мінск, 1996.*

*Шуляковский, Е.Г. Участие белорусского народа в освободительной войне 1648—1654 гг. /Е.Г. Шуляковский // Вопр. истории. — 1954. — № 5.*

*Шчарбакоў, В.К. Сялянскі рух і казацтва на Беларусі ў эпоху феадалізма /В.К. Шчарбакоў. — М., 1935.*

# КАРОНА «ЛІТОЎСКАЙ ІМПЕРЫІ»

Такога наплыву знакамітых гасцей Луцк, бадай што, не ведаў за ўсю сваю гісторыю (а яна і на той ужо далёкі ад нас час налічвала не адно стагоддзе: старажытны горад на Валыні ўпершыню згадваўся ў летапісах пад 1085 годам). Сюды, на заснежаныя берагі закаванай у лёд Стыры, зімой 1429 года, якраз на Вадохрышча, з'ехаліся, як сведчаць старадаўнія летапісы, «цэсар хрысціянскі, які ў той час быў яшчэ каралём вугорскім і чэшскім, — Сігізмунд, і кароль польскі Ягайла, Вітаўтаў брат, і ка-



Варотная вежа Верхняга замка ў Луцку — сучасніца гістарычных падзей зімы 1429 г.

роль дацкі, і цар перакопскі, і вялікі князь маскоўскі, Вітаўтаў зяць, і вялікі князь цверскі Барыс Аляксандравіч, і магістр прускі і ліфляндскі, і князь перамышльскі, і князі навасільскія, і ваявода валашскі, і вялікія паслы ад цара грэчаскага Іаана Палеалога, і князь мазавецкі...».

Прыехалі ў Луцк і высокія госці духоўнага сану: мітрапаліт маскоўскі Фоцій, кракаўскі біскуп Збігнеў Алясніцкі, а з далёкага Ватыкана прыбыў з шматлікай світай папскі легат.

Па сведчанні сучаснікаў тых далёкіх падзей, гасцей той зімой у Луцку сабралася ці не больш, чым было ў горадзе саміх месцічаў, — каля 15 тысяч. У чаканні прыезду самага знакамітага візітанта — імператара Сігізмунда І (таго самага «цэсара хрысціянскага, караля вугорскага і чэшскага») — шматлікім гасцям не было сябе чым асабліва заняць. Таму гаспадар, вялікі князь літоўскі Вітаўт, стараўся развесяліць іх, наладжваючы рыцарскія турніры і баляванні. Пілі і елі дарагія госці ўдосталь: штодзённа велікакняжацкія чыноўнікі «спісвалі» на ўтрыманне каранаваных і тытулаваных асоб з іх шматлікімі світамі семсот бочак сычонага мёду (мускатэль, мальвазію і іншыя менш моцныя напоі ніхто, відаць, не лічыў), па семсот ялавіц, бараноў і вепрукоў, сто ласёў, шэсцьдзесят зуброў і незлічона «іншай рознай зверыны, многіх мясных ды іншых хатніх страў».

Імператар Сігізмунд І разам з жонкай Барбарай прыехаў у Луцк толькі 22 студзеня, калі гасцям ўжо надакучылі і рыцарскія турніры, і штодзённае пахмелле (і не дзіва, бо самыя нецярплівыя з іх, што прыехалі раней за ўсіх, пілі і закусвалі ўжо некалькі тыдняў). Пры ўездзе ў горад Сігізмунда ўрачыста сустракалі (ужываючы сучасную тэрміналогію) кіраўнікі дэлегацый на чале з Вітаўтам і святарства ўсіх канфесій — каталіцкае, праваслаўнае, армянскае, іудзейскае.

Пасля прыезду «рымскага цэсара» турніры і баляванні працягваліся яшчэ некалькі дзён, і толькі пасля гэтага пачалося тое, дзеля чаго ў Луцку і сабраліся ўсе пералічаныя вышэй венцаносныя асобы — перамовы на самым высокім узроўні.



Вялікі князь Вітаўт. Гравюра
з «Хронікі Еўрапейскай Сарматыі» Аляксандра Гваніні. 1581 г.

Абмяркоўвалі і магчымы падзел Малдавіі, якая не выказвала асаблівага жадання ваяваць з туркамі, і аб'яднанне грэчаскай і рымскай цэркваў, і вайсковую дапамогу Візантыі ў яе барацьбе супраць тых жа туркаў.




Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае падчас уладарання Вітаўта Вялікага. Карта з польскага выдання

Але і шматлікія перамоўшчыкі, асабліва 79-гадовы Вітаўт, чакалі, калі ў парадак дня Луцкага з'езду будзе пастаўлена галоўнае пытанне: — прыняцце ўладаром Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага каралеўскай годнасці...

Магутную плынь часу стрымаць, спыніць, а, тым больш, павярнуць назад немагчыма. Ні імператар Сігізмунд, ні кароль Ягайла, ні вялікі князь Вітаўт, ні тысячы ўдзельні-

каў Луцкага з'езду зрабіць гэтага ў тыя студзеньскія дні 1429 года не маглі. У нас жа такая магчымасць ёсць. Пакінем старога Вітаўта ў яго трывожным чаканні і зробім экскурс у гісторыю, каб знайсці адказ на пытанне: ці адпавядалі Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае і яго ўладар той самай «каралеўскай годнасці», пра якую марыў Вітаўт?

Вернемся на два стагоддзі назад, у часы Міндоўга, пачынальніка дзяржавы, у якой ў часы Луцкага з'езду ўладарыў Вітаўт.

Як вядома, у 1246 годзе Міндоўг, адзін з найбольш уплывовых літоўскіх князёў, быў запрошаны на княжанне ў Навагрудак. Факт па тым часе досыць звычайны. Навагрудку, які якраз тады набіраўся моцы і быў ужо гатовы да таго, каб пераняць у слабеючага Полацка вядучую ролю на заходніх землях былой Кіеўскай Русі, быў патрэбны ваяўнічы ўладар — жорсткі і смелы, гатовы рашуча адстойваць інтарэсы новага аб'ядноўчага цэнтра славянскіх (а ў перспектыве, як пакажа час, і балцкіх) зямель.

У хуткім часе навагрудчане змаглі ўпэўніцца, што іх выбар быў правільны. Ужо ў 1248 годзе «літоўскі Рурык» далучыў да Навагрудка землі этнічнай Літвы, з якой ён паходзіў родам, потым пасадзіў на полацкі пасад свайго стаўленіка Таўцівіла, распачаў працяглую вайну з даўнім сапернікам Навагрудка — Галіцка-Валынскім княствам (праўда, не заўсёды паспяховую) і Лівонскім ордэнам.

Лівонскі вялікі магістр Андрэй Сцірланд хоць і ваяваў з Міндоўгам, але не мог не бачыць таго, што менавіта гэты князь з'яўляецца найбольш верагодным прэтэндэнтам на ролю самага ўплывовага ўладара рэгіёна, дзе ў крыжакоў і Ватыкана, які за імі стаяў, былі свае, далёка сягаючыя інтарэсы. Пасля няўдалай спробы ўзяць аблажаны крыжакамі Навагрудак Сцірланд прапанаваў Міндоўгу сустрэцца для перамоў. Падчас іх вялікі магістр даў зразумець, што можа дапамагчы Міндоўгу перамагчы ўсіх ворагаў: і галіцка-валынскіх князёў Данілу і Васільку Раманавіча, і жамойцкага князя Выкінта, і мяцежнага пляменніка Эдзівіда. Больш таго, ён згодны дапамагчы навагрудскаму князю стаць... каралём. Пры адной умове:

Міндоўг павінен адрачыся ад праваслаўнай веры (праваслаўе Міндоўг прыняў адначасова з абраннем на навагрудскі пасад) і разам са сваімі падданымі прыняць веру каталіцкую. Да ўсяго — зрабіць яшчэ адну дробязь: саступіць ордэну частку зямель жамойтаў і селонаў.

Міндоўг абяцаў падумаць, а, падумаўшы, прыняў рашэнне. У хуткім часе ў Ватыкан у суправаджэнні ордэнскіх паслоў адправіўся прыдворны баярын Міндоўга — Парнус. Ад яго рымскі папа Інакенцій IV даведаўся, што Міндоўг згодны прыняць каталіцкую веру і, тым больш, не супраць узлажыць на сябе каралеўскую карону.

Задаволены папа тут жа выслаў Міндоўгу сваю булу, у якой урачыста абвяшчалася, што «... каралеўства літоўскае і ўсе землі, якія здабыў ад няверных або ў будучым мог здабыць на права і ўласнасць святога Пятра, і яго, Міндоўга, з жонкай, сынамі і ўсім дваром пад пратэкцыю і апеку апостальскай сталіцы вырашылі ўзяць». У наступнай буле Інакенцій IV даручыў каранаваць Міндоўга холмскаму біскупу Генрыху.

Каранацыя адбылася 6 ліпеня 1253 года ў Навагрудку. У прысутнасці ўжо згаданага лівонскага вялікага магістра Андрэя Сцірланда і яго шматлікай світы біскуп Генрых узлажыў на галаву Міндоўга прывезеную з Рыма каралеўскую карону. Літва стала каралеўствам, а Навагрудак, адпаведна, яго сталіцай.

Караліваў Міндоўг нядоўга. Ужо ў 1261 годзе ён разарваў мір з Лівонскім ордэнам і адмовіўся ад каталіцтва. А праз два гады, калі цяпер ужо былы «літоўскі кароль» па праву лічыўся самым уплывовым з літоўскіх князёў, яго разам з сынамі па-здрадніцку забілі жамойцкі князь Транята, полацкі князь Таўцівіл, якога ён калісьці ўзвёў на пасад, і нальшчанскі князь Даўмонт.

Міндоўг з яго нядоўгім караляваннем адышоў у нябыт, але, як кажуць, прэцэдэнт быў створаны...

Справу «літоўскага караля» давяршыў яго сын — Войшалк, які, у адрозненне ад бацькі, быў больш палітыкам, чым ваяром. Памірыўшыся з даўнімі ворагамі Навагрудка — галіцка-валынскімі князямі, ён з іх дапамогай за шэсць гадоў свайго ўладарання аб'яднаў Навагрadскую, Літоўскую, Нальшчанскую землі і Дзяволтву ў досыць

магутную па тым часе дзяржаву. Яго ўладу прызналі таксама Полацкая і Віцебская землі. Менавіта з часоў Войшалка дзяржава атрымала назву, пад якой і ўвайшла ў гісторыю — Вялікае княства Літоўскае (Літва).

У наступныя сто з чвэрцю гадоў дзяржавай з рознай доляй поспеху кіравалі вялікія князі Шварн і Тройдзень, Літувер і Віцень, Гедымін і Яўнут, Альгерд, Кейстут і Ягайла. Адчувальнае ўзмацненне Літвы і пашырэнне межаў пачалося пры Гедыміне, прадоўжылася падчас уладарання яго сына Альгерда. Сваёй найбольшай моцы Літва дасягнула пры ўладары, які адзіны з усіх, хто правіў ёй, увайшоў у гісторыю як Вялікі. Гэта быў Вітаўт.

Пра тое, што Вітаўт быў асобай неардынарнай, дзяржаўным дзеячам еўрапейскага маштабу, сведчыць усё яго доўгае і бурнае жыццё. Яскравую характарыстыку даў Вітаўту знакаміты паэт-лацініст XVI стагоддзя Мікола Гусоўскі ў сваёй выдатнай паэме «Песня пра зубра» (пераклад з лат. Я. Семяжона):

Ён, двуадзіны ў асобе вялікага князя —
Факельшчык войнаў са слабым, а з дужым анёл — міратворца,
Ставіў агалены меч свой, як слуп пагранічны,
Перад нашэсцямі ворагаў з поўдня і ўсходу.
Нават татарын, пакорліва ўнурыўшы голаў,
Лук свой зламаны яму аддаваў і тлумачыў,
Што, спаганяўшы ясак каля вотчын літоўскіх,
Сам станавіўся пачварнай здабычай літвінаў.
Быў літасцівы да тых уладарцаў, якіх ён
Ставіў на княства па выбару ўласным. І нават
Грознай Ардзе мог прыцыкнуць:
Знай меру, татарын!
Як знакаміты багаццем і сілай Масковіі землі,
Ўсё ж і яны прымірэння прасілі з літвінам.
Турак з Таўрыды заўсёды цюкі падарункаў
Вітаўту слаў, прыхаваўшы свой клопат таемны:
Як бы задобрыць, улесціць і гнеў не наклікаць
На галаву сваю з боку Літоўскай дзяржавы.
Тры каршуны, што наводзілі жах на паўсвету,
Як пылюкі, перад ім нават ціўкнуць не смелі...
Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называюць той век залатым...

Перш чым у меру магчымасцей нашага сціслага па памерах аповяду паспрабаваць прааналізаваць зробленае Вітаўтам у той «залаты век», хацелася б з большага закрануць такі досыць спрэчны момант айчыннай гісторыі, як паходжанне літоўскіх князёў. Большасць даследчыкаў адназначна лічаць, што ўсе яны, пачынаючы з Міндоўга, літоўцы, ці літва, — прадстаўнікі аднаго з балцкіх плямёнаў, якія стагоддзямі памежнічалі з плямёнамі славянскімі, цесна кантактавалі з імі і падвяргаліся іх уплыву.

У той час некаторыя з іх высоўвалі досыць смелую, хоць і сумніўную ў навуковых адносінах версію, згодна з якой і Міндоўг, і Войшалк, і Гедымін, і Альгерд, і Ягайла, і той жа Вітаўт былі крывіцка-дрыгавіцкага (гэта значыць, славянскага) паходжання. Ужо многа пазней несумленныя, маўляў літоўскія (у сучасным разуменні гэтага слова) летапісцы зрабілі іх «сваімі», адабраўшы ў нас, беларусаў (таксама ў сучасным разуменні гэтага тэрміна).

Што ж, гэта вельмі натуральна, бо ў перыяд бурнага абуджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў таму-сяму з новай плыні айчынных аматараў нашай мінуўшчыны было не вельмі даспадобы тое, што нашымі продкамі правілі нейкія там «літоўскія князі». Але ж з песні, як кажуць, слова не выкінеш: што было — тое было. Да таго ж, як ужо адзначалася вышэй, запрашэнне чужых князёў на айчынныя пасады — з'ява не такая ўжо і рэдкая ў гісторыі наогул. Яшчэ ў IX стагоддзі, за чатырыста (!) гадоў да Міндоўга, на землі ўсходніх славян былі запрошаны варагі-русы, якія не толькі заснавалі славянскую дзяржаву, але і далі ёй назву — Русь. Рурыкавічы (нашчадкі варагаў-русаў) правілі на славянскіх землях каля сямі стагоддзяў і сёння з'яўляюцца неад'емным фактам гісторыі нашай усходняй суседкі — падабаецца гэта каму або не... А возьмем польскую дзяржаву, якой без малога два стагоддзі правілі нашчадкі літвіна Ягайлы — Ягелоны...

Дарэчы, варагі-русы прыйшлі да славян здалёк. Той жа Міндоўг, як і ўся Літва, быў самым блізкім суседам славян, што жылі на землях сучаснай Беларусі сем-восем стагоддзяў таму. Да таго ж нельга не пагадзіцца з тымі з даследчыкаў, хто сцвярджае, што тагачасныя балцкія пля-

мёны да часоў Міндоўга ўжо былі ў значнай ступені асіміляваны славянамі, многія з іх насілі славянскія імёны — Жывінбуд, Будзікід, Тройдзень, Войшалк, Транята, Гердзень, Логвеній... Досыць часта славянскія імёны набывалі ў балцкім асяроддзі крыху іншае гучанне, уласцівае іх моўнай сістэме: Едзімей станавіўся Гедымінам, Аляксандр — Альгердам, Канстанцін — Кейстутам, Кірыяк — Карыятам, Міхайла — Мінгайлам, Домант — Даўмонтам, Віт — Вітаўтам.

Жыццё і дзейнасць «літоўскіх князёў» настолькі цесна пераплецена з нашай айчыннай гісторыяй, што лічыць іх чужакамі, прыхаднямі неяк не выпадае.

Больш таго, Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае ў свеце ведалі як Літву, яе насельнікаў ужо з другой паловы XV стагоддзя называлі літвінамі, а дзяржаўнай мовай краіны была мова, якую тады называлі «рускай».

Асэнсоўваючы жыццёвы шлях Вітаўта, можна з поўным правам сказаць, што ён быў найперш літвінам. Унук легендарнага Гедыміна, сын выдатнага дзяржаўнага дзеяча з трагічным лёсам Кейстута, ён нарадзіўся ў 1350 годзе падчас уладарання ў Літве свайго дзядзькі — знакамітага Альгерда. Прымяняючы сучасную тэрміналогію, зазначым, што палітыкай Вітаўт стаў займацца ў сталым узросце, калі ў 1382 годзе, падчас жорсткай барацьбы за велікакняжацкі пасад, малодшы сын Альгерда — Ягайла (стрыечны брат Вітаўта) здзейсніў забойства яго бацькі Кейстута (свайго дзядзькі).

Сам ледзь не загінуўшы ад рук таго ж Ягайлы, Вітаўт, прагнучы помсты, уцёк да крыжакоў, зрабіўся іх саюзнікам, 21 кастрычніка 1382 года прыняў каталіцтва, абавязаўся стаць васалам Тэўтонскага ордэна і праз год нават саступіў крыжакам Жамойцію.

Безумоўна, Вітаўт быў рэалістам. Хутка ён зразумеў, што змагацца супраць Ягайлы, які з цягам часу стаў польскім каралём, бесперспектыўна. Давялося «забыцца» на тое, што Ягайла — забойца яго бацькі, і замірыцца з ім. Каб мір быў больш моцным, Ягайла даў Вітаўту ў валоданне Гродна і Брэст. Паколькі большасць яго новых

падданых спавядалі «грэчаскую веру», Вітаўт без асаблівых ваганняў перахрысціўся ў праваслаўе. Праўда, ужо ў 1385 годзе, падчас заключэння Крэўскай уніі, Вітаўт у чарговы раз мяняе веравызнанне і разам з іншымі літоўскімі князямі зноў становіцца католікам.

Калі праз год Ягайла прызначае сваім намеснікам у Літве Скіргайлу, пакрыўджаны Вітаўт распачынае новы тур барацьбы з ім. Не доўга думаючы, ён зноў прэзентуе Тэўтонскаму ордэну ўжо аднойчы падораную ім Жамойцію і знаходзіць сабе яшчэ аднаго саюзніка — вялікага князя маскоўскага Васіля I, аддаючы яму ў жонкі сваю дачку Соф'ю.

Цяпер ужо Ягайла вымушаны прызнаць, што Вітаўта голымі рукамі не возьмеш і з упартым сваяком лепш сябраваць. 5 жніўня 1392 года саапернікі сустрэліся ў маёнтку Вострава, паблізу Ліды, дзе паміж імі і было падпісана пагадненне. Вітаўт паабяцаў Ягайлу «заставацца назаўжды ў саюзе з Польскім каралеўствам і польскай каронай». З Вострава цяпер ужо сябры і саюзнікі накіраваліся ў блізкую Вільню, дзе праз некалькі дзён віленскі біскуп Андрэй Васіла ў касцёле Святога Станіслава каранаваў Вітаўта вялікім князем літоўскім і рускім (Жамойцію, нагадаем, незадоўга да гэтага Вітаўт аддаў крыжакам).

Вялікае княжанне Вітаўт пачынаў у складаным ваенна-палітычным становішчы (ды і ўсе дзесяцігоддзі яго ўладарання ў Літве спакойнымі не назавеш). Пастаянная пагроза з боку Тэўтонскага ордэна (у Кёнігсбергу крыжакі трымалі ў заложніках жонку Вітаўта Ганну, яго сыноў Івана і Юрыя і яшчэ некалькіх блізкіх сваякоў), дыпламатычны ўціск Польшчы, дзе ўвесь час марылі ўключыць Літву ў свой склад, узрастаючыя прэтэнзіі Масквы на значную частку тэрыторыі краіны — усё вымушала вялікага князя лавіраваць паміж пагрозамі, сёння браць у саюзнікі тых, з кім яшчэ ўчора зацята варагаваў, а назаўтра абвяшчаць ворагамі ўчарашніх саюзнікаў, якія, натуральна, імкнуліся адпомсціць з-за гэтага (так, у 1392 годзе крыжакі атруцілі сыноў Вітаўта, пазбавіўшы вялікага князя нашчадкаў).

Верагодна, ужо тады Вітаўт паставіў перад сабой галоўную мэту свайго жыцця — усталяванне моцнай, поўнасцю незалежнай ад Польшчы дзяржавы, а затым — каранацыя ў якасці «літоўска-рускага караля».

Шлях да мэты быў доўгім, таму пастараемся акрэсліць толькі некаторыя яго вехі. Найперш Вітаўту пасля неверагодна цяжкіх намаганняў удалося ўтаймаваць сепаратысцкія памкненні ўдзельных князёў — Дзмітрыя Северскага, Фёдара Карыятавіча Падольскага і Свідрыгайлы. У 1395 годзе, выкарыстаўшы сваркі мясцовых князёў, ён авалодаў Смаленскам. Праз год тут адбыліся яго перамовы з зяцем — маскоўскім уладаром Васілём І, у выніку чаго былі ўсталяваны межы паміж Літвой і Масковіяй.

Здолеў Вітаўт атрымаць у саюзнікі і татарскага эмігранта, былога залатаардынскага хана Тахтамыша, які падтрымаў «каралеўскія» памкненні вялікага князя і нават выдаў яму ярлык на кіраванне ўсімі рускімі землямі. Тахтамыш ішоў на такі крок не ад нейкай там асаблівай прыязнасці да Вітаўта. Ён хацеў сябраваць з моцным уладаром. Сваю моц вялікі князь прадэманстраваў у 1397 годзе, калі Вітаўтавы харугвы, пераадолеўшы кіпчацкія стэпы, фарсіравалі Дон, выйшлі да Волгі і нанеслі ўдар па асноўных залатаардынскіх улусах. Яшчэ праз год, узяўшы ў дапамогу крыжакоў, Вітаўт скіраваў удар па ордах крымскіх татараў. Летам 1398 года ён праз Падолле выйшаў да берагоў Чорнага мора. Згодна з паданнем, Вітаўт, нырнуўшы са скалы, праплыў па моры паўмілі (верагодна, заплыў адбыўся паблізу сучаснага Ачакава) і вярнуўся на бераг, засведчыўшы такім чынам, што Чорнае мора цяпер належыць Літве.

12 кастрычніка 1398 года Вітаўт сустрэўся на Саленскім возеры з вялікім магістрам Тэўтонскага ордэна. Падчас перамоў зноў прагучала ідэя абвясціць вялікага князя «каралём Літвы і Русі». Крыжакі абяцалі падтрымку ў дасягненні гэтай мэты.

Усяго хапала на шляху Вітаўта. Было і сакрушальнае паражэнне 12 жніўня 1399 года ад залатаардынцаў на Ворксле, і ганебны дагавор, падпісаны Вітаўтам у 1401 годзе ў Вільні, які пацвярджаў унію паміж Польшчай і

Літвой і занатоўваў, што пасля яго смерці Літва перастае існаваць як самастойная дзяржава.

Але быў і 1410 год — Грунвальд, дзе харугвы літвінаў унеслі важкі ўклад у сакрушальны разгром крыжакоў. Вынікам Грунвальдскай перамогі стала тое, што праз год да Літвы была далучана Жамойція, і Вітаўтава дзяржава стала называцца Вялікім княствам Літоўскім, Рускім і Жамойцкім. Абшары Літвы дасягнулі Балтыкі. Яна стала дзяржавай «ад мора да мора». Па сутнасці сваёй, гэта была велізарная поліэтнічная Літоўская імперыя — адна з магутнейшых еўрапейскіх краін таго часу. І Вітаўт з поўным правам мог прэтэндаваць на каралеўскую карону.

Дарэчы, калі ў 1410 годзе ў Чэхіі распачаліся гусіцкія войны, імператар Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунд і папа рымскі Марцін V прапанавалі Вітаўту каралеўскую карону гэтай дзяржавы. Ён згадзіўся і направіў у Чэхію свайго намесніка — Жыгімонта-Карыбута.

Задоўга да берасцейскіх падзей 1596 года Вітаўт здзейсніў спробу ўсталяваць у сваёй дзяржаве унію паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі. У лістападзе 1415 года ў Навагрудку сабраўся Сінод праваслаўнага духавенства Літвы. Высокі сход іерархаў адхіліў ад мітрапаліцтва праціўніка уніі Фоція і прызначыў мітрапалітам яе прыхільніка Грыгорыя Цамблака.

Відаць, ужо нішто не магло спыніць памкненняў Вітаўта да поўнай незалежнасці Літвы. Яго падштурхоўвала і трывалае міжнароднае становішча Вялікага княства: новы маскоўскі князь Васіль II даводзіцца яму ўнукам і лічыць яго апекуном, сваім уладаром Вітаўта прызнаюць князі разанскі і цвярскі, папа рымскі прызначыў яго апекуном Рыжскага арцыбіскупства, у Навагрудку ўсталявана самастойная праваслаўная мітраполія, у сваіх пісьмах «рымскі цэсар» Сігізмунд I настойліва раіць Вітаўту каранавацца на «літоўска-рускага караля» і абяцае замовіць слова перад Ватыканам.

І Вітаўт прымае рашэнне: зімой 1429 года ў Луцку збіраецца з'езд, з якога мы і пачалі свой аповяд.

Трэба адзначыць, што галоўнымі праціўнікамі каранацыі Вітаўта былі палякі. Яно і зразумела: адбудзецца гэты

акт і — бывай спадзяванні на інкарпарацыю Літвы ў склад Польшчы. Асаблівай непрыязнасцю да Вітаўта і ідэі яго каранацыі вызначаўся ўплывовы ў царкоўных колах кракаўскі біскуп Збігнеў Алясніцкі. Нягледзячы на тое што ўсе, ад каго залежала станоўчае вырашэнне пытання, далі згоду на прыняцце Вітаўтам каралеўскай годнасці, зламыснаму біскупу нейкім чынам удалося дабіцца пераносу каранацыі на наступны год. Госці мусілі, прачакаўшы сем тыдняў, пакінуць Луцк, каб зноў сустрэцца ў Вільні.

У верасні 1430 года пачаўся новы з'езд. Сабраліся ўсе, хто годам раней гасціў у Вітаўта ў Луцку, акрамя Сігізмунда. З нейкай нагоды імператар не змог прыехаць сам, але адправіў у Вільню з пасламі асвечаную ў Рыме карону і прывілей з правамі на каралеўскі тытул. Паслы павінны былі прыбыць у Вільню 8 верасня: у гэтым запэўнівалі Вітаўта імператарскія паслы — Баптыст Цыгаль і Сігізмунд Рот.

І тут у справу зноў умяшаўся Збігнеў Алясніцкі. Неўтаймоўны кракаўскі біскуп пачаў актыўную апрацоўку старога князя. Узамен кароны, якую везлі ў Вільню з Рыма, ён прапанаваў Вітаўту другую — польскую.

Разлік хітрага паляка быў досыць празрысты: век старога вялікага князя, які не мае нашчадкаў, ужо не доўгі. Хутка Вітаўт памрэ, на велікакняжацкі пасад узыдзе Ягайлаў сын, і ўсё стане на сваё, патрэбнае палякам месца: Вялікае княства каралеўствам не стане і застанецца залежным ад Польшчы.

Напэўна, Вітаўт, зважаючы на свае больш чым сталыя гады, мог бы, як кажуць, клюнуць на хітрую польскую прынаду: а што — жыць і сапраўды засталося мала, чаму б на старасці і не ўсцешыцца такой спакуслівай цацкай, як карона польская? Тым больш, што той, якую павінны прывезці з Рыма, усё няма і няма. Вось і каранацыю давялося перанесці на 29 верасня. Ды і самыя нецярплівыя з гасцей пачалі ад'язджаць з Вільні.

Але на ўсе спакуслівыя прапановы Вітаўт адказаў рашучым «не»: справа не ў ім асабіста, а ў незалежнасці Літвы. Ёй, Літве, дабіваецца ён каралеўскага вянца.

І тады біскуп пайшоў на надзвычайныя меры. Хроніка Быхаўца так апісвае драматычныя падзеі, што адбыліся недзе ў польскіх лясах: «І ляхі, не жадаючы кароны Літве, і карону ў паслоў адабралі і рассеклі яе папалам і прыклалі да кароны біскупа каралеўскага, якая і цяпер пры замку Кракаўскім у касцёле Святога Станіслава ёсць...»

Мінуў верасень, прыйшоў кастрычнік. 13 кастрычніка пакрыўджаны вялікі князь пасылае Сігізмунду ліст, у якім папракае таго за свае няспраўджаныя надзеі, за прыніжэнне, сорам, якія давялося перажыць, за дарэмныя вялікія выдаткі на запрашэнне шматлікіх гасцей. Але ад кароны не адмаўляецца і ў апошняй надзеі запрашае ў Вільню Ягайлу, каб угаварыць польскага караля не перашкаджаць каранацыі.

Ягайла прыехаў... Разам з Вітаўтам яны накіраваліся ў Трокі. Па дарозе старому князю стала кепска, ён упаў з сядла, і ў Трокі яго, знямоглага, прывезлі ў карэце. 27 кастрычніка 1430 года ў прысутнасці Ягайлы, мітрапаліта Фоція, свайго ўнука — маскоўскага князя Васіля Васілевіча — Вітаўт сканаў.



Замак у Троках (сучасны Тракай у Літве). Тут скончыў свой зямны шлях Вітаўт Вялікі

Той-сёй з даследчыкаў не выключае, што адправіцца на той свет упартаму Вітаўту дапамаглі. Варыянт, па тым часе, вельмі магчымы. Тым больш, калі ўлічыць, што той жа Ягайла некалі ўжо вырашаў свае праблемы падобным чынам (успомнім забойства бацькі Вітаўта — Кейстута).

Але гэта — толькі версія, якая пакуль што не мае пад сабой нават ускосных доказаў. Ці то ўладар Літвы памёр сам, ці то старога князя атруцілі — вынік адзіны: Вітаўт Вялікі не стаў «каралём Літвы і Русі», Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае не стала каралеўствам.

## Крыніцы


*Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.*

*Брянцев, П.Д. История Литовского государства с древнейших времен /П.Д. Брянцев. — Вильна, 1889.*

*Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і навагародскі перыяды /М. Ермаловіч. — Мінск, 1990.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. Т. 3. — Минск, 1993.*

*Насевіч, В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы /В. Насевіч. — Мінск, 1993.*

*Полное собрание русских летописей. Т. 35. — М., 1975.*

*Тарасаў, К. Памяць пра легенды /К. Тарасаў. — Мінск, 1990.*

*Чаропка, В. Імя ў летапісе /В. Чаропка. — Мінск, 1994.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. — Мінск, 1994.*

# ЖЫГІМОНТ І БАРБАРА: МЕЛАДРАМА З ПАЛІТЫЧНАЙ ІНТРЫГАЙ

Гадоў з трыццаць таму, калі сённяшняя эстрадная суперзорка Ала Пугачова яшчэ толькі пачынала свой шлях на музычны Алімп, на велізарных абшарах Савецкага Саюза, бадай што, не было дня, каб у радыёэфіры ці па тэлевізару не гучала адна песня ў яе выкананні — ну вельмі на той час папулярная! Галоўным героем моднага шлягера быў кароль Луі (верагодна, французскі), які, на сваю бяду, пакахаў бязродную прыгажуню, што мела неасцярожнасць пасвіць гусей пад сценамі каралеўскага палаца. Забыўшыся на сваё каралеўскае паходжанне і высокую пасаду, закаханы Луі ўзяў у галаву, што абавязкова павінен ажаніцца з прыгожай гусапаскай.

Але дзе там!.. Ледзь не да смерці напалоханыя сваякі закаханага летуценніка ўзнялі такі лямант, што Луі зразумеў: нічога з гэтага не атрымаецца — тыя ніколі не дапусцяць, каб нейкая там гусапаска ні з таго ні з сяго раптам стала каралевай.

Пад вянец, як вынікала з песні, Луі пайшоў з другой — у сваяках у той ўсе былі каралі. Такім чынам, каралеўства пазбегла еўрапейскага скандалу, Луі атрымаў у жонкі страхалюдную прынцэсу і, што галоўнае, вынес з гэтай меладраматычнай прыгоды наступную горкую выснову: жаніцца па каханні каралі, на жаль, не могуць.

З песні, як вядома, словы не выкінеш. Але і з гісторыі, калі быць сумленным даследчыкам, — таксама. Я вяду да таго, што якраз у беларускай, сумеснай з палякамі, мінуўшчыне, ёсць эпізод, які дае падставы засумнявацца ў тым,

што кароль Луі зрабіў адзіна правільны ў той сітуацыі выбар. Знайшлася асоба каралеўскай крыві, якая не адступіла ні перад бацькоўскім гневам, ні перад асуджэннем вышэйшага свету, ні нават перад магчымасцю пазбавіцца трона, і...

Але давайце не будзем спяшацца і паспрабуем па магчымасці коратка расказаць пра драматычныя падзеі, што ўзрушылі шырокую грамадскасць Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства ў другой чвэрці далёкага ад нас XVI стагоддзя.

1 жніўня 1520 года Кракаў, тагачасную польскую сталіцу, узрушыла радасная вестка: каралева Бона падарыла свайму мужу Жыгімонту I сына, а значыць, паўнапраўнага спадкаемца трона. Хлопчыка, як і бацьку, назвалі Жыгімонтам, але надалі і другое імя — Аўгуст.

А праз чатыры месяцы, 6 снежня, у далёкім ад сталічнага шуму і тлуму Нясвіжы, радавым гняздзе знакамітых і ўплывовых у абедзвюх дзяржавах магнатаў Радзівілаў, таксама назіралася вялікая сумятня: у сям'і Юрыя, якога за перамогі над ворагамі ў трыццаці бітвах празвалі Віктóрам (Пераможцам), або Літоўскім Геркулесам, і якому Жыгімонт I пасля славутага Канстанціна Астрожскага перадасць булаву вялікага гетмана, нарадзілася дачка. Дзяўчынку назвалі Барбарай.

Упершыню Жыгімонт Аўгуст і Барбара сустрэнуцца праз дваццаць тры гады, падчас балю ў Вільні. А мы, пакуль дзеці падрастаюць у клапатлівым атачэнні мамак, нянек і настаўнікаў, паспрабуем з большага зразумець, у які час яны жылі і якія людзі, з тых, што былі побач, аказалі найбольшы ўплыў на іх лёсы.

Для таго каб разабрацца ў палітычных варунках першай паловы XVI стагоддзя, ва ўзаемаадносінах і ўзаемаўплывах Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства, у ролі, якую адыгрывала ва ўсім гэтым набіраючая моц Маскоўская дзяржава, трэба, па меншай меры, напісаць таўшчэзны аналітычны трактат. На жаль, а можа, і на шчасце, мы такой магчымасці не маем, таму вымушаны абмежавацца асобнымі штрыхамі, каб коратка абмаляваць тагачасную ваенна-палітычную сітуацыю.

Унук літвіна Ягайлы (заснавальніка дынастыі Ягелонаў) і сын Казіміра IV Ягелончыка Жыгімонт пасля смерці вялікага князя літоўскага Аляксандра быў абраны панамірадай на велікакняжацкі пасад. Адбылося гэта 20 кастрычніка 1506 года, а ўжо менш чым праз два месяцы (8 снежня), нягледзячы на апазіцыю малапольскіх сенатараў, сейм абраў яго польскім каралём, што па тым часе ўжо стала традыцыяй (маецца на ўвазе ракіроўка з вялікіх князёў у каралі). На той час уладар дзвюх дзяржаў падыходзіў да саракагадовага рубяжа.

На доўгае праўленне Жыгімонта I (а ўладарыў ён амаль сорак два гады) выпалі многія нягоды. Адны толькі войны з Маскоўскай дзяржавай, якія па тым часе набылі хранічны характар, з рознай доляй поспеху працягваліся без малога два дзесяцігоддзі. На гэтыя ж гады прыпадаюць шматлікія спусташальныя набегі крымскіх татар, якім раз-пораз даводзілася даваць рашучы адпор, мяцеж Міхайлы Глінскага, знакамітая Аршанская бітва і шмат чаго іншага, што прыносіла каралю і вялікаму князю немалыя клопаты.

Якраз падчас уладарання Жыгімонта I была зроблена апошняя спроба разарваць дынастычную унію паміж Літвой і Польшчай. Падчас гэтай палітычнай інтрыгі на дзяржаўную арэну быў упершыню выведзены (зразумела, не па сваёй волі) яго малалетні сын Жыгімонт Аўгуст. Інтрыга набыла досыць востры характар яшчэ і таму, што ў яго ўмяшалася другая жонка Жыгімонта — Бона Сфорца з знакамітай дынастыі міланскіх герцагаў, з якой уладар дзвюх дзяржаў узяў шлюб 20 красавіка 1518 года (Жыгімонт Казіміравіч быў старэй за жонку на дваццаць сем гадоў).

Яшчэ ў 1522 годзе сойм Вялікага княства Літоўскага (не выключана, што не без уплыву Боны, якая, натуральна, клапацілася пра будучае свайго сына) паабяцаў Жыгімонту I, што пасля яго смерці новым вялікім князем будзе абраны Жыгімонт Аўгуст. Больш таго, у 1526 годзе велікакняжацкая літоўская рада звярнулася да Жыгімонта I з настойлівай просьбай адпусціць сына ў Вільню з тым, каб шасцігадовае хлапчаня (!) заняло літоўскі пасад. З

аналізу некаторых тагачасных дакументаў асобныя даследчыкі робяць выснову, што рада мела намер абвясціць Жыгімонта Аўгуста літоўскім каралём, а Літву — каралеўствам (зразумела, поўнасцю незалежным ад Польшчы).

Жыгімонт Казіміравіч думаў над прапановай рады, як і належыць мудраму дзяржаўнаму мужу, доўга — аж тры гады. Толькі ў 1529 годзе ён прывёз сына ў Вільню. Там яго ўрачыста абвясцілі вялікім князем літоўскім (якраз з гэтага моманту Жыгімонта I і сталі называць Старым). Але на каранацыю сына ўнук Ягайлы згоды не даў і, пагасціўшы ў Вільні, вярнуўся з хлопчыкам у Кракаў.

Забягаючы наперад, адзначым, што толькі ў 1544 годзе Жыгімонт I Стары пасля настойлівых патрабаванняў вялікалітоўскіх паслоў на Берасцейскім сейме адпусціў ужо дарослага сына ў Вільню, дзе той заняў велікакняжацкі пасад і, як мог, кіраваў літоўскай дзяржавай пры дапамозе рады.

За год да гэтага Жыгімонт Казіміравіч ажаніў сына: яго жонкай стала эрцгерцагіня Лізавета Габсбург, дачка спадкаемца трона Свяшчэннай Рымскай імперыі Фердынанда I...

Пакуль Жыгімонт Аўгуст яшчэ не сустрэўся з Барбарай Радзівіл, паспрабуем з большага ахарактарызаваць маладога вялікага князя.

На думку некаторых даследчыкаў (як тагачасных, так і сучасных), па маладосці Жыгімонт Аўгуст быў досыць несур'ёзным. Дзяржаўныя справы, якімі ён па сваёй пасадзе павінен быў займацца, яго мала цікавілі і былі ў цяжар. Бацька цвяроза ацэньваў «прафесійныя якасці» сына і галоўную мэту яго «службовай камандзіроўкі» ў Вільню бачыў не ў тым, каб той дапамагаў яму кіраваць Літвой, а ў тым, каб вывесці сына з-пад шкоднага ўплыву, які аказвала на бязвольнага маладзёна яго інтрыганкамаці. Большую частку часу малады вялікі князь аддаваў уладкаванню свайго віленскага двара: збіраў карціны вядомых еўрапейскіх мастакоў, некалькі пакояў аддаў пад бібліятэку, наладжваў вучоныя дыспуты пра лютэранства і кальвінізм. Найбольш жа любіў балы і маскарады, а яшчэ — паляванне. Так, сучаснікі Жыгімонта II Аўгуста



Жыгімонт II Аўгуст. Невядомы мастак. XVI ст.

падлічылі, што ў 1546 годзе ён паляваў аж 223 дні! Яны ж засведчылі, што для шыкоўных выездаў у свет малады гуляка трымаў 27 карэт (!) і 167 (!) коней.

У атачэнні маладога вялікага князя быў і трыццацігадовы Мікалай Радзівіл Чорны, стрыечны брат нашай гераіні Барбары, які яшчэ на згаданым вышэй Берасцейскім сейме (разам з яе родным братам Мікалаем Рудым) падтрымаў ідэю абрання Жыгімонта Аўгуста вялікім князем. Той не забыў паслугу і аддзячыў Мікалаю Чорнаму

пасадай маршалка земскага, якая адчыняла будучаму знакамітаму дзяржаўнаму дзеячу дарогу ў шэрагі паноў-рады.

Напамін пра двух Мікалаеў Радзівілаў — Рудога і Чорнага — дае нам падставы сказаць колькі слоў пра гэты знакаміты магнацкі род, многія прадстаўнікі якога і ў нашай меладраме, і ў гісторыі Літвы і Польшчы наогул адыгралі вельмі важную ролю.

Радзівілы далі Літве нямала славутых асоб: разважлівых дзяржаўных і рэлігійных дзеячаў, адважных і мудрых ваяроў. Усяго за некалькі пакаленняў, літаральна за стагоддзе, яны змаглі прабіцца на самыя ўплывовыя ў Вялікім княстве Літоўскім пасады і стаць аднымі з самых багатых у Літве магнатаў. Калі яшчэ пры Вітаўце Вялікім Радзівілы (вядома ж, па магнацкіх мерках) былі, скажам так, «моцнымі сераднячкамі», то ўжо да 1528 года (фактычна, часоў нашай меладрамы) іх роду належала 228 «дымоў» і амаль 70 тысяч падданых. Харугва, якую Радзівілы выстаўлялі ў літоўскае войска, налічвала 768 вершнікаў.

Пакінем убаку далетапісныя легенды пра паходжанне роду Радзівілаў ад міфічнага, паганскага яшчэ першасвятара Ляздзейкі (па ўсім відаць, рэальнай гістарычнай асобы). Адзначым толькі, што ў 1322 годзе, яшчэ пры Гедыміне, ляздзейкаў сын Віршал займаў важныя дзяржаўныя пасады. У грамаце вялікага князя Альгерда, датаванай 1359 годам, ён згадваецца як князь Віршал Ляздзейка. З іншых летапісных крыніц вядома, што сын Віршала Войшунд (пры хрышчэнні ён атрымаў імя Мікалай) узяў шлюб з князёўнай Пракедай Віцебскай. У гэтым шлюбе нарадзіліся два сыны — Осцік і Радзівіл. Ад апошняга і пайшоў род уласна Радзівілаў.

Па сведчанні згаданага вышэй Мікалая Чорнага, продкі Радзівілаў паходзілі з Ашмянаў, а знакаміты асветнік Сымон Будны называў іх выхадцамі з людзей «славутага языка славянскага».

Адным з нашчадкаў слаўнага роду быў згаданы вышэй Юрый (палякі называлі яго Ежы) Радзівіл. Ад яго шлюбу з Барбарай Коланскай нарадзіліся (у 1512 годзе) Мікалай, пасля празваны Рудым, а праз восем гадоў дачка Барбара. У 1515 годзе ў сям'і брата Юрыя — Яна Радзівіла, па

мянушцы Барадаты, нарадзіўся сын — таксама Мікалай, якога ў свой час стануць называць Чорным. У 1522 годзе Ян Барадаты загадаў доўга жыць, і Мікалая Рудога, разам з іншымі дзецьмі памерлага, узяў у сваю сям'ю Юрый. Так сышліся разам (натуральна, і раслі і выхоўваліся) два Мікалаі — Руды і Чорны — і Барбара Радзівілы.

У 1529 годзе абодва Мікалаі былі запрошаны Жыгімонтам I у Кракаў, да свайго двара, дзе яны знаходзіліся ў свіце маладога Жыгімонта Аўгуста, набіраючыся прыдворнага вопыту і абрастаючы патрэбнымі сувязямі. Да моманту, калі разгорнуцца асноўныя падзеі нашага аповеду, малодшы з Мікалаеў — Чорны, як ужо адзначалася, прыдбаў пасаду маршалка земскага.

А вось прыгажуню Барбару 17 мая 1537 года выдалі замуж за ваяводу наваградскага (а з 1542 года — і трокскага) графа Станіслава Гаштольда, старэйшага за яе на трынаццаць гадоў, апошняга з мужчын гэтага славутага роду, які меў за рэзідэнцыю замак у Геранёнах.

Хто ведае, як бы склаўся лёс Барбары, калі б яе мужу было наканавана больш доўгае жыццё. Але мужняй жон-



Руіны палаца Барбары Радзівіл у Вільні.
Мастак Н. Орда. Другая чвэрць XIX ст.

кай яна пабыла нядоўга. У 1542 годзе не стары яшчэ граф раптоўна памірае, не пакінуўшы пасля сябе сыноў-спадкаемцаў. На Станіславе род Гаштольдаў перарываецца. Яго ўладанні, згодна з тагачасным заканадаўствам, адыходзяць у вялікакняжацкую казну. Барбара, у якой за год да гэтага памірае і бацька, пасумаваўшы крыху ў Геранёнскім замку, пераязджае ў віленскі палац сваіх братоў.

А ў хуткім часе, як ужо было згадана, у Вільню прыбывае і Жыгімонт Аўгуст. Менавіта тут (па іншых звестках, у Геранёнах) іх шляхі перакрыжоўваюцца ўпершыню. Якраз у 1543 годзе і пачынаецца гісторыя іх пылкага і трагічнага кахання, якое далёка не ўсе сучаснікі Барбары і Жыгімонта Аўгуста зразумелі і прынялі. І дагэтуль даследчыкі ламаюць галаву, спрабуючы адказаць на пытанне: чаго было больш у любоўнай меладраме — гарачага пачуцця Барбары і Жыгімонта Аўгуста ці халоднага палітычнага разліку братоў Радзівілаў?

Існуе, па меншай меры, дзве асноўныя версіі таго, чаму Барбара апынулася ў цэнтры аднаго з самых гучных палітычных скандалаў польскай і беларускай гісторыі.

Як адзначаюць сучаснікі, Барбара Радзівіл была жанчынай незвычайнай прыгажосці. Таму застаецца загадкай, чаму Станіслаў Гаштольд (пра гэта таксама сведчаць сучаснікі) не падпаў пад чары маладой жонкі, быў да яе абыякавы і, як кажуць, нават здраджваў ёй з другімі жанчынамі. Магчыма, гэта было нейкім чынам звязана з тым, што ён, апошні з Гаштольдаў, страсна жадаў займець сына — прадаўжальніка роду, а Барбара за некалькі гадоў так і не змагла зацяжараць.

У Жыгімонта Аўгуста сітуацыя была куды больш зразумелай. Яго жонка Лізавета Габсбург прыгажосцю не вылучалася, знешнасць мела досыць невыразную, не вызначалася і розумам. Да таго ж пакутавала на эпілепсію. Вытанчанага, па-еўрапейску адукаванага і, што таіць, ласага да жаночых прывабаў Жыгімонта Аўгуста такое становішча, вядома ж, не задавальняла і было яму ў цяжар.

У канцы 1542 года Бог прыбраў да сябе бяздетнага Станіслава Гаштольда. Жалоба Барбары па мужу была



Барбара Радзівіл. Невядомы мастак. XVI ст.

нядоўгай. Маладая ўдава, якая пакутавала ў нешчаслівым шлюбе, пасумаваўшы для прыліку колькі месяцаў, быццам кінулася наверстваць упушчанае. Барбара пачала ўсё часцей выходзіць у свет, з'яўляцца на балях і маскарадах, што даваліся пры вялікакняжацкім двары.

Чуткі (і, дададзім, плёткі) пра маладую «вясёлую ўдаву» не маглі не дайсці да Жыгімонта Аўгуста, і той вырашыў праверыць, ці праўду кажуць людзі пра неверагодную пры-

гажосць Барбары. Як ужо гаварылася, іх першая сустрэча, магчыма, адбылася ў Вільні падчас аднаго з баляў. Пабачыўшы ўдаву, малады вялікі князь быў як уражаны маланкай: ён упэўніўся, што людзі не перабольшвалі прыгажосць Барбары. Жыгімонт Аўгуст закахаўся ў яе, як кажуць, з першага позірку. Каб часцей бачыць прыгажуню, ён прызначыў Барбару фрэйлінай сваёй жонкі Лізаветы.

І тут яшчэ адзін нечаканы паварот лёсу. 15 чэрвеня 1545 года раптам памірае Лізавета. Пры двары папаўзлі чуткі, што каралеву і вялікую княгіню ...атруцілі па настойлівай просьбе Барбары. Ды і невытрыманы Жыгімонт Аўгуст, не надта звяртаючы ўвагі на жалобу па жонцы, не спыняў сваіх заляцанняў да каханкі.

У гэтай двухсэнсаўнай сітуацыі Барбара перастала з'яўляцца пры двары, нават спрабавала з'ехаць у Геранёны. Але Жыгімонт Аўгуст знайшоў важную прычыну, каб наведвацца і туды: пасля смерці Станіслава Гаштольда яго ўладанні, як ужо адзначалася, пераходзілі ў велікакняжацкую казну, і малады вялікі князь з'яўляўся ў Геранёнах як бы для інспекцыі сваіх новых набыткаў.

Відавочна, што Барбара не вельмі супраціўлялася націску пылкага каханка. Прыхільнікі рамантычнай трактоўкі падзей гэтай меладрамы сцвярджаюць, што яе каханне да Жыгімонта Аўгуста было шчырым і бескарысным. Больш разважлівыя і цынічныя аналітыкі схіляюцца да думкі, што на першым месцы тут была палітычная інтрыга братоў Радзівілаў. Цяжка сказаць, ці ведала Барбара пра намеры сваіх роднага і стрыечнага братоў: адны лічаць, што яна ведала, якую мэту тыя паставілі перад сабой, другія ж упэўнены, што сястра была сляпой зброяй у іх руках, нічога не падазравала і кахала Жыгімонта Аўгуста па-сапраўднаму. Але адно можна сказаць з дастатковай доляй верагоднасці: пачуцці Жыгімонта Аўгуста да Барбары былі самымі шчырымі. І вельмі нават верагодна, што браты Радзівілы вырашылі гэта скарыстаць.

Абодва Радзівілы па свайму прыдворнаму статусу былі асобамі, блізкімі да маладога вялікага князя. У тагачасных дакументах ёсць сведчанні, што Чорны з Рудым не-

аднаразова звярталіся да Жыгімонта Аўгуста з просьбай «не чыніць нясланы іх дому». Той даваў абяцанні, што перастане патаемна наведваць Барбару і возьмецца за розум. Але праз пэўны час у чарговы раз парушаў свае абяцанні.

У адзін з начных візітаў Жыгімонт сустрэў у спальні Барбары... братоў Радзівілаў. Існуюць дзве версіі таго, што адбылося ў тую ліпеньскую ноч 1547 года. Па адной з іх, Руды і Чорны выхапілі з похваў шаблі і, пагражаючы імі (што было натуральна: каханка «застукалі» ў чужым доме), заставілі даць слова... ажаніцца з Барбарай. Па другой версіі, Жыгімонт Аўгуст сам прапанаваў братам такі варыянт развязкі досыць пікантнай сітуацыі.

Як бы там ні было, але ў тую ж ноч каплан Радзівілаў у прысутнасці абодвух Мікалаеў, Барбарынай сястры Ганны і іх сваяка Станіслава Кезгайлы патаемна павянчаў Жыгімонта Аўгуста і Барбару.

А 1 красавіка 1548 года ў Кракаве памёр кароль польскі Жыгімонт І Стары (вялікім князем літоўскім на той час, нагадаем, быў ужо яго сын). 17 красавіка Жыгімонт Аўгуст афіцыйна ўвёў Барбару ў свой віленскі велікакняжацкі палац як законную жонку. Сойм Вялікага княства Літоўскага без асаблівых ваганняў амаль аднагалосна прызнаў Барбару вялікай княгіняй.

Па ўсіх канонах, Жыгімонт Аўгуст павінен быў заняць і апусцелы польскі пасад. Але польскія паны і шляхта, а найбольш — аўдавелая каралева Бона Сфорца, згаджаючыся з гэтым, наадрэз адмовіліся, каб разам з новым каралём на кракаўскі трон села літвінка Барбара — жанчына хоць і дастаткова высакароднага паходжання (Радзівіл Руды на той час ужо быў князем), але не з вянцаноснай сям'і.

Скандал выбухнуў грандыёзны, на ўсю Еўропу...

Лёс Жыгімонта Аўгуста і яго жонкі Барбары вырашаў сейм у Пётркаве...

Давайце паразважаем наконт таго, ці толькі шлюб будучага польскага караля з «непаўнавартаснай» Барбарай стаў прычынай гарачых дыскусій, што разгарэліся на сейме ў Пётркаве? Дзеля справядлівасці заўважым, што

такія «няроўныя» шлюбы ў каралеўскім асяродку тагачаснай Еўропы хоць і рэдка, але ўсё ж такі здараліся, пра што сведчыць і французская, і англійская, і расійская гісторыя. Так што справа, хутчэй за ўсё, не ў Барбары, а ў яе братах, на той час адных з самых уплывовых у Вялікім княстве Літоўскім (ды і ў Польскім каралеўстве) дзяржаўных дзеячаў. Забягаючы наперад, адзначым, што, напрыклад, Мікалай Руды (родны брат Барбары) ужо ў 1553 годзе атрымаў пасаду вялікага гетмана літоўскага, а ў 1565-ым — літоўскага канцлера і выконваў абавязкі каралеўскага намесніка ў Літве. Мікалай Чорны з'яўляўся літоўскім канцлерам з 1550 года, а з 1551 года быў віленскім ваяводам і ў адсутнасць Жыгімонта Аўгуста фактычна кіраваў Літвой.

Дарэчы, менавіта яны — Руды і Чорны — напярэдадні Люблінскіх падзей 1569 года ўзначалілі барацьбу супраць уніі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай.

Безумоўна, разумеючы ўплывовасць Радзівілаў, іх вялікія кар'ерныя перспектывы (што і спраўдзілася), больш чым прыязныя адносіны з Жыгімонтам Аўгустам, польскія магнаты не хацелі дапусціць далейшага ўзвышэння братоў-літвінаў, што было непазбежным, калі б іх сястра Барбара стала польскай каралевай (дарэчы, і канцлерам, і ваяводам Мікалай Чорны стаў яшчэ пры жывой Барбары).

Не жадаючы ўзвышэння Радзівілаў, польскія палітыкі баяліся і роста сепаратысцкіх памкненняў Літвы, ведаючы, што браты з'яўляюцца прыхільнікамі самай шырокай аўтаноміі і нават поўнай незалежнасці Вялікага княства Літоўскага ад Польшчы. Іх сястра ў ролі польскай каралевы была б, на іх думку, магутным рычагом радзівілаўскага ўздзеяння на слабавольнага, як яны лічылі, Жыгімонта Аўгуста, да таго ж відавочна закаханага ў прыгажуню літвінку.

Але «слабавольны» Жыгімонт Аўгуст, на здзіўленне дэпутатаў сейма і сваёй маці Боны, стаяў непахісна: ён быў нават гатовы адмовіцца ад польскай кароны, каб толькі быць разам з Барбарай (праўда, у запасе ў яго была Літва, дзе яго ўжо даўно абвясцілі вялікім князем і толькі што прызналі за жонкай паўнамоцтвы вялікай княгіні).

Польскі сейм здаўся... 9 снежня 1550 года прымас Дзяргоўскі са згоды сейма ўрачыста надзеў на галаву Барбары Радзівіл польскую карону. Відаць, дэлегаты былі ашаломлены нечаканым праяўленнем з боку «слабавольнага» Жыгімонта Аўгуста як раз жалезнай волі. Да такога паваролу падзей сейм быў яўна не гатовы. Ёсць пэўныя звесткі і пра тое, што апрацоўку дэпутатаў сейма на карысць Барбары (магчыма, выкарыстоўваючы і подкуп: грошай у Радзівілаў не бракавала) актыўна займаўся Мікалай Чорны.

Але з сеймам не згаднілася зламысная Бона Сфорца. Вельмі многія даследчыкі схіляюцца да думкі, што менавіта каварная італьянка стала галоўнай прычынай таго, што польскую карону Барбара насіла толькі сто пяцьдзесят дзён.

Ужо падчас каранацыі каралева Барбара адчувала сябе кепска. А потым пачала загасаць, як свечка. Дыягназ прыдворных лекараў быў страшным і прагучаў, як прысуд: рак... Праўда, сімптомы невылечнай хваробы былі вельмі дзіўныя: усё цела маладой жанчыны пакрылася гнойнымі нарывамі, ад якіх ішоў невыносны смурод. Барбара пакутавала ад жудаснага болю, і смерць стала для яе доўгачаканым пазбаўленнем ад пакутаў.

Сканала Барбара на руках мужа 8 мая 1551 года. Ён вывез яе з такой чужой і нават варожай для яе Польшчы і, парушаючы традыцыі, пахаваў не ў Кракаве, а на радзіме, у Вільні, каля касцёла Святога Станіслава.

Вядома ж, было следства. Падчас яго высветлілася, што Барбара злоўжывала лекамі ад бясплоддзя, якія яна атрымлівала ад асабістага сакратара і лекара Боны Людвіга Монці. Папаўзлі чуткі, што дзейнічаў Монці па загаду самой старой каралевы. Падазрэнні амаль перараслі ва ўпэўненасць, калі Бона, прыхапіўшы вялікія каштоўнасці з каралеўскай скарбніцы, патаемна пакінула Польшчу: відаць, далей ад граху і вельмі верагоднай жорсткай расплаты. Наўрад ці Радзівілы даравалі б Боне тое, што яна парушыла іх далёка ідучыя планы, атруціўшы сястру.

Жыгімонт II Аўгуст уладарыў у абедзвюх дзяржавах яшчэ больш за дваццаць гадоў і памёр 7 ліпеня 1572 года адносна маладым, у адрозненне ад свайго бацькі, які



Смерць Барбары Радзівіл. Мастак Ю. Сімлер. 1868 г.

пражыў больш за 81 год. Сучаснікі сведчаць, што кароль і вялікі князь вельмі цяжка перажываў смерць сваёй жонкі. Каханне Жыгімонта Аўгуста і Барбары парадзіла нямала прыгожых легенд, у якіх праўда перамяшалася з вымысламі. Верагодна, што больш познія летапісцы пэўным чынам ідэалізавалі гэту сапраўды трагічную гісторыю, надаўшы ёй характар класічнай меладрамы.

Каханне — каханнем, але найперш Жыгімонт II быў уладаром дзвюх дзяржаў, і дзяржаўныя інтарэсы досыць хутка ўзялі верх над памяццю пра незабыўную Барбару. 31 ліпеня 1553 года кароль і вялікі князь ажаніўся ў трэці раз: яго жонкай стала сястра Лізаветы (першай жонкі Жыгімонта Аўгуста) — пакутаваўшая ад эпілепсіі Катарына Габсбург, дачка брата аўстрыйскага эрцгерцага Фердынанда I, якая аўдавела пасля смерці свайго мужа — мантыйскага герцага.

Нейкае закляцце, відаць, вісела ўсё ж такі над Жыгімонтам Аўгустам: і трэці яго шлюб быў бяздзетным. А з яго смерцю скончыла існаванне і каралеўская велікакняжацкая дынастыя Ягелонаў, якія ўладарылі ў Літве і Польшчы амаль два стагоддзі.

## Крыніцы


*Беларускія летапісы і хронікі. — Мінск, 1997.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. Т. 3. — Минск, 1993.*

*Казлоў, Л.Р. З дазволу караля і вялікага князя /Л.Р. Казлоў. — Мінск, 1992.*

*Масляницына, И. Радзивиллы — несвижские короли /И. Масляницына, И. Богодяж. — Минск, 1997.*

*Насевіч, В. Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх родаў XII—XVIII стагоддзяў /В. Насевіч. — Мінск, 1993.*

*Тарасаў, К. Памяць пра легенды /К. Тарасаў. — Мінск, 1990.*

*Чаропка, В. Уладары Вялікага княства /В. Чаропка. — Мінск, 1996.*

*Шышыгіна-Патоцкая, К.Я. Скарбы Нясвіжа /К.Я. Шышыгіна-Патоцкая. — Мінск, 1993.*

*Шышыгіна-Патоцкая, К.Я. Чорная дама Нясвіжскага замка / К.Я. Шышыгіна-Патоцкая. — Мінск, 1992.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. — Мінск, 2001.*

# ТАКІЯ РОЗНЫЯ АДНОЛЬКАВЫЯ ЛЁСЫ...

У невялічкай, двароў на трыццаць, заходнебеларускай вёсачцы, дзе дажывае свой век мая цешча, наўрад ці асабліва задумваюцца над прынцыповымі адрозненнямі праваслаўнай веры ад каталіцкай. Насельнікі вёскі, многім з якіх ужо за восемдзесят, увесь год занятыя іншымі, мірскімі клопатамі: ходзяць за скацінай, корпаюцца на бульбяных сотках ці ў агародах, ламаюць галову над тым, дзе і як разжыцца сенам і дровамі на зіму.

Рэлігійныя абрады тут, праўда, даволі строга выконваюць. Ніводная маці або цешча не дазволяць сыну або зяцю, што завіталі ў вёску на выхадныя ці ў адпачынак, узяцца за сякеру або касу ў нядзелю ці — крый Божа! — на Вялікдзень або Тройцу: грэх і сорам!

Прызнаемся: вельмі многія з нас сённяшніх, як правіла, і самі хрышчоныя, і дзяцей і ўнукаў стараемся не пакінуць у нехрысцях. А ўспомнім, што нават у самы разгар пабудовы «развітога сацыялізму» большасць з нас адзначалі і Раство, і Вялікдзень, і Радаўніцу. Без выканання рэлігійных абрадаў, але ўсё ж... У цешчынай вёсцы здзіўляе мяне зусім іншае: поўны кансенсус паміж праваслаўнымі і каталікамі, якіх у вёсцы прыкладна пароўну. І «польскія», і «рускія» святы тут шануюць аднолькава. І праваслаўных, і каталікаў, што адыходзяць у нябыт, хаваюць на адных могілках. Бывае, што бабулі-каталічкі ходзяць у царкву, каб паставіць там памінальную свечку (балазе, царква пад бокам).

Я падазраю, што і цешчы, і яе немаладым ужо сяброўкам, па вялікаму рахунку, не так ужо і важна, якую веру, «польскую» ці «рускую», яны спавядаюць. Галоўнае

для іх, відаць, у іншым: у тым, што недзе там, на небе, ёсць Бог, які ўсім кіруе і без ведама якога нічога не адбываецца тут, на зямлі.

Я часта задумваюся: чаму ж стагоддзямі людзі варагавалі паміж сабой і нават забівалі адзін аднаго толькі за тое, што яны, суседзі спрадвеку, спавядаюць розныя веры? I галоўнае — хто вінаваты ў людскіх пакутах і пралітай крыві?

Хрысціянства, між іншым, амаль палову сваёй гісторыі не падзялялася на праваслаўе і каталіцызм. Трагічны па сваёй сутнасці раскол адзінага па тым часе веравызнання на два напрамкі — усходні і заходні — быў вынікам палітычных супярэчнасцей і, галоўнае, тэрытарыяльных прэтэнзій паміж двума тагачаснымі сусветнымі цэнтрамі — Рымам і Візантыяй. Больш моцная на той час Візантыя не хацела саступаць ужо заняпаламу Рыму. Супрацьстаянне прывяло да таго, што ў Канстанцінопаль, сталіцу Візантыі, прыехалі паслы рымскага папы Льва IX і 16 ліпеня 1054 года абвясцілі з царкоўных амбонаў анафему (пракляцце, адлучэнне ад царквы) канстанцінопальскаму патрыярху Міхаілу Керуларыю. Рэакцыя візантыйскіх улад была адэкватнай: з вуснаў канстанцінопальскіх святароў прагучала анафема папскім легатам, а Рым быў абвешчаны «ерэтычнай сталіцай».

З часам за заходняй, рымскай, царквой замацавалася назва каталіцкай (ад лацінскага catholicus — сусветны, усеагульны). Усходняя, візантыйская, або грэчаская, царква стала называцца праваслаўнай, або артадаксальнай (ад грэчаскага orthodoxos — прававерны, праваслаўны).

Заўважым, што напачатку Кіеўская Русь адмовілася прызнаць царкоўны падзел. Дарэчы, вялікі кіеўскі князь Яраслаў Мудры, які на той час якраз знаходзіўся з візітам у Канстанцінопалі, з пашанай прыняў у сваёй рэзідэнцыі паслоў рымскага папы, якія толькі што абвясцілі анафему канстанцінопальскаму патрыярху.

На жаль, Беларусь неаднойчы станавілася арэнай (бывала, і крывавай) высвятлення адносін паміж дзвюма канфесіямі, якія часта пераходзілі ў міждзяржаўныя ваенныя сутычкі. Сведчанне таму — трагічныя падзеі сярэдзіны XVII стагоддзя, што адбываліся ў Пінску і яго ваколі-

цах (і наогул, на поўдні Беларусі), і не менш трагічныя лёсы двух знакамітых святароў, якія былі актыўнымі ўдзельнікамі і сталі ахвярамі гэтых падзей.

Ці перасякаліся жыццёвыя шляхі тых людзей, па сутнасці, зацятых ворагаў? Прынамсі, пісьмовых сведчанняў або згадак сучаснікаў на гэты конт пакуль не знойдзена. Але, на наш погляд, у даным выпадку не так ужо і важна — сустракаліся ці не Афанасій Філіповіч і Андрэй Баболя. Уражвае другое: у абодвух — такія розныя ... аднолькавыя лёсы. І перш чым закрануць трагічную аднолькавасць, трэба ўсё ж разгледзець іх рознасць.

Галоўнае ж адрозненне двух адметных хрысціян у тым, што адзін з іх — Афанасій Філіповіч — быў праваслаўным, другі ж — Андрэй Баболя — каталікам.



Абраз святога Афанасія (Філіповіча)



Святы Андрэй Баболя. Малюнак Л. Навотнага

Большая палова жыцця Афанасія Філіповіча — ці не суцэльная белая пляма. Дакладны год яго нараджэння невядомы. Ён губляецца недзе паміж 1595 і 1600 гадамі. Некаторыя ўскосныя даныя дазваляюць меркаваць, што нарадзіўся ён у 1597 годзе. Калі ўлічыць, што пастрыг у манахі ў праваслаўнай царкве XVII стагоддзя мог адбыцца не раней чым у трыццаць год, а Афанасій Філіповіч быў «рукапаложаны» ў манахі айцом Іосіфам Бабрыковічам у Вільні, пры царкве Святога Духа ў 1627 годзе, то вышэйназваная дата нараджэння можа быць вельмі верагоднай.

Дзе нарадзіўся Філіповіч — невядома наогул. Ёсць меркаванне, што на Гродзеншчыне, але яно нічым не падмацавана. Больш таго, няма адназначнай думкі наконт таго, што Філіповіч — прозвішча ці імя па бацьку. У дакументальных крыніцах, якія тычацца Мінскай губерні і Літоўскай епархіі, называюцца асобы шляхецкага паходжання і святары па прозвішчу Філіповіч, але гэта не дае падстаў лічыць, што Афанасій адносіцца да іх шэрагу.

Невызначаным застаецца і паходжанне Філіповіча. Вядомы рускі і ўкраінскі гісторык Мікалай Кастамараў яшчэ ў мінулым стагоддзі лічыў, што Філіповіч паходзіў з сям'і беднага шляхціца. Беларускі даследчык Аляксандр Коршунаў, не згаджаючыся з Кастамаравым, спасылаўся каля трыццаці гадоў таму на вядомы «Дыярыуш» Філіповіча, дзе ён сам называў сябе простым чалавекам, гарбаром, калугерам (манахам-пустэльнікам), і адносіў яго да выхадцаў з сям'і гарадскога рамесніка. Пісьменнік Кастусь Тарасаў схіляецца да версіі Кастамарава, падмацоўваючы сваё меркаванне тым, што толькі шляхціца, якім, на яго думку, з'яўляўся Філіповіч, канцлер Вялікага княства Літоў-

скага Леў Сапега мог запрасіць у 1620 годзе ў выхавацелі да «царэвіча маскоўскага», нібыта сына Лжэдзмітрыя I і Марыны Мнішак, якога рыхтавалі да ўзвядзення на маскоўскі прастол.

У паходжанні Філіповіча бясспрэчным уяўляецца толькі адно: ён — беларус (аб чым сведчыць мова яго «Дыярыуша»), а тое, што ён быў брэсцкім ігуменам, гаворыць на карысць яго, хутчэй за ўсё, заходнебеларускага паходжання, бо па царкоўных правілах XVII стагоддзя такі досыць высокі пост у праваслаўнай іерархіі мог займаць, за рэдкім выключэннем, толькі чалавек, які паходзіў з гэтай жа тэрыторыі...

Што тычыцца Андрэя Баболі, то наша малая дасведчанасць пра яго лёс тлумачыцца тым, што да апошняга часу ён быў персонай нон грата ў гісторыі. Чаму? Папершае, ён быў палякам, па-другое — каталікам, да таго ж — езуітам. Аднак не ўлічвалася, што значная частка яго жыцця і святарскай дзейнасці (няхай сабе і спрэчнай з праваслаўных пазіцый) праходзіла на беларускіх абшарах — у Вільні, Нясвіжы, Бабруйску і — даволі працяглы тэрмін — у Пінску і яго ваколіцах.

Польскія даследчыкі называюць датай нараджэння Баболі 30 лістапада 1591 года, дзень святога апостала Андрэя. Нарадзіўся ён у Страхоціне, каля Санака (паўднёвы ўсход Польшчы, цяперашняе Жэшаўскае ваяводства). Шляхецкі род Баболяў належаў да герба Ляліва і быў вядомы ўжо на мяжы XIII–XIV стагоддзяў. Продкі Баболі — людзі ваяўнічыя, не раз вызначаліся ў бітвах з туркамі, валахамі, маскавітамі і з'яўляліся шчырымі каталікамі. I Баболя, і Філіповіч былі высокаадукаванымі для свайго часу людзьмі. Але калі першы з іх прайшоў поўны курс навук у Бранеўскім езуіцкім капітуле і Віленскай езуіцкай акадэміі (1608–1622), то дзе, як і чаму вучыўся другі — невядома. Кастусь Тарасаў мяркуе, што пачатковую адукацыю Філіповіч мог атрымаць у адной з праваслаўных брацкіх школ (а яны ў маладыя гады Філіповіча дзейнічалі ў Вільні, Магілёве, Брэсце, Мінску, Слуцку, у тым жа Пінску), а прадоўжыў яе ў Віленскай езуіцкай акадэміі, куды прымалі моладзь любога хрысціянскага ве-

равызнання. Гісторык жа праваслаўнай царквы Аляксей Мельнікаў прама ўказваў, што атрыманая ў брацкім вучылішчы адукацыя не задавальняла юнака, і ён «прайшоў навучанне ў Віленскай езуіцкай калегіі».

Як вядома, з 1613 па 1616 год Андрэй Баболя вывучаў у Віленскай акадэміі філасофію, а з 1618 па 1622 год — тэалогію. Тут, у мурах акадэміі, Баболя і мог сустрэцца з Філіповічам. Давайце крыху паразважаем на гэты конт.

Першы раз Баболя прыехаў у Вільню, маючы дваццаць два гады, а скончыў курс навук, калі яму быў ужо трыццаць адзін год.

Відавочна, што Філіповіч мог вучыцца ў Вільні не пазней за 1620 год, калі ён прыняў пад апеку «царэвіча маскоўскага» (дарэчы, вядомы рускі агіёграф Міхаіл Талстой называў больш познюю дату гэтай падзеі — 1622 год). У 1613–1616 гадах Філіповіч па прычыне свайго маладога ўзросту наўрад ці мог вучыцца ў акадэміі (успомнім, што Баболя пачаў сваю адукацыю тут у дваццаць два гады). А вось пасля 1618 года сумеснае навучанне Андрэя Баболі і Афанасія Філіповіча ў Віленскай езуіцкай акадэміі (безумоўна, у выпадку, калі апошні там вучыўся на самай справе) вельмі верагоднае.

Як ужо адзначалася, з 1620 па 1627 год Філіповіч быў выхавацелем так званага «царэвіча маскоўскага» — на самай справе сына польскага шляхціца з Падляшша Дзмітрыя Лубы Яна Фаустына, якога, як адзначае той жа М. Талстой, «езуіты рыхтавалі на самазванства, каб зноў узняць смуту ў Расіі».

Сем гадоў правёў Філіповіч побач са сваім гадаванцам у адным з брэсцкіх манастыроў. Ці ведаў ён, каго вучыў навукам «царкоўнарускім» на самай справе? Адзін з ранніх біёграфаў Філіповіча, ужо згаданы М. Талстой, не абмовіўся аб гэтым ні словам. А. Коршунаў, разважаючы на гэты конт, катэгарычных высноў не зрабіў, ужываючы словы кшталту «верагодна», «трэба меркаваць», «відаць». А. Мельнікаў лічыў, што Філіповіч паступова прыходзіў да высновы, што яго выхаванец — чарговы самазванец. К. Тарасаў сцвярджае, што Філіповіч, бясспрэчна, верыў у праўдзівасць пададзенай яму легенды.

Дык дзе ж праўда? Аб ёй мы наўрад ці калі даведаемся. Але два апошнія дзесяцігоддзі жыцця Афанасія Філіповіча яскрава сведчаць аб тым, што ён вельмі балюча перажываў свой — вольны ці нявольны — грэх. Яго апантанасць у рэлігійных справах, гарачае адстойванне пазіцый праваслаўя, бязлітасная барацьба з уніяцтвам, сама трагічная гібель — як бы выкупленне гэтага сямігадовага граху. Свой пакутлівы шлях да гэтага выкуплення Афанасій Філіповіч пачаў у цеснай келлі Віленскага Святадухаўскага манастыра ў 1627 годзе. У тым жа годзе з благаслаўлення айца Іосіфа Бабрыковіча пачалося паслушэнства Афанасія Філіповіча, якое праходзіла ў Куцеінскім манастыры пад Оршай і ў Міжгорскай абіцелі паблізу Кіева. У 1632 годзе ў Вільні Філіповіч быў пасвечаны ў сан іераманаха, а ў наступным годзе стаў намеснікам ігумена блізкага ад Пінска Дубайскага манастыра Лявонція Шыціка...

А што ж Андрэй Баболя? Усе гэтыя гады ён удасканальваўся ў веры, адбываючы прабацыі ў Нясвіжскім калегіуме пад наглядам рэктара Яна Аляндуса. Пасля тут жа быў рэктарам езуіцкага касцёла. З 1624 па 1630 год прапаведаваў у Віленскім касцёле Святога Казіміра. З 1630 да вясны 1636 года — суперыёр у Бабруйску, пасля чаго вярнуўся ў Вільню. Потым былі Варшава, зноў Вільня, праца ў Плоцкім калегіуме, чатыры гады прапаведніцтва ў Ломжы, яшчэ раз Вільня і, нарэшце, на мяжы 1642–1643 гадоў — перавод у Пінскі езуіцкі калегіум...

Але вернемся да Афанасія Філіповіча. На Піншчыне ён адразу ж апынуўся ў самым цэнтры супрацьстаяння праваслаўнай царквы з уніятамі, падтрыманага каталіцкім святарствам і мясцовымі ўладамі.

Яшчэ ў 1614 годзе ўладальніца Дубая Раіса Гарабурда вырашыла пабудаваць тут царкву. Але ідэя прыйшлася не даспадобы Пінскай уніяцкай капітуле, якую ўзначальваў Паісій Сахоўскі. Сеймавы суд прыняў бок уніяцкага святара. Другі уніяцкі епіскап — Рыгор — у 1631 годзе адабраў у пінскіх праваслаўных вернікаў царкву Святога Фёдара. Падтрымку сваіх дзеянняў пінскія уніяты знайшлі ў літоўскага канцлера Альбрэхта Станіслава Радзівіла. Менавіта ён, займаючы пасаду пінскага старосты, у 1636 го-

дзе выгнаў манахаў з Дубайскага манастыра. На іх месца адразу ж уладкаваліся езуіты, якія да таго ж атрымалі ў валоданне манастырскія землі.

Афанасій Філіповіч спрабаваў пратэставаць супраць гвалту, выступіўшы з пісьмовым пратэстам, але безвынікова. Пасля выгнання з Дубая ён знайшоў прытулак у суседнім Купяцiцкім манастыры, славутым сваім абразом Божай Маці. Менавіта адсюль у лістападзе 1637 года Афанасій Філіповіч разам з паслушнікам Анісімам Валкавіцкім і пачаў сваё знакамітае падарожжа ў Маскву. Легальнай яго мэтай быў збор ахвяраванняў на абнаўленне Купяціцкай манастырскай царквы, тайнай, але галоўнай — пошук дапамогі і абароны ў маскоўскага цара.

Перыпетыі гэтага доўгага і часта небяспечнага ваяжу купяціцкіх манахаў шырока вядомыя, таму не станем на іх спыняцца. Адзначым толькі, што вынікі яго былі даволі паспяховыя: Філіповіч атрымаў шчодрыя ахвяраванні.

Але ў «Гісторыі падарожжа ў Маскву», напісаным Філіповічам і ўручаным цару Міхаілу, прама падкрэслівалася, што ахвяраванні — не галоўная мэта хадакоў з Літвы — Беларусі. У пасланні да рускага цара быў прамы заклік да вайны з суседняй дзяржавай: «... звіцяжай непрыяцеляў нашых, бо ўжо час настаў... А ў бітве той кожнага чалавека, які імянуе сябе праваслаўным, здорава захавай».

Такім чынам, як меркаваў у свой час А. Коршунаў, Філіповіч падбухторваў Маскву да ўмяшання ва ўнутраныя справы Вялікага княства Літоўскага. Свае ваяўнічыя прапановы ён, як лічыў Коршунаў, падмацаваў каштоўнымі звесткамі аб тым, што, пакуль Масква дрэмле, суседзі даўно ўжо рыхтуюць самазванца на маскоўскі трон.

Учынак Афанасія Філіповіча цяжка ацаніць адназначна. Як праваслаўны святар, ён меў рацыю, стараючыся абараніць сваю веру ад гвалтоўных дзеянняў каталікаў і уніятаў. Але ж ён яшчэ быў грамадзянінам сваёй краіны — і заклік да вайны супраць яе, і выдача вядомай яму дзяржаўнай тайны... Як ацаніць яго ўчынак?

Як бы там ні было, але, абцяжараны шчодрымі ахвяраваннямі для Купяціцкай царквы, у Вербную нядзелю

1638 года Філіповіч развітаўся з Масквой. 16 чэрвеня ён ужо быў у Вільні, а ў ліпені пераступіў парог Купяціцкай абіцелі.

А праз два гады, калі вырашалася пытанне аб прызначэнні ігумена ў Брэсцкі Сімяонаўскі манастыр, выбар паў на Афанасія Філіповіча. Тут і пачаўся апошні, самы бурны перыяд жыцця будучага прападобнамучаніка...

Першы пінскі перыяд у святарскай дзейнасці Баболі працягваўся да ліпеня 1646 года, калі ён з прычыны хваробы быў пераведзены ў Вільню. У Пінску Андрэй Баболя, шчыруючы ў езуіцкім калегіуме, выконваў абавязкі прапаведніка, кіраўніка навучання і мадэратара Марыінскай Сандаліцыі мясцовых землеўладальнікаў. У хроніцы Пінскага калегіума тых часоў засталіся сведчанні, што езуіты, сярод якіх быў і Баболя, вылучаліся вялікай актыўнасцю ў справе пераводу тутэйшых праваслаўных вернікаў у каталіцтва, гэта значыць, займаліся звычайнай «лоўляй душ».

Як можна ацаніць падобную дзейнасць? З пункту гледжання каталіцкай царквы, безумоўна, станоўча. Але мясцоваму праваслаўнаму святарству езуіцкія памкненні наўрад ці былі даспадобы. Хроніка Пінскага калегіума, называючы дзейнасць езуітаў плённай, тым не менш указвае на шматлікія факты процідзеяння з боку праваслаўнай царквы і нават пагрозы ў адрас каталіцкіх місіянераў.

Адным словам, адна канфесія даволі бесцырымонным чынам умешвалася ў справы другой (а праваслаўныя, заўважым, былі ўсё ж такі не язычнікі), маючы, відаць, падтрымку з боку ўлад. Галоўным натхніцелем езуітаў быў айцец Андрэй Баболя...

У тыя ж гады брэсцкі ігумен Афанасій Філіповіч апантана змагаўся з уніятамі і іх прыхільнікамі — католікамі. Да сучаснікаў дайшлі сведчанні, што барацьба была надзвычай вострай і бескампраміснай з абодвух бакоў. Змагаючыся з уніятамі, Філіповіч апеляваў да самога Уладзіслава IV, караля польскага і вялікага князя літоўскага. Адзначым, што патрабаванні брэсцкага ігумена да кіраўніка дзяржавы часта гучалі ва ультыматыўнай форме. У сваёй шырока вядомай супліцы, якую Філіповіч напісаў у

1643 годзе, ён фактычна ставіў Уладзіславу ультыматум, патрабуючы ад яго, каб «вера праўдзівая грэцкая грунтоўна была супакоена, а унія праклятая вынішчана». «Калі не супакоіце веры праўдзівае грэцкае і не знясеце уніі праклятай, — пагражаў Філіповіч, — то спазнаеце абавязкова гневу божага». Заканчвалася супліка катэгарычным патрабаваннем: «Выбірай жа сабе, што хочаш, пакуль час маеш!»

Дзякуючы сваёй бескампраміснай дзейнасці, якая часта прымала экстрэмісцкі характар, Афанасій Філіповіч быў шырока вядомы ў краіне. Яго тройчы арыштоўвалі, садзілі ў калодкі, высылалі ў Кіеў пад нагляд мітрапаліта Пятра Магілы. У 1645 годзе ён аказаўся ў цэнтры скандала вакол «царэвіча маскоўскага» Яна Фаустына Лубы.

Апантанасць Афанасія Філіповіча, якая не можа не выклікаць своеасаблівай павагі, аднак не знайшла, як сведчаць тагачасныя крыніцы, падтрымкі кіраўніцтва праваслаўнай царквы Вялікага княства Літоўскага. Безумоўна, былі спагада, імкненне змякчыць наступствы яго бурнай дзейнасці (у першую чаргу, з боку мітрапаліта Пятра Магілы), але, відаць, не больш таго. Відавочна, што для тых жа праваслаўных іерархаў Філіповіч быў нязручным чалавекам. Яго неўтаймаванасць, няўрымслівасць, разам з той жа спагадай, усё часцей выклікалі пачуццё прыкрасці, непаразумення.

1 студзеня 1647 года памёр мітрапаліт Пётр Магіла, які, як бы там ні было, сімпатызаваў Філіповічу. У сакавіку 1648 года ўспыхнула паўстанне на чале з Багданам Хмяльніцкім. 20 мая гэтага ж года не стала Уладзіслава IV, які, трэба прызнаць, ставіўся да ультыматумаў брэсцкага ігумена больш-менш цярпіма. Наступны ўладар — Ян Казімір — быў абраны толькі 20 лістапада 1648 года. Якраз у кароткі прамежак «бескаралеўя» і адбыліся трагічныя падзеі, аб якіх крыху ніжэй. А пакуль кінем позірк у лета 1652 года, калі ў Пінску зноў з'явіўся Андрэй Баболя. Тут ён, з невялікімі перапынкамі, і правёў апошні адрэзак свайго жыцця, прапаведуючы ў касцёле Святога Станіслава і выконваючы місіянерскія абавязкі ў ваколіцах горада.

Нагадаем, што падчас найбольш актыўнай дзейнасці Афанасія Філіповіча на Беларусі Андрэй Баболя знаходзіўся ў Вільні, дзе займаўся звычайнымі святарскімі справамі. Ці ведаў ён аб дзейнасці няўрымслівага брэсцкага ігумена? Хутчэй за ўсё ведаў, бо неардынарныя ўчынкі Філіповіча, безумоўна, мелі шырокі рэзананс. Безумоўна і тое, што Баболя, як заўзяты езуіт і шчыры каталік, паслядоўны прыхільнік уніі, не ўхваляў дзейнасці Філіповіча. Па сутнасці, яны былі непрымірымымі ворагамі.

Філіповіч жа, верагодней за ўсё, не ведаў аб існаванні Баболі, бо той не займаў якой-небудзь высокай пасады ў каталіцкай езуіцкай іерархіі.

Што ж рабіў гэты езуіт падчас свайго другога — і апошняга — знаходжання ў Пінску? Паводле сведчанняў, прыведзеных у працы Яна Попляткі, выдадзенай у Кракаве ў 1936 годзе, Андрэй Баболя вандраваў у ваколіцах Пінска і Янава, хрысціў дзяцей, асвячаў шлюбы, спавядаў і з найбольшай ахвотай працаваў з занядбанай моладдзю. Дыскутуючы з вучонымі праваслаўнымі манахамі, Баболя, як адзначаецца, перамагаў іх.

Яго місіянерскія вандроўкі давалі свой плён. Вядомы факт, што клопатамі Баболі праваслаўныя вернікі вёсак Баландзічы і Уздрожын перайшлі ў каталіцтва. Амаль поўнасцю каталіцкім стала і праваслаўнае мястэчка Янаў. Місіянерская дзейнасць Андрэя Баболі мела досыць шырокі рэзананс на Піншчыне і, зноў жа, часта ацэньвалася з супрацьлеглых пазіцый: праваслаўныя лічылі яго «душахватам», католікі называлі «лаўцом душ» і нават «апосталам Палесся».

Як адзначаў Ян Поплятка, Баболя падчас сваіх вандровак наведваў уніяцкія цэрквы, прапаведаваў там каталіцкую веру і рабіў усё магчымае, каб злучыць праваслаўных з каталіцкім касцёлам. Даследчык жыцця айца Андрэя не рабіў розніцы паміж каталіцкай і уніяцкай цэрквамі. Таму і «акаталічванне» Баболем праваслаўных палешукоў, магчыма, трэба разглядаць як іх пераход ва уніяцтва.

У 1654 годзе пачалася доўгая і крывавая вайна паміж Рэчцу Паспалітай і Рускай дзяржавай за беларускія і украін-

скія землі. На баку Расіі выступілі і ўкраінскія казакі (як вядома, у свой час Афанасій Філіповіч быў іх шчырым прыхільнікам). У пачатку мая 1657 года двухтысячны казацкі атрад Івана Ліхога захапіў Пінск. Праваслаўныя насельнікі горада падтрымалі казакоў. Католікі і уніяты вымушаны былі шукаць паратунку ў лясах, бо ваенныя дзеянні з боку казакоў даволі часта прымалі характар бязлітаснай рэлігійнай разні. Пакінулі Пінск і езуіты, якіх казакі не шкадавалі заўсёды. Сярод уцекачоў быў і Андрэй Баболя. Ён знайшоў сховішча ў Перадзеле, паміж Пінскам і Янавам. Быў май 1657 года...

За дзевяць гадоў перад гэтым адбыўся першы акт трагедыі ў двух актах, аб якой ідзе наш аповяд. 1 ліпеня 1648 года па даносу капітана каралеўскай гвардыі Шумскага быў арыштаваны Афанасій Філіповіч. Былі следства і суд, які палічыў, што брэсцкі ігумен заслугоўвае смяротнай кары за свае ўчынкі. Пакуль з Варшавы чакалі канчатковай санкцыі, закаваны ў калодкі Філіповіч быў звязнены ў цэйхгаузе.

У ноч на 5 верасня 1648 года Філіповіча прывялі да брэсцкага ваяводы Масальскага, які прамовіў: «Навошта яго да мяне прывялі? Маеце ўжо яго ў сваіх руках, дык рабіце ж сабе з ім, што хочаце!»

І гайдукі павялі ігумена на расправу.

Манахі Сімяонаўскага манастыра запісалі сведчанні аднаго з відавочцаў смерці Афанасія Філіповіча: «Калі ён тады ўжо быў выданы ад старшага, узялі яго да сябе тыя, што крыві яго даўно прагнулі, і павялі яго да барку, што недалёка быў ад абозу, ад места ў чвэрць мілі, ідучы да сяла Гершановічы, па леваму боку. Там яго найперш пяклі агнём. А гайдук адзін стаяў там на той час непадалёку і чуў голас нябожчыка айца ігумена. А ён ім штосьці адказваў пры тых муках. Потым паклікалі і гайдука таго. І казалі яму мушкет набіць дзвюма кулямі. Таксама перад ім і магілу загадалі падрыхтаваць. Наперад жа запытаўшы яго, каб адмовіўся ад слоў сваіх супраць уніі. А калі ім адказаў: «Што ўжо сказаў, тое сказаў, і з тым паміраю», — казалі таму гайдуку, каб у лоб яму стрэліў з мушкета.

... Нябожчык, ужо падстрэлены дзвюма кулямі ў лоб навылёт, яшчэ, абапіраючыся аб хвою, стаяў нейкі час па сваёй моцы, пакуль яго ўпіхнулі ў гэту магілу казакі. Але і там, расказвае, яшчэ сам тварам павярнуўся, рукі на грудзях на крыж склаў і ногі выцягнуў...»

Айца Андрэя Баболю, як сведчыў Ян Поплятка, выдалі казакам праваслаўныя янаўцы. Схапілі яго ў той момант, калі той на возе Яна Даманоўскага пакідаўПерадзел. Паводле Поплятkі, Баболя быў падвергнуты жудасным катаванням, якія адбываліся па дарозе ў Янаў і ў мясніцкай краме. Яго паласавалі бізунамі, калолі пікамі, seклі шаблямі, палілі агнём, засоўвалі пад пазногці трэскі, зразалі скуру з далоняў, галавы і плячэй. Праз разрэз у шыі Баболю вырвалі язык. Пасля падвесілі за ногі да столі і, нарэшце, забілі двума ўдарамі ў шыю.

Сканаў Андрэй Баболя а трэцяй гадзіне 16 мая 1657 года...

Недзе паміж 1658 і 1666 гадамі брэсцкі ігумен быў кананізаваны праваслаўнай царквой як святы прападобнамучанік Афанасій Брэсцкі. Перад гэтым, у маі 1649 года, астанкі ігумена перазахавалі ў царкве Сімяона Столпніка, дзе ён быў настаяцелем. Пасля яны захоўваліся ў



Капліца Андрэя Баболі ў Янаве (Іванаве).
Малюнак Н. Орды. XIX ст.

Леснінскім жаночым манастыры ў Польшчы. У канцы Другой сусветнай вайны манастыр пераехаў спачатку ў Сербію, а потым у Францыю (у ста дваццаці кіламетрах ад Парыжа), дзе размяшчаецца і цяпер.

У 1995 годзе частка мошчаў была прывезена ў Беларусь і перададзена ў брэсцкія Сімяонаўскі сабор і Брацкую царкву і ў Афанасьеўскую капліцу ў вёсцы Аркадыя пад Брэстам.



Капліца на месцы гібелі Афанасія Філіповіча ў в. Аркадыя (Брэсцкі раён), дзе захоўваецца частка яго мошчаў

Кананізацыя Андрэя Баболі каталіцкай царквой зацягнулася амаль на тры стагоддзі: згодна з дэкрэтам папы Пія IX яна адбылася толькі 17 красавіка 1938 года.

Будучага святога ў маі 1657 года пахавалі перад вялікім алтаром Пінскага езуіцкага касцёла. Згубленыя з цягам часу мошчы Андрэя Баболі былі адшуканы ў 1719 годзе. У 1808 годзе іх перавезлі ў тагачасную езуіцкую «сталіцу» — Полацк. У 1922 годзе яны патрапілі ў Рым, а з 1938 года захоўваюцца ў Варшаве, у касцёле Святога Андрэя Баболі.

Такія вось розныя і адначасова аднолькавыя лёсы...

Няма нічога дзіўнага, што Філіповіч і Баболя высока ацэньваюцца цэрквамі, да якіх яны належалі. Аб тым яскрава сведчаць факты кананізацыі брэсцкага ігумена і пінскага езуіта. Але нельга не падкрэсліць і таго, што яны, па сутнасці, былі зацятымі ворагамі і святасць аднаго ў вачах другога выглядала як цяжкая загана.

Аднак паспрабуем зірнуць на гэтых двух, безумоўна годных увагі і павагі, людзей вачыма сучаснага свецкага чалавека, які не можа не заўважыць ні палітызаванасці Філіповіча, ні крывадушша Баболі, ні ваяўнічага фанатызму абодвух, іх апантанасці, нежадання шукаць кампрамісы.

Яшчэ духоўныя настаўнікі Андрэя Баболі адзначалі яго прыроджаную халерычнасць, схільнасць да раптоўных выбухаў нецярплівасці, празмерную прывязанасць да сваіх меркаванняў, няўменне стрымліваць эмоцыі і пачуцці. Нагадаем, праваслаўныя вернікі, безумоўна, не без падстаў, называлі Баболю «душахватам». Ды і характарыстыка, дадзеная яму паплечнікамі-езуітамі («лавец душ»), мае не толькі станоўчае адценне, але гаворыць і аб хітрасці айца Андрэя, яго ўменні ўвайсці ў давер, акруціць чалавека. Адным словам, Баболя быў тыповым езуітам.

А што ж Афанасій Філіповіч? Цікавай уяўляецца характарыстыка, дадзеная брэсцкаму ігумену згаданым ужо Кастамаравым: «Асоба Афанасія Філіповіча не прадстаўляецца выходзячай з шэрагу сучаснікаў ні па разумоваму багаццю здольнасцей, ні па важнасці спраў, здзейсненых ім у гістарычным жыцці народа, але яна ў высокай сту-

пені дастойна ўвагі як тып свайго часу і свайго краю. Гэта быў гарачы фанатык, які адносіўся да тагачасных ворагаў праваслаўя з такімі ж бязлітаснасцю і злосцю, з якімі адносіліся гэтыя ворагі да праваслаўя. Праваслаўе ў рускіх краях, якія належалі польскай Рэчы Паспалітай, было прыгнечаным бокам, а таму фанатызм Афанасія Філіповіча выявіўся галоўным чынам у гатоўнасці пацярпець самому за веру. Але калі б ролі перамяніліся і праваслаўе стала бокам пераможным — той жа Афанасій Філіповіч стаў бы, можа быць, у адносінах да уніятаў і католікаў такім жа мучыцелем, якім быў у адносінах да праваслаўных які-небудзь Іясафат Кунцэвіч» (нагадаем: забіты ў 1623 годзе віцебскімі праваслаўнымі Кунцэвіч быў, як і Баболя, кананізаваны ў 1867 годзе каталіцкай царквой).

Невыпадкова некаторыя сучасныя даследчыкі жыцця і дзейнасці Афанасія Філіповіча праводзяць паралель паміж брэсцкім ігуменам і яго сучаснікам, знакамітым пратапопам Авакумам — галавой стараверства, ідэолагам драматычнага расколу Рускай праваслаўнай царквы. Авакум, як вядома, быў асуджаны афіцыйнай царквой, пятнаццаць гадоў правёў у земляной турме і, у рэшце рэшт, быў спалены паводле царскага ўказа.

На крайні радыкалізм Філіповіча ўказвае і К. Тарасаў. Адной з яго рысаў, нетыповых для рэлігійнага дзеяча, ён лічыць адмаўленне пакоры, далучаючы да яе кансерватыўнасць брэсцкага ігумена, яго наіўнасць і ідэалізм.

А што ж унія, апантаным праціўнікам і гарачым прыхільнікам якой былі, адпаведна, Афанасій Філіповіч і Андрэй Баболя?

Зацятыя спрэчкі вакол яе вядуцца і сёння. Апошнім часам многія даследчыкі сталі называць уніяцтва нацыянальнай рэлігіяй беларусаў. Як бы там ні было, а яно праіснавала на нашай зямлі амаль два з паловай стагоддзі. Напярэдадні далучэння Беларусі да Расійскай імперыі яго спавядала абсалютная большасць беларусаў.

Дарэчы, у вёсцы, дзе жыве мая цешча, і сёння яшчэ памятаюць, што праваслаўная Свята-Міхайлаўская царква, куды ходзяць па святах вяскоўцы, некалі была уніяцкай.

## Крыніцы

*Абэцэдарскі, Л.С. Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII века /Л.С. Абэцэдарскі. — Мінск, 1954.*

*Коршунов, А.Ф. Афанасий Филипович: жизнь и творчество / А.Ф. Коршунов. — Минск, 1965.*

*Лочмель, И.Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов /И.Ф. Лочмель. — М., 1940.*

*Мартос, А. Белорусы в исторической, государственной и церковной жизни /А. Мартос. — Буэнос-Айрес, 1966.*

*Поплятка, Я. Благаслаўлены Андрэй Баболя: Жыццё, пакуты, культ /Я. Поплятка. — Кракаў, 1936.*

*Тарасаў, К. Памяць пра легенды /К. Тарасаў. — Мінск, 1990.*

*Цярохін, С.Ф. Многія прыйдуць пад імем тваім /С.Ф. Цярохін. — Мінск, 1995.*

# «... І ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА Ў ПРЫДАЧУ»

Падзея, якая адбылася ў Расіі 28 чэрвеня 1762 года, на некалькі дзесяцігоддзяў наперад прадвызначыла лёс гэтай магутнай Еўразійскай імперыі. У выніку палацавага перавароту, здзейсненага маладымі гвардзейскімі афіцэрамі, на расійскім троне ўсталявалася жонка тагачаснага імператара Пятра III нямецкая прынцэса Софія Фрэдэрыка Аўгуста Ангальт-Цэрбсцкая, што ўвайшла ў гісторыю як імператрыца Кацярына II Аляксееўна.

Вось як апісвае тую падзею слынны расійскі гісторык Васіль Ключэўскі: «... Вечарам 28 чэрвеня Кацярына на чале некалькіх палкоў, вярхом, у гвардзейскім мундзіры старога пятроўскага пакрою і ў капелюшы, упрыгожаным зялёнай дубовай галінкай, з распушчанымі доўгімі валасамі, побач з княгіняй Дашкавай таксама вярхом і ў гвардзейскім мундзіры рушыла ў Пецяргоф, куды ў той жа дзень павінен быў прыехаць з Араніенбаума імператар са світай... Былога імператара выдалілі ў Ропшу, загарадную мызу, падораную яму імператрыцай Лізаветай, а Кацярына на другі дзень урачыста ўступіла ў Пецярбург».

У выніку гэтай, як называлі яе сучаснікі, вясёлай і далікатнай, сапраўднай дамскай рэвалюцыі быў пакладзены пачатак аднаму з самых слаўных перыядаў расійскай гісторыі, які атрымаў назву Кацярынінскай эпохі і многімі гісторыкамі быў названы «залатым векам» імперыі.

Стаўшы расійскай імператрыцай, Кацярына не забылася пра тых, хто, рызыкуючы не толькі прыдворнай кар'ерай, але і самім жыццём, дапамог ёй узысці на трон. Граф Мікіта Панін узначаліў Калегію замежных спраў. Княгіня Кацярына Дашкава стала першым — і адзіным у гісторыі Расіі — жанчынай-прэзідэнтам Акадэміі навук.

Галавакружную кар'еру зрабілі амаль усе бравыя гвардзейцы. Капітан Пётр Пасек у хуткім часе выбіўся ў генерал-губернатары. Унтэр-афіцэр Рыгор Пацёмкін стаў генерал-фельдмаршалам, святлейшым князем Таўрычаскім, галоўнакамандуючым рускай арміяй, бліжэйшым памочнікам і, нарэшце, што было даражэй за ўсе пасады і званні, фаварытам імператрыцы. Ужо праз сем гадоў пасля перавароту атрымаў званне генерал-аншэфа Аляксей Арлоў, які да таго ж стаў графам, камандаваў рускай эскадрай у Міжземным моры. Высока ўзляцеў і яго брат Рыгор, стаўшы генерал-фельдцэхмейстарам (ужо ў 1763 годзе) рускай арміі, а таксама фаварытам імператрыцы.

Але найбольш неверагодным чынам чэрвеньскія падзеі 1762 года паўплывалі на лёс чалавека, які да палацавага перавароту, што ўзвёў нямецкую прынцэсу на расійскі трон, хутчэй за ўсё, не меў ніякіх адносін; у лепшым выпадку, дзякуючы сваёй тагачаснай пасадзе, ён мог ведаць, што такая падзея выспявае.

Тым не менш менавіта Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ў выніку тых драматычных падзей узляцеў так высока, як ніхто з самых блізкіх паплечнікаў і нават фаварытаў Кацярыны. Прайшло крыху больш за два гады пасля перавароту — і менавіта дзякуючы імператрыцы ўсерасійскай Панятоўскі стаў польскім каралём і вялікім князем літоўскім — манархам Рэчы Паспалітай...

Што за чалавек быў гэты шчаслівец і з якой нагоды спадарыня Фартуна такім неверагодным чынам паспрыяла яму?

Ужо згаданы вышэй Васіль Ключэўскі называў яго разумнікам, але не без іроніі браў гэта слова ў двухкоссе. Характарызуючы «стаўленіка» Кацярыны, слынны гісторык з сарказмам сцвярджаў, што «...Станіслаў Панятоўскі... не мог кроку ступіць без таго, каб не сказаць прыгожага слоўца і не зрабіць глупства...».

Пакінем з'едлівую характарыстыку на сумленні Ключэўскага, заўважыўшы, што, вельмі верагодна, ён меў нейкія падставы на менавіта такую ацэнку будучага караля і вялікага князя. Не забудзем пры гэтым нагадаць, што сын вясковага святара, які ўсяго ў жыцці дасягнуў сам,



Элекцыя (выбранне) Станіслава Аўгуста Панятоўскага. 6 верасня 1764 г. Фрагмент карціны італьянскага мастака Бернарда Белота. 1760-ыя гг.

наўрад ці мог спагадна адносіцца да галавакружнага ўзлёту нашчадка магнацкага роду, што ўжо нарадзіўся, як кажуць, з залатой лыжкай у роце і быў проста асуджаны на бліскучую кар'еру.

Усе ж такі цяжка пагадзіцца з Ключэўскім, што такую высокую пасаду выпадкова заняў «разумнік» і досыць пасрэдны дамскі ўгоднік. Да таго ж расійскаму гісторыку было вельмі добра вядома, чым скончыў «улюбё-

нец лёсу» і які лёс напаткаў дзяржаву, што з лёгкай рукі Кацярыны II Станіслаў Аўгуст Панятоўскі ўзначаліў. Ведаў бы той, у якасці каго навечна ўвойдзе ў гісторыю, наўрад ці згадзіўся б на міласць імператрыцы... А так «разумнік», фаварыт, што ўзвысіўся не па заслугах, — для расіян; бязвольны здраднік, які загубіў тысячагадовую дзяржаву, — для палякаў. А для беларусаў? Кім жа быў (і з'яўляецца) той чалавек для нас? Давайце паразважаем над гэтым вельмі не простым пытаннем.

17 студзеня 1732 года ў маёнтку Воўчын (цяпер вёска ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці) нарадзіўся хлопчык. Бацькам яго быў вядомы ў тагачаснай Рэчы Паспалітай чалавек — Станіслаў Панятоўскі, сын Францішка, прыхільнік караля Станіслава Ляшчынскага, генерал шведскай арміі, удзельнік славутай Палтаўскай бітвы, генерал-лейтэнант войска літоўскага, падскарбі вялікі літоўскі, ваявода мазавецкі, кашталян кракаўскі, буйны магнат герба Цёлак. На той час ён меў за плячыма 55 гадоў (дарэчы, Бог адпусціць яму аж 86 гадоў жыцця, і памрэ ён у 1762 годзе, праз два месяцы пасля ўсталявання на расійскім троне Кацярыны, якая, гэтага стары ўжо не пабачыў, крута зменіць лес яго старэйшага сына).

Жыццё хлопчыку дала Канстанцыя з роду князёў Чартарыйскіх, пачатак якому паклаў яшчэ ў XIV стагоддзі сын легендарнага Альгерда — Канстанцін. Была яна дачкой Казіміра Чартарыйскага, падканцлера літоўскага. Менавіта ён у свой час стане стваральнікам так званай «фаміліі» — прарасійскай магнацкай групоўкі, якая ў свой час паспрыяе ўзвядзенню сына Канстанцыі на трон Рэчы Паспалітай.

Як бачым, нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Станіславам Аўгустам, на, як цяпер прынята гаварыць, этнічна беларускай тэрыторыі.

Кім быў гэты чалавек па крыві? Не памятаю ўжо, хто з маладых гісторыкаў у адным са сваіх артыкулаў назваў Станіслава Аўгуста Панятоўскага беларускім шляхціцам. Заява гэта, на першы погляд, аж залішне смелая, тым не менш мае пад сабой такі-сякі грунт. І не толькі таму, што маёнтак Воўчын — спрадвеку беларуская (ці, пра-

вільней, ліцвінская) зямля. Упершыню пісьмовыя крыніцы згадваюць пра паселішча ў самым пачатку XVI стагоддзя. На той час яно належала шляхецкаму роду Солтанаў. Вядома, што ў 1586 годзе староста астрынскі Ярослаў Солтан заснаваў тут царкву Святых Мікалая і Георгія. У XVII стагоддзі Воўчын належаў Гасеўскім. У 1708 годзе маёнтак перайшоў да гетмана польнага літоўскага Казіміра Сапегі. Але валодаў ён Воўчынам нядоўга — у 1719 годзе прадаў маёнтак канюшаму вялікаму літоўскаму Якубу Флемінгу.

І вось тут — супярэчнасць... Паводле адной з крыніц, у 1721 годзе падскарбі літоўскі Станіслаў Панятоўскі набыў Воўчын у Флемінга, а ў 1738-ым маёнтак стаў уладаннем Чартарыйскіх. Паводле другой — узяўшы ў 1721 годзе шлюб з Канстанцыяй Чартарыйскай, Панятоўскі атрымаў за ёй Воўчын у якасці пасагу. Больш верагодным нам уяўляецца першы варыянт, якога прытрымліваюцца даследчыкі В. Міронаў і В. Шаблюк.

Падскарбі ў 1729 годзе пабудаваў у Воўчыне мураваны касцёл Прасвятой Тройцы. Не выключана, што менавіта ў ім і быў ахрышчаны будучы манарх Рэчы Паспалітай.

Цяжка сказаць з поўнай упэўненасцю, што бацькі хлопчыка былі палякамі. Наўрад ці выклікае сумненне тое, што яны сябе імі лічылі. Але ж Станіслаў-старэйшы, як ужо адзначалася, займаў высокі пост падскарбія вялікага літоўскага, меў званне генерал-лейтэнанта войска літоўскага. Дзед яго па маці, Казімір Чартарыйскі, знаходзіўся ў свой час на ўплывовай пасадзе падканцлера літоўскага. Ды і радавод свой Чартарыйскія вялі, як было згадана, ад Канстанціна Альгердавіча, зусім не паляка.

Нагадаем, што род Панятоўскіх (праўда, не такі славуты і старажытны) вядомы з XV стагоддзя і меў адгалінаванне на Мсціслаўшчыне. А Чартарыйскія перайшлі з праваслаўя ў каталіцызм толькі ў канцы XVI стагоддзя.

Зыходзячы з прыведзеных фактаў, можна выказаць меркаванне, што калі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі і быў палякам, то па духу, па мове, па адукацыі, у пэўнай ступені — па выхаванню. Па паходжанні ж ён, відавочна,

быў літвінам (паняцце «беларус» у тыя часы ўжывалася вельмі рэдка і то, часцей за ўсё, у адносінах да людзей нізкага сацыяльнага стану).

Так, бліскучая кар'ера радавітаму літвіну была амаль што наканавана. Ужо ў дваццаць два гады ён меў званне стольніка (падкрэслім) Вялікага княства Літоўскага. Перад гэтым Станіслаў Аўгуст многа падарожнічаў па Англіі і Францыі. Натуральна, што тагачасная асветніцкая культура Еўропы аказала моцны ўплыў на фарміраванне яго светапогляду. Палітычныя прыхільнасці маладога стольніка былі на баку ўжо згаданай партыі Чартарыйскіх. Не выключана, што менавіта гэта прадвызначыла тое, што ў 1757 годзе ён атрымаў прызначэнне ў Пецярбург на пасаду сакратара, а потым і пасла Саксоніі і Рэчы Паспалітай у Расіі.

Малады, адукаваны і, відаць, дастаткова дасціпны прыгажун хутка стаў сваім чалавекам пры двары. Дыпламатычныя абавязкі, хутчэй за ўсё, не вельмі абцяжарвалі Панятоўскага. Заставалася досыць часу і на актыўнае свецкае жыццё, на амурныя прыгоды. Не выключана, што менавіта яны далі першы штуршок яго нечаканаму ўзлёту. У Пецярбургу, дзе Панятоўскі, дарэчы, правёў каля сямі гадоў, ён вельмі блізка сышоўся з вялікай князёўнай Кацярынай, жонкай спадчынніка расійскага трона Пятра III, вядомай сваёй схільнасцю да любоўных уцех. У хуткім часе малады дыпламат ужо быў у ліку фаварытаў неардынарнай жанчыны.

Настане час — і расійская імператрыца ўспомніць пра свайго фаварыта. Аддзячыць яна свайму ўлюбёнцу сапраўды па-царску: якую там палову царства — Каралеўства і Вялікае княства ў прыдачу атрымае колішні хлопчык з Воўчына!..

Безумоўна, эпоха каралявання і княжання Станіслава Аўгуста Панятоўскага стала самым трагічным перыядам у гісторыі Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага (пра трагедыю апошняга доўгія часы гаварыць не было прынята). Завяршылася яна гібеллю Рэчы Паспалітай, якая стала вынікам трох драпежніцкіх падзелаў некалі магутнай дзяржавы паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй.

Пра трагічныя падзеі напісаны агромністыя тамы даследаванняў і мемуараў, у якіх падзелам Рэчы Паспалітай і яе знішчэнню амаль аднагалосна дадзена негатыўная ацэнка. Хаця, заўважце, той жа Васіль Ключэўскі, аналізуючы цараванне Кацярыны II і налічыўшы амаль 500 вялікіх спраў, якія здзейсніла імператрыца, сярод несумненных заслуг не прамінуў адзначыць і тое, што яна «адваявала ў Польшчы і Турцыі землі з насельніцтвам амаль 7 млн душ абодвух палоў».

Але мы акрэслім «эпоху Панятоўскага» толькі некалькімі штрыхамі. Аднак спачатку адзначым, што ўжо падчас праўлення ў Рэчы Паспалітай Аўгуста II Моцнага (1697—1706, 1709—1733) Расія пачала актыўна ўмешвацца ва ўнутраныя справы гэтай дзяржавы. Стаўшы польскім каралём і вялікім князем літоўскім, саксонскі курфюрст, які імкнуўся да абсалютнай улады і быў праціўнікам шляхецкай «залатой вольнасці», увесь час канфліктаваў са шляхтай, што вельмі непакоіла Расію, якая не хацела мець у суседзях нестабільную краіну.

Спадкаемец курфюрста яго сын Аўгуст III стаў уладаром Рэчы Паспалітай ужо пры непасрэднай дапамозе Расіі, якая стала на яго бок у барацьбе за трон са Станіславам Ляшчынскім. Менавіта Аўгуст III давёў падуладную яму краіну да глыбокага палітычнага крызісу, абумоўленага феадальнай анархіяй.

5 кастрычніка 1763 года Аўгуст III пакінуў гэты свет. Амаль год у Рэчы Паспалітай панавала бескаралеўе, якое суправаджалася жорсткай барацьбой за трон паміж магнацкімі групоўкамі Чартарыйскіх і Патоцкіх. Натуральна, што ў польска-літоўскія справы ўмяшалася толькі што стаўшая імператрыцай Кацярына II, падтрыманая прускім каралём Фрыдрыхам II. Менавіта з іх дапамогай 6 верасня 1764 года на выбарчым сейме Станіслаў Аўгуст Панятоўскі і стаў каралём польскім і вялікім князем літоўскім — уладаром Рэчы Паспалітай.

Дарэчы, кіраўнікі згаданай прарасійскай «фаміліі» рыхтавалі на трон Аўгуста Чартарыйскага ці, на крайні выпадак, яго сына Адама Казіміра. І толькі энергічнае ўмяшанне Кацярыны II прадвызначыла перамогу другараднага прадстаўніка партыі, да таго ж не Чартарыйскага.

Калі коратка акрэсліць прычыну, якая прывяла да падзелаў Рэчы Паспалітай у 1772, 1793 і 1795 гадах, то гэта была незадаволенасць Расіі і Прусіі палітыкай праводзімых там даволі дэмакратычных рэформ. Намеры дзвюх дзяржаў у свой час досыць выразна ахарактарызаваў Ф. Энгельс: «...Кацярына і Фрыдрых заключылі ў Пецярбургу дагавор, па тайнаму артыкулу якога абодва ўзялі на сябе абавязак ахоўваць сілаю зброі польскую канстытуцыю, гэты лепшы сродак для разбурэння Польшчы ад усялякіх спроб рэформы. Гэтым быў прадвызначаны будучы падзел Польшчы».

Апошнія акты трагедыі Рэчы Паспалітай, што вельмі знамянальна, адбыліся на беларускай зямлі, у Гродне. Менавіта тут, у Сенатарскай зале Каралеўскага палаца, вядомага яшчэ пад назвай Новы Замак, 17 чэрвеня — 23 лістапада 1793 года праходзіў апошні сейм Рэчы Паспалітай, які зацвердзіў другі падзел краіны. У Гродне Станіслаў Аўгуст Панятоўскі перажыў самыя горкія часіны свайго жыцця, менавіта гродзенскія дзеі манарха далі падставы назваць яго здраднікам, які спрычыніўся да пагібелі дзяржавы.

Вось як апісвае стан Панятоўскага падчас Гродзенскага сейма польскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі



Каралеўскі палац (Новы Замак) у Гродне, дзе праходзіў сейм 1793 г. Літаграфія з акварэлі Напалеона Орды. 1861—1869 гг.

Уладзіслаў Рэймант у сваім знакамітым рамане «Апошні сейм Рэчы Паспалітай»: «... Ён сядзеў быццам прыкаваны да ганебнага стаўба, выстаўлены пад град пякучых папрокаў апазіцыянераў, іх пагардлівых позіркаў і злосных усмешак, — сядзеў, разумеючы страшэннае значэнне гэтага дня, сядзеў, пакутуючы ад няшчасця, якое перажывала радзіма, і першым схіляў галаву, падстаўляючы шыю пад ярмо, кіруемы слабасцю, няздольны ні на барацьбу, ні на супраціўленне, ні на жыццё, ні на смерць.

На руінах Рэчы Паспалітай грунтаваўся яго трон, які ўзвышаўся толькі над ганьбай, прадажніцтвам здраднікаў, слязамі і горам прададзеных. Самаго ж яго глыбока хвалявала толькі адно пытанне: ці заплоцяць, ва ўзнагароду за яго пакорлівасць, дзяржавы, што разабралі па частках яго краіну, яго даўгі і ці забяспечаць яму магчымасць спакойна пражыць астатак яго гадоў?»

Падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі, выкліканага другім падзелам, Панятоўскі быў адхілены ад улады, а 25 лістапада 1795 года, знаходзячыся ў Гродне, куды няшчасны манарх пераехаў па патрабаванню Расіі, ён пакорліва выканаў волю той, якая 33 гады таму ўзвяла яго на трон, — адрокся ад прастола.

Сваю благадзейку Станіслаў Аўгуст перажыў на якіх два гады. Жыццё свае ён скончыў 12 лютага 1798 года ў Пецярбургу, там, адкуль пачаўся яго нечуваны ўзлёт да вяршынь улады. Рэшткі свайго жыцця былы кароль і вялікі князь бавіў у поўнай раскошы, але ўсімі забыты і пракляты на радзіме.

Пахавалі былога манарха без залішняга шуму — хоць сціпла, але з каралеўскімі ўшанаваннямі (Кацярыны, што ні кажы, ужо не было на гэтым свеце) — у пецярбургскім касцёле Святой Кацярыны Александрыйскай (дзіўнае супадзенне).

І ляжаць бы праху Панятоўскага тут вечна, але лёс распарадзіўся па-свойму.

Праз 140 гадоў, здавалася б, вечнага спакою труну з рэштками Станіслава Аўгуста забралі з касцёла і, пагрузіўшы ў спецыяльны вагон, павезлі на захад. 9 ліпеня 1936 года на памежнай станцыі Стоўбцы збянтэжаныя польскія



Так выглядае сёння касцёл Прасвятой Тройцы ў Воўчыне, дзе ў 1938—1989 гг. спачываў прах Станіслава Аўгуста Панятоўскага

чыгуначнікі прынялі ад сваіх усходніх суседзяў дзіўны груз. Што рабіць з ім далей — ніхто не ведаў. Паляцелі запыты ў ваяводскі Навагрудак, адтуль — у Варшаву. Са сталіцы далі каманду перагнаць вагон у Брэст, а ўжо адтуль рэшткі Панятоўскага перавезлі ... у Воўчын, дзе і пакінулі ў занядбаным касцёле Прасвятой Тройцы.

Чаму так адбылося? Сваю версію падзей (і яна не пазбаўлена грунту) прапанаваў археолаг Алесь Краўцэвіч: «Улетку 1938 г. Савецкаму Саюзу патрабавалася згода палякаў прапусьціць праз сваю тэрыторыю савецкія войскі для абароны Чэхаславаччыны ад Германіі. Як вядома, да-

мовіцца з польскім урадам не ўдалося, хоць Сталін і прыкладаў намаганьні ў гэтым кірунку. Відавочна, адным з ягоных крокаў быў жэст зь вяртаньнем палякам труны з прахам іхнага караля. Разгубленасьць, якую выклікаў гэты падарунак, тлумачыцца стаўленьнем тагачаснага польскага грамадзтва да асобы Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Нашага земляка лічылі за здрадніка, які прывёў да пагібелі Рэч Паспалітую. Адсюль, відавочна, і таямнічасьць пры пераводзцы труны, і адсутнасьць хоць колькі-небудзь урачыстай сустрэчы, і рашэньне зьмясьціць парэшткі караля не на Вавэлі, а на ягонай Радзіме, у сьціплым Воўчыне».

Але і «сьціплы Воўчын» не стаў апошнім прытулкам шматпакутнага манарха.

Каля дваццаці гадоў таму стаўленне палякаў да асобы Панятоўскага пакрысе пачало мяняцца. У ім ужо бачылі не здрадніка, а ахвяру абставін, вышэй якіх ён, на жаль, не здолеў узняцца. Якраз тады ж, увосень 1987 года, у Воўчыне і з'явіліся гродзенскія даследчыкі Міхась Ткачоў, Алесь Мілінкевіч і Уладзімір Кіслы, якія ў паўразбураным касцёле Прасвятой Тройцы знайшлі рэшткі труны Станіслава Аўгуста. Інфармацыя пра гэта трапіла ў Польшчу і ўзняла такую хвалю цікавасці, што летам 1989 года ў Воўчыне пачаліся сумесныя польска-беларускія даследаванні (пра іх, дарэчы, у свой час пісалася), у выніку якіх рэшткі Панятоўскага склалі ў спецыяльна зробленую труну і перавезлі ў Польшчу, паставіўшы яе, праўда, не ў Вавелі, а ў Варшаўскім каралеўскім замку, у саборы Святога Яна.

З аднаго боку — шырокі жэст тагачасных беларускіх улад, з другога — надзіва непрадуманы, паспешны крок, які яскрава выяўляе і гістарычную недасведчанасць тых, хто прымаў гэта рашэнне, і поўную адсутнасць у гэтых людзей такіх якасцей, як нацыянальная свядомасць і патрыятызм.

Так, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў апошнім польскім каралём, але — і апошнім вялікім князем літоўскім. На беларускай зямлі ён упершыню пабачыў свет; на ёй жа адбыліся, несумненна, самыя трагічныя падзеі яго жыцця. Сюды, на радзіму, воляю лёсу былі



Кафедральны касцёл Святога Яна (злева) у Варшаўскім каралеўскім замку, дзе сёння пакоіцца прах Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Фота 1970-ых гг.

прывезены яго рэшткі (дзе ім бы ляжаць вечна). І, нарэшце, усё ж такі ён, і гэта вельмі верагодна, быў літвінам, сынам нашай зямлі.

Але што зроблена, тое зроблена. Труна Станіслава Аўгуста Панятоўскага знаходзіцца ў Варшаве. У беларускім

Воўчыне стаіць занядбалы да неверагоднасці касцёл Прасвятой Тройцы, які, хоць і цвёрда паабяцалі палякам, так і не пачалі аднаўляць.

І ў гэтым мы — такія, як мы ёсць...

## Крыніцы


*Грыцкевіч, А. Апошні кароль /А. Грыцкевіч // Культура. — 1994. — 20 ліпеня.*

*Ключевский, В.О. Исторические портреты /В.О. Ключевский. — М., 1988.*

*Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV — XVIII стст./А.К. Краўцэвіч. — Мінск, 1991.*

*Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі: энцыклапедычны даведнік /А.М. Кулагін. — Мінск, 2001.*

*Ленин, В.И. Война и революция. Полн. собр. соч. в 55 т. Т. 32. М., 1958—1965.*

*Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / складальнік Г.А. Маслыка. — Мінск, 1995.*

*Палуцкая С. Апошні сейм Рэчы Паспалітай /С. Палуцкая // Беларуская мінуўшчына. — 1995. — № 4 (14).*

*Реймонт, В. Последний сейм Речи Посполитой /В. Реймонт. — Минск, 1994.*

*Энгельс Ф. Внешняя политика русского царизма. В 50 т. Т. 22. М., 1954—1981.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 5. — Мінск, 1999.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1. — Мінск, 2001.*

*Zamojski A. Ostatni kryl Polski /A. Zamojski. — Warszawa, 1990.*

*Polski słownik biograficzny. T. 27. — Wroclaw etc., 1983.*

# ТАЯМНІЦА КРЫЖА ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

«У лета 6669 кладзе Ефрасіння святы крыж у сваім манастыры, у царкве Святога Спаса. Дрэва святое бясцэннае, акова ж яго золата і срэбра, і камяні і перлы на 100 грыўняў, а да... 40 грыўняў, і хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, не аддаюць. Калі ж не паслухаецца хто і вынесе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым, хай пракляты будзе ён святой жыватворную Тройцаю ды святымі айцамі... і хай напаткае яго доля Іуды, які прадаў Хрыста. Хто ж насмеліцца ўчыніць такое... валадар або князь, або епіскап ці ігуменне, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Ефрасіння ж, раба Хрыстова, што справіла гэты крыж, здабудзе вечнае жыццё з усімі святымі...» *(Надпіс на вонкавым баку крыжа)*

«Господи, помози рабоу своемоу Лазорю, нареченномоу Богъши, съделавъшемоу крьстъ сии црькви святаго Спаса і Офросиньи». *(Надпіс на адваротным баку крыжа)*

Ці многа ведаем мы пра майстра, які па замове ігуменні Ефрасінні зрабіў адмысловы крыж, што выконваў ролю каўчэга для захавання хрысціянскіх святынь, атрыманых з Канстанцінопаля і Іерусаліма? З кароткага надпісу на адваротным баку крыжа вынікае, што звалі яго Лазарам Богшам. Зразумела, што быў ён выдатным ювелірам: да рамесніка сярэдняй рукі ігуменне не звярнулася б з такім ганаровым заказам. Заказ, дарэчы, і аплочаны быў вельмі шчодра: за 40 грыўняў, што атрымаў Богша за крыж, па тым часе можна было купіць аж 160 лісіных шкур. Столькі ж грошай атрымаў бы майстар,



Помнік Ефрасінні ў Полацку.
Скульптар І. Голубеў. 2000 г.

які б замасціў чатыры кіламетры драўлянай мастоўкі (тагачаснага тратуара).

Але згадзіцеся, што каб не гэты крыж, то наўрад ці даведаліся б мы, што ў другой палове XII стагоддзя жыў

у Полацку ювелір Лазар Богша, і не стала б яго імя ў адзін шэраг з імем легендарнай Ефрасінні Полацкай і таленавітага дойліда Іаана, які ў тыя ж часы, калі Богша стварыў свой крыж, пабудаваў велічную Спаса-Праабражэнскую царкву, куды той крыж і быў змешчаны ў 1161 годзе.

Наўрад ці думаў Лазар Богша, што невялікі, у 52 сантыметры, крыж зроблены ім па заказу ігуменні Спасаўскага манастыра Ефрасінні, навечна абяссмерціць яго імя. Ды і сама прападобная, верагодна, не меркавала, што крыж, які назавуць яе імем, напаткае драматычны лёс, і праз вякі ён, згублены і адноўлены, стане нацыянальнай святыняй беларусаў.

Змешчаны, як ужо адзначалася, у 1161 годзе ў манастырскую царкву, крыж, як сведчаць даследчыкі, нядоўга захоўваўся ў мурах абіцелі. Недзе на мяжы XII і XIII стагоддзяў яго вывез у Смаленск адзін з тамтэйшых князёў падчас нейкага міжусобнага ваеннага канфлікту (адзін з такіх канфліктаў адбыўся, напрыклад, у 1195 годзе, калі смаленскае войска пад кіраўніцтвам князя Мсціслава Раманавіча хадзіла паходам на Полацкае княства і, напачатку займеўшы поспех, усё ж было разбіта дружынай князя Уладзіміра Полацкага). Святыня захоўвалася тут досыць працяглы час, каля трохсот гадоў, пакуль вялікі маскоўскі князь Васіль III, захапіўшы ў 1514 годзе Смаленск, не вывез крыж у Маскву.

Перыпетыі лёсу знакамітага крыжа праясняе Ніканаўскі летапіс запісам, які адносіцца да 1563 года, часоў Івана Грознага: «Когда же боголюбезный царь и великий князь мысля итти на отступников крестьянские веры на безбожную Литву, бе же тогда в его царской казне крест Полоцкий украшен златом и камением другим, написано же на кресте: «Зделан сии крест в Полотцску повелением княжны Евфросинии и поставлен во церкви всемилостивого Спаса, да не изнесит ис тое церкви никтоже; егда же кто его из церкви изнесет, да пришлет с тем суд в день судный». Нацыи же поведают: в прежний некогда Смолняне и Полочане держите у себя государей князей по своим волям и межь себя смолняне съ полочаны вое-



Лазар Богша. Літаграфія Арлена Кашкурэвіча

вахуся и тот крест честный Смолняне въ Полотцку взяша в войне и привезоша въ Смоленск, егда же благочестивый государь князь великий Василий Иванович всеа Руси вотчину свою Смоленск взял, тогда же и тот честный крест взя с собою и имея надежду на милосердого Бога и на крестъную силу пдбедити врага своя, еже и бысть».

Ёсць меркаванне, што, узяўшы зімой 1563 года Полацк падчас Лівонскай вайны, Іван Грозны вярнуў крыж у Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр. Верагодна, маскоўскі ўладар памятаў аб праклёне, што быў напісаны на святыні.

Калі ў 1579 годзе Стэфан Баторый вярнуў Полацк Вялікаму княству Літоўскаму, Спаса-Праабражэнская царква была перададзена езуітам. Крыж перанеслі ў Сафійскі сабор. Дарэчы, з канца XVI стагоддзя і аж да 1839 года ён з'яўляўся уніяцкім храмам. Пасля скасавання уніі было вырашана вярнуць святыню на ранейшае месца, што і было зроблена 23 мая 1841 года, калі хросны ход урачыста перанёс крыж Ефрасінні Полацкай з Сафійскага сабора, дзе ён захоўваўся больш за 260 гадоў, у храм Спаса. Крыж змясцілі ў келлі, дзе некалі жыла славутая ігуменння. Тут ён праляжаў 80 гадоў.

А потым надышлі часы ваяўнічага атэізму.

У 1921 годзе бальшавіцкія ўлады рэквізавалі крыж і памясцілі яго ў адзін з сейфаў мясцовага фінаддзела.

У 1928 годзе ў Полацк выехаў тагачасны дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі. Менаві-

та ён прывёз крыж Ефрасінні Полацкай у Мінск. Але і ў сталіцы рэліквія затрымалася ненадоўга.

21 лістапада 1928 года ў Беларускі дзяржаўны музей з'явіўся агент АДПУ (Аб'яднанае дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне) Лугаўцоў. Ён прад'явіў тагачаснаму дырэктару музея М. Шапавалаву даверанасць за подпісамі начальніка фельдаддзела Мінскага АДПУ А. Іванова і інструктара АДПУ А. Пішчыка. Згодна з дакументам, Лугаўцоў павінен быў забраць з музея каштоўнасці для перавозу іх у Магілёў. У іх пераліку быў і крыж Ефрасінні Полацкай. Прадстаўніку АДПУ яго здаваў былы дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі.

Ужо на наступны дзень, у 9 гадзін вечара Лугаўцоў перадаў каштоўнасці (у тым ліку і крыж) дырэктару Беларускага дзяржаўнага музея ў Магілёве У. Віннікаву.

З акта, складзенага пры перадачы крыжа з Мінска ў Магілёў, вынікала, што на той час рэліквія была значна пашкоджана: на ёй не хапала некалькіх кавалкаў золата, адсутнічала большасць каштоўных каменняў, якія некалі ўпрыгожвалі крыж, папсаваны выявы амаль усіх святых. Як сведчыў акт, на крыжы захавалася ўсяго 8 каменняў, з іх 6 былі з шкла і толькі 2 (аметыст і гранат) — сапраўдныя.

Нейкі час крыж знаходзіўся ў экспазіцыі Дзяржаўнага гістарычнага музея па вуліцы Міронава, 33. Але хутка мясцовыя ўлады былі занепакоены тым, што святыня стала прадметам залішняй увагі і нават пакланення вернікаў. Было вырашана схаваць крыж ад людзей. Яго разам з іншымі каштоўнасцямі змясцілі ў пакой-сейф былога пазямельна-сялянскага банка, дзе на той час знаходзіўся музей.

У 1930 (па іншых звестках, у 1933-ім) годзе музей пераехаў у другі будынак, а ў яго памяшканнях размясціўся абкам партыі. Цікава, што пакой-сейф з каштоўнасцямі — уласнасцю музея — застаўся на ранейшым месцы, так бы мовіць, пад партыйным наглядам (праўда, дырэктар музея Іван Сяргеевіч Мігулін меў да яго доступ).

Тут крыж Ефрасінні Полацкай знаходзіўся да самага яго знікнення.



Будынак былога пазямельна-сялянскага банка ў Магілёве, у якім перад вайной размяшчаўся абкам КП(б)Б. Менавіта з пакоя-сейфа гэтага дома ў ліпені 1941 г. бясследна знік крыж Ефрасінні Полацкай

Існуюць некалькі версій далейшага лёсу беларускай святыні. Коратка разгледзім іх, грунтуючыся на публікацыях апошніх гадоў. Самая распаўсюджаная з іх (да апошняга часу яна мела характар афіцыйнай) — крыж разам з іншымі каштоўнасцямі прысабечылі гітлераўцы. Версія ў асноўным грунтуецца на сведчаннях Лукоўнікава, які падчас нямецкай акупацыі Магілёва працаваў інспектарам гарадскога аддзела народнай асветы. Ён ужо пасля вайны расказваў І.С. Мігуліну наступнае (падаецца па пісьму былога дырэктара музея): «... немцы доўгі час не звярталі ўвагі на сейф, і толькі пасля таго, як праз акно заўважылі бляск металу, яны вырашылі сейф ускрыць. Баючыся, што сейф замініраваны, яны заставілі ўскрыць яго савецкага ваеннапалоннага, які аўтагенам павялічыў замочную шчыліну, і сейф быў адкрыты. Убачыўшы ўсё тое, што было ў сейфе, ваенны камендант прамовіў: «усё гэта належыць Германіі» — і даў указанне скласці вопіс усяго, што было ў сейфе, але немцы, як лютэране, дрэнна разбіраліся ў прадметах праваслаўнага культу, таму ў створаную камі-

сію запрасілі Лукоўнікава, які ў той час працаваў у гарадской управе. Калі вопіс быў складзены, усе рэчы сейфа склалі ў тару і вывезлі».

Супрацоўнік магілёўскай службы дзяржбяспекі Сяргей Багдановіч, які доўгі час даследуе лёс крыжа, небеспадстаўна сумняваецца ў праўдападобнасці паказанняў Лукоўнікава. Ён даводзіць, што «... дзвярныя замкі і краты сейфа... былі зняты ужо ў пасляваенны час, і некаторыя супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Магілёўская праўда» (яна размяшчалася ў гэтым жа будынку) бачылі іх без аніводнага пашкоджання».

Па сведчаннях, на якія спасылаецца С. Багдановіч, з лета 1942 па студзень 1944 года немцы вывозілі з Магілёва ў тыл бібліятэку і гарадскі архіў. «Іншых звестак, у тым ліку і пра захоп немцамі скарба з пакоя-сейфа музея, атрымаць не ўдалося, хоць прагледжана ўжо больш за 80 крымінальных спраў», — паведамляе С. Багдановіч.

«Нямецкі след» тым больш сумніўны ў святле таго факту, што Магілёў быў пакінуты Чырвонай Арміяй толькі 26 ліпеня 1941 года: гэта значыць, больш чым праз месяц пасля пачатку вайны. За той час з горада можна было спакойна вывезці любыя каштоўнасці. І іх, відаць, вывезлі... Куды? На ўсход... І гэта — другая версія...

Па сведчанні І.С. Мігуліна, прыкладна 2 ліпеня 1941 года ён прыйшоў у абкам партыі, каб пацікавіцца лёсам музейных каштоўнасцей. «Але ў будынак мяне не пусцілі вартавыя, якія стаялі каля ўваходу, — піша І.С. Мігулін. — На маё пытанне «Чаму?» адказалі: «Абкам эвакуіраваўся, у будынку нікога няма».

Хутчэй за ўсё, не было ўжо тут і музейных каштоўнасцей. Да такой жа думкі схіляецца і згаданы вышэй С. Багдановіч, які падрабязна аднавіў падзеі магілёўскай эвакуацыі.

30 чэрвеня тагачасны першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка, які знаходзіўся ў Магілёве, па тэлефоне атрымаў ад І.В. Сталіна дазвол на эвакуацыю. Ужо на наступны дзень у напрамку Касцюковічаў пацягнуліся магіляўчане, пачаўся вываз каштоўнасцей. А 2 ліпеня горад пакінула апошняя аўтакалона, якая накіравалася ў бок Чавусаў.

Якраз у той час у Магілёве знаходзілася прыбыўшая з Масквы група работнікаў НКУС (Народны камісарыят унутраных спраў) на чале з капітанам В. Пудзіным, якая выконвала спецыяльнае даручэнне. На думку С. Багдановіча, яна і магла «вывезці з магілёўскага сейфа скарбы, якія лічыліся прадметамі антыкварнага фонду, «золата партыі».

С. Багдановіч не выключае і таго, што крыж разам з іншымі каштоўнасцямі вывезлі самі работнікі абкама — часу ў іх было дастаткова. Калона з партыйнымі архівамі (сярод іх маглі быць і каштоўнасці) 3 ліпеня накіравалася з Магілёва ў бок Лёзна.

Дарэчы, архівы Магілёўскага абкама партыі ў гады вайны захоўваліся ў Самары і Уфе. Можа, след магілёўскіх скарбаў, выказвае думку С. Багдановіч, трэба шукаць якраз там?

Існуе яшчэ адно сведчанне, якое ўскосна пацвярджае «расійскі след» крыжа. Гэта ўспаміны магіляўчаніна Пятра Харытонавіча Паддубскага, які 13 ліпеня 1941 года ў якасці шафёра быў удзельнікам вывазу нейкіх каштоўнасцей з будынка абкама па вуліцы Ленінскай непасрэдна ў Маскву. Аперацыяй, па словах Паддубскага, кіраваў сам Панамарэнка.

І, нарэшце, яшчэ адна версія — «магілёўская». Згодна з ёй, каштоўнасці вывезці на ўсход не паспелі. 15–16 ліпеня ў раёне Чавусаў немцы замкнулі кальцо акружэння Магілёва. «Разумеючы, што прарвацца са скарбам не ўдасца, — выказвае здагадку С. Багдановіч, — чэкісты закапалі яго дзесьці ў гэтым раёне, а самі разышліся, каб па аднаму перайсці лінію фронту».

Да «магілёўскай версіі» дапасуецца і легенда пра тое, што крыж разам з другімі рэлігійнымі каштоўнасцямі музея быў пакінуты на захаванне нейкаму з магілёўскіх святароў, след якога навечна згубіўся ў ваеннай віхуры.

Апошнім часам вельмі сур'ёзным сумненням падвяргаецца звязаная з «нямецкім следам» здагадка, што крыж Ефрасінні Полацкай трапіў з Германіі ў ЗША, у калекцыю Морганаў, якая была заснавана вядомым амеры-



Мастак-эмальер з Брэста Мікалай Кузьміч,
які ў 1992–1997 гг. аўтэнтычна аднавіў крыж
Ефрасінні Полацкай

канскім банкірам Джонам Перпонтам Морганам яшчэ ў канцы XIX стагоддзя. Праверкай здагадкі займаліся многія даследчыкі, у тым ліку літаратуразнавец Адам Мальдзіс,

журналіст Алесь Лукашук і нават дыпламат Пётр Краўчанка.

Пачалося ж усё з таго, што падчас святкавання 500-годдзя з дня нараджэння Францыска Скарыны супрацоўнік Эрмітажа Барыс Сапуноў паведаміў А.В. Мальдзісу, што легендарны крыж, быццам, нехта купіў адразу пасля вайны на аўкцыёне ў адной з заходнееўрапейскіх краін для калекцыі Морганаў. Той жа Мальдзіс потым даведаўся, што сляды крыжа ў ЗША шукаў другі супрацоўнік Эрмітажа — Бебут Шаўкоўнікаў, які, на жаль, ужо памёр.

Згаданы вышэй Алесь Лукашук падчас свайго візіту ў ЗША ў 1990 годзе наведаў фонд і бібліятэку Джона Перпонта Моргана і нават звярнуўся ў ФБР, каб натрапіць на сляды крыжа. Амерыканцы былі ўважлівыя і ветлівыя, але ніякай інфармацыі беларускаму журналісту не прадставілі.

У кастрычніку 1990 года калекцыю Морганаў наведаў тагачасны міністр замежных спраў Беларусі Пётр Краўчанка. Дыпламат перадаў амерыканцам афіцыйны запыт наконт знаходжання беларускай нацыянальнай святыні ў ЗША. Але афіцыйны адказ на запыт быў адмоўны.

Крыж знік. І напрамак яго знікнення пакуль што не ўстаноўлены. Можа, у яго пошуках нечым дапаможа Інтэрпол, які, як вядома, зарэгістраваў прапаўшую беларускую рэліквію пад нумарам 34-1130?

Менавіта ў заблытанай, бадай што тупіковай сітуацыі і нарадзілася ідэя ўзнаўлення крыжа Ефрасінні Полацкай. Узнікла яна ў 1992 годзе, падчас святкавання 1000-годдзя заснавання Полацкай праваслаўнай епархіі і правядзення Першага сходу беларусаў блізкага замежжа. Работа па аднаўленню нацыянальнай святыні была даручана вядомаму ў Беларусі мастаку-эмальеру з Брэста Мікалаю Пятровічу Кузьмічу. Пасля атрымання благаславення ад Іерусалімскіх святыняў пачалася доўгая і крапатлівая праца, падчас якой брэсцкі мастак быў узяты на духоўнае ўскармленне і пад апякунства Беларускай праваслаўнай царквы.

Пасля заканчэння работ легендарны крыж быў асвечаны ў Сімяонаўскім кафедральным саборы Брэста.



Чын Узвіжання аднoўленага крыжа Ефрасінні Полацкай правёў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт

І вось 27 верасня 1997 года, на свята Узвіжання, абсалютная копія крыжа Ефрасінні Полацкай была дастаўлена ў старажытны Полацк. Паколькі ў Спаса-Праабражэнскай царкве на той час не было ўмоў для надзейнай аховы рэліквіі, яе часова змясцілі ў Крыжаўзвіжальным саборы. А ўжо 6 снежня 1997 года адбылося ўрачыстае ўскладанне славутага крыжа туды, куды ён быў пакладзены яшчэ ў 1161 годзе — у Спаса-Праабражэнскую царкву...

Між іншым даводзілася чуць меркаванні, што спакой, згода і працвітанне прыйдуць на зямлю Беларусі тады,

калі будзе знойдзены і вернуты на месца крыж, зроблены Лазарам Богшам амаль восем з паловай стагоддзяў таму...

## Крыніцы

*Алексеев, Л.В. Лазарь Богша — мастер-ювелир XII в. / Л.В. Алексеев // Советская археология. 1957.*

*Алексеев, Л.В. Полоцкая земля /Л.В. Алексеев. — М., 1966.*

*Арлоў, У. Еўфрасіння Полацкая /У. Арлоў. — Мінск, 1994.*

*Арлоў, У.А. Таямніцы Полацкай гісторыі /У.А. Арлоў. — Мінск, 1994.*

*Багдановіч, С. Загадка крыжа Ефрасінні Полацкай // Магілёўская праўда. — 1993. — 22 мая.*

*Багдановіч, С. Папярэднія вынікі пошуку Крыжа Ефрасінні Полацкай /С. Багдановіч // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: матэрыялы навуковай канферэнцыі. Мінск, 19—20 чэрвеня 1997 г. — Мінск, 1997.*

*Вестник Белорусского экзархата. — 1990. — № 2.*

*Мальдзіс, А. Таямніцы старажытных сховішчаў /А. Мальдзіс. — Мінск, 1974.*

*Тоўсцік, А. Куды быў вывезены крыж святой Ефрасінні? / А. Тоўсцік // Кантакты і дыялогі. — 1996. — № 6.*

*Штыхов, Г.В. Древний Полоцк /Г.В. Штыхов. — Минск, 1975.*

*Юшкевич, В. Тайна креста /В. Юшкевич // Советская Белоруссия. — 1990. — 28 сентября.*

# ЛЕГЕНДЫ БЕЛАГА КОВЕЛЯ

У кожнага дарослага чалавека ў пашпарце ёсць запіс аб месцы нараджэння. У ёй на ўсё жыццё занатавана малая радзіма любога з нас: у каго — г. Слонім, у каго — в. Забалоцце, у каго — ст. Дрэтунь. Не складае цяжкасці «расшыфроўка» гэтых немудрагелістых скарачэнняў: горад, вёска, станцыя. У маім жа пашпарце месца нараджэння пазначана так — м. Смаляны. Наўрад ці кожны сёння ведае, што азначае гэтае «м.». Асабліва людзі маладыя. Бывала, што і таму-сяму з чыноўнікаў даводзілася тлумачыць, што я меў гонар нарадзіцца не ў горадзе, не ў вёсцы, не на станцыі, а ў населеным пункце, якое мела статус мястэчка.

Больш таго, магу зазначыць, што нейкі невядомы мне сельсавецкі «пісар» афіцыйна зафіксаваў у метрыцы маё менавіта местачковае паходжанне роўна праз трынаццаць гадоў пасля таго, як Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР сваім Указам «Аб класіфікацыі населеных пунктаў Беларускай ССР» ад 27 верасня 1938 года (а я пабачыў свет 21 верасня 1951 года) скасаваў само паняцце «мястэчка». З таго самага дня адны беларускія мястэчкі былі «павышаны» ў сваім статусе да пасёлкаў гарадскога тыпу або нават гарадоў, другія ж — сярод іх і Смаляны — пераўялі ў ранг звычайных вёсак.

Не ведаю, наўмысна ці выпадкова памыліўся той «пісар», але, як мне здаецца, за трынаццаць гадоў пасля прыняцця згаданага вышэй указа з яго памяці (можа, на нейкім генным узроўні захаваўшыся) не выветрылася яшчэ тое, што Смаляны вельмі доўга былі мястэчкам. Калі ж быць дакладным, то гэты годны статус ім надаў аж у 1678 годзе кароль польскі і вялікі князь літоўскі Ян III Сабескі.



Базарная плошча ў Смалянах. Фота пачатку XX ст.

У пяцідзесятыя гады мінулага стагоддзя, на якія прыходзіцца маё дзяцінства, Смаляны (па-мясцоваму — Смальяны) лічыліся досыць значным населеным пунктам, своеасаблівай сталіцай для шматлікіх вёсак і вёсачак, што былі раскіданы па іх ваколіцах... Шыбекі і Цюльпін, Вязьмічы і Гаршчэўшчына, Бабрамынічы і Шупені, Дубавое і Рэпухава — для іх жыхароў Смаляны, якія ўсе яны па даўняй звычцы называлі мястэчкам, былі асяродкам цывілізацыі. Наведванне яго па нейкіх справах заўсёды насіла святочнае адценне. Цэнтрам Смалянаў у гады майго дзяцінства была прасторная Базарная плошча. Дзіцячая памяць захавала шумныя і вясёлыя кірмашы, якія віравалі на плошчы па нядзелях. Ад плошчы ва ўсе бакі разыходзіліся некалькі вуліц. Аршанская, Віцебская, Талачынская, Ганышаўская выводзілі на бальшакі. Па іх дабіраліся да Оршы, Сянно, Багушэўска, Лепеля, Талачына, Віцебска. Школьная, як казалі старажылы, атрымала сваю назву ад яўрэйскай школы — ешыбота, што некалі знаходзілася на ёй. Замкавая вяла да руінаў старадаўняга замка; у канцы яе ўтульна месцілася драўляная царква — па расказах, таксама вельмі старая. Касцёльную вуліцу ўпрыгожваў занядбаны каталіцкі храм з прыбудовамі, дзе на той час знаходзіўся машынны двор калгаса «Новае жыццё». Былі яшчэ ў мястэчку вуліцы Васілёнкаўская, Плігаўская, Слабада, на пачатку якой стаяла мураваная, таксама занядбаная праваслаўная царква.

Адметнасцю Смалянаў з'яўляліся і могілкі: напаўзакінутыя польскія і яўрэйскія, а таксама праваслаўныя, дзе было шмат старадаўніх крыжоў, каваных агароджаў і надмагілляў. Як памятаю, найвышэйшым геройствам сярод местачковых хлопцаў лічылася майскай ноччу пайсці на каталіцкія могілкі і прынесці адтуль ахапку бэзу. Такога — пышнага і духмянага — не было ні ў адным местачковым палісадніку.

Многа пазней я даведаўся, што смалянскія каталіцкія могілкі ў ліпені 1855 года сталі апошнім прытулкам вядомага літаратара, барацьбіта з царскім самадзяржаўем Тамаша Зана, а пасля — яго жонкі Брыгіды і сына Абдона і што ў 1877 годзе мястэчка наведаў знакаміты Напалеон Орда, які замаляваў магілу Зана.

Пасля напаміну аб могілках вы ўжо, мабыць, зразумелі, што, акрамя беларусаў у мястэчку жылі яўрэі (у вайну іх амаль усіх расстралялі немцы) і палякі, якія, хутчэй за ўсё, былі звычайнымі беларусамі каталіцкага веравызнання. Нейкіх асобных вуліц на той час у іх не было, таму добрымі суседзямі жылі побач і Каляда, і Каган, і Жылінскі.

Але дамінантай Смалянаў — архітэктурнай, гістарычнай, паўсядзённай — з'яўляўся замак. Праўда, замка ў прывычным яго паняцці даўно ўжо не існавала. Ад яго захаваліся толькі руіны складзенай з чырвонай цэглы пяціяруснай вежы, ці, як бы сказаў дасведчаны архітэктар, намёкі на адзін з элементаў унутранай планіроўкі, ці прасцей — рэшткі сцен амаль квадратнай вуглавой залы.

Аб тым, што замак (як і самі Смаляны) — пабудова старажытная, мы, местачковыя хлапчукі, не задумваліся. Ён быў прывычным атрыбутам нашага, як мы сёння любім гаварыць, басаногага дзяцінства. Насупраць замка на рэчцы Дзярноўцы была зручная для купання затока, дзе мы бавілі час у летнюю спякоту. Калі ж надакучвала плюхацца ў вадзе, лазілі па сценах, рызыкуючы зламіць галаву, сарваўшыся ўніз.

Відаць, мы прывыклі да сваёй маляўнічай вежы, як палачане да Сафіі ці гарадзенцы да Каложы, і іншы раз проста не звярталі на яе ўвагі. Тым больш, што ў Смаля-



Руіны Смалянскага замка

нах былі, як ужо адзначалася вышэй, і іншыя архітэктурныя шэдэўры. Але замкавыя руіны ў іх шэрагу з'яўляліся аб'ектам нумар адзін. Наш хлапчукоўскі інтарэс да іх пападгравала і тое, што пра замак хадзілі розныя страшныя і загадкавыя легенды. Нібыта на мяжы ночы і раніцы, калі туман, узнімаючыся ад Дзярноўкі, хавае вежу так, што бачнай застаецца толькі самы верх, у пустых вокнах раптам запальваецца халоднае святло. З-пад зямлі, куды глыбока ўрасла вежа, гучыць чароўная музыка, а па сценах ходзіць здань у выглядзе жанчыны ў белым саване, і, быццам, здань гэтая — цень самой каралевы Боны, якой некалі належаў замак.

Гаварылі яшчэ, што ад замка вядуць некалькі падземных хадоў. Адзін з іх цягнецца аж да Оршы, у Куцеінскі манастыр, другі ідзе да Слабады, трэці — да царквы, што на Замкавай вуліцы, а чацвёрты, шырокі, як тунель, — выводзіць да касцёла. Па ім каралева Бона некалі ездзіла з замка на тройцы да імшы.

Хадзілі чуткі, што ў падвалах замка, што схаваны пад здзірванелым узгоркам, закапаны незлічоныя скарбы ці той самой Боны, ці то шведскага караля. Мы з хлопцамі, прызнаюся, варочалі дзірван пад сценамі, але, акрамя кавалкаў цэглы і кафлі, так нічога і не знайшлі.

Пра падземныя ж хады гаварылі толькі шэптам: знаходзіліся, быццам, даўней сарвігаловы, што спрабавалі лазіць туды, але толькі іх і бачылі — згінулі ў смуродных сутарэннях сярод жудасных шкілетаў.

Праўда, мы, хоць і былі дзецьмі, у казкі гэтыя не вельмі і верылі. Замак і замак. Нічога асаблівага...

Аб тым, што ў Смалянах, з іх замкам і другімі адметнасцямі, ёсць шмат чаго такога, чаго няма ў другіх навакольных вёсках і нават гарадах, я даведаўся праз шмат гадоў, калі вучыўся ў Мінску ва універсітэце і ўсур'ёз захапіўся краязнаўствам, беларускай мінуўшчынай. З розных крыніц (кніг, часопісаў, архіўных дакументаў) стала мне вядома, што за чырвонымі сценамі Смалянскага замка і сапраўды хаваецца нямала таямніц, што за імі — стагоддзі і лёсы многіх выдатных людзей: беларусаў і рускіх, палякаў і шведаў, што з замкам і з самімі Смалянамі звязаны імёны каралёў і каралеў, цароў і князёў. Што мне, без перабольшання, пашчасціла нарадзіцца ў легендарным мястэчку.

Калі ж яно з'явілася на гэтай зямлі, у шырокай даліне ракі Дзярноўкі, якая ўпадае ў Адроў (па-мясцоваму — Адроўку), што крыху ніжэй Оршы зліваецца з Дняпром?

Як адзначае вядомы беларускі археолаг Вольга Ляўко, археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Смалянаў пакуль што не праводзіліся, калі не лічыць, што яшчэ ў 1980 годзе пад сценамі замка былі закладзены два шурфы глыбінёй каля 1,5 метра і плошчай 21 квадратны метр. Археолагі знайшлі рэшткі кафлі, падложнай пліткі і бытавой керамікі XVII стагоддзя.

Пад пытаннем застаецца і існаванне на тэрыторыі Смалянаў старажытнага гарадзішча, хаця, як лічаць асобныя даследчыкі, якраз на яго месцы і быў узведзены замак.

Яшчэ на пачатку XIX стагоддзя пачынальнік беларускай археалогіі Зарыян Даленга-Хадакоўскі выказаў мер-

каванне, што згаданы ў «Поучениях» Уладзіміра Манамаха пад 1078 годам горад Одрск мог знаходзіцца якраз на месцы Смалянаў, якое здаўна было самым значным паселішчам у наваколлі і знаходзілася ўсяго ў некалькіх кіламетрах ад ракі Адроў, ад якой, на думку Даленгі-Хадакоўскага, і пайшла назва гэтага горада (па аналогіі, Слуцк — на Случы, Віцебск — на Віцьбе, Полацк — на Палаце, адсюль, Одрск — на Адрове).

З пункту бачання археалогіі гэта версія пацверджання не знайшла. Але, можа, пакуль? Тым больш, што ў ваколіцах Смалянаў нямала старажытных курганоў, што сведчыць: людзі тут жывуць даўно, як кажуць, спакон веку.

А вось самы ранні пісьмовы дакумент, у якім згадваюцца Смаляны, датаваны 1484 годам. У Львоўскім архіве знаходзяцца на захоўванні «Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Siawucie». На 138 старонцы выдадзенага ў 1887 годзе першага тома зборніка дакументаў ёсць сведчанне, што якраз у 1484 годзе кароль польскі і вялікі князь літоўскі Казімір IV Ягелончык аддаў Смаляны князю Сямёну Іванавічу Бельскаму.

Як вядома, род князёў Бельскіх мае дзве галіны, дарэчы, не звязаныя сваяцтвам, — Рурыкавічы і Гедымінавічы. Сямён Бельскі паходзіў з апошняга. Год яго нараджэння невядомы, а памёр князь недзе пасля 1507 года. Дакументальна пацверджана, што якраз у 1484 годзе Бельскі судзіўся з другім князем — Іванам Сямёнавічам Кобрынскім з-за зямельнага пасагу жонкі апошняга, княгіні Фядоры Іванаўны з роду Рагацінскіх.

Не выключана, што менавіта ёй да гэтага належалі Смаляны.

Казімір IV Ягелончык увайшоў у гісторыю талентам вырашэння многіх складаных дзяржаўных спраў. Спрабуючы спыніць раскол, які існаваў паміж магнатамі Вялікага княства Літоўскага, ён шчодра раздаваў баярам маёнткі. Праўда, Сямён Бельскі не ацаніў шчодрасці Казіміра і, незадаволены сваім становішчам у Вялікім княстве Літоўскім, у 1500 годзе перайшоў на службу да вялікага князя маскоўскага Івана III Васілевіча (дарэчы, разам з гарадамі Гомелем, Старадубам, Чарнігавам, Любечам). Ме-

навіта Сямён Бельскі стане потым адным з ініцыятараў войнаў, якія Маскоўская дзяржава будзе весці з Вялікім княствам Літоўскім на пачатку XVI стагоддзя.

Відаць, Бог пакараў-такі князя за здраду, бо нашчадкаў Сямён Бельскі пасля сябе не пакінуў.

Лёс жа Смалянаў пасля гэтага складваўся такім чынам. Наступнік Казіміра, кароль і вялікі князь Аляксандр, аддаў іх у 1510 годзе ў валоданне сваёй жонцы Алене Іванаўне, дачцы вялікага князя маскоўскага, якая валодала імі, відаць, да сваёй смерці ў 1513 годзе. Новы ўладар Вялікага княства Літоўскага кароль і вялікі князь Жыгімонт І Стары ў 1522 годзе перадаў Смаляны герою Аршанскай бітвы князю Канстанціну Астрожскаму (дарэчы, сваяку Бельскага), які валодаў імі да 1530 года, калі славуты палкаводзец памёр. Да 1539 года ўладальнікам Смалянаў быў яго сын Ілья. Але малады князь не пражыў і 30 гадоў, і пасля яго заўчаснай смерці Смаляны сталі велікакняжацкім уладаннем.

Наступны перыяд смалянскай мінуўшчыны адзначаны некалькімі гістарычнымі недарэчнасцямі. Так, «Живописная Россия» сведчыць, што пасля апісаных намі вышэй падзей сын Жыгімонта І Старога Жыгімонт Аўгуст падарыў Смаляны «вядомаму князю Курбскаму пасля ўцёкаў яго ад Івана Грознага. Курбскі асцерагаўся жыць паблізу рускіх межаў і таму прамяняў Смаляны з Абольцамі, якія таксама яму належалі, на Ковель у Валынскай губерні, які належаў Сангушку».

Гэта версія не вытрымлівае ніякай крытыкі ўжо хоць бы таму, што князь Андрэй Курбскі ўцёк ад Івана Грознага ў Вялікае княства Літоўскае ў 1564 годзе. Атрымаць Смаляны ў валоданне ён не мог, бо перад гэтым адбыліся наступныя падзеі. У 1543 годзе князь Васіль Міхайлавіч Сангушка-Ковельскі з роду Любартавічаў-Сангушкаў (таксама нашчадак Гедыміна) прасіў жонку Жыгімонта І Старога каралеву Бону абараніць яго ад крыўдаў з боку сваіх братоў, якія, відаць, рабілі на князя нейкі ўціск. Васіль Міхайлавіч прапанаваў Боне аддаць яму за яго ковельскія маёнткі двор Абольцы Віцебскага павета і воласці Усвята і Азярышча. Бона ўжо было згадзілася, але тут у

справу ўмяшаўся яе муж: вялікі князь не захацеў развітацца з блізкімі да віцебскага каралеўскага замка валасцямі. Ён прапанаваў жонцы аддаць Сангушку ў абмен на яго ковельскія маёнткі: «... двор наш Смалняны, які ад нас трымаў гараднічы Гарадзенскі... воласць Горвальскую».

Так у 1543 годзе ўладальнікам Смалянаў стаў першы з роду князёў Сангушкаў. Застаецца толькі здагадвацца, хто такі «гараднічы Гарадзенскі», які «трымаў» «Смалняны» з 1539 па 1543 год.

З князямі Сангушкамі гісторыя Смалянаў была звязана каля двух стагоддзяў. Колькі з іх валодалі імі, сёння сказаць цяжка. У пісьмовых крыніцах акрамя Васіля Міхайлавіча згадваюцца як уладальнікі Смалянаў: Самуэль Сямён, сын Андрэя (? — лістапад 1638 года) — маршалак аршанскі, кашталян мсціслаўскі і віцебскі, ваявода віцебскі; Геранім Уладзіслаў, сын Самуэля (1611–1657 гады) — намеснік біскупа віленскага, біскуп смаленскі; верагодна, Казімір Антоні, сын Гераніма (1677–1706 гады) — маршалак дворны, а пасля маршалак вялікі; Павел Кароль, сын Гераніма (1680–1750 гады) — стольнік Вялікага княства Літоўскага, падскарбі дворны, маршалак дворны і вялікі.

Уладальнікам Смалянаў мог быць Геранім Януш, сын Паўла Караля (1743—1812 гады) — мечнік Вялікага княства Літоўскага, ваявода валынскі, удзельнік польскага паўстання 1794 года. Якраз за ўдзел у паўстанні Смаляны ў Сангушкаў маглі секвестраваць.

У Паўла Караля былі яшчэ два сыны — Януш Аляксандр (1712–1775 гады) і Юзаф Паўлін Ян Адам (1740–1781 гады). Не выключана, што і нехта з іх мог быць апошнім гаспадаром Смалянаў, якія ў 1772 годзе, пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, адышлі да Расіі.

Менавіта з імем аднаго з Сангушкаў, Самуэля Сямёна, праўнука Васіля Міхайлавіча, звязана ўзвядзенне галоўнай архітэктурнай адметнасці паселішча — Смалянскага замка. Даты нараджэння і смерці гэтага чалавека маюць для нас вялікае значэнне, таму што менавіта ён, Самуэль Сямён, «замак і палац пад Смалянамі, Белы Ковель, вялікім коштам пабудаваў...». У адным з выпускаў

«Историко-юридических материалов», выдадзеным у Віцебску ў 1891 годзе, прыведзена закладная князя Сямёна за 1626 год, дзе запісана наступнае: «...маёнтка майго Смалян Белага Ковеля, што ляжыць у павеце Аршанскім».

Калі ўлічыць, што ў 1593 годзе князь Сямён ужо валодаў Смалянамі (гэта вядома з «Інвентара спісання двара і ўсяго маёнтка Смальянскага, места, баяр і падданых...»), але замка на той час яшчэ не было, а ў 1626 годзе ён ужо стаяў, то, відавочна, недзе паміж гэтымі датамі і схаваны год яго ўзвядзення. Такім чынам, Смалянскаму замку (дакладней, яго руінам) каля чатырох стагоддзяў.

А цяпер вернемся на хвіліну да асобы каралевы Боны з дынастыі міланскіх князёў Сфорца. Сцвярджэнне аб тым, што Бона некаторы час жыла ў Смалянскім замку і нават раз'язджала ў карэце па падземным ходзе, што вёў з замка ў касцёл, не больш чым народнае паданне, якое гістарычна не абгрунтавана. Як вядома, каралева Бона памерла ў 1557 годзе, калі ні замка, ні тым больш касцёла (аб якім гаворка ніжэй) у Смалянах яшчэ не было. Так, яна магла бываць тут, бо ёй нейкі час належалі размешчаныя паблізу Абольцы, але не больш таго.

У свой час у адной з кніг (цяпер ужо не памятаю, якой) мне давялося сустрэць цікавае, хоць і не бясспрэчнае тлумачэнне таго, чаму замак у Смалянах звязваюць з імем Боны. Не выключана, што ў мястэчку, даволі буйным гандлёвым цэнтры, часта бывалі купцы з суседняй Жамойціі (сучаснай Літвы). Безумоўна, іх уражвалі руіны (а на пачатку XIX стагоддзя гэта ўжо былі менавіта руіны) некалі велічнага замка. Слова «боня» ў літоўскай мове якраз і азначае ... «руіны». Відаць, прыезджыя купцы вельмі часта яго паўтаралі — боня ды боня... Мясцовыя ж жыхары, магчыма, спалучылі гэты факт з легендай і надалі яму сваё «гістарычнае тлумачэнне».

Колькі слоў аб іншых архітэктурных адметнасцях Смалянаў. Згаданы мной на пачатку аповяду каталіцкі храм, помнік архітэктуры барока, — гэта касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Ён быў узведзены каля Базарнай плош-



Касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі

чы ў 1678—1680 гадах пры ўжо існуючым кляштары дамініканцаў. Фундавалі пабудову касцёла князь Геранім Любартавіч Сангушка і яго жонка Канстанцыя. У 1899 годзе касцёл і кляштар былі адрамантаваны пад кіраўніцтвам архітэктара Даўкшы. У канцы 1930-ых гадоў савецкія ўлады закрылі храм, і аж да 1984 года ў ім і ў будынку кляштара размяшчаліся майстэрня і гараж мясцовага калгаса.

Драўляная Спаса-Праабражэнская царква ўзведзена на Замкавай вуліцы, па некаторых звестках, у 1792 годзе. Але калі верыць звесткам з кнігі Дз.А. Талстога «Римский католицизм в России» (1876 год), што храм гэты

пабудаваны ў стылі барока намаганнямі князя Паўла (а, можа, Паўліна) Сангушкі, то царква, магчыма, крыху старэйшая, бо Павел памёр у 1750 годзе (Паўлін у 1781 годзе). У канцы тых жа 1930-ых гадоў царква была закрыта, а ў яе будынку доўгі час размяшчаўся вінзавод (!). Сёння храм дзейнічае і радуе прыхаджан унікальнымі размалёўкамі XVIII стагоддзя, размешчанымі на купале. Яны зроблены тэмперай на дошках. Гэта выявы 12 апосталаў ва ўвесь рост.

Мураваная Свята-Аляксееўская царква, якая размясцілася на Слабадзе, пабудавана ў псеўдарускім стылі значна пазней, у 1864 годзе. Закрыта, як вы ўжо, напэўна, здагадваецеся, у 1930-ыя гады. Сёння знаходзіцца ў занядбаным стане.

Але і касцёл, і абедзве царквы — не самыя старадаўнія смалянскія храмы. У інвентары за 1543 год згадваюцца яшчэ дзве царквы — Свята-Мікалаеўская і Спаса-Праабражэнская, якія знаходзіліся ў маёнтку, што належаў князю Васілю Міхайлавічу Сангушку.

«Эпоха Сангушкаў», як ужо згадвалася вышэй, працягвалася ў Смалянах з сярэдзіны XVI па канец XVIII (а можа, і пачатак XIX) стагоддзя. Менавіта ў той перыяд склалася іх мястэчковае аблічча, што прывяло ў 1678 годзе да згаданага вышэй надання ім Янам III Сабескім статуса мястэчка, буйнога гандлёвага цэнтра тагачаснага Аршанскага павета і ўсяго Віцебскага ваяводства. Па пісьмовых сведчаннях вядома, што ў XVIII стагоддзі цэнтрам мястэчка была даволі прасторная плошча (яна існуе і сёння). На ёй знаходзіліся гандлёвыя рады, у цэнтры якіх у 1742 годзе была ўзведзена драўляная ратуша, а таксама важніца. На плошчы размяшчаўся і драўляны праваслаўны храм — ужо згаданая Свята-Мікалаеўская царква. Жылая забудова мястэчка была на той час досыць густой.

Як мястэчка, Смаляны нетыповыя для ўсходняга рэгіёна Вялікага княства Літоўскага. Тутэйшыя мястэчкі звычайна мелі адну доўгую вуліцу, у розных канцах якой жылі рамеснікі-гандляры і сяляне. Цэнтральная плошча ў большасці выпадкаў адсутнічала, культавых будынкаў было няшмат.

Мястэчкі ж з цэнтральнай плошчай, ад якой разыходзілася некалькі вуліц (як у Смалянах), былі тыповымі для заходняй часткі Вялікага княства Літоўскага. Чаму Смаляны будаваліся па «заходняму» варыянту, цяжка сказаць. На тое, відаць, былі нейкія, нам пакуль невядомыя, прычыны.

Але адной з большых (калі не галоўнай) загадак мястэчка Смаляны з'яўляюцца дата і «аўтарства» разбурэння замка. Пакуль што замкавыя руіны хаваюць ад нас і час падзеі, і імя таго, хто зруйнаваў гэты архітэктурны шэдэўр абарончага дойлідства.

Існуюць розныя меркаванні наконт таго, калі Смалянскі замак ператварыўся ў руіны. Але відавочна, што падчас руска-польскай вайны 1654—1667 гадоў ён моцна не пацярпеў, бо вядомы акт 1680 года, у якім маецца запіс: «Гіеранім Любартавіч Сангушка ... на Белым Ковелі князь». І далей: «... вуліца Замкавая... ад замка ісці ў рынак, па левай руцэ».

Замак, безумоўна, мог пацярпець падчас Паўночнай вайны 1700—1721 гадоў. Вядома, што баявыя сутычкі паміж рускімі і шведамі мелі месца і ў Смалянах. Вядомы расійскі гісторык Я.В. Тарле сведчыць, што ў сярэдзіне лета 1708 года ў Смалянах нечакана быў атакаваны генерал-ад'ютант шведскага караля Карла XII Каніфер. Падчас бою яго варта была разгромлена, а сам ён узяты ў палон казакамі і 3 жніўня 1708 года дастаўлены да Пятра I у Горкі.

Але замак, відаць, застаўся больш-менш цэлым, бо ў інвентарах за 1739 і 1742 гады (калі Смаляны належалі Паўлу Каралю Сангушку) ёсць апісанне яго памяшканняў. Там сказана, што ў жылых памяшканнях замка стаялі печы, упрыгожаныя кафляй з выявай «Пагоні», а сцены пакояў упрыгожвалі фрэскі XVII стагоддзя з рэлігійнымі сюжэтамі. Інвентары сведчылі, што «...замак мураваны на капцы» быў наўкола «вадою абвіты». Перад замкам знаходзіўся стаў з мостам і парэнчамі. Злева ад замка, пры ўваходзе на дзядзінец, быў склеп.

Праўда, вядомы беларускі гісторык Міхась Ткачоў лічыў, што замак усё ж такі быў разбураны ў вайну Расіі

з Рэччу Паспалітай (1654—1667 гады) і ў Паўночную вайну (1700—1721 гады). А ў кнізе вядомага беларускага гісторыка Міхаіла Без-Карніловіча «Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся», выдадзенай у Санкт-Пецярбургу ў 1855 годзе, прама сказана, што замак разбурылі рускія войскі 3 жніўня 1708 года. Гэту версію падтрымліваў і Адам Кіркор у «Живописной России».

Як бачым, нешта тут не стыкуецца. Але відавочным застаецца факт, што на малюнку вядомага польскага жывапісца Юзафа Пешкі, датаваным канцом XVIII стагоддзя, Смалянскі замак адлюстраваны хоць і не поўнасцю зруйнаваным, але ў выглядзе, які сведчыць, што наўрад ці ў ім стала жывуць людзі.

Так што, каму належыць «гонар» знішчэння выдатнага помніка архітэктуры — рускім, палякам ці шведам, пакуль што невядома...

У 1831 годзе гаспадаром Смалянаў стаў калежскі асэсар Васіль Сямёнаў, а ў 1847 годзе — яго сын, тайны саветнік сенатар Аляксей Сямёнаў. У «Могилевских губернских ведомостях» за 1902 год невядомы аўтар паведамляў, што ў 1860 годзе сенатар «...прадаваў сцены на злом... не ацалела б і вежа, калі б Смаляны не перайшлі да В.А. Цітова. Новы гаспадар не толькі не дазволіў бурыць вежу, але нават пастараўся ўмацаваць яе контрфорсамі».

Атрымліваецца, што менавіта гэтаму Цітову мы абавязаны тым, што і сёння смалянскі пейзаж упрыгожваюць рамантычныя руіны таго, што некалі было велічным замкам князёў Сангушкаў.

У сваім аповядзе аб Смалянах мы, як бачыце, дайшлі да ўжо досыць блізкага нам XIX стагоддзя. Натуральна было б даведацца, што сабой уяўляла старажытнае мястэчка 100—150 гадоў таму. Згаданы крыху вышэй Без-Карніловіч, апісваючы ў сваёй кнізе Смаляны сярэдзіны XIX стагоддзя, пісаў, што «ў мястэчку маюцца мураваныя гандлёвыя лаўкі, цэрквы, касцёл, паблізу якога відаць развалiны старажытнага замка...». «У Смалянах, — паведамляе гісторык, — яўрэяў мужчынскага полу больш за 1000 душ».

Недзе гадоў праз трыццаць у «Живописной России» Адам Кіркор занатоўвае наступны гістарычны факт: «Пры рэчцы Дзярноўцы ляжыць нязначнае мястэчка, з кірмашамі, Смаляны».

З «нязначнасцю» мястэчка цяжка пагадзіцца. У 1880 годзе (прыкладна ў той час, калі Кіркор занатоўваў свае ўражанні аб Смалянах) быў праведзены перапіс, згодна з якім тут пражывала 2315 насельнікаў (1142 мужчыны і 1173 жанчыны). У мястэчку меліся 252 драўляныя дамы, 55 крамаў, 4 царквы, сінагога, каталіцкі касцёл і 4 малітоўныя дамы. А.С. Дэмбавецкі ў «Опыте описания Могилевской губернии» (1884 год) паведамляе, што прыкладна ў той жа час у Смалянах дзейнічалі цагельны завод і сыраварня. Мястэчка славілася сваімі майстрамі-меднікамі. У ім былі бальніца і аптэка, яго ўпрыгожвалі вадасховішча з дамбай і шлюзамі плошчай 22 дзесяціны, дзе разводзілі карпаў.

У другой палове XIX стагоддзя тут быў закладзены пейзажны парк, які з'яўляўся часткай досыць буйной панскай сядзібы, у цэнтры якой месціўся вялікі драўляны дом у два паверхі.

Яркай адметнасцю мястэчка тых часоў з'яўляліся кірмашы, якія славіліся далёка за межамі Смалянаў. Найбольш значнымі з іх з'яўляліся два штогадовыя — Мікалаеўскі (6 снежня) і Крыжаўзвіжанскі (14 верасня). Безумоўна, яны не ішлі ні ў якое параўнанне ні з вядомым на ўвесь захад тагачаснай Расійскай імперыі Зэльвенскім кірмашом, ні нават з самым буйным у Аршанскім павеце і ўсёй Магілёўскай губерні кірмашом у Любавічах. Так, згодна з справаздачай магілёўскага губернатара 6 снежня 1847 года, на Мікалаеўскі кірмаш было дастаўлена тавараў усяго на 200 рублёў, а прададзена на 150 рублёў. Крыху больш фінансава ўражваў Крыжаўзвіжанскі кірмаш 14 верасня 1858 года, на які прывезлі тавараў ужо на 300 рублёў, а прадалі на 240 рублёў.

Між іншым калі яшчэ раз успомніць «нязначнасць» Смалянаў сярэдзіны XIX стагоддзя, то варта было б заўважыць, што ў 1999 годзе ў Смалянах налічвалася 1522

жыхары. Гэта азначае, што за апошнія 120 гадоў насельніцтва былога мястэчка зменшылася больш чым на трэць.

Напрыканцы даволі беглага экскурса ў смалянскую даўніну трэба сказаць колькі слоў аб паходжанні назвы мястэчка. Аршанскі краязнавец Аляксандр Шынкевіч выказвае меркаванне, што яно атрымала сваё найменне ад слова «смала», якую тут некалі гналі ў мясцовых смалакурнях. Можа, і так. Але беларускі гісторык Андрэй Мяцельскі, які даследуе археалогію Усходняй Беларусі і сур'ёзна займаецца пытаннямі гістарычнай геаграфіі, прытрымліваецца іншай версіі. На яго думку, назва старажытнага мястэчка звязана з яго памежным месцазнаходжаннем — на рубяжы Полацкага і Смаленскага княстваў. Вельмі верагодна, што паселішча заснавалі (прычым значна раней, чым у другой палове XV стагоддзя) выхадцы са Смаленшчыны, што перасяліліся сюды падчас адной са шматлікіх войнаў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. На карысць гэтай версіі можа сведчыць, напрыклад, тое, што на многіх старадаўніх картах паселішча пазначана як «Смольняны».

Што ж тычыцца таго, што ў многіх гістарычных дакументах Смаляны або Смалянскі замак называюцца Белым Ковелем, то гэта, верагодна, звязана з тым, што, як адзначалася, у 1543 годзе ўладальнікам паселішча стаў князь Васіль Міхайлавіч Сангушка-Ковельскі, які атрымаў яго ў абмен на свае ковельскія маёнткі. Князь, відаць, быў не пазбаўлены настальгіі па родных мясцінах і назваў сваё новае ўладанне Белым Ковелем (памятаеце — «на Белым Ковелі князь...»?).

Прызнаюся шчыра: ужо колькі гадоў не бываў у Смалянах. Сёння амаль нічога, акрамя дзіцячых успамінаў, не звязвае мяне з былым мястэчкам. Гадоў з трыццаць таму не стала майго дзеда Васіля, знанага местачковага ўмельца-каваля, што жыў у самым канцы Аршанскай вуліцы. Памёр і бацька, які добра памятаў, як местачковыя камсамольцы-атэісты зцягвалі крыж з купала Свята-Аляксееўскай царквы. Ціха сканала ў сваёй некалі дагледжанай хаце мая старая цётка Юля. А галоўнае, ужо

амаль дзесяць гадоў няма на свеце майго стрыечнага брата і лепшага сябра дзяцінства, сына цёткі Юлі — Валеркі, дзякуючы якому і трымаліся мае даўнія повязі са Смалянамі.

Але цяпер, як сказаў класік, няма таго, што раньш было... Смаляны — не Мір і не Нясвіж. Наўрад ці каму прыйдзе ў галаву ідэя адбудаваць адмысловы замак. Ведаю, што спробы вернікаў прывесці да ладу касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі і Свята-Аляксееўскую царкву завяршыліся нічым: як стаялі некалі велічныя храмы занядбанымі, так і стаяць.

Крыху суцяшае толькі тое, што ў 1996 годзе былі аднаўлены помнікі Тамаша Зана і яго жонкі з сынам. На пачатку 1990-ых гадоў адноўлены і стары дом на былой панскай сядзібе. Але гэта, на жаль, кропля ў моры гістарычнага забыцця, якое паглынула і прадаўжае паглынаць смалянскую даўніну.

Скрушна ад гэтага і балюча. Але, як відаць, тут ужо нічога не зробіш. А калі і будзе што зроблена, то, напэўна, не пры нашым жыцці.

Стаяць, падпіраючы сіняе неба, чырвоныя муры Смалянскага замка... Здалёк чутны званы божых храмаў, што клічуць вернікаў да малітвы... Храпуць запрэжаныя ў шыкоўную карэту коні: каралева Бона імчыць падземным ходам да імшы... З замкавых сцен углядаецца ў трывожную далячынь сівы князь Сангушка...

Што бачыць ён там, за сівою смугой стагоддзяў? Няўжо замкавыя руіны і занядбаныя храмы?

## Крыніцы

*Акты Западной России. Т. 2. — СПб., 1848.*

*Асіноўскі, С.М. Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі / С.М. Асіноўскі. — Мінск, 1997.*

*Асіноўскі, С. Смаляны /С. Асіноўскі // Беларуская мінуўшчына. — 1995. — № 1.*

*Баравы, Р.В. Да гісторыі замка ў Смалянах /Р.В. Баравы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1971. — № 3.*

*Без-Корнилович, М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других све-*

*дений, к ней же относящихся /М.О. Без-Корнилович. — Минск, 1995.*

*Городские поселения Российской империи. Т. III. — СПб., 1863.*

*Дембовецкий, А.С. Опыт описания Могилевской губернии / А.С. Дембовецкий. — Могилев, 1884.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. Т. 3. — Минск, 1993.*

*Историко-юридические материалы. — Витебск, 1891.*

*Левко, О.Н. Средневековая Орша и ее округа: историко-археологический очерк /О.Н. Левко. — Орша, 1993.*

*Смольяны // Могилевские губернские ведомости. — 1902, — № 34.*

*Ткачоў, М. Людзі і замкі /М. Ткачоў. — Мінск, 1991.*

*Толстой, Д.А. Римский католицизм в России /Д.А. Толстой. — СПб., 1876.*

*Шынкевіч, А.М. Аршанская даўніна /А.М. Шынкевіч. — Мінск, 1992.*

*Шынкевіч, А.М. Аршаншчына старажытная /А.М. Шынкевіч. — Орша, 1991.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1. — Мінск, 1993.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. — Мінск, 2001.*

# ЗАГАДКА ДВАНАЦЦАЦІ АПОСТАЛАЎ НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА

Сёння ў гэта цяжка паверыць, але быў час (па гістарычных мерках, не такі ўжо і далёкі: з паўтысячы гадоў таму), калі Беларусь (край, па агульнаму меркаванню, выключна сялянскі) у Еўропе называлі «краінай замкаў». І гэта — не міф, не перабольшванне. На карце Вялікага княства Літоўскага канца XVI стагоддзя пазначана, што ў 112 (!) гарадах і мястэчках, размешчаных у межах сучаснай Беларусі, меліся замкі: шляхецкія, магнацкія, велікакняжацкія, каралеўскія. У адрозненне ад той жа Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, дзе і сёння шматлікія старажытныя муры з'яўляюцца неад'емнай часткай мясцовага ландшафту і аб'ектамі паломніцтва турыстаў, амаль усе беларускія замкі спасціг трагічны лёс: у віхурах няспынных войнаў XIV—XVIII стагоддзяў яны былі разбураны, прытым падаўляючая большасць — ушчэнт. Сёння цяжка паверыць, што некалі велічныя замкавыя муры ўпрыгожвалі тыя ж Оршу, Быхаў, Ляхавічы, Слуцк. Былая веліч замкаў у Навагрудку, Ружанах, Смалянах, Крэве, Гальшанах толькі ўгадваецца па вартых жалю іх рэштках. Апошнім часам робяцца спробы захаваць руіны старажытнага замка ў Лідзе. І толькі замкі ў Міры і Нясвіжы гаротны лёс нейкім цудам абмінуў: яны ўзяты пад апеку дзяржавы і ЮНЕСКА, і ёсць надзея, што імі змогуць любавацца і нашы нашчадкі.

Многія беларускія замкі (і тыя, што разбураны, і тыя, што ўцалелі) акружаны самымі неверагоднымі легендамі і паданнямі. Яно і не дзіўна: у любым замку павінны быць і таямнічыя гісторыі, і свае прывіды, і бясследна зніклыя скарбы.



Замак Радзівілаў у Нясвіжы. Літаграфія з малюнка 1876 г.

Замак Радзівілаў у Нясвіжы ў гэтым плане несумненны лідэр: тут і Паповая горка з загінуўшымі на ёй зацятымі ў веры пратэстантамі; і Чорная дама — прывід заўчасна загінуўшай Барбары Радзівіл, што нядоўгі час была польскай каралевай; і гісторыя аб трагічным каханні радзівілаўскіх прыгонных — балерыны Ганусі і мастака Язэпа; і неразгаданыя таямніцы нясвіжскіх саркафагаў, і шмат чаго іншага.

Але самай таямнічай гісторыяй, звязанай з замкам Радзівілаў у Нясвіжы, была і застаецца легенда (а можа, хто ведае, і чыстая праўда) аб калекцыі «Дванаццаць апосталаў», якая вось ужо амаль два стагоддзі хвалюе ўяўленне як летуценных краязнаўцаў, так і сур'ёзных гісторыкаў.

Пасля кашмарнай і крывавай пераправы цераз Бярэзіну паблізу Студзёнкі (а адбывалася ўсё гэта напрыканцы лістапада 1812 года) крах напалеонаўскага паходу ў Расію стаў неабвержным фактам. Страціўшы на берагах Бярэзіны каля 70 тысяч чалавек, ашаломлены Банапарт фактычна кінуў рэшткі сваёй арміі на волю лёсу. 4—5 снежня паблізу Маладзечна адбыўся, па сутнасці, апошні бой

французаў з рускімі войскамі, пасля чаго ўсякі больш-менш арганізаваны іх супраціў спыніўся, а Напалеон у карэце з вернай аховай накіраваўся ў Парыж.

Знясіленыя, галодныя і скачанелыя ад холаду напалеонаўскія ваякі кідалі зброю і бязладным натоўпам цягнуліся на захад, засцілаючы беларускія гасцінцы і тракты сотнямі трупаў. Гледзячы на жудасную карціну, цяжка было паверыць, што менш чым паўгода таму французы гэтымі ж шляхамі з трыумфам, хаця і з цяжкімі баямі, рухаліся на ўсход, на Маскву. У іх шэрагах бадзёра скакаў і князь Дамінік Геранім Радзівіл.

Як князь аказаўся пад сцягамі Напалеона? Аб гэтым коратка. Як вядома, у 1793 годзе нясвіжскія ўладанні Радзівілаў (разам з цэнтральнай часткай Беларусі) увайшлі ў склад Расійскай імперыі (у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай). На той час князь быў яшчэ хлапчуком, а ва ўзросце 18 гадоў (у 1804 годзе) прысягнуў новым уладам, якія афіцыйна прызналі яго ўладальнікам 120 тысяч душ мужчынскага полу ў Літве, Беларусі і на Украіне. Хутка малады Радзівіл нават стаў камергерам імператарскага двара, але ў 1811 годзе ў чыне падпалкоўніка ўзначаліў 8-ы уланскі полк Варшаўскага княства, падвасальнага Банапарту (верагодна, Радзівіл паверыў абяцанням Напалеона аб аднаўленні незалежнасці Польшчы).

Такім чынам, у 1812 годзе князь са сваім палком удзельнічаў у паходзе Банапарта на Маскву. Вядома, што ўланы Радзівіла вызначыліся ў баях пад Смаленскам, Мажайскам, Воранавам, у выніку чаго князь атрымаў чын палкоўніка Варшаўскага княства і гвардыі Напалеона.

Ваенная авантура Банапарта, як вядома, пацярпела крах, пра што ўжо згадвалася вышэй. І калі пабіты французскі імператар скіраваўся ў Парыж, то князь Дамінік яшчэ за месяц да ганебных уцёкаў з'явіўся ў сваім родавым замку. І гэта вядома дакладна. Як вядома і тое, што 26 кастрычніка 1812 года ў Нясвіж імкліва ўварваўся 14-ы егерскі полк пад кіраўніцтвам А. Красоўскага, а яшчэ праз чатыры дні (па некаторых звестках, 3 лістапада) у горад трыумфальна ўвайшлі войскі корпуса генерала Сяргея Аляксеевіча Тучкова з малдаўскага кор-

пуса адмірала Паўла Васілевіча Чычагова (яго, дарэчы, пазней абвінавацілі ў тым, што Напалеону ўдалося фарсіраваць Бярэзіну).

Вельмі верагодна, што менавіта Дамінік Радзівіл і Сяргей Тучкоў сталі галоўнымі дзеючымі асобамі загадкавых падзей, што адбыліся ў Нясвіжскім замку на мяжы восені і зімы 1812 года.

Пра незлічоныя багацці, назапашаныя родам Радзівілаў, хадзілі легенды, падчас больш падобныя на казкі, чым на праўду. Большасць з іх звязана з Нясвіжам. Уладаннем Радзівілаў горад стаў у 1533 годзе, калі яго ў якасці пасагу атрымаў за Ганнай Кішкай (Нясвіж на той час належаў яе бацьку) сын Мікалая Радзівіла Чорнага — Ян.

Да гэтага Нясвіж быў цэнтрам невялікага ўдзелу. Радзівілы ж зрабілі яго сталіцай сваіх велізарных уладанняў, што на некалькі стагоддзяў прадвызначыла лёс горада. Тут знаходзілася галоўная рэзідэнцыя Радзівілаў. Сюды з розных радзівілаўскіх маёнткаў перасяляліся многія сотні людзей. Па сведчанні сучаснікаў, толькі княжацкі двор налічваў некалькі тысяч самага рознага кшталту «абслугоўваючага персаналу». Ужо першы ўладальнік Нясвіжа, Ян, празваны Барадатым, пабудаваў тут крэпасць і абнёс горад валам. У ім было ўзведзена некалькі храмаў — касцёлаў і цэркваў.

Бацька Яна — Мікалай, па мянушцы Чорны, у 1547 годзе ўзвёў на старажытным гарадзішчы Нясвіжа драўляны замак. Стараннямі таго ж Чорнага тагачасны кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст надаў гораду розныя прывілеі, якія садзейнічалі яго хуткаму развіццю. А ў 1586 годзе Нясвіж атрымаў і магдэбургскае права.

Хаця і горад, і замак неаднаразова цярпелі ад розных ваенных катаклізмаў (у 1654 годзе большую частку Нясвіжа спалілі рускія войскі; у 1706 годзе яго разрабавалі шведы, а ў 1768 годзе — рускія), Радзівілы настойліва аднаўлялі разбуранае і разрабаванае, у выніку чаго горад станавіўся яшчэ больш прывабным і багатым.

Можна многа і доўга апісваць усе нясвіжскія багацці, але мы звернемся да сведчання, прыведзенага Адамам

Кіркорам у трэцім томе «Живописной России»: «У замку была асобая кладоўка, у якой захоўваліся каштоўнасці і рэліквіі роду Радзівілаў. Чытаючы інвентары і вопісы нагрувашчаных тут багаццяў, здаецца амаль неверагодным, якім чынам прыватныя асобы маглі столькі накапіць і захаваць на працягу цэлых стагоддзяў; але прыватныя асобы былі багацей многіх царуючых, і капілася ўсё гэта вякамі. У кладоўцы захоўвалася многа каштоўных камянёў, зліткі і розныя сасуды з золата і серабра, багатая зброя, булавы і жэзлы гетманаў і маршалаў Радзівілаў, парча, тканіна незвычайна каштоўная і цудоўнай работы, габелены, фарфор, хрусталь і тысячы другіх прадметаў. У замку змяшчаліся, акрамя карціннай галерэі, бібліятэка з пяцідзесяці з лішнім тысяч тамоў кніг, нумізматычны кабінет, кабінет рэліквій, многа вырабаў з слановай косці, зброя, панцыры, латы, кальчугі, кірасы роду Радзівілаў, Сабескага, Баторыя, валашскіх гаспадароў, розныя падарункі пап, рымскіх імператараў і другіх гасудараў, у тым ліку Пятра Вялікага, і шмат чаго іншага. Тут жа змяшчаўся архіў, у якім захоўваліся не толькі ўсе акты, граматы, прывілеі, якія да роду Радзівілаў адносіліся, а таксама карэспандэнцыя і многа пісьмаў розных царуючых асоб, але і большая частка дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага з часоў Ягайлы...»

Вядомы і такі факт: з 16 па 22 верасня 1784 года Нясвіж наведаў тагачасны (і, як потым акажацца, апошні) кароль польскі і вялікі князь літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Сустракаў яго тагачасны ўладальнік Нясвіжа Караль Станіслаў, вядомы як Пане Каханку. Радзівіл не любіў Панятоўскага, лічыў яго паходжанне ніжэйшым за сваё, бачыў у каралі выскачку. Нават сустрэў яго арыгінальна: у старадаўнім паліняльм кунтушы. Кароль заўважыў гэта і здзівіўся, на што Радзівіл адказаў: «Лёгка Вашай высокасці наражацца ва ўсё новенькае, калі Вы і самі новенькі; а я, каб уважыць Вас, апрануў самы стары кунтуш, які цэлыя стагоддзі служыў маім продкам!»

Так, кунтуш у Пане Каханку быў стары, але гасцей, якія ў тыя дні з'ехаліся ў Нясвіж, налічылі каля пяці тысяч чалавек. Сустракаў Панятоўскага асабісты полк Ра-

дзівіла колькасцю ў тры тысячы шабель. Шэсць дзён доўжыліся абеды, балі, тэатральныя прадстаўленні, агляды радзівілаўскіх войскаў, практыкаванні артылерыйскіх кадэтаў і маракоў на сажалках парку ў Альбе. Кароль аглядзеў замкавыя кабінеты, галерэі, рэліквіі і архіў.

Адам Кіркор, які азнаёміўся з выпіскай з афіцыйнага пратаколу, складзенага падчас каралеўскага візіту, апісаў сваё ўражанне так: «Чытаючы, здаецца бачыш перад сабою сцэны з «Тысячы і адной ночы...»

А што ж дванаццаць апосталаў, пра якія мы абмовіліся на пачатку аповяду? Як бачым, Адам Кіркор, апісваючы радзівілаўскія каштоўнасці, пра іх не згадвае. Можа, і не было іх на самай справе?

Не, сведчанні пра «апосталаў» ёсць... Праўда, іх няшмат. Так, у 1887 годзе ў Парыжы пабачылі свет мемуары Адама Ежы Чартарыйскага, які ў 1804—1806 гадах быў міністрам замежных спраў Расіі, бліжэйшым дарадцам імператара Аляксандра І. Яму ў свой час пашчасціла зазірнуць у скарбніцу Радзівілаў. Вось яго ўражанні ад убачанага: «Багаты замак у Нясвіжы. У 18 залах адных толькі ўпрыгожванняў сабрана на 5—10 мільёнаў дукатаў. Каштоўнейшая калекцыя зброі, карцін, кніг, брыльянтаў. Але няма нічога даражэй за калекцыю «Дванаццаць апосталаў». Пяць з іх з чыстага золата і ўсыпаны каштоўнымі камянямі. Кошт іх роўны кошту золата, выдаткаванага імператарам Напалеонам на Егіпецкі паход...»

Падчас апісанага вышэй візіту Панятоўскага ў Нясвіж у верасні 1784 года там пашчасціла пабываць і тагачаснаму камандуючаму рэзервовым корпусам Расіі ў Рэчы Паспалітай Мікалаю Васілевічу Рапніну. Ён таксама даў падобнае да ўражанняў Чартарыйскага апісанне статуі дванаццаці апосталаў.

У выдадзеных у 1868 годзе ў Варшаве ўспамінах Міхала Казіміра Агінскага таксама згадваюцца «апосталы» Радзівілаў: «Гэтыя статуі яны вазілі з сабою. Калі прагуляюць дзе ці хочуць прыдбаць новыя маёнткі, то закладваюць аднаго з 12-ці апосталаў, але заўсёды потым выкупляюць назад».

Спасылкі на калекцыю «Дванаццаць апосталаў» сустракаюцца таксама ў публікацыях паэта Уладзіслава Сыракомлі (1853 год) і этнографа Паўла Шпілеўскага (1855 год).

Беларускі гісторык Аляксей Ненадавец спасылаецца таксама на сведчанне аднаго з прыдворных Радзівілаў — нейкага Ляснеўскага: «Дванаццаць апосталаў і чатыры евангелісты велічынёй у два локці — гэта золата ў радзівілаўскай скарбніцы...»

Натуральна паўстае пытанне: што ж гэта за «дванаццаць апосталаў» і, калі яны існавалі на самай справе, то як і адкуль трапілі ў Нясвіжскі замак?

У адной з сваіх публікацый згаданы вышэй Аляксей Ненадавец спрабуе адказаць на гэта пытанне. Прааналізаваўшы некалькі версій, ён схіляецца да таго, што каштоўныя скульптуры «дванаццаці апосталаў» прывёз у Нясвіж з крыжовага паходу адзін з пачынальнікаў роду Радзівілаў.

Аб крыжовым паходзе крыху ніжэй, але, сапраўды, Мікалай Крыштоф Радзівіл, празваны Сіроткам, у 1567 годзе, перайшоўшы з кальвінізму ў каталіцтва, быў прыняты ў шэрагі мальтыйскіх рыцараў. Менавіта ён у 1583–1584 гадах зрабіў вялікае падарожжа на Блізкі Усход (Крыт, Кіпр, Сірыя, Ліван, Егіпет), якое падрабязна апісаў у выдадзеным у 1601 годзе дзённіку.

Якраз Сіротка і якраз пасля падарожжа на месцы драўлянага замка, пабудаванага яго бацькам, пачаў узводзіць замак ужо мураваны, пабудаваў езуіцкі, бернардзінскі і дамініканскі кляштары.

Сын Сіроткі, Сігізмунд-Карл, таксама быў рыцарам Мальтыйскага ордэна (прыняты туды ў Балоны). З дазволу гросмайстра ордэна ён стварыў у Сталовічах (сёння — вёска ў Баранавіцкім раёне) камандорства і, быццам бы, разам з крыжакамі здзяйсняў адтуль паходы ў Святую Зямлю. Хаця камандорства было хутка распушчана (па пратэсту Расіі), але крыжакі (зноў быццам бы) з аднаго з паходаў прывезлі з Канстанцінопаля ў Сталовічы тыя самыя дванаццаць статуй, што значна пазней атрымалі назву «залатых апосталаў».

Як сведчыць Аляксей Ненадавец, у 1759 годзе статуі былі нават асвечаны ў Ватыкане. Ён жа прыводзіць факт, што ў 1771 годзе Радзівілы запрасілі з Варшавы ў Нясвіж знакамітых майстроў для рэстаўрацыі палатна «Тайная

вячэра», якое знаходзілася ў алтары езуіцкага касцёла. Калі мастакам для працы спатрэбіліся мадэлі, ім, быццам бы, паказалі дванаццаць залатых апосталаў, якія, што асабліва ўразіла рэстаўратараў, былі поўнасцю ідэнтычныя персанажам і кампазіцыі знакамітай карціны легендарнага Леанарда да Вінчы.

І яшчэ адно «быццам бы». Усведамляючы унікальнасць і каштоўнасць «апосталаў» і ўлічваючы, што недзе на мяжы XVII–XVIII стагоддзяў банда рабаўнікоў спрабавала ўкрасці статуі, Радзівілы загадалі прыдворнаму майстру вылепіць з воску дванаццаць абсалютных копій «апосталаў» — парсун. Копіі ўпрыгожылі фальшывымі камянямі і выставілі ў Блакітнай зале Нясвіжскага замка. Сапраўдныя ж «апосталы» былі надзейна схаваны ў адным з патаемных сховішчаў.

А цяпер вернемся да таго моманту, калі ўдзельнік няўдалага напалеонаўскага паходу ў Расію князь Дамінік Геранім Радзівіл з'явіўся ў сваёй вотчыне.



Дамінік Геранім Радзівіл. Партрэт пачатку XIX ст.

Перш чым даведацца пра мэту гэтага візіту, нагадаем, што зусім яшчэ дзіцём (бо нарадзіўся ён у 1786 годзе) князь у 1790 годзе, пасля смерці свайго дзядзькі, ужо згаданага Караля Станіслава, Пане Каханку, стаў уладальнікам велізарнай латыфундыі (так званыя Нясвіжская і Алыцкая ардынацыі), у якую ўваходзілі дзесяткі гарадоў і вёсак. Малады Радзівіл, безумоўна, ведаў, якімі велізарнымі багаццямі ён валодае. Тым больш што незадоўга да драматычных падзей 1812 года па яго загаду была праведзена

рэвізія Нясвіжскай скарбніцы, якая доўжылася больш за чатыры месяцы, з 1 снежня 1808 па красавік 1809 года. Як сведчыць беларускі гісторык Сяргей Рыбчонак, што вывучаў дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, «рэвізоры пераглядзелі кожную рэч з дваццаці пакояў і старанна занатавалі ўсё, што лічылі патрэбным».

На думку многіх даследчыкаў, якраз з-за гэтых багаццяў малады князь (дарэчы, апошні прадстаўнік нясвіжскай, галоўнай галіны роду Радзівілаў) і з'явіўся ў Нясвіжы. Наўрад ці ён сумняваўся, што пераходу на бок Напалеона яму не даруюць і што вялізныя багацці, сабраныя яго нашчадкамі, расійскія ўлады канфіскуюць. Магчыма, Дамінік Геранім збіраўся, пакуль ёсць час і магчымасці, вывезці з Нясвіжа хаця б частку іх.

Дык што ж адбывалася ў Нясвіжскім замку напярэдадні 26 кастрычніка 1812 года, дня, калі ў горад увайшлі рускія войскі? На гэта пытанне спрабавалі адказаць многія даследчыкі: Аляксей Ненадавец і Сяргей Рыбчонак, на якіх мы ўжо спасылаліся, нясвіжскі краязнавец Клаўдзія Шышыгіна-Патоцкая, якая не так даўно памерла. З іх



Рускія казакі каля Нясвіжа ў 1812 г. Хромалітаграфія. 1912 г.

меркаванняў вынікае дзве версіі: першая — князь Дамінік Геранім, безумоўна, не змог вывезці свае скарбы на захад (не было ні часу, ні «транспартных» магчымасцей), але самае каштоўнае з сваіх багаццяў (у тым ліку і «дванаццаць апосталаў») ён схаваў ці то ў самім замку, ці то ў ваколіцах Нясвіжа; другая — нічога Радзівіл ні вывезці, ні схаваць не паспеў; скарбы Нясвіжскага замка трапілі ў рукі аднаго з расійскіх генералаў (аб іх размова наперадзе), які ці то вывез іх на ўсход, ці то нават прысабечыў.

Пачнём з другой версіі. Аляксей Ненадавец спасылаецца на сведчанне польскага даследчыка М. Кольмана, які ў сваёй кнізе «Гісторыя Беларусі» піша: «... войскі Аляксандра I ... з пачатку лістапада скіраваліся на Мінск і занялі Нясвіж, дзе разрабавалі скарбы радзіволаўскія і забралі ўсё каштоўнае аздабленне з сярэдзіны палаца. Усё тое вывезена на колькіх дзесятках вазоў, замак аддадзены на тры дні на разрабаванне салдатам».

Існуе меркаванне, што да радзіволаўскіх скарбаў прыклаў руку ўжо згаданы вышэй генерал Тучкоў. У першай кнізе 6-га тома «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» Андрэй Лукашэвіч у інфармацыі, прысвечанай Тучкову, прама сцвярджае: «Пасля заняцця 3.11.1812 Нясвіжа прыняў удзел у рабаўніцтве каштоўнасцей замка. У снежні 1812 на чале корпуса паўторна ўступіў у Нясвіж і прычыніў маёнтку Д. Радзівіла страты больш чым на 12 млн злотых».

Дакладна вядома, што за гэтыя дзеянні загадам фельдмаршала М.І. Кутузава Тучкова знялі з пасады і аддалі пад следства. Справа цягнулася з 1812 па 1826 год, але вынікаў не дала: генерала апраўдалі, як бы сёння сказалі, «за адсутнасцю складу злачынства», ці, хутчэй, «за адсутнасцю доказаў».

Тучкоў, дарэчы, быў не першым, хто «зацікавіўся» скарбамі Радзівілаў. Яшчэ перад ім у княжацкую скарбніцу «зазірнуў» уланскі палкоўнік Кнорынг. Чуткі аб «вольнасцях» падначаленых дайшлі да адмірала Чычагова. Ён быў вымушаны стварыць спецыяльную камісію, у задачу якой уваходзіў надзор за тым, каб рэквізіцыя праходзіла ў рамках закону. Па сведчанні даследчыцы Маі Яніцкай, якая

вывучала адпаведныя крыніцы, члены камісіі вынеслі з скарбніцы «калекцыю розных каштоўных каменняў, сабраную ў даўнія часы, брыльянты ў аправе і без аправы... шмат тытунёвак залатых і сярэбраных, упрыгожаных брыльянтамі...» Сярод рэквізаваных рэліквій аднаго сталовага серабра было на сто персон, акрамя таго — фарфор і фаянс, старадаўнія манеты, зброя, рыцарскія даспехі, кубкі, аздобленыя золатам і брыльянтамі, мячы і кінжалы (у тым ліку папскі меч Яна III і шмат чаго іншага).

Згодна з загадам Чычагова № 284 ад 9 студзеня 1813 года, нясвіжскія скарбы на трынаццаці брычках вывезлі спачатку ў Мінск, а пасля і далей — у Маскву, Пецярбург і нават Харкаў.

Дванаццаць апосталаў сярод рэквізаваных скарбаў не згадваюцца.

А цяпер звернемся да першай версіі, куды больш загадкавай і рамантычнай, але, на жаль, не пацверджанай дакументальна.

І тут варта згадаць асобу, якая, відаць, адыграла ў лёсе нясвіжскіх скарбаў не апошнюю ролю. У Клаўдзіі Шышыгінай-Патоцкай — гэта безымянны «ўпраўляючы» Радзівіла. Аляксей Ненадавец называе яго «эканомам Адамам» або «Адамам для асобных даручэнняў». У даследаванні Сяргея Рыбчонка гаворка ідзе пра «дазорцу замка Альберта Бургельскага», які ў публікацыі Маі Яніцкай выступае як «маршалак замка».

Дык вось, згодна з першай версіяй, менавіта гэтаму чалавеку князь Дамінік Геранім Радзівіл даручыў вывезці фамільныя каштоўнасці, якія, як адзначала Шышыгіна-Патоцкая, важылі 60 пудоў (без малога — тону), з Нясвіжа. Быццам бы якраз у гэтым абозе і знаходзіліся «дванаццаць апосталаў». Князь, рызыкуючы трапіць у рускі палон, выехаў з горада першым, а фурманкі з каштоўным грузам загадаў адправіць следам.

І тут пачынаецца разыходжанні ў трактоўцы ходу падзей. «Упраўляючы» Шышыгінай-Патоцкай паспеў толькі пагрузіць скарбы, але вывезці не паспеў, бо ў горад ужо ўварваліся рускія войскі, якія і захапілі большую частку абозу з каштоўнасцямі. Праўда, больш каштоўнае з скарбніцы

ён паспеў схаваць і адправіў ганца з гэтай весткай наўздагон князю. Ганца паблізу Міра схапілі і, не доўга думаючы, расстралялі, як шпіёна. Аўтара ж дэпешы затрымалі трохі пазней, дапытвалі, нават катавалі, але той не сказаў, дзе схаваў скарб, і быў павешаны на замкавай браме...

«Адама» Ненадаўца напаткаў фактычна такі ж лёс. З яго запіскі тыя, хто яе прачытаў, быццам бы, даведаліся, што той «...схаваў у надзейным месцы 12 каштоўных апосталаў, кухоннае серабро, карціны...». Зрабіў «Адам» менавіта так ці не, нам невядома. Эканом, як мог, цягнуў час, месца схованкі не называў, а пасля таго, як нехта з радзівілаўскай дворні заявіў, што гэта менавіта «Адам» забіў двух расійскіх егераў, палявы суд прыгаварыў яго да пакарання смерцю. Праўда, пазней суддзі зразумелі, што наконт «Адама» яны пагарачыліся: статуі апосталаў, як і другія, самыя каштоўныя рэліквіі Радзівілаў, зніклі. Атрымалася, што «Адам» забраў таямніцу іх захавання з сабой у магілу.

Згаданы Рыбчонкам і Яніцкай Альберт Бургельскі пасля драматычных нясвіжскіх падзей пражыў яшчэ трынаццаць гадоў. Але і яму, як кажуць, дасталося на арэхі. Дапытваў яго наконт лёсу скарбаў сам генерал Тучкоў. Спачатку Бургельскі маўчаў, але пасля таго, як на яго вачах усыпалі бізуноў і пабілі палкамі некалькіх радзівілавых двароввых, паказаў, дзе знаходзіцца схованка з каштоўнасцямі. Па загадзе Тучкова мураваны лёх узламалі, і генерал убачыў перад сабой такое, што аслупянеў: скарб сапраўды быў незлічоным. Спакушаны бляскам золата і брыльянтаў, Тучкоў хацеў было прысабечыць знойдзенае, але, быццам бы, не паспеў здзейсніць свой намер: на хціўага генерала данеслі яго начальніку Чычагову. Каштоўнасці пагрузілі на некалькі дзесяткаў брычак і па загаду Чычагова вывезлі. Куды? Аб тым мы ўжо расказвалі вышэй.

Пра тое, ці былі ў тым абозе «дванаццаць апосталаў», нам невядома.

Прозвішча Альберта Бургельскага ўсплыло на паверхню яшчэ раз — у 1822 годзе. Ці то хто данёс на былога дазорцу, ці то ўсё адбылося па-другому, але ўлады канфіскавалі ў яго куфар серабра (не выключана, што з радзі-

вілаўскіх каштоўнасцей). На Бургельскага ўпала падазрэнне, што ён прысабечыў з каштоўнага скарбу куды больш, чым куфар. Княжна Стэфанія Вітгенштэйн, спадчынніца Радзівілаў, пачала цягаць Бургельскага па судах, але толку не дабілася, і справа развалілася.

Ну а што ж «залатыя апосталы»? Яны, як вы ўжо напэўна здагадаліся, бясследна зніклі. З гэтай нагоды натуральна зноў паўстае пытанне: а можа, іх і не было?

У плане адказу на яго заслугоўвае ўвагі меркаванне ўжо згаданага намі Сяргея Рыбчонка. Вывучаючы дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, гісторык прыйшоў да наступнай высновы: «...так званыя апосталы не былі асобнымі скульптурамі, як меркавалі даследчыкі, а складаліся ў кампазіцыю на дзвярах, якія, у сваю чаргу, упрыгожвалі цыборыюм».

Выказваючы гэта меркаванне, Рыбчонак мае на ўвазе «Цыборыюм Святога Міхала», які ўваходзіў у калекцыю рэліквій Радзівілаў і быў запісаны ў спецыяльны рэестр, складзены Дамінікам Геранімам Радзівілам у 1808—1809 гадах (пра гэту падзею мы ўжо згадвалі вышэй). Цыборыюм, як адзначае гісторык, гэта той жа ківор — надбудова над алтаром храма ці сам алтар. З архіўнага дакумента, знойдзенага гісторыкам, вынікае, што на сярэбраных дзверцах да цыборыюма якраз і знаходзіліся пазалочаныя фігуркі Хрыста і некаторых апосталаў. Усіх фігурак было адзінаццаць.

На думку Рыбчонка, знаходзіліся апосталы ў нясвіжскім касцёле Святога Міхала або ў навіцыяце езуітаў пры ім. У 1736—1738 гадах Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька) фактычна адбудаваў і ўпрыгожыў гэты храм. Вось тады, як мяркуе Рыбчонак, і былі зроблены і цыборыюм, і фігуркі апосталаў.

Недзе ў перыяд з 1773 па 1786 год (пасля скасавання ордэна езуітаў) касцёл і кляштар пры ім былі знішчаны і там размясціўся шпіталь. Касцёльныя каштоўнасці (сярод іх і фігуркі апосталаў) папоўнілі скарбніцу Радзівілаў.

Той жа Рыбчонак лічыць, што да Канстанцінопаля апосталы дачынення не маюць, а зроблены яны былі ў 1720—1730 гады ў Нясвіжы мясцовымі майстрамі і мелі памер

у адзін — два локці (ад 60 да 120 сантыметраў), што ўскосна пацвярджаюць паэт Сыракомля і невядомы нам Ляснеўскі.

Чаму апосталаў не дванаццаць, а адзінаццаць? Магчыма, лічыць Рыбчонак, адна фігурка была пашкоджана і пераплаўлена на серабро.

Безумоўна, разважанні Сяргея Рыбчонка могуць расчараваць некага з рамантыкаў (а яны, безумоўна, лічаць, што «дванаццаць апосталаў», прывезеных адным з Радзівілаў з крыжовага паходу, існавалі на самай справе), але, згадзіцеся, меркаванне гісторыка мае пад сабой рэальны грунт.

Сяргей Рыбчонак выказаў сваё меркаванне наконт «апосталаў» у 1994 годзе. Але шукаць іх пачалі значна раней, і наўрад ці толькі рамантыка рухала шукальнікамі радзівілаўскіх скарбаў. Выкажам думку, што хутчэй за ўсё іх прыцягваў бляск золата і брыльянтаў.

Як вядома, пасля таго, як пабітыя французы пакінулі межы Беларусі, а князь Дамінік Геранім Радзівіл, прыняўшы ўдзел у бітвах пад Лютцэнам, Дрэздэнам і Лейпцыгам, 11 лістапада 1813 года ў баі пры Ганау атрымаў смяротную рану, Нясвіжскі замак перайшоў пад кіраванне Палацавага ведамства царскай сям'і. Менавіта яно, як адзначае Аляксей Ненадавец, прыслала ў Нясвіж атрад лейб-гвардзейцаў: ім было загадана знайсці «дванаццаць апосталаў» і даставіць іх у Пецярбург.

Лейб-гвардыя змарнавала нямала часу, але царскі загад так і не выканала.

Нейкі час замак належаў герою 1812 года генералу Пятру Хрысціянавічу Вітгенштэйну, але той, нават не наведаўшы Нясвіж, прадаў яго ваеннаму ведамству, якое размясціла ў ім кадэцкі корпус. Кадэты таксама спрабавалі шукаць апосталаў. Якраз яны правяралі версію, што скарб завалены двума выбухамі ў падземных сутарэннях паміж замкам і Міхайлавай гарой.

Кадэтам, як і лейб-гвардзейцам, таксама не пашчасціла.

У 1870-ыя гады пасля настойлівых просьбаў манаршых сямей Прусіі, Францыі, Швецыі і Бельгіі цар у рэшце рэшт вярнуў Нясвіжскі замак Радзівілам. У канцы XIX стагоддзя ўладальнікам Нясвіжскага замка стаў спадчыннік Ра-



Радзівілы з паляўнічымі трафеямі. Мінская губерня.
Фота пачатку XX ст.

дзівілаў па прускай галіне — Антоні Вільгельм. Па загаду князя тэрыторыю замка з прускай педантычнасцю перакапалі ўздоўж і ўпоперак: скарбаў, натуральна, не знайшлі.

Падчас Першай сусветнай вайны «скарбаразведвальнымі» работамі ў замку і яго ваколіцах старанна і досыць маштабна займаўся аўстра-венгерскі сапёрны батальён: вынік — нулявы.

Шукальнікі скарбаў з ведамства Альфрэда Розенберга падчас гітлераўскай акупацыі Беларусі таксама шчыравалі ў Нясвіжскім замку: «дванаццаць апосталаў» Радзівілаў таксама маячылі ў іх перад вачыма. Тое-сёе знайшлі (бо шукалі грунтоўна), але ўсё больш па дробязі. Скарб фашыстам так і не адкрыўся.

І зноў паўстае пытанне: а ці быў ён, радзівілаўскі скарб (натуральна, і легендарныя дванаццаць апосталаў) на самай справе?

Самую слушную, на наш погляд, думку выказвае не раз ужо згаданы намі Сяргей Рыбчонак. Па яго звестках, адмірал Чычагоў перадаў усе вывезеныя з Нясвіжскага замка каштоўнасці (а тое, што іх вывозілі, не выклікае сумненняў) імператару Аляксандру І. У Расіі ўсе вывезенае з Нясвіжа і захоўвалася да пачатку XX стагоддзя. У

1905 годзе ўдава князя Антоні Вільгельма Радзівіла княгіня Марыя Дарота дэ Кастэльяні афіцыйна звярнулася да імператара Мікалая II з просьбай вярнуць ёй фамільныя каштоўнасці. Рыбчонак спасылаецца на некаторыя крыніцы, з якіх вынікае, што нешта ўдаве вярнулі. Але што? Як адзначае гісторык, «сёння толькі адны Радзівілы ведаюць, што менавіта».

На нашу думку, калі што і вярнулі, то не так ужо і многа: вядомых усяму свету мільярдэраў сярод нашчадкаў Радзівілаў журналісты з «Forbes» пакуль не адзначаюць.

Таямніца калекцыі «Дванаццаць апосталаў» так і засталася таямніцай. Ці то яе забралі з сабой у магілу «эканом Адам», дазорца Бургельскі, генерал Тучкоў, князь Дамінік Геранім Радзівіл, ці то гісторыя пра апосталаў — проста прыгожая легенда Нясвіжскага замка...

## Крыніцы


*Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 3. — Мінск, 1996.*

*Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 13. — Мінск, 2001.*

*Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 16. — Мінск, 2003.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенова. Т. 3. — Минск, 1993.*

*Масляницына, И. Радзивиллы — несвижские короли /И. Масляницына, Н. Богодяж. — Минск, 1997*

*Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік / складальнік Г.А. Маслыка. —. Мінск, 1995.*

*Ненадавец, А. Скарбы Радзівілаў: хто іх знойдзе? /А. Ненадавец // Культура. 1993 г. 24 жніўня.*

*Ненадавец, А. Таямніца залатых апосталаў /А. Ненадавец // Культура, 1993 г. 22 сакавіка.*

*Рыбчонак, С. Дванаццаць апосталаў /С. Рыбчонак // Вяртанне. — 3: Зб. арт. і дак. — Мінск, 1996.*

*Сыракомля, У. Вандроўкі па маіх былых ваколіцах /У. Сыракомля. — Мінск, 1992.*

*Шпилевский, П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю /П.М. Шпилевский. — Минск, 1992.*

*Шышыгіна-Патоцкая, К.Я. Скарбы Нясвіжа /К.Я. Шышыгіна-Патоцкая. — Мінск, 1993.*

*Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — У 6 т. Т. 6. — Мінск, 2001.*

*Яніцкая, М. Драматычныя лёсы каштоўнасцей Нясвіжскага замка / М. Яніцкая // Вяртанне. — 2: Зб. арт. і дак. — Мінск, 1994.*

# «ЗОЛАТА НАПАЛЕОНА»

22 ліпеня 1812 года Францыя аб'явіла вайну Расіі, а яшчэ праз два дні (24 ліпеня), на досвітку, па трох пантонных мастах, перакінутых цераз Нёман у ваколіцах Коўна (цяпер літоўскі Каўнас), з прускага боку на правы бераг ракі пераправілася дывізія генерала Марана. Следам за ёй рухаліся дывізіі корпуса маршала Даву, кавалерысты Мюрата і імператарская гвардыя. Амаль адначасова з тэрыторыі Варшаўскага герцагства на толькі што далучаныя да Расійскай імперыі беларускія землі ўступілі палякі пад началам князя Юзафа Панятоўскага, саксонцы пад кіраўніцтвам графа Рэнье і аўстрыйцы, якіх вёў князь Шварцэнберг (нездарма 600-тысячнае войска Банапарта называлі «арміяй народаў», або «вялікай арміяй»).

Так пачаўся легендарны і драматычны паход імператара Францыі Напалеона Банапарта ў Расію...

Вось як апісвае гэту лёсавызначальную для напалеонаўскай Францыі падзею, якая да 1810 года ўжо скарыла амаль усе еўрапейскія дзяржавы, вядомы расійскі гісто-



Пераправа французаў цераз Нёман.
Літаграфія А. Адама. 1830-ыя гг.

рык Альберт Манфрэд: «Уварванне ажыццяўлялася ў найвялікшым парадку. Дывізіі бясконцым патокам рухаліся адна за другой, з разгорнутымі баявымі сцягамі, самкнутымі радамі. Камандзіры ў касках, упрыгожаных султанамі, на гладкіх, сытых конях наперадзе, затым салдаты мерным крокам, нідзе не парушаючы строю. Конныя грэнадзёры гвардыі ў белых плашчах, з высокімі ківерамі на галовах, на вялікіх конях варанай масці маўкліва рухаліся па мастах цераз раку. Увесь дзень і ноч і зноў дзень над Нёманам стаяў роўны дробны гул тысяч салдацкіх ног і конскіх капытоў. Армія была такой вялікай, што пераправа працягвалася больш за двое сутак. Апошнімі, ужо 26 чэрвеня, цераз Нёман прайшлі драгуны і кірасіры дывізіі Грушы. Затым яшчэ на працягу тыдня палкі, што прыйшлі здалёк, даганялі «вялікую армію».

«Расійскай авантуры» Напалеона, яго няўдаламу «паходу на Маскву», наогул, вайне 1812 года, якая па праву атрымала назву «Айчыннай» (натуральна, для Расіі), прысвечана безліч ваенна-гістарычнай, мемуарнай, мастацкай літаратуры. Таму мы не будзем расказваць пра ваенны бок эпахальнай падзеі. Але скажам толькі, што значная, калі не большая частка падзей Айчыннай вайны 1812 года адбылася на беларускай зямлі, на абшарах паміж Дняпром і Заходнім Бугам, Паўночнай Дзвіной і Прыпяццю. Відавочна, што імператар Францыі падрыхтаваўся да паходу ў Расію няблага: нягледзячы на супраціў рускіх войск, упартыя баі пад Мірам, Кобрынам, Астроўна, Полацкам, Гарадзечна, Чашнікамі, Бабруйскам, Смаленскам, грандыёзную Барадзінскую бітву, ужо 14 верасня французы ўступілі ў Маскву, якая была пакінута без бою. Усяго 83 дні спатрэбілася Напалеону, каб пераадолець больш за тысячу кіламетраў і без супраціву заняць старажытную сталіцу Рускай дзяржавы. Адзначым, што амаль праз 130 гадоў яшчэ аднаму сквапнаму заваёўніку — Адольфу Гітлеру спатрэбілася пяць месяцаў для таго, каб пераадолець такі ж па працягласці шлях, але ўзяць Маскву германскаму фюрэру так і не ўдалося.

Шматвяковая практыка заваёўных паходаў сведчыць, што з падзеннем сталіцы «аб'екта агрэсіі» (а Масква лічылася «другой сталіцай» Расіі; тым больш, што Санкт-Пе-



Напалеон пры пераходзе праз Сен-Бернар.
Мастак Ж.Л. Давід. 1800 г.

цярбург набыў «сталічны статус» усяго за 100 гадоў да апісваемых намі падзей) вайна, як правіла, заканчваецца паражэннем, або, у лепшым выпадку, падпісаннем зневажальнага для пераможанага боку міру. У нашым выпадку гэтага не адбылося. Больш таго, падзенне Масквы стала першым крокам да падзення самой напалеонаўскай Францыі. Нездарма ўсяго праз некалькі гадоў пасля свайго драматычнага паражэння, падчас ссылкі на востраў

Святой Алены, былы імператар напіша ў сваім дзённіку: «Я павінен быў бы памерці адразу ж пасля ўступлення ў Маскву...»

Усяго 34 дні прабылі французы ў Маскве. Доўгачаканага адпачынку тут заваёўнікі не атрымалі, запасаў правіянту і фуражу не папоўнілі. За месяц Масква была дашчэнту спалена. З «вялікай арміі» французскае войска хутка пачало ператварацца ў дрэнна кіруемую банду марадзёраў, рабаўнікоў і гвалтаўнікоў. Сведкам гэтай метамарфозы стаў ваенны інтэндант капітан Анры Бейль, у будучым — знакаміты французскі пісьменнік Стэндаль, удзельнік паходу Напалеона ў Расію. У пісьмах Стэндаля з Масквы пераважаюць дзве тэмы — рабаўніцтва і п'янства заваёўнікаў.

Безумоўна, Напалеон бачыў разлажэнне сваёй некалі дысцыплінаванай арміі і хутка зразумеў: яшчэ некалькі дзён — і ён страціць усялякі кантроль над ёй. Таму 19 кастрычніка армія пакінула спаленую Маскву. Наперадзе ляжаў шлях дадому. Як і любая армія ў паходзе, войска Напалеона было абцяжарана шматлікімі абозамі з ваенным рыштункам. Сярод іх былі і два транспарты, якія даследчыкі паходу Банапарта ў Расію амаль адразу назавуць «крамлёўскімі скарбамі Напалеона I», або «золатам Напалеона».

Пра тое, што (па розных ацэнках) французы вывезлі з разрабаванай Масквы, — крыху пазней. А першым паўстае натуральнае пытанне: няўжо ваярам Напалеона было што вывозіць з горада? Чаму масквічы не паспелі вывезці каштоўнасці напярэдадні ўварвання Банапарта ў Маскву?

Сітуацыя і сапраўды дзіўная, але ёсць сведчанні, што ўсяго за некалькі дзён да ўварвання ў горад французаў жыхары нават не дапускалі такой мажлівасці. Як адзначае той жа А. Манфрэд, у «Московских ведомостях» напярэдадні ўступлення Напалеона ў Маскву была змешчана абвестка, што 11 верасня «...імператарскімі расійскімі акцёрамі прадстаўляцца будзе «Наталля, баярская дачка», драма ў 4 дзеях, сачыненне п. Глінкі... Пасля спектакля ў гэтым тэатры даны будзе маскерад».

Чаму ж масквічы, як кажуць, «спалі ў шапку» ўсяго за якіх-небудзь тры дні да прыходу Банапарта ў горад? Вельмі

верагодна, што гараджане спадзяваліся на той самы праславуты рускі «авось»: большасць з іх свята верыла ў тое, што горад не будуць здаваць ні ў якім разе. Не на вышыні аказаўся і маскоўскі генерал-губернатар Фёдар Растапчын: граф не прымаў ніякіх захадаў да арганізацыі эвакуацыі, бо небеспадстаўна баяўся ўзнікнення панікі. А яе прыкметы пачалі праяўляцца ўжо пасля 18 жніўня, калі французы ўзялі Смаленск. Самыя дальнабачныя гараджане ўжо тады пачалі пакідаць горад. Гарадская бедната стала наракаць і, па чутках, рыхтавалася ўдарыць у набат, каб па гэтаму сігналу «рэзаць дваран».

Калі ж стала зразумелым, што Масква ўсё ж такі будзе «французу отдана», Растапчын падпісаў загад аб эвакуацыіі. Але было ўжо позна — самі насельнікі Масквы горад пакінуць паспявалі, а вось хатні скарб ды і дзяржаўныя і царкоўныя каштоўнасці вывозіць было проста не на чым: не было коней, якіх можна было б запрэгчы ў падводы. Нават каштоўнасці Дзяржаўнага казначэйства вывезлі з горада ўсяго толькі за дзень да прыходу французаў. А вось начынне маскоўскіх храмаў (а іх у горадзе было безліч — як пісалі, «сорак саракоў») у большасці засталося на месцы, таму і стала галоўным «аб'ектам» французскіх рабаўнікоў.

Дарэчы, Маскву французы рабавалі не толькі таму, што былі яны, як кажуць, «марадзёрамі па натуры». Справа ў тым, што афіцыйна горад Напалеону не здавалі, і таму Масква амаль на законных падставах лічылася «ваенным трафеем».

Што ж канкрэтна французы вывезлі з Масквы? Меркаванняў на гэты конт досыць многа, і памеры нарабаваных каштоўнасцей гучаць самыя розныя.

Некаторыя даследчыкі лічаць, што з горада было вывезена 5 тон серабра і амаль 300 кілаграмаў золата ў злітках (французскія сапёры пераплавілі ў іх груваcткія ўпрыгажэнні крамлёўскіх храмаў). Ёсць сведчанні, што абоз з нарабаванымі каштоўнасцямі налічваў 25 падвод, а самыя унікальныя з іх месціліся на двух падводах, якія знаходзіліся пад узмоцненай аховай.

Другое сведчанне — блізкае да першага. Згодна з ім, «маскоўскія трафеі» Напалеона склалі 18 пудоў золата

(тыя ж самыя «амаль 300 кілаграмаў») і 325 пудоў серабра (5200 кілаграмаў). Гаварылі таксама пра багатае царкоўнае начынне, старажытную зброю, каштоўнае каменне. Наўрад ці гэтыя лічбы далёкія ад сапраўднасці, бо добра вядома, што толькі з Архангельскага сабора было ўкрадзена больш за 120 пудоў серабра і каля 3 пудоў золата.

Фактам з'яўляецца тое, што 19 кастрычніка напалеонаўскія войскі (разам з абозам, на якім везлі «трафеі») пакінулі Маскву. Гэткім жа фактам з'яўляецца і тое, што літаральна нічога з «каштоўных набыткаў» у Францыю не трапіла. Па сведчанні напалеонаўскага маршала Берцье, толькі некалькі падвод з казной дабраліся да Коўна. Астатняе бясследна знікла па дарозе. Большасць з даследчыкаў, якія займаліся і займаюцца таямніцай «напалеонаўскага скарбу», лічыць, што ён застаўся на беларускай зямлі. Самай жа папулярнай версіяй з'яўляецца затапленне скарбу на дне аднаго з беларусскіх азёр або пад хвалямі той ці іншай беларускай ракі.

Як вядома, шлях адступлення напалеонаўскай арміі пралягаў праз Оршу, Коханава, Талачын, Бобр, Барысаў, Зембін, Плешчаніцы, Маладзечна, Смаргонь (далей — на Вільню, Коўна, Варшаву).

І азёр, і рэк уздоўж гэтага маршрута — безліч. Утапіць нарабаванае Напалеон мог бы ў любым (ці любой) з іх. Народных паданняў пра тое, што «напалеонаўскае золата» ляжыць на дне канкрэтнага возера ці вось у гэтай рацэ, існуе нямала (гавораць пра азёры Баброўскае, Лясное, Арэхаўскае, Святое). Мы ўзгадаем толькі некаторыя з іх.

Дзеля справядлівасці заўважым, што той-сёй з даследчыкаў лічыць, што «напалеонаўскія трафеі» да Беларусі не даехалі і схаваны на Смаленшчыне. Часцей за ўсё называецца Семлеўскае возера ў ваколіцах Вязьмы, непадалёк ад знакамітай старой Смаленскай дарогі.

Штуршком для пошукаў скарба менавіта тут стала 14-томнае даследаванне англійскага пісьменніка Вальтэра Скота «Жыццё Напалеона Банапарта, імператара французскага», якое пабачыла свет у 1835 годзе ў Санкт-Пецярбургу. У ім Скот спасылаўся на сведчанне ад'ютанта імператара — графа дэ Сегюра, які сцвярджаў, што Напалеон «зага-

даў, каб маскоўская здабыча, старажытныя даспехі, гарматы і вялікі крыж з Івана Вялікага былі кінуты ў Семлеўскае возера як трафеі, якія яму не хацелася аддаваць назад і якія ён не меў магчымасці везці з сабою».

Возера не раз абшуквалі, як кажуць, уздоўж і ўпоперак. Чарговы ўсплеск «залатой ліхаманкі» вакол вадаёма зафіксаваны ў 1960-ыя гады, калі спецыялісты з Усесаюзнага НДІ гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі ўстанавілі, што вада Семлеўскага возера мае павышанае ўтрыманне медзі, цынку і, што галоўнае, серабра (але не золата). Аднак пошукі скарбу поспеху не мелі. Да таго ж скептыкі справядліва заўважылі, што, мінаючы Вязьму, Напалеон яшчэ быў упэўнены: з Расіі яму ўдасца выбрацца «па-добраму», таму тапіць скарб у Семлеўскім возеры імператару не мела сэнсу.

Але легенда пра скарб у Семлеўскім возеры жыве. Больш таго, пошукі на яго дне раз-пораз працягваюцца. Падчас адной з зімовых экспедыцый было зроблена чарговае «адкрыццё»: каля берага, пад тоўстым слоем торфу шукальнікі знайшлі старадаўні насціл з бярвенняў, які без доступу паветра досыць няблага захаваўся. Адразу ж узнікла версія: насціл зроблены ў 1812 годзе французамі, для таго, каб па гразкім беразе падвезці цяжкія падводы, нагружаныя каштоўнасцямі, да вады...

Наступны пункт нашага падарожжа ўслед за Напалеонам — Орша, якая стаіць на Дняпры, куды французы ўступілі 20 лістапада, страціўшы перад гэтым каля 25 000 чалавек у баях каля Краснага. Менавіта тут, у Оршы, Банапарту стала ясна, што да Парыжа ён можа і не дабрацца, тым больш — даставіць туды нарабаванае.

Усяго два дні «гасціў» Напалеон у Оршы. Тут яму прынеслі вестку, што да горада набліжаюцца казакі атамана Мацвея Платава. Гэта вымусіла імператара даць загад на адступленне. Ёсць сведчанні і пра другі дакумент, у якім Напалеон загадаў утапіць у Дняпры «маскоўскія трафеі», у тым ліку знакамітае сярэбранае панікадзіла вагой у 112 пудоў, вывезенае французамі з Успенскага сабора Крамля. У паніцы французы спалілі і 60 пантонаў, пра адсутнасць якіх потым вельмі шкадавалі падчас перапра-

вы цераз Бярэзіну. Па некаторых сведчаннях, дняпроўскія хвалі схавалі на дне ракі шыкоўныя падсвечнікі, дарагі царкоўны посуд, сярэбраныя і залатыя апраўы абразоў, старадаўніх кніг, упрыгожаных каштоўнымі каменнямі, вырабы з каляровага шкла, гарматы і іншую зброю. Пра Оршу, як месца патаплення каштоўнасцей, пісаў і ад'ютант М.І. Кутузава Аляксандр Міхайлоўскі-Данілеўскі: «Мноства скарбу, які абцяжарваў армію, загадана знішчыць... або ўтапіць у Дняпры так званыя трафеі, вывезеныя з Масквы».

У Оршы адбылася яшчэ адна знакавая падзея, з нагоды якой да гэтай пары больш за ўсіх бядуюць гісторыкі. «Пры адступленні напалеонаўскай арміі, якое ўжо каля Смаленска прыняло катастрафічны характар, — піша А. Манфрэд, — у Оршы 20–21 лістапада 1812 года па распараджэнню Дару (граф, статс-сакратар Напалеона. — С.А.) з-за адсутнасці коней і падвод увесь архіў напалеонаўскай арміі, які да той пары дбайна зберагаўся, быў спалены».

Не выключана, што сярод дакументаў архіва, спаленага па загаду Напалеона гофмаршалам Дзюрокам, быў і дакладны рэестр нарабаваных французамі каштоўнасцей...

У Талачыне, куды Напалеон з'явіўся 22 лістапада, імператар даведаўся, што армія на чале з адміралам Паўлам Чычаговым, апярэдзіўшы французаў, выйшла да Бярэзіны ў ваколіцах Барысава і захапіла мост цераз раку. Даведаўся імператар і пра тое, што лёд на рацэ яшчэ зусім слабы і выключае магчымасць пераправы па ім. Ёсць сведчанні, што на нарадзе з маркізам Каленкурам, якая адбылася ў Талачыне, Банапарт аддаў загад спаліць рэшткі архіва, эмблемы карпусоў і яшчэ адну частку падвод з нарабаваным дабром. У канцы нарады імператар быццам бы сказаў: «Я лепш буду да канца кампаніі есці рукамі, чым пакіну рускім хоць адзін відэлец з маёй манаграмай!»

Некаторыя лічаць, што загад Напалеона быў выкананы ў ваколіцах мястэчка Бобр, а месцам затаплення каштоўнасцей з'яўляецца невялічкае возера, якое мясцовыя жыхары сёння называюць Стаячым...

Так, вакол непрыметнага вадаёма сапраўды ходзяць легенды падобнага кшталту. Ён не раз станавіўся аб'ектам для шукальнікаў скарбаў. Якраз яны і высветлілі, што ў возеры — двайное дно: ад паверхні вады ідзе двухметровы слой густых водарасцей, пасля — слой мутнай вады аж у дзевяць метраў і, нарэшце, дно з пяску і глею.

Расказваюць, што на возеры падчас пошуку скарбу трагічна загінуў дваццацігадовы студэнт з Масквы, які з дапамогай акваланга пераадолеў слой водарасцей, але калі праз 20 хвілін стаў узнімацца на паверхню, у гэтых жа водарасцях і заблытаўся.

Кажуць, што падчас вайны на напалеонаўскі скарб пакваціліся фашысты, якія спрабавалі з дапамогай магутных помпаў адпампаваць з возера ваду. Але вады ў возеры не паменела...

Ходзяць чуткі і пра тое, што працэнт серабра і медзі ў вадзе возера Стаячае аж у сто разоў перавышае норму.

Але найбольш верагодным месцам затаплення нарабаваных французамі скарбаў лічыцца рака Бярэзіна паблізу ад вёскі Студзёнка (ваколіцы Барысава). Менавіта тут армія Напалеона была абкружана рускімі войскамі,



Пераправа цераз Бярэзіну. Лістапад 1812 г.
Аўталітаграфія сярэдзіны XIX ст.

але французы ў неймаверна цяжкім, амаль бязвыхадным становішчы ўсё ж змаглі ажыццявіць пераправу, страціўшы пры гэтым 70 000 чалавек.

Французы здолелі навесці цераз раку ўсяго дзве пераправы (памятаеце 60 пантонаў, неразважліва спаленых імі ў Оршы?), але іх, натуральна, было мала. Напалеону зноў прыйшлося аддаваць загад: паліць афіцэрскія і генеральскія экіпажы, падводы з трафеямі. На правы бераг, да вёскі Брылі, пераправілі толькі асабісты абоз Банапарта, у якім было 715 запражных і верхавых коней.

А куды ж падзеліся «золата і серабро»? У спісе адбітых у французаў трафеяў згадваліся каштоўнасці з чыстага серабра вагой усяго ў 12 пудоў 37 фунтаў.

Па чутках, многае з нарабаванага французы ў паніцы закапалі ў лясах вакол Студзёнкі, тое-сёе ўтапілі ў Бярэзіне. Але пошукі скарбаў, якія, дарэчы, пачаліся ўжо ў 1813 годзе і цягнуцца з пераменлівай настойлівасцю да гэтай пары, пакуль не далі аніякіх вынікаў.

На нашу думку, у той крывавай калатнечы, якая віравала на Бярэзіне з 25 па 29 лістапада 1812 года, наўрад ці можна было ўсур'ёз займацца хаваннем скарбаў. На невялікім плацдарме паблізу Студзёнкі былі сканцэнтраваны многія дзесяткі тысяч французаў, навакольныя лясы літаральна кішэлі імі. У такой экстрэмальнай сітуацыі наўрад ці можна было нешта надзейна схаваць ці ўтапіць. Проста кінуць пад першы куст або боўтнуць у першую затоку — так. Але ж пасля ніхто і нічога тут так і не знайшоў.

Як вядома, пасля пераправы цераз Бярэзіну рэшткі напалеонаўскай арміі адступалі ў напрамку Зембіна і Плешчаніц і 3 снежня прыбылі ў Маладзечна. З гэтымі мясцінамі звязана яшчэ адно паданне пра скарб Банапарта. У ваколіцах Плешчаніц ёсць вёска Селішча. Рухаючыся з Барысава ў Маладзечна, якраз у Селішчы Напалеон, быццам бы, спыняўся на начлег. Па чутках, імператар на той момант быў літаральна ў шоку: стаялі лютыя маразы, шлях адступлення быў услань трупамі замерзлых французаў — гэта было ўжо панічнае бегства некалі агромністага і баяздольнага войска. Мяркуюць, што ў



Мемарыяльны знак, устаноўлены ў памяць французскіх воінаў, якія загінулі 26–29 лістапада 1812 г. падчас пераправы цераз Бярэзіну

Селішчы Напалеон аддаў загад закапаць цяжкія бочкі з нарабаваным золатам (магчыма, гэта быў каштоўны груз з асабістага абозу імператара, пра які мы згадвалі вышэй), таму што везці іх далей не было на чым. На месцы закапанага скарбу французы, быццам бы, пакінулі прыметны арыенцір — вялізны камень. Гадоў праз трыццаць пасля таго мясцовыя сяляне звалаклі гэты валун і ўладкавалі яго ў фундамент панскай сядзібы.

Расказваюць, што праз многа гадоў у ваколіцы Селішча наведваліся нашчадкі тых салдат, якія хавалі скарб, але месца тое так і не знайшлі.

У свой час масла ў агонь падлілі студэнты Белдзяржуніверсітэта, якія паблізу Зембіна падчас уборкі бульбы адшукалі рэшткі французскага салдата, у кашальку якога ляжалі шэсць залатых рускіх манет, адчаканеных на мяжы XVIII і XIX стагоддзяў. Той-сёй з даследчыкаў палічыў гэты выпадак пацвярджэннем існуючай версіі пра тое, што Напалеон, пакідаючы Маскву, раздаў золата салдатам. Пасля вяртання ў Францыю яны, быццам бы, павінны былі вярнуць яго ў дзяржаўную казну.

І нарэшце, яшчэ адна кропка на карце Беларусі, з якой звязана легенда пра «золата Напалеона».

Як вядома, 5 снежня Банапарт дабраўся да Смаргоні. Тут ён перадаў камандаванне рэшткамі «вялікай арміі» маршалу Мюрату, а сам 6 снежня пакінуў свае войска, узяўшы курс на Вільню, Коўна, а потым — на Варшаву.

І тут, на наш погляд, ёсць неабходнасць узгадаць адзін факт: як лічаць некаторыя даследчыкі, суправаджалі абоз з «золатам Напалеона» падначаленыя князя Юзафа Панятоўскага — афіцэры і салдаты так званага Надвіслянскага (ці Вісленскага) легіёна — ураджэнцы Рэчы Паспалітай. І калі Напалеон з Смаргоні скіраваў на Вільню, то ваяры Панятоўскага (калі верыць схеме з 3-га тома «Беларускай энцыклапедыі») узялі курс у бок Сувалак, скіраваўшы на радзіму, у Польшчу. Не выключана, што іх маршрут пралёг і праз мястэчка Парэчча (сёння — вёска ў Гродзенскім раёне). Якраз у яго ваколіцах, паблізу літоўскай мяжы, і знаходзіцца невялікае лясное возера пад назвай Чортава.

Больш за дваццаць гадоў таму аўтару гэтага нарыса часта даводзілася бываць на яго берагах падчас ваеннай службы ў недалёкай ад Парэчча Гожы. Ад мясцовых жыхароў не раз даводзілася чуць, што маляўнічае возера — фактычна мёртвае: у яго водах не водзіцца рыба, на берагах не гняздуюць птушкі. Чаму? Па тым часе нейкай канкрэтнай версіі на гэты конт я не пачуў, акрамя той, што ў возеры, быццам бы, некалі затанула вёска.

Многа пазней даведаўся, што тутэйшы краязнавец Іван Гаўрыцкі выказаў версію, згодна з якой менавіта на дне Чортава возера і знаходзяцца тыя самыя «напалеонаўскія скарбы». Якраз золата і серабро, што многія дзесяцігоддзі ляжаць на дне возера, і загубілі ў ім усё жывое. Версія гэта, быццам бы, ускосна пацвярджаецца ўспамінамі героя Айчыннай вайны 1812 года Дзяніса Давыдава.

Вось такі яшчэ адзін след «золата Напалеона»: магчыма, яго ўтапілі ў Чортавым возеры ваяры Юзафа Панятоўскага...

Многія гісторыкі, якія даследуюць часы паходу Напалеона ў Расію, упэўнены, што французскія трафеі на самай справе схаваны ў беларускай зямлі (ці, калі заўгодна, вадзе). Але ёсць і такія, што лічаць само існаванне абозу з маскоўскімі трафеямі Банапарта міфам. Дык дзе ж праўда?

Прыхільнікаў існавання «золата Напалеона», безумоўна, усцешыць публікацыя Ганны Крукавай, у якой яна спасылаецца на дакумент, копію якога нехта барон дэ Сен-Дзідзье накіраваў перад зыходам французаў з Масквы ваеннаму міністру Банапарта). Назва дакумента — «Трафеі Крамля. Стан прадметаў, адпраўленых у Францыю ў якасці трафеяў у выкананне ўказаў Яго Імператарскай Вялікасці і Караля». Пасада ў згаданага вышэй барона была не абы-якая: ён падпісаўся як «упаўнаважаны на пошук каштоўных прадметаў, якія захоўваюцца ў саборах Крамля». Пералік «прадметаў» быў досыць красамоўны: каштоўнае каменне, перліны, маленькія кароны з брыльянтамі, злiткі золата і серабра, каўчэг з мошчамі Святога Андрэя, царкоўнае начынне з Архангельскага і Успенскага сабораў Крамля, унікальны абраз Святой Дзевы. Са спіса вынікала, што, напрыклад, са Збройнай палаты рабаўнікі вывезлі старажытныя даспехі рускіх цароў, сцягі, штандарты. Калі верыць барону дэ Сен-Дзідзье, усё дабро было запакавана ў пяць скрыняў, якія загрузілі ў дзве падводы.

Так што абоз з «золатам Напалеона» з Масквы, відаць, выехаў. А вось куды ён падзеўся?

Беларускі гісторык Ігар Груцо, які доўга і дбайна даследуе часы Айчыннай вайны 1812 года, лічыць, што напа-

леонаўскія трафеі знаходзяцца ў Беларусі ўжо па той прычыне, што ў Францыю яны так і не трапілі.

Другі даследчык — Алег Іоў — таксама не выключае таго, што тое-сёе з нарабаванага французамі сапраўды схавана ў нашай зямлі, але наўрад ці скарбы сканцэнтраваны ў якім-небудзь адным ці нават некалькіх месцах. Хутчэй за ўсё, «золата Напалеона» схавана рабаўнікамі ўздоўж усяго тысячакіламетровага маршруту, які пралягаў ад Оршы да Смаргоні і Гродна праз Талачын, Бобр, Барысаў, Плешчаніцы, Маладзечна і дзесяткі другіх, куды менш значных населеных пунктаў Беларусі. А ўжо чагочага, а азёр і рэк на гэтай бясслаўнай дарозе Банапарта было больш чым дастаткова. І дзе французы тапілі ў вадзе ці закопвалі ў зямлі свае няправедныя набыткі, як кажуць, вядома аднаму Богу. Больш-менш значных скарбаў з «напалеонаўскай серыі» ў Беларусі пакуль што не знойдзена, хаця пошукі іх працягваюцца ўжо без малога 200 гадоў.

Пошук каштоўнасцей пачаўся яшчэ ў 1813 годзе, калі па загаду расійскага імператара Аляксандра I у Бярэзіне паспрабавалі знайсці быццам бы патопленую ў рацэ французскую ваенную казну.

Цікавы дакумент захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. Справа называецца «Аб пошуку грошай, закапаных французамі». З дакумента вынікае, што 18 ліпеня 1851 года нейкі «дваранін Адам Шчалкоўскі данёс п. Віленскаму, ваеннаму губернатару, што яму вядомы некаторыя месцы ў Заходніх губернях, дзе французскія войскі, якія рэціраваліся ў 1812 годзе, закапалі ў зямлю скрыні з грашыма»... Цікава, што прадпрымальнаму шляхціцу паверылі: імператар Мікалай I дазволіў Шчалкоўскаму пошукі скарба і нават выдзеліў яму ў дапамогу спецыяльнага чыноўніка з Вільні.

Захоўваецца ў справе і ўказанне магілёўскага віцэ-губернатара паліцэйскім уладам аказваць Шчалкоўскаму «ўсемагчымае садзейнічанне... і пра тое, што будзе адкапана, адразу ж данесці».

Кім быў Адам Шчалкоўскі: звычайным авантурыстам ці шчырым патрыётам, які дбаў пра інтарэсы дзяржавы?

На жаль, гэта нам невядома. А вось тое, што ўжо 2 жніўня (усяго праз два тыдні пасля пачатку «экспедыцыі») пошукі скарбаў былі спынены з-за поўнай адсутнасці якіх бы то ні было вынікаў, мы можам даведацца са згаданай вышэй справы.

З тае пары, як мы ўжо адзначалі, прайшло амаль два стагоддзі. Напалеонаўскі архіў, як мы ведаем, згарэў у Оршы. Шукальнікі «золата Напалеона» настойліва і пакуль што безвынікова баламуцяць ваду ў беларускіх азёрах і рэках. Легенды і паданні пра незлічоныя скарбы Банапарта па-ранейшаму бударажаць уяўленне летуценнікаў. Што будзе далей? Гэтага не ведае ніхто. Магчыма, таямніца «золата Напалеона» так і застанецца таямніцай. Але, згадзіцеся, што настолькі ж магчымы і другі, больш аптымістычны варыянт.

## Крыніцы


*Беларуская энцыклапедыя. — У 18 т. Т. 3. — Мінск, 1996.*

*Давыдов, Д.В. Военные записки /Д.В. Давыдов. — М., 1982.*

*Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье /под общ. ред. П.П. Семенва. Т. 3. — Минск, 1993.*

*Крюкова, А. Клады Беларуси /А. Крюкова // Аргументы и факты в Беларуси. — 2005. — 24 августа.*

*Лютынский, В.П. Орша в войне 1812 года: исторический очерк /В.П. Лютынский. — Орша, 1995.*

*Мазинг, Г.Ю. Березина, год 1812-й /Г.Ю. Мазинг, Л.Ф. Ерусалимский. — Минск, 1989.*

*Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси /В.Н. Рябцевич. — Минск, 1995.*

*Тарле, Е.В. Наполеон /Е.В. Тарле. — Минск, 1992.*

*Тарле, Е.В. Нашествие Наполеона на Россию, 1812 г./Е.В. Тарле. — М., 1992.*

*Шевцов, Н. Тайна московских сокровищ /Н. Шевцов // Труд. — 2005 — 15 сентября.*

*Шнейдер, А. Наполеон в Толочине /А. Шнейдер // Во славу Родины. — 1992. — 10 октября.*

*Яршоў, І.А. Вежы над Дняпром: нарысы /І.А. Яршоў. — Орша, 1996.*

## ЗМЕСТ

Ад аўтара . . . . . . . . . . 3

ЦЕНІ ПАГАНСКІХ КАПІШЧАЎ . . . . . . . . . . 5

«...І ПАЎСТАЎ ПАМОРАК ВЯЛІКІ» . . . . . . . . . . 14

«АДВЕДАЎ ПАН БОГ ГОРАД АГНЁМ...» . . . . . . . . . . 29

«СПРАВА ВЯЛІКАЙ СМЕЛАСЦІ І РОЗУМУ ВЫШЭЙШАГА» . . . . . 41

«СУМЛЕННА ПРЫНЯЛІ СВОЙ ЛЁС» . . . . . . . . . . 56

«ГАРАДЫ АДЧЫНЯЛІ ІМ БРАМЫ» . . . . . . . . . . 70

КАРОНА «ЛІТОЎСКАЙ ІМПЕРЫІ» . . . . . . . . . . 87

ЖЫГІМОНТ І БАРБАРА: МЕЛАДРАМА З ПАЛІТЫЧНАЙ ІНТРЫГАЙ . . . . . . . . . . 102

ТАКІЯ РОЗНЫЯ АДНОЛЬКАВЫЯ ЛЁСЫ... . . . . . . . . . . 117

«... І ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА Ў ПРЫДАЧУ» . . . . . . . . . . 134

ТАЯМНІЦА КРЫЖА ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ . . . . . . . . . . 147

ЛЕГЕНДЫ БЕЛАГА КОВЕЛЯ . . . . . . . . . . 159

ЗАГАДКА ДВАНАЦЦАЦІ АПОСТАЛАЎ НЯСВІЖСКАГА ЗАМКА . . . . . . . . . . 176

«ЗОЛАТА НАПАЛЕОНА» . . . . . . . . . . 192

Навукова-папулярнае выданне

**Асіноўскі** Святаслаў Маркавіч

**ШТО РАНЬШ БЫЛО...**

Рэдактар *В.М. Пінчук*
Мастак і мастацкі
рэдактар *В.Г. Загародні*
Тэхнічнае рэдагаванне
і камп'ютэрная вёрстка *Ж.М. Голікавай*
Карэктары *Л.А. Адамовіч, Л.Р. Кузьміна,*
*Г.К. Піскунова, Л.К. Сямёнава*

Падпісана да друку 20.03.2008. Фармат 84×108 $^1/_{32}$. Папера афсетная. Гарнітура «Лазурскі». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 10,92. Ул.-выд. арк. 10,56. Тыраж 2000 экз. Зак. 825.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0056828 ад 02.03.2004. 220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Друкарня «Перамога». 222310, Маладзечна, В. Таўлая, 11.

ISBN 978-985-01-0741-1

9789850107411



